Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

Лагойскі раённы выканаўчы камітэт

# *Благаслаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы*

## *Народная духоўная культура Лагойшчыны*

У 3 кнігах

**Кніга 3**

Пад агульнай рэдакцыяй: В. С. Новак (гал. рэд.),
А. А. Кастрыцы, С. А. Вяргеенка, В. К. Шынкарэнка

Гомель
ГДУ імя Ф. Скарыны
2013

УДК 39 (476.1 Лагойшчына)

**Аўтарскі калектыў:**
д-р філал. навук, праф. *В. С. Новак*;
д-р гіст. навук, д-р архітэктуры, член-кар. НАН Беларусі *А. І. Лакотка* ;
д-р філал. навук, дац. *В. К. Шынкарэнка*; д-р філал. навук, праф. *А. Ф. Рогалеў*;
д-р філал. навук, праф. *А. А. Станкевіч*; д-р філал. навук, праф. *А. М. Ненадавец*;
канд. філал. навук, дац. *С. А. Вяргеенка*; канд. філал. навук, дац. *А. А. Кастрыца*;
канд. філал. навук, дац. *А. М. Палуян*; канд. філал. навук, дац. *У. А. Бобрык*;
канд. філал. навук *А. Г. Алфёрава; Т. М. Дубяк* і інш.

**Благаслаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы** : Народная духоўная культура Лагойшчыны : у 3 кн. Кн. 3 / пад агул. рэд. В. С. Новак (гал. рэд.), А. А. Кастрыцы, С. А. Вяргеенка, В. К. Шынкарэнка ; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2013. – 186 с. : іл.
ISBN 978-985-439-814-3 (Кніга 3)
ISBN 978-985-439-824-2

У выданні, якое складаецца з трох кніг і падрыхтавана ў выніку выканання навуковага праекта «Сучасны стан духоўнай культуры Лагойшчыны: гістарычныя падзеі, знакамітыя асобы, абрады, звычаі і песні» (№ дзяржрэгістрацыі 20082066), прадстаўлена духоўная культура Лагойскага краю.

Змест трэцяй кнігі складаюць архіўныя і экспедыцыйныя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы з захаваннем асаблівасцей мясцовай гаворкі.

Адрасуецца фалькларыстам, этнографам, краязнаўцам, гісторыкам, работнікам устаноў культуры і адукацыі, настаўнікам, студэнтам і ўсім тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю і дбае пра захаванне яго гісторыка-культурнай спадчыны.

Рэкамендавана да выдання навукова-тэхнічным саветам установы адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»
23 сакавіка 2010 года, пратакол № 2

Пад агульнай рэдакцыяй: *В. С. Новак (гал. рэд.),*
*А. А. Кастрыцы, С. А. Вяргеенка, В. К. Шынкарэнка*

**Рэцэнзенты***:*
д-р філал. навук, праф. *У. І. Коваль;*
д-р філал. навук, праф. *А. У. Марозаў*

**ISBN 978-985-439-814-3** (Кніга 3)
**ISBN 978-985-439-824-2**

© УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны», 2013

## ЗАМОВЫ

### Ад залатніка

Залатнік, залатнік, сядзь на залатое крэсельца. Пры гэтым тры разы пагладзіць па жываце.

*Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на*
*ад Солуб Лідзіі Іванаўны, 1946 г. н.,*
*студэнткамі Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

### Ад рожы

Плыло тры рожы на рацэ: енна – бледна, друга – красна, трэцця – сіня, няхай на (імя) згіне. Бог да памоцы, а я – Святым Духам.

*Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на*
*ад Фярко Марыі Іванаўны, 1907 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Фярко В. (1999 г.)*

### Ад ста хвароб

Як сонца заходзе,
Хай чары і хвароба ад (імя) адходзе.
(Гаварыць кожны вечар перад сном).

*Запісана ў в. Баброва Лагойскага р-на*
*ад Залуцкай Яніны Яфімаўны, 1921 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Апімаховіч А. (2005 г.)*

### Ад рожы

Рожа-рожа, рожа-паня. Не хадзі па касцям, не гнаі мяса. Рожа вадзяная, рожа ветраная, гінь ты, рожа, прападзі, на сухія лясы, на чорныя балоты.

### Ад грыжы

Грызь, грызь, каб не адсачывалася ні на вітаха, ні на маладзіка, ні на якага дня.

*Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на*
*ад Шавель Аляксандры Емяльянаўны, 1935 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шавель Т. (2000 г.)*

### Ад рожы

Божая Мацер каля сіняга мора хадзіла, 12 рожаў у руках насіла: калючую, балючую, пякучую, шчыпучую, дзіўную, прыдзіўную, чырвоную. На сінім моры ўсё пакідала. Як на сінім моры агню не бываць, так табе балезні (імя) не бываць. Отча наш, Отча наш, Отча наш.

### Ад звіху, жывата

Ідзі, балезь, на сухія лясы, на дзікія балоты. Не сушы маёй касці, не мары жывата.

### Ад звіху

Ехаў цар Давыд з Богам ваяваць. Як табе, цар Давыд, з Богам не ваяваць, так табе, звіху, у (імя) руцэ, назе не бываці.

### Ад дванаццаці хвароб

Ішла Святая Прачыстая цераз поле чыстае, хлеб запякала, дванаццаць жыстокіх балезняў, падвеяў, пужанняў унічтажала.

*Запісана ў в. Бяларучы Лагойскага р-на*
*ад Андросавіч Леаніды Васільеўны, 1927 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кульба В.*

### Ад змяінага ўкусу

Гадзіна вадзяная, земляная, сляпні і вужы, змеі і вужакі, ярыца, пераярыца! Аддайце сваю жаласць і вазьміце сваю ярасць (імя або назва жывёлы). Калі не аддасцё сваёй жаласці і

не возьмеце свае ярасці, то не будзе вам збудзішча ні пад кустом, ні пад лістом, ні пад карэннямі. Сонца і яркі месяц не будуць вам свяціць і не будзе прынімаць вас сыра мацьзямля.

*Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на*
*ад Макейчык Ніны Васільеўны, 1966 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.*

**Ад спуду**

Сустракаю (імя) з хлебам, соллю і паскай.
А ты, Госпадзі, адпусці, будзь з душой і ласкай.
Бо (імя) не пасць –
Займеў перад гудам і пажарам власць.
Будзе гуд і пажар рады тым,
Што (імя) вам прыслаў.
(Прыслаў) сорак сем (драбкі цукру)
Павячэраць гуду і пажарнікам всем.
Прашу Бож'ю Маць
(Імя) апраўдаць.
Кладу на складу,
Штоб у нашым доме ўсе было ў ладу.
Кладу на мяжы,
Штоб было і ў хляву, і ў дзяжы*.

* (З тэксту вынікае, што ён суправаджае абрад «падносу» ці «кармлення» пэўных язычніцкіх бостваў, персаніфікацый стыхій (пажару) ці ахоўніка-дамавіка (гуда), які таксама мог спаліць сядзібу. Паднашэнне клалі, відаць, на кладзе дроў, альбо на мяжы, адгароджваючыся ад чужога непрыемнага ўладання).

*Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на*
*ад Макейчык Ніны Васільеўны, 1966 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.*

**Ахоўная замова ад звяроў**

Ішоў Ісус Хрыстос цераз лес, не ўкусіў яго ніякі пес. І ты мяне не ўкусіш.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жылянінай Галіны Іванаўны, 1930 г. н.,*
*БДПУ імя М. Танка, (2005 г.)*

**Ад звіху**

Звіху ты мой, звіху,
Ня будзь так ліху,
Жыл не сушы,
Жывата не тамі.
Ехаў святы Ян на вараным коніку,
Пад крыжам стаў.
Стань, звіху, на крэсце,
На сваім месце.
Здровась, Марыя.
Я з помаччу, Бог з Духам Святым.
Маё слова Гасподне, мой дух святы.
Папросім Госпада Бога, каб ён дапамог.

*Запісана ў в. Гасцілавічы Лагойскага р-на*
*ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1920 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Хабаравай Т.*

**Як выганяць начніцы**

Вось як шмат дзіця плача, то кажуць, што трэба выганяць начніцы. Для гэтага трэба закрыць дзіця ў шкафу на дзень, каб дзіця памяняла ноч на дзень і надварот. Каб усё стала на свае месцы.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на***
***ад Сімко Кацярыны Іосіфаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Дамініным А. (2008 г.)***

**Ад парушэння**

Прашу двадзесыці анёлаў з неба,
Замаўляць залатнік (імя) трэба.
Насвенчая панна Марыя на камені сядзела,
Белы кужаль выцінчала,
Залатнік (імя) замаўляла:
Залатнічок, залатнічок,
Не хадзі па жываце,
Стань на сваім месце, у кутку,
Дзе цябе Бог паставіў у Божым слове.
Як месяц і сонца кружыцца,
Залатнік на месца станавіся.
Стань, залатнік, на месца.
Стань, залатнік, на месца.
Стань, залатнік, на месца.
Амэн.

**Ад грыжы**

Грыжу грызу, грыжу замаўляю,
На век праклінаю.
Не адсачвайся, грызь,
Пакуль Сашкава жысць.
Здровасць Марыя!
Здровасць Марыя!
Здровасць Марыя!

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Кульша Марыі Іосіфаўны, 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Баркоўскай П. (1999 г.)***

**Ад грыжы**

Грызь-грызь, я цябе грызу, за сіняе мора шлю каляду есці, асіну грызці. Табе, грызь, там быць, а табе, дзіця, жыць.

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Гажаўкі Юзэфы Вікенцьеўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.***

**Ад спуду**

Насвеншая Матка па мору ішла,
Ісуса Хрыста за ручку вяла.
На кладачку стала, тая кладачка зыбнулася,
Насвеншая Матка злякнулася.
Кладачка, на места стань,
(Імя хворай) на месце стань.
Здровась Марыя, я з помаччу, Бог з Духам Святым.
Маё слова Гасподне і мой Дух Святы.
Папрасі Госпада Бога, каб Бог памог (імя хворай).

**Ад рожы**

Ішоў пан Езус з Ерусаліма, нёс у пачцы 12 роз:
Сем зялёных, тры мінёных,
Адна чорна, другая бяла,
Каб тая роза нігды не паўстала.
Здровесь, Марыя,
Я з помашчу, Бог с Духам Святым,
Маё слова Гасподне і мой Дух Святы,
Папросім Господа Бога,
Каб Бог памог (імя хворага).

*Запісана ў в. Заазер'е Лагойскага р-на*
*ад Сінюковіч Марыі Пятроўны, 1923 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Юрцэвіч М. (1995 г.)*

**Ад рожы**

Рожу (імя) замаўляю,
Бога на помашч прызываю,
Сто дваццаць анёлаў з неба,
Рожу (імя) замовіць трэба:
Агнявую, вадзяную, ветраную,
Урочную, прыдзіўную, прыгаворную.
(3 разы паўтараць.)

**Ад залатніка**

Залатнік (імя) замаўляю, Бога на помашч прызываю, сто дваццаць анёлаў з неба прызываю. Залатнік замовіць трэба з усіх сустаў, з кагцей, з касцей, стань у жываце на сваім месцы, як белы камень у поле на сваім месцы. (3 разы).

*Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на*
*ад Шамецька Алены Іванаўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Майтак М.*

**Ад праклёнаў**

Ішоў Ісус Хрыстос з нябёс,
З сабой крэст евангельскі нёс.
Госпадзі перада мной і за мной,
Заслані мяне, Госпадзі, каменнай сцяной.
А той, хто хоча на мяне напасць,
Напусці на таго, Госпадзі, вялікую страсць,
Агонь, лес, туман, дым.
Амінь, Амінь, Амінь.

**Ад спужання**

Каціласся вадзіца з гор, з імхоў, з балот, з белага карэння, з шэрага камення. Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос, Насвенша Матка, святая субота, вада ад пужання (імя). Каб (імя) пужанне прайшло.

**Ад іспугу**

Добры дзень, вадзіца-смачыца, усяму свету памачніца, з крыніцы браная, з гор-далін прыбываная, нясі з (імя) іспуг у далёкі луг. Хух!

*Запісана ў в. Загор'е Лагойскага р-на*
*ад Кішко Мальвіны Мікалаеўны, 1972 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Болаш М.*

### Замова ад пужання (спуду)

Матка Боска, цудатворная, ты цэлы свет учыніла, узровіла. Храмых, сляпых і трундаватых. Уздраў жа ж ад пужання. Ты ж цудоўна ў свентым абразе. Дапамажы (імя) у тым няшчасным разе. Здрось Марэла ласкі пэўна. Благаславенна свента Марэла.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Акуліч Соф'і Іосіфаўны, 1935 г. н.,*
*студэнткамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,*
*Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

### Ад урокаў (зглазу)

Ясна заранучка на небе ўсходзе,
Насвеншая Матка па мору ходзя,
За сабою трох паннаў водзя.
Першая панна агонь залівае,
Другая панна траву раскідае,
А трэццяя зайздроснікаў адганяе.

Здровась, Марыя, я з помашчу, Бог з Духам Святым. Маё слова Гасподне, мой Дух Святы. Папросім Госпада Бога, каб Бог памог.

### Ад залатухі

Ехаў святы Ян залатою гарой, залатою далінай.
Яго конь залаты: галава залатая і ногі залатыя, і сам залаты.
Святы Ян тожа залаты: галава залатая, рукі залатыя і ўвесь залаты.
– Святы Ян, куды ідзеш?
– Іду к (імя хворага) жывату.
Залатая залатушачка, мая душачка, мая птушачка!
Стань на крэсце, на сваім месце.
Просім Госпада Ісуса Хрыста, Матку Насвеншую:
Дапамагі (імя). (Перахрысціцца 3 разы.)
Ва імя Атца, Сына і Святога Духа. Амінь.

*Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на*
*ад Ліс С. С., 1933 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Азановіч В. і Каранчук А.*

### Ад болю галавы і зубоў

– Месяц Булат!
У цябе ёсць брат Ігнат?
– Ёсць!
– А ў брата Ігната не баліць буйна галава?
– Не, не баліць.
– А ў брата Ігната не баляць белыя зубкі?
– Не.
– Дык няхай у тваёй рабы Божай (імя) ніколі не баліць буйная галава і белыя зубкі.
(Перахрысціцца). Амінь.

### Ад зубнога болю

– Маладзік малады, твой рог залаты! Ці быў ты на тым свеце?
– Быў.
– Ці бачыў там жывых і мёртвых?
– Бачыў.
– Ці баляць ім зубы?
– Не.
– Няхай жа не баляць і мне.

*Запісана ў в. Карбачоўка Лагойскага р-на*
*ад Жалабковіч Валянціны Іванаўны, 1963 г. н.*

**Ад укусу змяі**

Когда идёшь в лес, берёшь с собой кусок хлеба и ложишь его под куст и семь раз читаешь молитву. Тогда ты вообще не встретишь змею.

*Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на*
*ад Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,*
*Пятроўскай Канстанцыны Іванаўны, 1931 г. н.,*
*Студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,*
*Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

**Ад гадзюкі**

Вот гэта, калі ўваходзіш у лес або калі гадзюка ўжо ўкусіла.

Аднажды мая кароўка з поля прыйшла, цыцкі ў яе, як твой гэты стол сталіся, ну, гадзюка яе ўкусіла. Дык я гэта загаварыла і пасля ночы ўжо нічога ў яе не было. А мне гэта расказала Эвілінка, калі я з ёй па лесе хадзіла. Нада так гаварыць:

У лес уступаю –
Найсвеншу Матачку на помач узываю.
Вынь язык, вынь джала,
А не вынеш, сама згінеш.

Во гэта трэба казаць і духу не мяняць. А як загаворыш так тры разы, то трэба пахукаць, ну дунуць.

**Ад звіху**

Ішоў конь па залатым мосце.
Конь спатыкнуўся – звіх мінуўся.
Звіх, звіх, не ламі касцей, не порці людзей.

*Запісана ў в. Ляўданшчына Лагойскага р-на*
*ад Анімаховіч Алены Іосіфаўны, 1932 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Анімаховіч А.*

**Ад начнічак**

Калі дзіця пераблытае дзень з ноччу: днём спіць, а ноччу – не, трэба ўзяць вечарам у падол дзіця і накрыж ісці ад накуцця да печы, і так 3 разы з усіх вуглоў хаты. Потым прамовіць:

Курачкі – сястрычкі,
Вазьміце начнічкі,
Вам пець і гуляць,
А майму (маёй) (імя) добра спаць.
Вам хлеб і соль,
А майму (маёй) (імя) добры сон.

После гэтых слоў апусціць паціху дзіця з падола на пасцель.

*Запісана ў в. Масцішча Лагойскага р-на*
*ад Пратасоўскай Ядзвігі Францаўны, 1982 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Чарніцкай Т.*

**Ад зубнога болю**

Месяц ты, месяц, срэбныя рожкі, залатыя твае ножкі. Сыйдзі ты, месяц, знімі мой зубны боль, занясі яго ў аблокі. Мой боль не вялікі, не малы, твая моц велічэзная. Мне болі не вынесці. Вось зуб, вось два, вось тры, усе тваі. Месяц-месяц, забяры ад мяне зубны боль. Амінь. (3 разы).

**Ад зубнога болю**

Месячок-маладзічок, залаты ражок, схадзі да мерцвяца, папытайся, ці баляць яму зубы. Не баляць яму, хай не баляць і мне.

### Ад ліха

Месячык светлы, залатыя рожкі,
Выйдзі з-за хмаркі,
Паглядзі на зямельку, зазірні ў хату,
Каб там усё было добра,
На зямельцы каб было родна,
У хляўку каб было прыплодна. Амінь.
(Выйсці на маладзік за хату, прагаварыць 3 разы.)

### Ад жалязніцы

Жыў Леўтар на сінім моры, было ў яго дванаццаць жонак.
Так стала, што ні аднэй не стала.
Так і ў кароўкі маёй жалязніца прапала.
(Паўтараюць 12 разоў, стоячы за хлявом.)

*Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на*
*ад Цішэвіч Рымы Аляксандраўны, 1965 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Раманоўскай Н.*

### Ад залатухі

Залатая залатуха, не хадзі каля бруха, касцей не ламі, крыві не сушы, рассыпся, залатнічок, драбней маку, стань на меры, як маці радзіла.

### Ад урокаў

Мінайцеся, урокі: дзявоцкія, жаноцкія, кавалерскія, мужчынскія, на мхі, на балоты, на сухія лясы, на шэра каменне, на быстрыя воды, на гарачыя агні, на зялёныя дубы. Каб зялёныя дубы ссохлі-звялі і ад (імя) урокі прапалі.

### Ад пуду

Я нічога не знаю, на помач Госпада Бога прызываю. Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос, Насвенча Матка, усе святочкі гадавыя, царкоўныя, касцельныя, прыступіце, ад (імя) цяжкую хваробу адганіце: галаўную, касцяную, нутравую, пузавую, нервную. Не баліце, нервы, станьце на меры, як маці радзіла. Мінайцеся, пуд дзявоцкі, жаноцкі, кавалерскі, мужчынскі, агнявы, вадзяны, стралавы, гразавы, ветраны, конскі, карові, сабачы, гусіны; мінайся, пуд, авечы, казячы; мінайся, пуд, ваўчыны, вужыны, птушыны; мінайся пуд.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Мусько К.*

### Любоўная прысушка

Уставала рана, умывалася бела. Выйшла ў чыстае поле, а ў чыстым полі стаіць баня без крышы, без дзвярэй. Там адна даска, там мая таска, а ты, Лена, чортава маці, рві лес-дуброву, давай любові раба божага (імя хлопца), рабе божай (імя дзяўкі) у румянае ліцо, у рацевое сэрца. Амінь.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Зялёнкі Ніны Апалінараўны, 1938 г. н.*

### Любоўная прысушка

Госпадзі, спасіба табе за тое, што ты даў, і трыжды спасіба за тое, што не даў. Настаў мяне на пуць мудрасці і акружы людзьмі, якім я магу памочь. Госпадзі, пашлі мне маю палавінку. Амінь. (Паўтараць 3 разы перад сном, штоб скарэй сустрэць палавінку і выйсці замуж).

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Паўлавай Мар'і Ігнатаўны, 1940 г. н.*

«36 картей, 4-х мастей, наведут таску на милого – любимого (Ф. И. О.)» – это нужно говорить и тусовать колоду с картами, а потом раскладывать и смотреть, если карт остается мала, то мальчик будет по тебе скучать.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Мерыневіч Вольгі, 2000 г. н.*

**На захаванне цяжарнасці**

На сінім моры сіні камень,
На тым камні святая цэркаўка,
А ў той цэркаўцы прыстол,
На тым прыстоле Ісус Хрыстос.
У яго рана распорана,
Гарачай кроўю абліёна.
Ах, Езус мой каханы,
Змілуйся над намі.
У нядзельку параненьку
Сонейка ўсходзе,
Гасподзь з малітвай ходзе.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Коўшык Г. П., 1906 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляўданскай Н.*

**Ад пуду**

Пуд мужчынскі, жаночы, кавалерскі, паненскі, стукавы, лекавы... Стань, Божачка, да памагай, а я з Духам Свентым.

*Запісана ў в. Праходы Лагойскага р-на*
*ад Катура Ядзвігі, 1978 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Лагойкінай Н.*

**Ад рожы**

Рожа пудавая,
Рожа насувая,
Рожа родавая,
Рожа красная,
Рожа белая,
Рожа бледная,
Рожа прыдзённая,
Рожа розавая,
Рожа сіняя,
Рожа зялёная.
Стань, Божа, ды памагай,
А я з Духам Свентым.

**Ад парушэння**

Найсвентша Матка на камені сядзела, белы кужаль прала.
Белы кужаль прала, залатнік увівала.
Залатнічок, сабірай адусюль:
Із касцей, із жыллей, із нутрэй.
Стань, Божачка, да помаччы, а я з Духам Святым.

**Замова на захаванне кахання**

Каб каханы мой мяне любіў, і ніколі нос не вараціў.

*Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на*
*ад Русак Таццяны Фёдараўны, 1930 г. н.*

**Ад рожы**

Заранкі, прыбывайце, да (імя) рожаў не майце. Заранкі прыбылі (раніца), рожу ў (імя) ўнялі. Унімайце пужлівую, вадзяную, ветраную, находную, урочную. Мінайся, ніколі не ўзывайся.

Ішоў Пан Езус з Ерусаліма, нёс 12 руж: рудую, чорную, чырвоную, белую, жоўтую, ружовую, сінюю, сівую, зялёную, брынкітную, палавую і вялую. Згінь, рожа, на Езуса Хрыста, Езус Хрыстус, змілуйся над намі.

*Запісана ў в. Пятроліна Лагойскага р-на*
*ад Ванаткевіч Настассі Пятроўны, 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н. (1998 г.)*

Замоў не ведаю, але мая маці добра рожу замаўляла. Яна казала, што гэта можа перадаць толькі самай меншай. Але мая мама нікому не перадала.

*Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на*
*ад Данілевіч Ніны Аляксандраўны, 1938 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Нікалаенка В., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

**Замова ад уроку**

Мой брат рабіў.

Браў горстку гарачых вугляў, кідаў у вядро з вадой і нешта нашэптваў. Але я не ведаю гэтых слоў.

*Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на*
*ад Мельнікавай Любові Мікітаўны, 1929 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,*
*Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

**Замова ад уроку**

Отговаріваю от колдуна і от колдуні, от чёрного і от черёмного і от белого і русого, от девкі самокруткі і от бабы простоволоскі. І как нікто не может своего носа да глаза откусіть, так ты не можеш ізурочіть і іспортіть… (імя) і не могла бы его заразіть ветроносная язва. Будьте, мої слова, ліпкі, будьте, мої слова, едінокупно не в договоре. Тем моім словам губы і зубы – замок, язык мой – ключ. І брошу я ключ в море. Останься, замок во рту. Бросіла я ключ в сінее море, шчука-белуга подходіла, ключ подхватіла, в морскую глубіну ушла і ключ унесла.

**Замова ад крывацёку**

Тры разы прачытаць над парэзам, тры разы дунуць: «Встань, коса, на камень – кровь не капнет, встань, топор – весь заговор».

*Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на*
*ад Лубнеўскай Ніны Пятроўны, 1932 г. н.,*
*(перасяленка з в. Аўшчынінкі Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.)*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н.,*
*Нікалаенка В., Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

**Замова ад барадавак**

3 разы трэба сказаць: «Ойча наш».

– Здоровась, Марія, ласкі, сполніе, пан с тобо благословенасты, мендзьмі на местамі благославен, овот жэвота твоего, Езусь Свенто, Матка боже, молься за нами, годзіны смерці наша.

*Ячменем у тарэлачкі ўсё сціраць, хай паплюе той, каму сціраюць, і выкіне курам ячмень. Гэта трэба зрабіць 3 разы.*

**Замова ад барадавак**

Бярэш ячмень, насыпаеш у тарэлку, тры разы сціраеш. Той, каго лечаць, павінен папляваць у тарэлку і маўчаць, пакуль не дойдзе да хаты. Пры гэтым патрэбна прачытаць малітву:

Ойчэ наш, стурый ест небе свенцэм!
Імя твоё пшэсць королевство,
Бонць воля твоя яко в небе, так і на земле.
Хлеба нашего пушебнэго
Дай нам дзісь,
Отпусь нам нашы віны,
Як і мы отпускаем нашым віновальцам. Амін

Сдрось Марія ласкі з пэўня
Пан з тобо благославі нас.
Мендзы невестамі благославен
Жывота твоего, Езус, свента Матка Божа,
Кжэсі годзіны смерці нашэй.

Паўтарацъ малітву тры разы. Потым хворы, не агледаючыся, высыпае гэты ячмень курам.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.,***
***Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)***

**Дзеянні ад урокаў**

Нашэпчуць вады і нада выпіць.
Хто ўмее, «выпісвае» ваду ад спужання дзецям.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Бартко Аляксандра Іванавіча, 1927 г. н.,***
***Бартко Рэгіны Антонаўны, 1929 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С., (2008 г.)***

**Ад спуду**

Ва імя Айца, Сына і Святога Духа.
Ад спужання (імя хворага) вады намаўляю,
Бога на помач запрашаю (2 разы)
І Святую Багародзіцу.
Езус, сыну Давіда, уздруў гэта дзіця,
Ежалі святая воля твая над ім.
Ад спуду чалавечча, сабачча, кашачча,
Ад цёмных вачэй, ад сініх вачэй,
Ад цёмнага воласу, ад тонкага голасу.
Ішоў пан Езус, нёс тры пальмы руж.
Една сохла, друга звяла,
А трэцця трэба, каб (імя хворага) выздравяла.
Ішла я дарогай,
Сустрэлася з Богам.
А Бог пытае: «Куды ідзеш?»
«Іду здароўя шукаць».
«Ідзі – зямлю тапчы,
Расу сцірай, а мне здароўя давай».
Ва імя Айца, Сына і Святога Духа.
Бог з помаччу, я з словам.
Бог з помаччу, я з Духам. (3 разы)
(3 разы падуць у святы крыж).

**Ад рожы**

Ва імя Айца, Сына і Святога Духа.
Рожу прымаўляю, Бога на помач запрашаю

І Святую Багародзіцу.
Раняя зарыца, вячэрняя зарыца,
Будзь (імя хворага) памачніца.
Вадзіца-цароўна, усяму свету роўна,
Будзь (імя хворага) памачніца.
Агнявую, ветраную, вадзяную,
Урочную, прарочную,
Белую, сінюю, чырвоную,
Мужчынскую, жаноцкую, дзявоцкую (рожу лячыць).
А ты, рожа, цела не сушы, касці не ламі, крыві не пі.
Мужчынскую – пад шапку,
Жаноцкую – пад чапец,
Дзявоцкую – пад касу,
Кавалерскую – пад нагу.

**Ад звіху**

Звіх, звіх, ня будзь ліх. Ехаў звіх на дзевяці канях калінавым мастом. Мост праламіўся, конь спатыкнуўся. Каб у (імя) звіх мінуўся. (Паўтарыць усё гэта 3 разы). Ва імя Айца, Сына і Святога Духа.

***Запісана ў в. Такаўшчына Лагойскага р-на***
***ад Мекты Марыі, 1907 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Юрцэвіч М. (1995 г.)***

**Ад рожы**

Ішла Насвенчая Матка па полі, знайшла тры кусты ружы. Адна чырвона, другая ружова, а трэцяя – бела. Каб яна тут засохла, прапала. Бог з помаччу, а я з духам. (3 разы.). Малітва «Здровась Марыя».

***Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на***
***ад Дубаневіч Ніны Каітанаўны, 1934 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н. (1998 г.)***

**Ад пярэпалахаў**

Выходзьце, пярэпалахі, з кагцей, з нагцей, з рук, з галавы, з носа, з жывата, са ўсіх суставаў, штоб іспуг Надзін на месце стаў. Бог з помашчу, а я з Духам Святым. Калі Бог паможа, дык і я памагу. Ва імя Атца і Сына і Святога Духа. Амін.

**Ад залатніка**

У нядзельку рана солнышка ўсходзе,
Найсвеншая Матка Ісуса Хрыста за ручку водзе.
Правяла на ўтраню, з утрані – на Божу службу,
З Божай службы – на вячэрню.
З вячэрні – у сіняе мора.
А ў сінім моры ляжыць белы камень,
На тым камені сядзяць тры дзявіцы – родныя сястрыцы.
Белы кужаль пралі, залатнік у (імя) выбіралі.
Залатнік, выбірайся, на места вастанаўляйся.

***Запісана ў в. Убалацце Лагойскага р-на***
***ад Курылёнак Любові Іосіфаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сямёнавай Л. (1994 г.)***

**Ад пугання**

Першым разам, Божым часам, вячэрняя зарніца, Божая памачніца, памажы выгнаць у Вольгі пуганне, заіканне, чыханне атцоўскае, мацярынскае, дзявіч’е, хлапеч’е, жэнскае, мужчынскае, старчаскае, кацінае, сабач’е, ваўчынае. Выйдзі, пуганне, з касцей, з машчэй, са ўсех печаней,

з буйнай галавы, з чорных бравей, з яркіх вачэй, з белай касці, з краснай крыві. Па касцях не хадзі, касцей не ламі, сэрца не знабі, у галаве боль не твары. Стань, Госпадзі, на сваім месце, як Мацер Прачыстая ў сваім залатым крэсле. Стань Ты, Госпадзі, Волечцы на помач, на радасць. Амінь.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Кізінай Соф'і Аляксандраўны, 1917 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Граванс В.***

**Малітва**

Памятай, Божа, душы слугаў тваіх, дзядоў і прадзедаў нашых і даруй ім усё грахі іхныя – свядомыя і несвядомыя, пусціш да сябе ў валадарства вечнае славы тваёй, шчасця і радасці невымоўнае навекі. Даруй, Божа, грахі, нам, прадзедам, дзядулям і бабулям нашым – усім продкам, што адышлі ў веры і надзеі, на ўваскрэсіны, і ўчыні ім вечную памяць. Амінь!

Хай лёс твой будзе счастлівы, у хаце будзе песенна. Сытна і мірна і весела! Хай доля без бед, зязюля шмат год кукуе. Калі без працы не звесцяцца. Хай будуць здаровы дзеці і ўнукі.

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад бібліятэкара Вязовіч Марыі Іванаўны, 1951 г. н.***

*Язэп ГЛАДКІ (Адам ВАРЛЫГА)*

## ЗАБАБОНЫ

(Запісаў Адам Варлыга на Лагойшчыне («Заранка» – Нью-Іорк, 1972 г.))

**Барадаўкі на руках**. Лечаць барадаўкі гэткім чынам: пералічаюць барадаўкі на руцэ, а потым адлічваюць столькі бабін ці гарашын, сціраюць імі барадаўкі, завязваюць іх у ванучку, выносяць гэты вузельчык на крыжавыя дарогі, каб ніхто не ўбачыў, кідаюць яго ды безаглядкі ідуць дамоў. Хто гэты вузельчык з бобам ці гарохам знайдзе ды развяжа, дык да яго пярэйдуць тыя барадаўкі, а хто кінуў, у таго згінуць. А калі пад рукамі няма бобу і гароху, дык на шнурку гэтулькі завязваюць вузельчыкаў, колькі было барадавак, ды гэтаксама кідаюць на крыжавых дарогах.

**Благая рука**. Калі чалавек мае благую руку, дык ад яго не завядзеш ніякай жывёлы і ніякай пашні насеньня. А калі прадасі нейкую жывёлу ці нейкай пашні насеньня чалавеку з благой рукой, дык у яго ўсё тое павядзецца, што ён купіў, а ў таго, што прадаў – зьвядзецца. Ёсць людзі і з «добрай рукой». Калі ад гэткага чалавека што купіш, дык усё павядзецца: ці жывёла, ці пашня. Кажуць: «Пашло рукой», «Паручыла», «Пашло з рукі». Калі нейкая жывёліна захварэе ці не вядзецца (не сыцее ці не дае прыплоду), дык просяць, каб хоць перетаргаваў чалавек з добрай рукой гэту жывёліну. Добрую руку яшчэ называюць «лёгкай рукой».

Каб усцерагчыся ад благой рукі, дык пры прадажы насення ці жывёліны трэба пільнавацца, каб не прадаць з сваім мехам. Маіх бацькоў у гэткім выпадку сусед моцна падашукаў. Аднаго дня суседка прышла да маёй маткі пазычыць меха з току зносіць змалочанае збожжа. На другі дзень ейны брат з гэтым мехам прышоў да майго бацькі парасяты купляць. Мой бацька ў гэты свой мех усадзіў яму двое парасят на хоўлю. А той сусед меў цяжкую руку.

Каб прадаўцу і пакупніку ўхіліцца ад благой рукі (нават незнаёмых між сабой), дык падавалі повад прадаванай жывёлы не голай рукой, а ў крыле (крысе) сярмягі.

**Благія вочы**. Народ верыў, што іншыя людзі маюць благія – урочлівыя вочы. Часамі гэткі чалавек сам не рад гэткім вачам, але ж гэта не ад яго залежа. Часамі, калі чалавек з урочлівымі вачыма паглядзіць на нейкую жывёлу, дык гэта жывёла можа захварэць, а часамі й здохнуць. З жывёлаў былі чулымі да ўрокаў цяляты. З людзей уважаліся чулымі да ўрокаў радзіхі й толькі што народжаныя маладзёнкі. Абаронай ад урочлівых вачэй быў ліvandрэк (гэта было нейкае чорнае рэчыва, падобнае на смалу). Яго радзіхі трымалі пры сабе і пры народжаных маладзёнках, яго каровам прывязвалі да рог, а маленькім цялятам – да шыі. Найболей шкодзіла, калі ўрочлівая людзіна пахвале маленькую жывёліну ці дзіця, а не калі хоць пільна паглядзіць. Калі ўрочлівая асоба скажа: «Вось харошанькае цялётка!», ці хоть пільна паглядзіць, дык трэба яму сказаць, калі не моцна, дык шопатам, а не хоць падумаць: «Не ўрачы хаця». Але часамі бывае, што і свой семянін ці і сам гаспадар можа ўрачы. Але, каб гэтага не здарылася, дык трэба папяраджаць словамі: «Ня ўрокам кажучы». («Ня ўрокам кажучы – наша цялушка добра расце». «Ня ўрокам кажучы – мой хлопчык яшчэ ніколі не хварэў»). Калі нехта з сваёй сям'і нешта сваё ўсхваляе без папярэджання, дык трэба яму заўважыць: «Не ўрачы хаця».

**Брухатая баба**. Калі кабеціна ўцяжку прыходзіць нечага пазычаць, дык у доме, куды яна прыходзіла ў пазыкі, мышы наробяць нейкай шкоды: папраядаюць адзежу ці нешта іншае папсуюць, незалежна ад таго, ці ей пазычылі, чаго яна прасіла, ці не. Каб усцерагчыся гэтай бяды, дык, калі яна выйдзе з хаты, трэба тапаром пасеч парог, але пасля гэтага ў яе родзіцца дзіця з рассечанай вуснай, як у зайца.

Кабеціне ўцяжку трэба надта асцерагацца, каб нічога не браць чужога, каб нават не зайздраваць і не глядзець на чужое, бо ў праціўным выпадку, калі народзіцца гэта дзіця, дык будзе мець ахвоту да зладзейства.

**Бурбалкі на лужах у часе дажджу**. Калі ў часе дажджу бурбалкі на лужах станавяцца, дык гэта сведча, што на доўгі час задажджылася.

**Валасень выліваць**. Часамі пры пашкоджанні пальца ён абрывае і з яго зганяе пазногаць. Тады ў пальцы бывае вялікі боль і калоцце, што хворы некалькі начэй не засне. Гэту хваробу завуць «Валасень» (па-руску – «Ногтоеда»). Калі я быў малы, дык у маёй маткі быў гэты валасень: пазногаць з пальца быў сагнаны, скура на пальцы была аблезшы. Палец быў загноены і

выглядаў страшна. Матка сама бралася лячыць гэты палец. Яна загадала старэйшай сястры прынесці жытняй саломы з гумна. Адлічыла тры разы па дзевяць саломінак з каласкамі ды звязала іх у мяцёлачку. Яна загатавала саган вады ды гэты вар лыжкай ліла на балючы палец, а сястра пад пальцам трымала мяцёлачку каласкоў, каб вада з пальца цякла на каласкі. Матка на гэты палец выліла тры разы па дзевяць лыжак вару. Калі гэта работа была скончана, дык матка стала расхінаць тыя каласкі, а яны былі пераплецены белымі валаскамі, а іх было вельмі шмат. Мы ўсе дзеці бачылі тыя валаскі.

У нашых даўнейшых людзей было веранне, што хвароба валасень праяўляецца ад таго, што нейкім чынам (бліжэй усяго ад чараў) пападаюцца пад скуру на канцы пальца валасы, якія там точуцца ў целе, а за гэта моцнае і страшнае калоцце ў пальцы. А гэтым варам тыя калючыя валаскі пераганяюцца з пальца ў каласкі саломы. Матка казала, што тое лячэнне ей памагло, і наступную ноч яна спала.

**Вада з роту**. Калі дзіця перапужалася ды захварэла ад пярэпалахаў, дык яму давалі піць ваду з роту той асобы, якая перапалохала дзіця, а калі дзіця спужалася жывёлы (сабакі ці каровы), дык кідалі хлеб у ваду, каб тая жывёла вылавіла, ды тую ваду давалі піць хвораму.

**Вяселле**. Калі вяселле змокла, едучы да шлюбу ці ад шлюбу, дык вінна маладая, бо калі яна была маладой дзяўчынай, дык не рупілася хутка пасля яды стол сціраць.

Каб конь воза з месца не крануў, калі маладыя ад маладой будуць ехаць да маладога, дык трэба ў гэты воз няўзнаку ўкінуць струк бобу ці гароху на дзевяць каліў. Хоць практыка паказала, што гэткіх струкаў не бывае, але выпадкі былі, што конь не мог возу крануць з маладымі. Праўда, струка на дзевяць каліў у возе не знаходзілі, але знаходзілі кол у спіцах задніх колаў возу.

**Вясёлка воду бярэ**. Калі ў часе дожджыку на небе з'яўлялася вясёлка, дык людзі верылі, што пасля гэтага задажджыцца, бо вясёлка з рэчак і азёр у хмары вады набрала.

**Вітацца праз парог**. Людзі асцерагаюцца, каб не павітацца праз парог, бо праз гэта можа паўстаць звадка між гэтых людзей.

**Дзеркачом не можна біць статку**, бо сыць ня будзе браць: будзе скура ды косці.

**Жабу забіць**. Калі жабу забіць, дык дождж пойдзе. Калі здарылася працяглая суш, дык стараюцца жабу забіць, каб дождж пашоў. А калі задажджылася, дык перасцерагаюць дзяцей, каб жаб не білі, а то дождж не перастане.

**Жваку таўчы**. Калі жвачная жывёліна (карова, авечка, каза) захварэе ды спыняе жваць жваку, дык ёй таўкуць жваку. Для гэтага трэба дзве асобы. Адна выходзе з хаты ў сенцы, а другая кладзе ў ступу кавалак лыка, хлеба і солі ды таўчэ. Тая асоба, што была ў сенцах, прыходзе ў хату і пытае: «Што ты таўчэш?» – «Жваку», – адказвае другая. «Каму?» – пытае першая. «Казе!» – адказвае другая. «Якой?» – пытае першая. «Сівой!» – адказвае другая. «Таўчы, каб жвала!» – адказвае першая. Першая асоба тры разы выходзе ў сенцы і тры разы паўтарае гэтыя самыя пытанні. Пасля ўсяго гэтага бяруць стоўчанае лыка з хлебам і соллю ды ўпіхаюць у рот хворай жывёліне.

**Жычку абвязаць дзецям каля шыі**. Калі ў дзяцей у ваколіцы з'явіцца пошасная хвароба на горла – шкарлятына, – дзецям абвязваюць каля шыі чырвоную жычку, як папераджальны сродак.

**Жыргаць**. Жыргаць – гэта значыць пераступаць нагамі праз нейкую рэч (праз пугу, дубец ці нават праз ногі чалавека). Калі хто перажыргне нешта няўмысле, дык ён павінен аджыргнуць, а гэта знача адыйсці назад задам па тым самым месцы ў той жа раз. Жырганне шкодзе і няўмыснае, і сумыснае. Калі перажыргнуць ногі недарослага чалавека, калі ён ляжыць, дык гэта чалавек не будзе расці. Калі перажыргнуць пугу ці дубец ды гэтай пугай ці дубцом ударыць жывёліну ці чалавека, дык тая жывёліна ці чалавек не будзе ні расці, ні прыбываць. Калі сумленны чалавек перажыргнуў ногі чалавека ці пугу, ці дубец, які ўжываецца замест пугі, дык ён сам зараз жа мусе аджыргнуць. А калі хто перажыргнуў ды не хоча аджыргнуць, дык узнікалі звадкі і бойкі між дзяцей.

**Забіць крата**. Калі хто заб'е крата ды свежай крывёй вымажа свае рукі, дык калі гэта кроў будзе і абмыта, але гэтыя рукі праз усё жыццё змогуць лячыць жываты. Каму забаліць жывот, а гэты чалавек сваімі рукамі пагладзе балючы жывот, дык боль жывата спыніцца.

**Зачыніць вароты**. Калі сваты прыехалі да дзеўкі ў сваты, а дзеўка адмовілася выйсці замуж ды сватоў увяла ў гнеў, дык яны, выязджаючы з двара, зачыняюць за сабой вароты, а гэта таму, каб да гэтай дзеўкі ніколі ніякія сваты не прыязджалі, каб яна ніколі замуж не вышла.

**Калі зладзеі пакрадуць**, але калі пакінуць вароты адчыненымі, дык ёсць надзея, што пакража знойдзецца. Але калі зладзеі за сабой зачынюць вароты, дык няма надзеі ў адшуканні пакрадзенага.

**Замова ад прусакоў і клапоў**. Калі дзярэш мох на новую хату, дык выдраўшы першую жменю, трэба сказаць: «Дзяру я першы раз мох, каб клоп і прусак здох».

**Замова, каб кроў стрымаць**. Калі з пасечанай ці парэзанай раны кроў не спыняецца цячы, дык клічуць знахара, а ён шэпча замову: «Ехаў Даніла на белай кабыле, кабыла прыстала, кроў перастала». Трэба прыпускаць, што гэта замова вельмі старадаўняя, яшчэ з дахрысціянскіх часоў, а тады, напэўна, гаварылася, што ехаў «Ярыла», бо бог Ярыла ездзіў на белым кані. Але, калі імя «Ярыла» ў народзе стала забыта, дык падобнае яму (па сугуччу) сталі ўжываць імя «Даніла».

**Замова-заклён на пугу**. (Яна паходзе з пастушковага асяроддзя.) Пуга драцяк надта моцная, яе не парвеш, але яна часамі ломіцца – адвальваецца кавалкамі. Пастушкі верылі, што гэта робіцца ад чараў. Кожны хлопец падшыванец ведаў гэтыя чары і чараваў пугу, але не сваю, а чужую. Ён браў пугу свайго ворага і мерыў яе кархамі і пядзямі, прамаўляючы: «Корх, пядзя, а на канцы варона сядзе». «Кусь». (Пры гэтым слове кусаў зубамі адмераны канец пугі.) І гэткім чынам перамяраў усю пугу. І ўласнік пугі і чараўнік верылі, што тая пуга разляціцца на гэткія кавалкі, на якія «чараўнік яе размерыў».

**Зубоў у роте няможна лічыць**. У старадаўніх нашых людзей было веранне, што калі пералічыш зубы ў роце, дык яны стануць балець і высыпацца.

**Ікаўка**. Калі да каго ікаўка прычэпіцца, дык пабочныя асобы стараліся раптам яго зманіць, каб ён спужаўся, дык ікаўка спынялася.

**Каб дзеўка скруцілася і замуж не вышла**. Калі хлопец любіць дзяўчыну і хоча з ёй жаніцца, а матка хлапца супроць гэтага, дык яна мусіць падхапіць кавалак палатна, што тая дзяўчына выткала, прывязаць яго за крыло вятрака, каб яно некалькі разоў акруцілася, потым занесці яго ў царкву ці касцёл на ахвяру, дык тая дзеўка ні за кога замуж не выйдзе, а «скруціцца» – састарэе дзеўкай.

**Каб дзіця было рэзвае, лёгкае, шустрае, вясёлае**, дык паруць і даюць піць пералёт. Пералёт – гэта пушок, што бывае на вясновай баравой сіняй красцы, соне, калі яна адцвіціць.

**Каб засцерагчы дзіця ад чараў, урокаў і розных хваробаў,** дык пры купанні выціраюць калядным попелам. Попел высыпаюць у чатыры кучкі па рагох пелішчаў. Мокрае дзіця пасыпаюць попелам, беручы яго накрыж з кожнай кучкі. Пасля выцірання і попел апаласкваюць.

**Каб дзіця было дужае, моцнае і хутка расло**, дык яго купаюць у трацялетнім жыце. Са дзве кварты жыта сыпяць у гаршчок, яго доўга вараць ды ў той вадзе дзіця купаюць.

**Каб вылячыць катар**, дык, прышоўшы ў лазню, трэба ў нос набраць вады ды на гарачую печку высмаркаць. І гэтак паўтарыць тры разы.

**Каб зімой жыта пад снегам не выпрала**, дык ад засевак жыта ды аж да ўсевак гаспадар не топя лазні і не парыцца ні ён ні сям'я.

**Калі аб адной назе (адна нага абутая) хто ходзе,** дык у таго бацька памрэ ці маці.

**Калі ў печы булка хлеба раздваілася,** дык нехта з сям'і адлучыцца.

**Калі гаспадар засее жыта,** дык забаранаваўшы з таго рогу, дзе пачынаў сеяць, рассцілае чылай саломы па засееным, быццам паказвае, каб гэткае жыта расло, як гэта салома.

**Калі кот мыецца** (лапкамі шаруе па пысках), дык госць прыдзе.

**Калі левая рука свярбіць,** дык грошы лічыць будзеш.

**Калі лучынка ў светачы пагасла,** дык нехта пад вакном падглядаў.

**Калі маладая жывёліна захадам сонца гарцуе,** дык яе воўк з'есць.

**Калі нос свярбіць, дык будзеш гарэлку піць,** або нехта хвігу дасць.

**Калі пераносіца свярбіць,** дык нехта на той свет пераносіцца (умірае).

**Калі правая рука свярбіць,** дык вітацца будзеш.

**Калі сабака вые** (без прычыны), дык гаспадар памрэ.

**Калі садзяць капусту,** дык кладуць на градзе камень, увёрнуты ў анучу, каб качаны былі вялікія і тугія, як камень.

**Калі садзяць рэдзьку,** дык тая кабеціна ці дзеўка мусе быць высака падаткнуўшыся і босая, каб рэдзька была гэткая доўгая, таўстая і гладкая, як яе лыткі.

**Калі скацё з начы ў хлеве застаюць мокрае,** дык гэта ўсю ноч кадук на ім ездзіў і цяпер на ім сядзіць. Каб адвучыць кадука ездзіць на тэй жывёліне, дык трэба гальнік абрабіць у самы горшы бруд ды біць тым гальнікам па хрыбце тую жывёліну і прамаўляць: «Які госць, такая і чэсць».

**Калі ў лучынцы, якая гарыць у светачы,** вугаль рашчэпіцца на два рагі, дык скора прыдзе вусаты госць.

**Калі ўвязаць кудзелю ў прасніцу.** Кудзелю трэба ўвязваць у прасніцу ў сераду, бо ў серады шмат дачок, дык памогуць спрасці.

**Калі вясной пастушок запасвае** (першы раз выганяе статак на пашу), дык ён цэлы дзень мусе насіць замкнёны замок у кішэні, каб ваўкова ляпа была замкнёна ад Вялікадня да Дзядоў, каб не душыў статку.

**Калі вока свярбіць,** дык плакаць будзеш.

**Калі вока скача** (як-бы тузаецца), дык трэба яго левай рукой мезеным пальцам перакрыжаваць (гэта азначае, зрабіць заклён, каб нячыстая сіла яго пакінула).

**Калі воўк дарогу перабяжыць,** дык у дарозе пашанцуе.

**Калі вусны свярбяць,** дык цалавацца будзеш.

**Калі заяц дарогу перабяжыць,** дык у дарозе не пашанцуе.

**Калі заяц у вёску ўбяжыць,** дык вёска згарыць.

**Калі з пустым вядром нехта дарогу пярэйдзе,** дык у дарозе не пашанцуе.

**Калі жар ў копца смяецца** (разгараецца), дык госць прыдзе.

**Калі каноплі пасеюць і забарануюць,** дык у адным рагу варочаюць зуб’ем угору смык ці баравы, каб быллё было гэткае таўстое, як зуб’я смыка ці бараны.

**Калі каноплі пасеяныя і забаранаваныя,** дык гаспадар (а найболей сусед) бярэ з прасла плоту, але выбірае гнілейшую, або загадзя паложаную на прасла гнілую плаціну, ды б’е ёй па пасеяных каноплях, каб яна зламалася. Канец плаціны, што застаўся у руках, кідае накрыж на адламаны канец і прымаўляе: «Каб вы тут прапалі». Каноплі – расліна праклятая і ўпартая – яна дзее супроць волі гаспадара.

**Канапляная мякіна**. Вясной канаплянай мякінай выкурваюць расаднікі, каб у капусце кілы не было і каб летам чэрві не елі капусту.

**Каменчык з дзіркай**. У натуральным выглядзе рэдкая з’ява ў прыродзе, але ён уважаецца за вялікае зелле ў нейкай жаночай хваробе. У полі вешалі каровам на шыю гэткі каменчык, на якіх валы нападалі. Але ў Магдусінай каровы на шыі вісеў заўсёды. Некатарыя бабы ў сваіх сховах трымалі каменчыкі з штучна вырабленымі дзірачкамі і перадавалі ў спадчыну старэйшым дочкам. У разе патрэбы іх пазычалі хворым жанчынам. Іх насілі на шыі, мачылі іх у вадзе і пілі туюю ваду. Гэты штучны з дзіркай каменчык быў той, які даўна ўссаджваўся на пятку верацяна.

**Каромысла, што ваду носяць**. Калі ўдарыць дзеўку гэтым каромыслам, дык хлопцы за ёй будуць ганяцца, а калі ім ударыць хлопца, дык дзеўкі будуць за ім ганяцца. Гэтым каромыслам няможна ўдарыць карову, бо за ёй у полі быкі будуць ганяцца.

У в. Л-цы ў 1906 г. маці пайшла ў пуню будзіць дачку, аж пры ёй застала дзяцюка. Яна вярнулася ў сенцы, узяла каромысла, прышоўшы ў пуню, пачала біць гэтым каромыслам дачку і дзяцюка. Гэтым яна хацела выкарыстаць нагоду, каб яны адно за адным ганяліся ды пажаніліся. Але гэты дзяцюк усхапіўся ды выцяў поўху будучай цешчы. Справа дайшла да валаснога суда, але гэта кабеціна выгранкі не мела, бо светак не было.

**Кіёчак ад навоя красён**. Калі ткалля апошні раз прыпусціла пражны навой, дык пруточак адвальваецца на дол. Трэба яго падняць ды на ім конна выехаць на вуліцу. Гэту выправу даручаюць хлапчуку 5–6 гадоў. Хто гэтага хлопца пасылае, дык мае на ўвазе цяжарную жанчыну. Калі хлопчык убачыў мужчыну, дык тая жанчына родзе хлопчыка, а калі жанчыну, дык дзяўчынку.

**Каўтун**. Хвароба валасоў, як і падвей, звязана з нячыстай сілай. Яго лячылі знахары. Пры каўтуне няможна было валасоў ні расчосаваць, ні стрыгчы, хворы цярпеў недамаганні ва ўсім целе. Калі каўтун пачынае завівацца, тады хвораму лягчэла. Каўтуны былі ў палец таўшчыні і ў качалку. У апошнія гады 19 в. старшына Гайна-Слабадской воласці Дзям’ян Занямонец з в. Стайкі меў каўтун натоўсткі з качалку. Ён мусіў каўтун складаць у некалькі разоў, каб схаваць пад шапку. У Ганевіч на Лагойшчыне быў знахар Кашэўскі, які лячыў каўтун. Ён спярша завязваў валасы шаўковай ніткай, каб каўтун звіваўся і выцягваў хваробу з цела навонкі. А калі каўтун вырастаў вялікі, дык выпякаў яго гарачым жалезам.

**Кілу лячыць трэба клінам**, які выпадкова знайдзеш у лесе ды там жа клінам і абцёрці яе, ды на тое самае месца і кінуць той клін. А каб лёгка было ў лесе знайсці клін, дык просяць суседа, каб ён загадзя панарабляў ды накідаў кліноў.

**Круг**. Маленькія свярбячыя болечкі, што садзяцца кругам. Калі перайсці праз тое месца, дзе конь пакачаўся ў пяску, або што дзеці гуляючы на пяску нарабілі нагамі, дык можа на целе сесці круг. Калі заўважыў, што на зямлі прайшоў праз вышэй успомненыя кругі, дык трэба задам па тых самых слядах адступіць з таго круга. А калі круг ужо на целе, дык трэба яго сцёрці гарохам, адлічыўшы тры разы па дзевяць, ды як і пры барадаўках, занесці і кінуць на крыжавыя дарогі.

**Кусанка хлеба**. Трэба асцерагацца, каб хоць і ў сваёй сям'і не ўкусіць чужой кусанкі хлеба, гэта значыць таго хлеба, што нехта ўкусіў, бо з той асобай будзеш кусацца, г. зн. грызціся, сварыцца.

**Лён**. Нашы сяляне вельмі шанавалі лён, бо казалі, што праз ільняную анучыну вужака не ўкусе, а праз пласконную ці суконную ўкусе. Калі восенню слалі лён, каб ляжаў, дык яго абсцілалі кругам камлямі навонкі. А пры ім высцілалі круг, або паўкруга і звалі месяц. Яны верылі, што месяц мае нейкі ўплыў на вылежванне лёну.

**Лес**. Нашы старыя людзі верылі, што людзі з лесам вядуць між сабой бязупыннае змаганне за зямлю. У наш час людзі перамаглі лес, але прыдзе той час, калі лес запануе над усёй зямлёй.

**Мак відук** (што сам насяецца). Калі часамі летам сталася вялікая суш, што доўга дажджу не было, дык гаспадыні да ўсходу сонца сыплюць у студню мак-відук, каб дождж пашоў.

Калі каму нябожчык сніцца, дык ён думае, што нябожчык з магілкі ўстае ды да яго прыходзе, а таму ён тую магілку, дзе пахаваны той нябожчык, макам-відуком абсыпае, каб нябожчык не ўстаў.

**Маладзік**. Наш старасвецкі народ з павагай ставіўся да месяца, але кожную квадру месяца шанаваў асобна. Ён верыў, што калі пад маладзік ці маладзіком параніць цела, дык яно не будзе жыць, а будзе гнаіцца – прыкідацца. Нашы старыя людзі ўпэўнівалі, што калі шалёны воўк ці сабака пакусае жывёлу ці чалавека, дык тое шаленства праяўляецца толькі пад маладзік ці маладзіком. (Пра гэта мне не давялося чуць навуковых заўвагаў.) Нашы людзі верылі, што раны, зробленыя трэцяй квадрай (віташком), хутка зажывалі. Нават радзілі старыя раны і болькі віташком пакратаць, патрывожыць, дык будуць зажываць. Самай лепшай парой месяца ўважалася «поўна» (канец другой квадры). Гэта пара была спрыяльнай на заканчэнне работ і на складанне запасаў.

**Насенная рэпа** ўважалася зеллем ад водры. Калі дзіця захварэе на водру, дык яму давалі есці насенную рэпу, а напэўна таму, што гэта насенне было надта падобна на сыпку водры.

**Над студняй ці каля студні няможна было нічога есці,** бо ў гэту студню будуць мышы валіцца.

**На сваю галаву**. Гэтак выклікае гаспадар, калі курыца запяе, як певень. Нашы сяляне верылі, што курыца пяе або на сваю смерць, або на гаспадарову, дык вось чаму гаспадар так і выклікае. Калі толькі курыца запяе, дык гаспадыня бярэ гэту курыцу ды куляе яе ад кута хаты да парога. Калі куляючы хвост курыцы пападзе на парог, дык яна пела на гаспадарову галаву, а калі галава – дык на сваю. Калі куляючы курыцу гаспадыня набліжаецца парогу, дык мяркуе, каб галава курыцы папала на парог, а калі пападзе, дык тут жа на парозе адсякае курыцы галаву, каб спраўдзілася, што яна пела на сваю галаву.

**Навязку навязаць**. Былі такія знахары, што пры звіху нагі ці рукі, на шнуры шэпчучы, навязвалі вузельчыкі, ды той шнурок прывязвалі да пакалечанай нагі ці рукі. Знахар (ці знахарка) перад смерцю перадаваў свайму сыну ці даччэ ў спадчыну гэты сакрэт лекаў. Але калі ён перадаў іншай асобе сакрэт лекаў (тых слоў) ці хто падслухаў тыя словы, дык ён сам перастаў быць знахарам.

**Ногці красуюць**. Часам у старэйшых дзяцей ці падлеткаў на ногцях з'яўляюцца белыя кропелькі. Старыя казалі, быццам гэта вяшчуе, што тая асоба будзе хваслівіцца або новымі ўборамі, або нейкай славай.

**Пажар**. Калі здарыцца пажар, дык трэба, каб жанчына зусім голая з распушчанымі валасамі наўкола абегла гаручыя будынкі дый пабегла на поле. Гэткая з'ява практыкавалася ў нашай вёсцы ў 1901 г.

**Пажар ад пяруна**. Калі пярун запале будыніну, дык яе няможна гасіць датуль, пакуль не лінеш на агонь казінага малака, а пасля таго можна гасіць і вадой.

**Печ засланіць**. Калі нехта з хаты выходзе ў дарогу, дык трэба печ засланіць засланкай, хоць калі яна і паліцца, ато падарожнаму ў дарозе не пашанцуе.

**Рука развілася**. Калі ад цяжкай працы рука ў суставе апохне і баліць, дык яе перавязваюць тым шнурком, што быў звязаны венік.

**Рунь жыта**. Калі жыта і добра расце, і хораша выглядае, але на яго не можна казаць «зялёнае», бо яно адкажа: «Каб ты сам ззелянеў». А на жыта трэба казать «Аздобнае».

**Стрэльба жывіць**. Быццам ёсць такія чараўнікі, што калі ён патрымае ў руках стрэльбу, дык з яе нічога не застрэліш, калі і лучыш у звера ці птушку. Каб адрабіць тыя чары, дык калі ўбачыш звера (першы раз пасля чараў), трэба стрэльбу махнуць назад ды праз яе перакінуць нагу, хутка падняць яе ўгору ды стрэліць на звера ці птушку, а калі застрэліш, дык чары перастануць дзеіць на гэту стрэльбу. Само-сабой зразумела, калі стралец, прарабіўшы гэткія рухі з стрэльбай, ды зможа застрэліць звера ці птушку, дык ягоная стрэльба ніколі жывіць не будзе, і ніякія чары на яе дзеіць ня будуць.

**Свечку ставіць у вуха**. Калі баліць галава і коле ў вуха, дык нашы селяне самі сябе лячылі, ставячы свечку ў вуха. Мая матка гэтак сябе лячыла: яна чысценькую анучку скруціла, як лейку, дзе адзін канец быў шырокі, а другі тонкі. Яна ў шырокі канец той лейкі насыпала наструганага воску, а тонкі завостраны ўставіла шчыльна ў вуха. Яна ляжала бокам, а шырокі канец той лейкі з воскам гарэў. Старэйшай дзяўчыне яна загадала сачыць, каб лейка стаяла проста, каб воск не выліваўся. Свечка ў вуху гарэла каля 10–15 мінут. Калі матка яе выняла ды стала разверчаваць гэты недагарак, дык зверху быў недагарэлы воск, а ў дольным канцы, які быў у вуху, дык было нацягнена нейкага бруду, падобнага на вушную серку. Я помню, што матка хвалілася суседцы, што тая свечка ей памагла.

**Свечку зламаць на некага**. Гэта страшная помста на свайго ворага. Безумоўна, што гэты забабон перанесены з дахрысціянскіх часоў у хрысціянскі ўклад жыцця ды пратрываў да нашых часоў. Гэткі спосаб помсты ўжывалі дзяўчаты, пакіненыя з дзяцьмі сваімі каханкамі. Гэта дзяўчына падбірала вялікае свята, ішла ў царкву, купляла свечку, паліла яе, ламала ды кідала пад ногі.

Чаму вясной вечарам статак з пашы спяшаецца дадому, а восенню застаецца начаваць на пашы.

Вясной надвечар травіца кажа да кароўкі: «Еж, еж мяне, кароўка, ды ідзі дадому, адпачні, а калі заўтра раненька прыдзеш, дык я большая падрасту».

Восенню надвечар травіца кажа да кароўкі: «Еж, еж мяне, кароўка, ляж паляжы ды ізноў еж, бо заўтра можа мяне і не будзе».

**Шпунт ад заколенай каляды**. Выкармленае свінчо к Калядам колюць шылам у сэрца ды гэту дзірку затыкаюць шпунтам, каб кроў не выцякала. Калі свінчо разбіраюць, дык гэты шпунт кідаюць на печ у самы куток, каб налета каляда вырасла вялікай і сытая, як печ.

**Штаны з каменнем у калошах**. Калі ў полі валы надсадзілі карову, дык у мужчынскія нагавіцы з павязанымі калошамі накладаюць каменне ды вешаюць карове на спіне. І гэтыя штаны вісяць на спіне каровы дзень – два.

**Таптаць сярэдзіну**. Калі некаму забаліць сярэдзіна, дык ён у хаце долкам кладзецца пад парогам, а іншая асоба ідзе з сянец у хату і топча яму балючую сярэдзіну. Але тая асоба, што топча, мусе быць першым дзіцем ў маткі.

**Траянка**. Вада з трох крыніц ці студняў. Гэта вада бярэцца ў глухую поўнач, але трэба пільнавацца, каб ніхто з людзей не бачыў, як гэта вада бярэцца. Яе даюць піць ад пярэпалахаў, падвею і іншых хваробаў. А калі вада засталася нескарыстанай, дык яе трэба выліць на зямлю, але на такое месца, дзе ніколі сонца не свеціць, як і тую ваду, што намаўлялі знахары.

**Як ашукаць смерць пасля хаўтураў**. Калі нябожчыка завязуць на могілкі і пахаваюць ды едуць дамоў, дык каня выпрагаюць на вуліцы (а то нават недаяжджаючы да вёскі), а сані кідаюць там, дзе выпраглі каня, бо на тых санях і смерць ехала. Калі б яе прывезці на свой панадворак, дык ноччу яна б прышла ў хату ды некага другога задушыла з гэтай сям'і. У даўныя часы і летам нябожчыка вазілі хаваць толькі на санях. А калі смерць застанецца начаваць на вуліцы, а як пазябне, дык пойдзе далей шукаць сабе ахвяраў.

**Як ашукаць смерць на вяселлі ўдаўца**. Калі ўдавец прыедзе ад шлюбу ў сваю хату з маладой жонкай (асабліва, калі гэта ўжо трэцяя жонка), дык гэта новая жонка мусе лезьці праз вакно, каб выхітраваць смерць, бо калі пахавалі папярэднюю жонку, дык з таго часу смерць стаіць на ганку і пільнуе, пакуль гаспадар праз дзверы ўвядзе новую жонку. А калі новая жонка ўлезла праз вакно, дык смерць і не ведае, што гаспадар жанаты ды стаіць на ганку і пільнуе.

*Алена КАСТРЫЦА*

# МІФАЛАГІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ЖЫХАРОЎ ЛАГОЙШЧЫНЫ (ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І ПАВОДЛЕ СУЧАСНЫХ ЭКСПЕДЫЦЫЙНЫХ ЗАПІСАЎ (2008 г.))

Значэнне традыцыйнай культуры ў гісторыі чалавецтва надзвычай вялікае. Даследчык духоўнай спадчыны беларусаў У.А. Васілевіч адзначае: «Калі пагадзіцца з думкаю, што фальклор з'яўляецца своеасаблівай (хоць, вядома, і вельмі супярэчлівай) мастацкай энцыклапедыяй народнага жыцця – ведаў, вопыту, этыкі і эстэтыкі селяніна, то, напэўна, роля прыкмет і павер'яў, вераванняў і нават самых цёмных забабонаў у гэтай энцыклапедыі была, бадай што, адна з вызначальных, бо ў штодзённым жыцці чалавека яны неслі і дарадчую, і перасцерагальную, і забаронную функцыі, у значнай меры кіруючы паводзінамі чалавека» [У. Васілевіч «Зямля стаіць пасярод свету…»].

У сістэме іншых фальклорных жанраў прыкметам і павер'ям належыць асобнае месца, што абумоўлена не толькі іх старажытнасцю, устойлівай утылітарнай функцыянальнасцю і добрай захаванасцю, але і тым, што ў іх найбольш яскрава адлюстраваліся міфалагічныя ўяўленні. Вытокамі ўзнікнення народных вераванняў з'явіліся рэальныя ўмовы жыцця і побыту і найперш гаспадарчая дзейнасць: чым больш значнае месца ў жыцці чалавека займала гаспадарка (земляробства, жывёлагадоўля), тым больш захавалася прыкмет, павер'яў, магічных дзеянняў, накіраваных на павелічэнне ўраджаю і дабрабыту.

Названыя жанры вуснай народнай творчасці з'яўляюцца адной са старажытных з'яў фальклору. Яны ўзніклі ў глыбокай старажытнасці як спроба растлумачыць шматлікія назіранні за тымі зменамі, якія адбываліся ў навакольным асяроддзі, у асабістым жыцці людзей, у іх дзейнасці. З цягам часу народныя прыкметы і павер'іператварыліся ў своеасаблівыя маральна-этычны і утылітарна-практычны кодэксы, у своеасаблівую рэгламентацыю паводзін чалавека.

Вялікая колькасць прыкмет, павер'яў і магічных дзеянняў, што іх суправаджаюць, звязана з вадой. У іх аснове ляжаць рэальныя якасці вады, аднак немагчымасць зразумець і растлумачыць тыя ці іншыя з'явы паслужыла прычынай для з'яўлення і трывалага існавання многіх міфалагічных уяўленняў. Прыкметы і павер'і пра ваду, а таксама магічныя дзеянні, звязаныя з імі, адлюстроўваюць веру ў лекавыя, прафілактычныя, засцерагальныя, апатрапеічныя і ачышчальныя ўласцівасці вады *(На Вялікдзень «у міску налівалі ваду, кідалі туды краснае яйка і ўмываліся, каб прыгожаму быць» (Сабалеўская Алена Пятроўна, 1932 г. н., в. Рэпішчы).* Прычым узнікненне і існаванне дадзеных уласцівасцей вады часта залежала ад якасцей і ўласцівасцей іншых прадметаў. У сваю чаргу, вада перадавала пэўныя якасці тым прадметам, што знаходзіліся з ёй у непасрэдным кантакце.

Паводле адных сваіх семантычна-функцыянальных асаблівасцей (здольнасць ачышчаць, лячыць, прадуцыраваць) да вады крынічнай (зямной) набліжана раса. Здольнасць прадказваць аб'ядноўвае расу і дождж, што, безумоўна, не з'яўляецца выпадковым: і дождж, і раса, уласна прыродныя з'явы, ні ў якім разе не падпарадкаваныя волі чалавека *(«Калі раніцай расы не будзе, то будзе дождж» (Сімко Кацярына Іосіфаўна, 1932 г. н., в. Дрыла).*

Аналіз павер'яў і прыкмет аб вадзе дазваляе зрабіць вывад, што частка з іх уключыла ў сваю аснову элементы ірацыянальнага характару, заснаваныя на памылковай прычынна-выніковай сувязі. Другая частка засноўваецца на якасных параметрах прадметаў (напрыклад, асвечанасць), якія з'яўляюцца вызначальнымі на пэўным этапе іх выкарыстання. Трэцяя частка грунтуецца на рэальных уласцівасцях і аб'ектыўных вывадах.

Папулярнасць групы павер'яў і прыкмет аб ўраджаі лёгка растлумачыць. Паколькі асноўным клопатам селяніна была ўласная гаспадарка, то ўсе яго памкненні, дзеянні і назіранні былі скіраваны на яе захаванне і паляпшэнне («*Капусту сажалі пад вечар, каб чэрві не пагрызлі» (Ярашонак Сафія Анатольеўна, 1943 г.н, Ярашонак Міхаіл Іванавіч, 1944 г. н., в. Кацялі);» «Калі закладвалі бульбу ў капец, дык клалі лапкі яловыя і каменьчыкі. Тры камяні кінуць і малітву прачытваюць «Здаровась, Марыя», каб мышы не грызлі» (в. Дзераўно, Рудкоўская Алена Міхайлаўна, 1928 г. н.);» «Калі начыналі сажаць капусту, то трэба было прынесці на градку камень такі ладны і накрыць яго белай трапачкай. Гэта каб капуста была моцная, як камень, і беленькая, як салфетачка» (Ляхновіч Леаніда Мікалаеўна, 1942 г. н., в. Глубчані);» На Міколу садзілі агурцы і казалі: «Мікола выспя з прыпола» (в. Сукневічы, Зімніцкі Вікенцій Філіпавіч, 1936 г. н.)).*

Жаданне абараніць ураджай ад небяспечнага ўздзеяння злых людзей, з'яў прыроды было вызначальнай рысай чалавечага існавання. Прааналізаваныя прыкметы і павер'і і звязаныя з імі магічныя дзеянні дазваляюць зрабіць вывад: чалавек з мэтай захаваць ураджай імкнуўся паўплываць на прыроду і духаў прыроды. Паколькі гэта было не заўсёды магчыма, то ён стварыў пэўную сістэму паводзін, якая ў большасці выпадкаў можа быць прадстаўлена ў выглядзе схемы: калі не хочаш гэтага, не рабі тое.

Такім чынам, страх і бяссілле стварылі пэўныя забароны і засцярогі, устойлівае бытаванне якіх падтрымліваецца традыцыяй. Прыкметы і павер'і, звязаныя з ураджаем, а таксама шырокі спектр магічных дзеянняў адлюстравалі своеасаблівасць мыслення, багацце народнай фантазіі, высокі творчы пачатак беларусаў.

Народная свядомасць ставіць расліны побач з такімі важнымі стыхіямі, як агонь і вада, надзяляе іх звышнатуральнымі якасцямі (уменнем размаўляць) і незвычайным паходжаннем («Бог даў», «чорт уплюнуў»). Верагодна, гэта з'явілася адной з прычын, што абумовілі шматфункцыянальную нагрузку, уласцівую зеляніне.

Адзначым некалькі важных момантаў у выкарыстанні зеляніны. Так, вельмі важнымі з'яўляюцца якасныя прыметы раслін: сухасць, жгучасць, калючасць, моцны пах, асвечанасць і т. п.

Сухасць – гэта прымета, якая адносіцца да якаснай характарыстыкі расліны на пэўным этапе яе выкарыстання. Найбольш папулярнай з'яўляецца гэта якасць у прыкметах на ўраджай, надвор'е, а таксама павер'ях пра здольнасць высахшых раслін знішчаць грызуноў, хваробу *(«Перад Тройцай у суботу ставілі бярозкі. От глядзіш па ёй, ці будзе сушыцца сена добра, ці не. Як не высахлі – добрэ. Значыць, будзе пагана сохці, а як добра высахлі, дык добра будзе сохці (Луцкая Зінаіда Мікалаеўна, 1941 г. н., в. Хатаевічы); «У нас на Тройцу бярозкі ставілі…. А тады гэту бярозу, як тая высахне, лажылі ў пуню і наверх сена, каб мышы не елі (Міхневіч Валянціна Мікалаеўна, 1938 г. н., в. Хатаевічы)).*

Такія якасці раслін, як пякучасць, калючасць і моцны пах абумовілі папулярнасць вераванняў, звязаных з вераваннямі ў апатрапеічныя здольнасці адзначанай групы раслін *(На Купалле ад ведзьмы, як закрыю хлеў, дык на парог лажу жычку (крапіву) (Паўтарачанка Аляксандра Міхайлаўна, 1948 г. н., в. Расохі)).* У некаторых прыкметах і павер'ях уласцівасці раслін з'яўляюцца больш важнымі, чым самі расліны і дзеянні, а таму выкарыстанне той ці іншай травы, кветкі, дрэва было абгрунтавана наяўнасцю ў яе пэўнай якаснай характарыстыкі. У аснове значнай часткі павер'яў пра зеляніну і магічных дзеянняў, звязаных з імі, ляжаць элементы імітатыўнай і кантагіёзнай магіі.

Прыкметы і павер'і, якія датычаць гаспадарчай дзейнасці чалавека, дастаткова шырока прадстаўлены ў народнай традыцыі. Для іх характэрны добрая захаванасць, вялікая папулярнасць і амаль паўсюднае (у геаграфічным плане) выкарыстанне.

# ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І

## Прыкметы і павер'і

Калі ляжыць кот на палу – к цёплай зіме.

Калі ў патухшай печкі застаецца вугалёк – к гасцям.

Калі чорная кошка перойдзе табе дарогу – к скорай смерці або хваробе.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Анішкевіч Анжэлы Усеваладаўны,1964 г. н.,***

Каб гром не ўдарыў, жагнаюцца.

Цяжарнай жанчыне нельга за ліцо нічога не брацца, бо астанецца радзімае.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Андрушкевіч Зінаіды Канстанцінаўны, 1925 г. н.***

Еслі разаб'ецца пасуда на свадзьбі – к няшчасцю.

Як пачынаеш строіць хату, то пад первы вугалок заложвалі дзеньгі.

Каб бульба добра сахранілася, то пад яе трэба палажыць тры камні і прагаварыць: «Здровась, Марыя», малітву такую:

Здровась, Марыя,
Ласкі пэўнам,
Пан з табою,
Благаславёна та менза вен местамі.
І благаславен овод жывата твоега, Езус.
Свята Марыя,
Матачка Божа,
Мусеш за намі жытцы
Тэраз і абудзілі смерці нашая.

Перахрысціць камяні і прагаварыць тры разы.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Шаўчэнка Ганны Іосіфаўны, 1934 г. н.***

Калі доўга не было дажджа, то ў царкве заказвалі малебен прароку Іллі ад дажджу.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны, 1922 г. н.***

Не глядзі на неба і на круг – не будзеш прасіць хлеба.

Бульбу ў пограб клалі ў той дзень, калі было Благавешчанне.

Капусту клалі ў той дзень, калі было Благавешчанне, а таксама ў мужчынскі дзень. Шынкуюць таксама.

Каб дождж быў, моляць Іллю.

НаВаздвіжанне нельга лажыць капусту.

Калі памёр чалавек, то ў хаце яго цела абкладаюць крапівай тры дні, каб не пахла.

Да вянчання нельга была цалавацца.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Лісоўскай Алены Міхайлаўны, 1936 г. н.***
***ад Драгун Алены Уладзіміраўны, 1940 г. н.***

Калі водзяцца ў вуглах хаты шмялі, то будуць вадзіцца грошы.

Калі пачынае стукаць град у вакно, то выкідывалі засланку на двор навыварат або дзяркач выносілі.

Калі была засуха, то бралі мак-самасей і ў тры калодзежы засыпалі.

Агуркі як пачынаюць гарэць, то, каб захаваць завязь, мужчына ў ніжнім бяллі павінен панасіць.

Каб была завязь на агурках, то раілі мужчынам у ніжнім адзенні пахадзіць па градзе і памахаць касой.

Калі выбіраешся ў дарогу і раптам пераходзяць табе з пустым вядром, то табе не пашанцуе.

Перад тым, як садзіць расаду капусты, на канец грады клалі камень, абвёрнуты ў белую анучку, каля яго садзілі галінку крапівы, каб качаны былі белыя і цвёрдыя, як камень і анучка, і не ляцелі на іх матылі.

Калі на бравіне ўспыхвала болька і нарывала, была гнойная болька, то казалі, што гэта ячмень, нехта сурочыў. Той, хто першы заўважыў, павінен тры разы паказаць кукіш і сказаць: «Ячмень на воку, на кукіш ад уроку». Болька павінна прарваць, а рана – загаіцца.

Калі дарогу кот перабяжыць – не павязе.

Калі ідзеш куды-небудзь па дарозе ды сустрэнеш жанчыну з пустымі вёдрамі, то не павязе, а калі сустрэнеш мужчыну першым – павязе.

Добрызычлівасць была ў людзей раней. Калі снедалі, абедалі і заходзіў хто ў хату, то яго прасілі да стала паесці. Лічылася, калі ўвайшла жанчына, калі абедалі, то будуць непрыемнасці, калі мужчына – збываліся мары.

Калі сабіраліся ўязджаць – не ўбіралі пасцель. Пазней убіралі.

У нас была такая прыкмета, калі парасёнка куплялі: калі купляеш парасё, то бярэш пучок саломкі разам з ім, бо парасё ляжыць у шуме, у саломкі, у мяшок трэба садзіць парася за заднія ногі і лычом клалі ў мяшок, каб не выбег.

Садзіць агурцы трэба ў панядзелак, будзе первая завязь усегда, а капусту трэба садзіць у жаночыя дні, нельга садзіць у чацверг – будуць чэрві, і складываць нельга ў чацверг – несмачная будзе. Добра складваць капусту ў сераду, пятніцу, суботу, у жаночыя дні.

Калі высяваюць семена капусты на расаду, то высяваюць іх вечарам, калі тапілася печ і варыліся поўныя гаршкі, каб быў добры ўраджай.

***Запісана ў в. Акцябр***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.***
***Новак В. С.***

Бура будзе – расцвітаюць кветкі ярко, ярко, аж у вачах рабіт.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Марыі Віктараўны, 1932 г. н.***

Калі жабу заб’еш, то будзе дождж.

Калі папісяеш на касцёр, то маці памрэ.

Нельга калыхаць нагамі пад сталом, калі сядзіш, бо чорта калыхаеш.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Бурлакова Яўгена Уладзіміравіча, 1928 г. н.***

Калі ў дом уляціць пціца – гэта значыць быць бядзе.

Еслі падвесіць у сябе над дзвярыма жалезную падкову, то ў доме ўсё будзе добра.

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Жылача Анатолія Сяргеевіча, 1927 г. н.***

Цяжарнай жанчыне нельга сядзець на парозе, бо дзіця будзе доўга ў праходзе знаходзіцца.

Цяжарнай жанчыне нельзя нагой падкідваць ката, бо будзе дзіцё валасатае.

Цяжарнай жанчыне трэба ўсё дапіваць да канца, нічога ў кружцы не пакідаць, бо дзіця будзе п’яніцай.

Пры пажары нельзя хватацца за ліцо – на дзіцяці астанецца пятно.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Солуб Лідзіі Іванаўны, 1946 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)***

На наступны дзень пасля поснай куцці (першай) рабілі абадок з чаго-небудзь і лажылі туды куццю, і давалі дзяўбсці курам. Тады яны цэлы дзень будуць несціся ў адным гняздзе і не будуць нікуды хадзіць.

На Юр'е выганялі карову ў поле, каб яна паспрабавала роснай травы, тады яна не будзе ўрочная, а будзе малочная.

Нельга на Іллю касіць сена і складваць яго, бо маланка можа спаліць.

На жніво першы сноп ставяць на кут, тады гаспадар услаўляецца і на будучы год будзе добры ўраджай.

Пасля Пакроў не гоняць пакрытых кароў у поле, бо цялё можа нарадзіцца мёртвым.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Фярко Галіны Іосіфаўны, 1939 г. н.,***
***студэнткай Фярко В. (2000 г.)***

Еслі апяты на дрэве высока, то раннія маразы.

Еслі бура дзярэўі валя, людзі паміраць будуць.

Калі надыходзіць туча, то на акно ставяць грамнічныя свечы. Куды дуе дымок, туды і хмарка.

Пры пажары бяруць ікону і ідуць ад агня, тады лічаць, што і агонь пойдзе следам.

***Запісана ў в. Атрубак Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык Валянціны Сямёнаўны, 1938 г. н.,***
***студэнткай Акуліч Т.***

Калі кот сыты ў хаце і сабака – добрая гаспадыня.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кохана Сяргея Мікалаевіча, 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кір'ян Н. (2005 г.)***

Ваду, у якой першы раз купалі дзіця, вылівалі пад плот, каб ніхто не таптаў, каб дзіця слёзы не пралівала.

***Запісана ў в. Гасцілавічы Лагойскага р-на***
***ад Бурскай Леаніды Аляксандраўны, 1937 г. н.***

Калі пачыналі сажаць картошку, так першую баразну называлі красная баразна. Яе ўжо так святочна садзілі.

Калі начыналі сажаць капусту, то трэба было прынесці на градку камень такі ладны і накрыць яго белай трапачкай, гэта, каб капуста была моцная, як камень, і беленькая, як салфетачка.

Каб дзіцё не наўрочылі, то яму булаўку прышчэпвалі, або пад матрас лажылі кусочак жалеза, і каб яно было ржавае.

***Запісана ў в. Глубачаны Лагойскага р-на***
***ад Ляхновіч Леаніды Мікалаеўны, 1942 г. н.***

Калі сала мокрае – на дождж.

Калі соль мокрая – на дождж.

Каб не было града, то на чацвёрты дзень пасля Троіцы нічога не рабілі.

Выкідвалі на вуліцу лапатку, на якай выпякалі хлеб.

Цяжарнай жанчыне нельга была адалжваць, бо калі ў хаце няма таго, што патрэбна, то гаспадар мог кінуць нешта ўслед, каб мышы не пагрызлі.

На Пахом садзілі агуркі.

Калі закладвалі бульбу ў скапец, дык клалі лапкі яловыя і каменьчыкі. Тры камяні кінуць і малітву прачытаюць»Здровась, Марыя», каб мышы не грызлі.

***Запісана ў в. Дзераўно Лагойскага р-на***
***ад Рудкоўскай Алены Мікалаеўны, 1928 г. н.***

Было два Юр'і: адно галоднае, другое халоднае.

На Благавешчанне гавораць: «Птушка гнязда не ўе, а дзеўка касу не пляце».

Неба зорнае – дажджа не трэба чакаць.

Трэба садзіць на нарастаюшчую луну – ураджай добры будзе.

Куры хохляцца – дождж будзе.

Сабака вые – чакай хуткай смерці ў доме.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на ад Міклашэвіч Анастасіі Уладзіміраўны, 1937 г. н., студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. (2008 г.)***

Нільзя цяжарнай пераступаць цераз браўно, бо дзіця пупавінай задушыцца.

Нільзя таксама пераступаць чэраз вяроўку – дзіця пупавінай задушыцца.

Забараняецца біць жывёлу, асабліва катоў, бо дзіця народзіцца з шэрсцю на плечыках.

***Запісана ў в. Дрыла 1-я Лагойскага р-на ад Сімко Кацярыны Іосіфаўны, 1932 г. н., студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А. (2008 г.)***

## Прыкметы і павер'і

Венік на ганках трэба ставіць уверх – злыя людзі не будуць ісці ў хату, а ў хаце доўжэн стаяць уніз.

Нельга, каб нож ляжаў на стале – каб сваркі не было, разніны.

На захад сонца нельга месці пол.

Нельга садзіцца на парозе – роды будуць плахія.

Калі жанчына бярэменная, нельзя цераз вяроўку пераступаць – дзіця будзе пупавінай абкручанае.

Пасля родаў 12 нядзель нельзя парадзісе на людзі паказвацца.

Нельзя, каб праз жаніха з нявестай хто-небудзь праходзіў.

Нельзя, каб пад ногі маладым што-небудзь кідалі.

Нельзя, каб на месца маладых хто-небудзь садзіўся, каб месца маладога ці маладой у жыцці не замяніў хто-небудзь другі.

Маладых абсыпаюць жытам, каб багатыя былі.

Калі карова ацялілася і ў яе выходзіць паслед, то яго закапваюць пад парог хлява – ад уроку.

З рук у рукі грошы нельзя даваць. Трэба пакласці іх куды-небудзь – каб вяліся.

Пасля заходу сонца нельзя пазычаць грошы і соль.

Калі садзіш капусту, нельзя ні з кім разгаварываць, каб капуста была добрая.

Калі строіш дом, то пад кажды вугал трэба пакласці капейку – каб багата жылося.

Калі строіш дом, трэба глядзець, каб крыніцы пад домам не было.

Калі хто ў дарогу паехаў, то хату нельзя месці – каб добра даехаў.

Калі ў хаце дзіця памерла, то да Спаса нельзя яблакі есці.

Калі карова ацялілася, то нельзя нікому нічога пазычаць. Каб вялося.

Калі поўная хата гасцей, нельзя нічога пазычаць – госці пераругаюцца.

Праз парог нельзя гаварыць – сварка, скандал будзе.

Калі дзіця адвучаеш ад грудзі, а потым цераз некалькі дзён зноў даеш яму папіць малака з грудзі – дзіця будзе злое, вочы ў яго будуць нядобрыя. Так рабіць не трэба.

Трэба, каб на стале ляжаў хлеб з блінамі – к багацтву.

Калі ў хаце гора, то з вуліцы кругом клямкі чэрцяць круг.

Калі яйцо круглае – будзе пятух, калі някруглае – курыца.

Калі купляеш карову, то вяроўку павінна даць хазяйка сваю, але не голаю рукою, руку далжна заматаць у пярэднік.

Купляць парасят трэба ў мужчын. Жанчыны шкадуюць.

На сцяну дома трэба вешаць падкову конскую рожкамі ўверх – для багацця ці к шчасцю.

Калі нарадзілася дзіця, то за шалёўку затыкалі нож, каб дзіця не сурочылі. Нож трэба затыкаць вертыкальна.

Распашонку трэба перадаваць ад старэйшага дзіцяці да малодшага, каб яны дружныя былі.

Пад кохтай трэба насіць булаўку галоўкай уніз – ад уроку.

Перад тым, як госці зойдуць у хату, гаспадыня на парог сыпе соль, каб усё злое засталося на вуліцы.

Калі хазяйка рассыпала соль, то трэба на ёй паставіць крэст і перакрысціцца, а патом можна прыбіраць, падмятаць.

*Запісана ў в. Завішына Лагойскага р-на*
*ад Корзюк (Бахар) Яўгеніі Іванаўны, 1936 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)*

У жэнскі дзень закладвалі картошку ў пограб.

Цяжарнай жанчыне нічога не ў каго прасіць нельга, бо ёй нельга адмаўляць. А калі ў гэтай хаце няма таго, што яна папрасіла, то чалавек павінен кінуць ёй што-небудзь услед (зямлю, гліну, траву, а калі чалавек добры, то кіне хлеб), бо мышы паядуць усё ў хаце. Плоха яшчэ гэта таму, бо лічыцца, што дзіця гэта (што кінулі) усё жыццё есць будзе.

Нельга круціць бяллё кругамі (улева і ўправа), дзіцё можа абматацца пупавінай.

Цяжарнай жанчыне нельга плюваць, бо ў дзіцяці будзе дрэнна пахнуць з рта.

*Запісана ў в. Зарэчча Лагойскага р-на*
*ад Шавель Алены Уладзіміраўны, 1943 г. н.*

Калі сабака капае землю – то маладая дзеўка выдзе замуж за нялюбага.

Калі прычэпіцца шмель – к скорай смерці.

Нельга даедаць хлеб за чужымі людзьмі – бо будзеш з імі сварыцца.

*Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на*
*ад Ермановіч Марыі Сцяпанаўны, 1925 г. н.,*

Каб карову не зглазілі, у хвост утыкалі булаўку, таксама яе абсыпалі макам.

Над хлевам утыкалі вярбу, ці абразалі ёй хвост і таксама ўтыкалі над хлевам.

Капусту сажалі моўчкі падвечар, каб чэрві не грызлі.

Капусту квасілі маладзіком.

Асвяшчонныя зёлкі спальвалі і з гэтымі зёлкамі ішлі ў поле і казалі: «Гуляйце на прыволле, а мневарыўню і бульбачку засыпаць». І потым апырсквалі пасвяцонай вадой.

*Запісана ў в. Кацялі Лагойскага р-на*
*ад Ярашонак Сафіі Анатольеўны, 1943 г. н.,*
*Ярашонак Міхаіла Іванавіча, 1944 г. н.*

Калі кура запяе пеўнем – будзе бяда.

Сабака пачынае выць – на бяду.

Многа развялося мышэй і пацукоў – будзе бяда.

Ні ў коем разе не пазычаць людзям муку і соль – будзе жыццё як мука і салёнае ад слёз.

Пасля заходу сонца нельга нікому нічога аддаваць з хаты, бо звядзецца дабро.

Праз парог нельга перадаваць рэчы, вітацца, браць.

На Благавешчанне калі пасадзіць капусную рассаду, будзе добрая капуста.

Ад Пасхі да Радаўніцы нельга гарадзіць плот – не будзе дажджу.

У час вянчання маладая, калі хоць трохі наступіць на ногу маладому, то будзе кіраваць мужыком.

*Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на*
*ад Ліхачова С. В.*

Вясной, еслі распускаецца первая альха – лета будзе мокрае, еслі бяроза первая – лета сухое будзе.

Варона хавае дзюбу пад крыло, а гусь падымае лапы – заўтра будзе мароз.

*Запісана ў в. Чырвоная Зара Лагойскага р-на*
*ад Сівец Соф'і Антонаўны, 1942 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Аўрамчук Н. (2005 г.)*

На Купалле нічога не пазычалі, асобенна малочнага.
Бярэменнай нельзя ругацца, прасіць і красці.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Шыла Лідзіі Нікіфараўны, 1937 г. н.*
*(перасяленка з Віцебскай вобл.),*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,*
*Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)*

Калі ластаўкі лятаюць нізка – будзе дождж.

*Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на*
*ад Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,*
*Пятроўскай Канстанціны Іванаўны, 1931 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Калі сухавей – будзе дождж.
Калі няма расы на траве – будзе дождж.

*Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на*
*ад Багуцкай Таццяны Ігнатаўны, 1932 г. н.,*
*Дубоўскай Таццяны Рыгораўны, 1932 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Калі сонца заходзіць у хмару, то будзе хмуры дзень, а калі ярка, то будзе цёпла.
Калі ўязжаеш, не разрэшаецца падмятаць.

*Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на*
*ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,*
*Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Калі хто памрэ, то ў вакно глядзець не трэба.
Калі выносяць пакойніка, то ўсе хлявы адкрываюць.
Як сонца ў хмару заходзіць – будзе дождж.
Трэба завешваць зеркалы, калі хто памрэ. Каб не дваілася.
Калі граза, то пад дзеравам нельга стаяць, а то Пярун заб'е.

*Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на*
*ад Мялешка Ганны Васільеўны, 1927 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Калі кот лажыцца пад ногі і зварачваецца – да холаду.
Нельга косці грысці, калі цяжарная – дзіця будзе скрыпець зубамі.
Калі цяжарная, то нельзя праз вяроўку піераступаць – дзіця ў пупавіне заблытаецца.
Калі цяжарная, то на грудзі булаўку не трэба насіць – пераносіца ў дзіцяці будзе сіняя.
Нельзя сядзець на стале – роды будуць цяжкія.

*Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на*
*ад Пятрашка Аксаны Анатольеўны, 1980 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Пятух пяе вечарам – на змену пагоды.
Бярозка на Тройцу быстра сохне – сена будзе быстра сохнуць.
Прыйшоў Пятрок – апаў лісток. Прыйшоў Ілля – апалі два.
Ластачка нізка к зямле лётае – к дажджу.
Туман увечары сцеліцца – дажджа не будзе.

*Запісана ў в. Старае Чэрнева Лагойскага р-на*
*ад Акуліч Ядвігі Аляксандраўны, 1931 г. н.,*
*Акуліч Антона Адамавіча, 1931 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Дамінным А., Елавой Н., (2008 г.)*

Пачынаюць чысціцца куры – значыць, скора палье дождж.

Калі курыца запяе пеўнем, то скора ў хаце будзе бяда ці смерць жыхара дома.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Паўлавай Мар'і Ігнатаўны, 1940 г. н.,***

Нікуда, нічаво не адолжаць і самой не занімаць, бо ребёнак будзе цягнуць усё ў рот. Гліну есці, галошы. Казалі, ножніцамі еслі шчоўкнуць, дык губа можа расечца. Вот казалі, што адна ўшла з хаты, і тапаром за ней аб парог секанулі – і губа ў дзіцёнка была рассечана.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Надзеі Фацееўны, 1925 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Каб качаны завязваліся, браліся за галаву і гаварылі, каб качаны раслі па галаве. Рабілі гэта ў адзін з дзён іюля.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы***
***ад Грынь Ганны Пятроўны, 1953 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Нарбутава)***
***Новак В. С.***

Дачушка, не глядзі ні серпа, ні круга – не будзеш прасіць хлеба ў друга. Але ў гадавыя празднікі ніколі не рабілі.

Ну, гаварылі, што еслі бярэменная, то нельзя доўга маўчаць, каб дзіця гаварыла. Дзіця будзе доўга не разгаварываць. Ніткі нельзя матаць. Шыць нельзя, бо можа пупавіна абвіцца. А ў мяне было, што была я дома. І ка мне прыйшла бярэменная жанчына і ў мяне не было чаго ёй даць. Яна пайшла. Вы знаеце, у мяне дзе што было, паелі мышы. Дык глаўна і ў каструлі што было, усё з'елі мышы. Бярэменнай трэба даваць што-небудзь абязацельна.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Медунецкай Веры Ермалаеўны, 1940 г. н.***

Калі многа галак і варон лятае – будзе дождж.

Калі варона каркае, будзе холад.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Ганны Сяргееўны, 1936 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Лічылася, што калі незамужняя дзяўчына сядзе на ўгал стала, то яна застанецца ў дзеўках, а калі замужняя, то паругаецца з мужам.

***Запісана ў в. Прылепцы Лагойскага р-на***
***ад Русак Таццяны Фёдараўны, 1930 г. н.***

**Прыкметы, звязаныя з провадамі ў армію**

Трэба зямлю са следа сына, калі той ідзе ў армію, за ікону пакласць, каб вярнуўся дамоў.

Валасы сына і хлеб трэба пакласць за ікону, каб у яго ўсё добра было.

Абавязкова трэба сыну даць крэст на нітачцы з кроснаў, якая ідзе назад, каб вярнуўся сын.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Паўтарачанка Аляксандры Міхайлаўны, 1948 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К. (2008 г.)***

Если на небе звёзды блестят – это к холоду.

Редкие звёзды – к пурге.

Луна ясная – к стуже.

Кто похвастает хорошим урожаем, у того следующий год пустой будет.

Не показывать пальцем на дерущихся кошек, собак, иначе в семье не будет мира и покоя.

Покупая нож, нельзя брать сдачу. Тогда этим ножом никогда не порежешься.

Нельзя есть из треснувшей посуды – к несчастью.

Нельзя брать чужой носовой платок – с этим платком перейдут чужие слёзы.

Нельзя двоим смотреть в одно зеркало – полюбят одного человека.

Нельзя оставлять на столе пустую бутылку – не будет денег.

**Нельзя дарить:**

Жемчуг – к слезам.

Зеркало – к разорению.

Кошку – к изменам в семье.

Чётное число цветов – к покойнику.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Яскевіч В. М., 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Курыбінай І.***

Каб цыбуля расла чыстая, то яе ў Чысты чацверг знімалі са сцен і чысцілі.

Каб ніхто не назурочыў, то перад уваходам у хату вешалі красную ткань ці што такое, бо як паганыя вочы пабачаць, дык ужо нічога не зробяць.

От калі быў град і каб не пабіў пасевы, дык рабілі так: калі забівалі парася, то рассякалі голаву і бралі вот ніжнюю часць (яе санкамі называюць), потым з яе на Вялікдзень варылі халоднае, а затым гэтыя санкі, калі ўжо пачынаўся град, закопвалі наградку.

***Запісана ў в. Рэпішча Лагойскага р-на***
***ад Сабалеўскай Алены Пятроўны 1932 г. н.***

Бярэменныя жанчыны асцерагаліся шмат есці, бо, лічылі, што дзіця ніколі не наесца. Ім забаранялася браць яду з могілак і есці на Рудуніцу. Нада было глядзець толькі на красівыя вешчы. Нільзя было хапацца ў страхе за сваё цела.

***Запісана ў в. Рэпішча***
***ад Зінькевіч Раісы Пятроўны, 1952 г. н.***
***Новак В. С.***

Цяжарнай жанчыне:

Нельзя пераступаць праз шланг, вяроўку – дзіцёнак будзе абкручаны пупавінай.

Нельга стрычся – век дзіцяці скароціш.

Нельга валасы завіваць – лёс дзіцяці скруціш.

Калі ў дзіцяці паявіцца першы зуб, нацельную рубашку нада крыху надарваць і спаліць у печы. Каб астатнія зубы безбалезненна раслі.

Нельга, каб дзіця спала, калі чалавека хароняць.

Еслі чалавек радзіцца ў чацверг – будзе чысцюлей, у нядзелю – гультай, у суботу – танцор, у аўторак – рабацяга.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.,***
***Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Если курица снесла яйцо с кровью – будет резкое похолодание.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Умэцкай Ніны Антонаўны, 1930 г. н.,***
***Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Калі мой мужык Іван будаваў хату, то на першы вянец лажыў дзеньгі, на жэрдкі – крэст, штоб сахраняў. На вуглу высякаў ямачку і клаў золата, капеечкі.

Калі хадзілі за мохам на балота, трэба было гаварыць так: «Балота, балота, дай мне мох, каб не было ў маёй хаце ні клапоў, ні блох».

На Благавешчанне дзеўка касу не пляце, птушка гняздо не в'е.

На Благавешчанне калясо вешалі на крышу, штоб каршун не хапаў курэй (да ўсхода сонца).

Прыйшлі Саракі, гоняць снег да ракі.

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Шавель Галіны Іванаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Доміным А., Булахавай М. (2008 г.)***

Каб карова не хварэла, ёлачку ломяць і вешаюць у хляве, ставяць хрэсцікі на парозе і ў хляве.

Калісь хтось памрэць, пераносіца чэшацца: калі на кончыку, то хтось блізкі, калі вышэй – далёкі.

***Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Ганны Канстанцінаўны, 1940 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Знаю, што нельзя бярэменнай цераз браўно пераступаць.

Бярэменнай нельзя было біць нагамі жывёл, асобенна кошак, бо спіна будзе валасатай у дзіцяці.

Як хто памрэ, то цэлы год нельга пець і вясяліцца.

Нельга выкідваць хлеб, бо будзе неўраджайны год.

Вот еслі коцік ласніцца, то гэта абязацельна к гасцям.

А еслі што-та ўпала на падлогу, то хтосьці спяшыць.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Кішкурны Фаіны Уладзіміраўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

Пры растушчай луне можна сеяць. Да паўнаты, як мой бацька казаў.

Да Купалля трэба ўспець сабраць травы: зверабой, аблепіху. Патому шта ў купальскую ноч лётае ведзьма.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Міхайлоўскай Валянціны Іванаўны, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Шурмель С. (2008 г.)***

На первы вянец клалі грошы, кагда хату будавалі.

На жэрдкі клалі крэсцік, штоб сахраняў.

На Міколу садзілі агурцы і казалі: «Мікола высыпе з прыпола».

Да Іллі нада было сабраць цыбулю, бо кажуць: «Ілля надзелает гнілля».

Ну, пра гуркі і цыбулю знаю. Патому шта жонка пастаянна гаворыць так, ну. А пра хату, патаму шта сам сваімі рукамі дом будаваў.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Зімніцкага Вікенція Філіпавіча, 1936 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Елавой Н., Доміным А., Булаховай М. (2008 г.)***

Цяжарнай жанчыне нельзя красці, дзіця будзе злодзеем.

Нельзя пазычаць, бо дзіцё будзе нішчым.

Нельзя біць жывёлу, бо дзіцё будзе з шэрсцю на спінцы.

Нельзя ўглядацца ў чалавека з якім-небудзь недахопам. Лічылася, што дзіцё можа нарадзіцца з такім жа недахопам.

***Запісана ў в. Сукневічы Лагойскага р-на***
***ад Вярбіцкага Антона Пятровіча, 1937 г. н.,***
***Вярбіцкай Раісы Міхайлаўны, 1935 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Доміным А., (2008 г.)***

Каб выклікаць дождж, неабходна ў тры студня высыпаць жменю мака самасея.

Ад града на акно ставілі ікону Божай Мацеры.

Ад града выкідвалі на двор лапату, на якой садзілі хлеб у печ.

Калі будавалі хату, то ў кожны кут лажылі манету і кусок хлеба.

Карову выганялі ў поле асвяцонай вярбой. Падразалі хвост і кідалі гэты хвост у хляве.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.***

Сабака качаеца зімой – к мяцелі.

Петухі кукарэкаюць – нехта прыйдзе з крэўпі (з радні).

Цяжарным жанчынам нельга пляваць на задуманае, бо з рота будзе ваняць.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Бынкоўскай Ганны Пятроўны, 1938 г. н.,***

Ну, гавораць, што нельзя з пустымі вёдрамі пераходзіць дарогу людзям.

Нельзя перадаваць каму-небудзь што-небудзь чараз парог.

Стаяць нельзя на парогу, бо чорт вселіт сваі сілы.

Нельзя на сабе зашываць адзежу, памяць зашыеш. Можна так шыць, калі нітку ў роце дзержаць.

Нельзя паказваць маладую скаціну чужым, бо скаціна здохне.

Маладым дзеўкам, якія яшчэ не ражалі, нельзя глядзець, як ржэ лошадзь.

Бярэменным нельзя сматрэць на пажар, а то рабёнак радзіцца з плахім ліцом.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Шаршунь Ніны Канстанцінаўны, 1940г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М., Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

Звёзднае неба на куццю – грыбоў многа будзе.

Мароз па заборы трашчыць – сухі год, значыць ураджайны.

Калі строілі новую хату, то клалі на вуглы чатыры манеты.

Кагды засяляліся ў новую хату, то першую пускалі кошку.

А на самі Каляды куццю звалі есці: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці, каб не марозіў наш ураджай».

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Алены Ігнатаўны, 1923 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

Еслі ластаўкі лётаюць нізка, будзе дождж.

Вот еслі кот мыецца, чакай гасцей. Якой лапай мыецца, з той стараны і чакай.

Еслі доўга і багата сёння смяешся, значыць заўтра будзеш плакаць.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Мігунька Ганны Пятроўны, 1937 г. н.,***
***студэнкай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

Цераз парог не здароваюцца, бо спрэчка ў хаце будзе.

На Каляды трэба за сталом папробаваць усю яду і пачаць новы хлеб есці, каб багацце вадзілася.

Не можна на Каляды пасля абеду нічога рабіці.

Не можна пераступаць цераз дзіця, бо яно расці не будзе.

Цяжарнай жанчыне не можна есці прама са скаварады, бо дзіця народзіцца чорным.

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Надзеі Раманаўны, 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н.***

Еслі рассыпецца соль, дык будзе плоха.

Еслі нож упадзе, плахавата будзе.

Не трэба пераступаць праз вяроўку бярэменнай, патаму што ў дзіцяці ўнутры замотваецца пупавіна і цяжка ражацца будзе.

Цераз парог нельзя нічога даваць. Напрымер, хочаш сваёй вазлюбленай канфет даць, то нельзя.

Венік ставілі возле парога, каб замуж выйсці, а еслі возле печы, то каб дома сядзець.

Калі хату пачыналі строіць, то некаторыя грошы ў вуглы клалі, некаторыя золата.

*Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на*
*ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.*

Калі злодзеі пакрадуць ды пакінуць вароты адчыненымі, дык ёсць надзея, што пакрадзенае дабро знойдзецца. Але калі злодзеі за сабой зачыняюць вароты, дык няма надзеі ў адшуканні пакрадзенага дабра.

Каб дзіця было дужае, моцнае, хутка расло, дык яго купаюць у трацялетнім жыце.

Калі нехта з хаты выходзе ў дарогу, дык трэба печ засланіць заслонкай, хоць калі яна і паліцца, а то падарожнаму ў дароге не пашанцуе.

Калі ад цяжкай працы рука ў суставе апухне і баліць, дык яе перавязваюць тым шнурком, што быў звязаны венік.

*Запісана ў Лагойскім р-не*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Мазгуновай К.*

**Выслоўі**

Як хто хоча, той па свайму бацьку так і плача: хто ў кулак, а хто – ніяк.

*Запісана ў г. Лагойск Лагойскага р-на*
*ад Зыбінай Еўдакіі Навумаўны, 1926 г. н.*
*(раней пражывала ў в. Дварэц Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.),*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Маспанавай Т. (2004 г.)*

Сем вёрст да нябёс, ды ўсё лесам.

Як сукам па сцяне.

Гавора, як з меха сыпе.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жалянінай Марыі Мікалаеўны, 1930 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кур'ян Н. (2005 г.)*

Калёсы цёрліся, мы вас не прасілі, а вы прыпёрліся.

Ох, дзеці мае, дзеці, куды вас падзеці?...

*Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на*
*ад Пунтус Вольгі Паўлаўны, 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А. (2000 г.)*

Хуткасць патрэбна толькі пры лоўлі блох.

Я, да я!..Хлопец на ўсю вёску, а ў вёсцы адзін дом.

*Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на*
*ад Шавель Іосіфа Фёдаравіча, 1928 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шавель Т. (2000 г.)*

Каб табе моль пяты пааб'ядала.

Каб табе пуста была.

Патрэбен, як сабаку пятая нага.

Соль табе ў вочы, ды паленца ў зубы.

Каб ты ногі павыкручваў, а рукамі зямельку шукаў.

*Запісана ў в. Манчакі Лагойскага р-на*
*ад Хітровай Марыі Фёдараўны, 1928 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Цішэвіч Ю. (2001 г.)*

**Выслоўі-праклёны**

Каб ты морам (агнём) занялася.

*Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на*
*ад Падбярозка Марыі Антонаўны, 1920 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шарыпавай В. (2006 г.)*

*Аляксей НЕНАДАВЕЦ*

# НАРОДНЫЯ ПЕРАСЦЯРОГІ, ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І, ЗАПІСАНЫЯ НА ЛАГОЙШЧЫНЕ У 80-х ГАДАХ XX СТАГОДДЗЯ

Запісваць фальклор у гэтым раёне мне давялося ў 1985-м годзе, падчас навучання ў дактарантуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Акадэміі навук Беларусі. Ехаць давялося аднаму, бо ўсе супрацоўнікі аддзела фалькларыстыкі, дзе я навучаўся, павінны былі накіравацца ў іншыя месцы ў экспедыцыю. Але мяне гэта не надта палохала, бо на той час многае ўмеў рабіць, многаму навучыўся ў такім, здавалася б, нескладаным працэсе, як запіс вуснапаэтычных твораў. Я паціху распытваў пра ўсемагчымыя факты, пра тое, як тлумачаць жыхары раёна тое ці іншае здарэнне, і пераканаўся, што на самой справе, да нашага часу дайшло многае са старасветчыны, асабліва прыкмет, павер'яў і перасцярог. Засяродзіўшыся, пачаў складаць праграмку-апытальнік, бо так заўсёды намнога прасцей прыступаць да працы, аддзяляць асноўную інфармацыю ад пабочнай, фіксаваць звесткі па іншых аспектах, што можа спатрэбіцца ў даследчай працы. Першая вёска, якую я адразу наведаў, была Гайна.

Мяне цікавіла, якімі перасцярогамі карысталіся жыхары перад тым, як пачыналі будаваць хату. Вяскоўцы згадвалі, як усё адбывалася на самой справе, як старанна разлічвалі і пралічвалі ўсемагчымыя варыянты, бо пабудаваць хату ва ўсе часы было нялёгкай справай, а тады, у даўнія гады, – тым болей.

Ушаноўваліся мясцовымі жыхарамі дрэвы. Лічылася, што той, хто зламаў галінку дрэва, злачынец, бо ён, як тлумачылі ў народзе, зламаў руку жывой істоце. Зараз гэта здаецца мала падобным на праўду, але ў часы, далёкія ад нашых дзён, у некаторых мясцінах, дзе размяшчаліся, напрыклад, свяшчэнныя дубровы, людзьмі несвядома былі створаны самыя сапраўдныя біясферныя запаведнікі – нават засохлыя, абабітыя ветрам ці дажджом галінкі, зваленыя дрэвы там забаранялася кранаць, бо гэта магло наклікаць бяду на паселішча, на ўвесь род. Меркавалі, што лясныя духі не шкадавалі таго, хто парушыў адвечны парадак свяшчэнных месцаў. Нешта прыбіраць ці рабіць у такіх гаях выпадала толькі з дазволу служкаў-вартаўнікоў ці калі дрэвам былі прынесены адпаведныя ахвяры. Для такога ляснога народа, якім з'яўляліся беларусы, лес сапраўды меў велізарнае значэнне. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што нашы продкі шанавалі лясы. Яны часам нават сцвярджалі, што жыццё на тутэйшай зямлі пайшло з лясоў, болей таго, першыя людзі жылі сярод пушчаў, якія іх кармілі і аберагалі. Не была ў гэтым плане нейкім выключэннем і Лагойшчына.

Тут мне даводзілі, што калі тры першыя дрэвы, да якіх лесаруб падышоў у парадку чарговасці, яму нечым не спадабаліся, то ў той дзень, паводле народных павер'яў, яму ўжо ўвогуле нельга было секчы дрэў на нейкія гаспадарчыя патрэбы, бо гэта вялікі грэх.

Ды і далёка не заўсёды і не кожнае дрэва мог прыдбаць у свой двор гаспадар. Дрэва для будоўлі, лічылася, лепш за ўсё ссякаць тады, калі месяц знаходзіўся ў апошняй сваёй квадры («у ветаху») – тады яно будзе трывалае; ссечанае ў маладзік, нядоўга праслужыць; спілаванае паміж квадрамі («на зменах») сточыць шашаль. Старэнькі дзядок даводзіў, што лес для будаўніцтва хаты нарыхтоўвалі «на збыта». У гэты час у ім было менш вільгаці, таму, меркавалі, узведзеная будыніна прастаіць значна даўжэй. Потым, нібы адумаўшыся ці штосьці ўспомніўшы, сказаў зусім іншае, маўляў, калі ўкралася, тады вось і пабудавалася. Людзі меркавалі: нельга на пабудову браць вывернутае непагаддзю дрэва, бо яго чорт вывернуў для сябе і разам з ім можа перасяліцца ў новую хату. Таксама нельга было ўжываць тое дрэва, што завісла над другім, бо такі будынак, лічылі, хутка згарыць. Вопытны селянін ніколі не браў для будаўніцтва рыплівае дрэва, бо ў збудаванай з яго хаціне людзі могуць нібыта часта паміраць ад кашлю ці заходзіцца ад падучых хвароб. Ёсць і іншы варыянт, паводле якога ў рыплівым дрэве жыве душа памёршага чалавека, і селянін, калі яго ссек, пазбавіў душу апошняга прытулку, за што потым і сам будзе пакараны і прыйдзецца яму пакутаваць да смерці. Не падыходзілі для гэтай мэты і дрэвы, якія, ссечаныя, падалі на поўнач: у збудаваным доме ў хуткім часе памрэ чалавек, а ў хляве – жывёла. Ні адзін прадбачлівы гаспадар не павінен быў ссякаць дрэва ў тую квадру месяца, калі пачынаўся «сход» («гнілая квадра»), бо ў будыніне вельмі доўга будзе трымацца вільгаць. Самымі

спрыяльнымі месяцамі для нарыхтоўкі лесу лічыліся сакавік і красавік, таму што веснавы сок рабіў драўніну мацнейшай. Глядзелі таксама, каб на будоўлю не трапіла дрэва з «ваўком», г.зн. з чорным стрыжнем, – інакш сям'ю зноў такі будуць даймаць хваробы і розныя няшчасці. Падкрэслівалі, каб не пераступалі ў лесе праз страмовіну (вываранець), што віхор зваліў, бо сам будзеш кружыцца.

Людзі былі перакананы, што ў той час, калі секлі дрэва, яно «выпускае з сябе крыкі болю і адчаю», якія выяўляліся ў рыпенні, хістанні, трэску і г. д. Гаварылі нават пра тое, што падчас сну душа дрэва пакідае ягонае цела і самастойна падарожнічае, прыняўшы пры гэтым выгляд птушкі, жучка і іншых жывых істот; адсюль вера ў прарочыя сны і іх тлумачэнне, а таксама забарона рэзка і нечакана будзіць соннае дрэва, г. зн. секчы яго знянацку, не звярнуўшыся перад гэтым з малітвай: тады душа не паспее вярнуцца і ўвайсці ў дрэва. Як бачым, тут душа ўяўляецца як жывая істота, якая не супрацьпастаўляецца целу і ўвасабляе асобныя функцыі дрэва. Людзі свята верылі ў тое, што дух дрэва робіць жывёлу пладавітай і ўплывае на дзетанараджэнне ў жанчын. Акрамя таго, калі чалавек гінуў ад падзення дрэва, то родныя памёршага бачылі ў гэтым помсту з боку дрэва і ў сваю чаргу ссякалі яго і расшчаплялі на трэскі.

Жывёла, якая была на падвор'і, сведчыла аб багацці любога вясковага гаспадара, таму з ёю звязваліся ўсемагчымыя надзеі, планы на будучае. Вядома ж, ніхто асабліва не імкнуўся адмаўляць перасцярогі, якія сыходзілі ад старэйшых, не жадаў на сабе выпрабоўваць – надыдзе пакаранне за гэты грэх ці ўсё пройдзе, як і раней бывала, гладка і спакойна. Старэйшыя – папярэджвалі, а маладзейшыя слухаліся і стараліся потым усё перадаць сваім нашчадкам, каб і іхнія падворкі абыходзіла злыбяда. Асабліва вылучалі карову – асноўную карміцельку вясковай сям'і. «Пастухам ад Юр'я і да Дзям'яна нельга ні ў якім разе стрыгчы валасы, каб каровы не разбрыдаліся па лесе, каб не губляліся там ні ў якім разе і каб на іх у гэты год не нападалі ваўкі». Любая гаспадыня, пачуўшы сама, навучала і дачку ці нявестку – ні ў якім разе не пачынай рэзаць новы бохан хлеба з таго боку, на якім ёсць трэшчына, бо ад гэтага будуць моцна і заўсёды трэскацца каровіны саскі. Давялося запісаць і такое: «Ніколі не стаў даёнку, якая б патрэба ні была, на прыпечак, бо ў тваёй каровы будзе моцна пухнуць вымя. Карова ж не стане падпускаць да сябе гаспадыню, будзе кідацца на яе з рагамі»; «Малако працадзіўшы, то даёнку спачатку добра памый, а потым цадзілку павесь сушыцца і побач даёнку таксама прыладкуй. Калі яны ўвесь час побач знаходзяцца, то ніякая трасца ім не страшная і ніякае чорнае слова ці варажба не накінецца, не прыстане»; «У нас жанчыны даёнку ў хату ўвогуле не неслі, а, працадзіўшы малако і старанна спаласнуўшы яе, вешалі на рагулю, спецыяльна вычасаную з галінастага сука і пастаўленую гаспадаром так, каб яна знаходзілася па дарозе ў хлеў. Тады гаспадыні ўсё зручна было. Атрымлівалася, што яна па дарозе даёнку сваю забірала і ішла ў хлеў. Некаторыя гаспадыні, як найбольш спрактыкаваныя, даёнку вешалі побач з хлявом, але ў такіх людзей і калодзеж знаходзіўся недзе побач. Пра ўсё людзі раней думалі. Нічога стараліся не прапускаць, каб потым не апраўдвацца ды знахара не клікаць малако ў каровы замаўляць»; «Некалі чула ад маці не раз нават, як яна прамаўляла адносна таго, каб даёнку на прыпек не ставілі. Помню і чаму гэтага нельга было рабіць, бо даёнка высахне-перасохне, а ад гэтага перасыханне ў каровы цыцкі патрэскаюцца».

Вельмі часта вяскоўцы згадвалі ў такіх перасцярогах і пра свіней. Яно і зразумела – выгадуеш ладнага кабанчыка, то будзе заўсёды скварка і на стале, і ў гаршку, а калі не пашанцуе, калі недзе нешта схібіш, то пра які ўжо дастатак там можна будзе весці гаворку. Здзіўляе нават тое, як і калі продкі паспявалі ўсё гэта заўважаць і за ўсім чыста сачыць. Хутчэй за ўсё, гэта было зведзена ў нейкую своеасаблівую сістэму, паасобныя элементы якой гаспадар ці гаспадыня выконвалі ў абавязковым парадку, нават асабліва і не задумваючыся, таму што ўсё гэта проста пастаянна знаходзілася ў іхніх галовах. «Купіш маленькіх парасятак, то абавязкова паўкідай іх у мех і сабе за плечы вазьмі. Па дарозе калі хто запытаецца, што нясеш? Дык адказвай наадварот, што ката тапіць ці пеўня на базар, ці яшчэ якую трасцу. Нічога, што парасяты вішчаць і сустрэчныя адразу здагадаюцца, што да чаго. Справа ў тым, што ўсе пра такую завядзёнку самі ведаюць і крыўдаваць за падман ні ў якім разе не будуць»; «Калі парася купіш і нясеш у мяху дамоў, то людзей не бойся, ідзі прама ля іх, але не старайся спыняцца. На ўсе пытанні трэба адказваць. Толькі калі гаварыць станеш, то не забывайся, што казаць неабходна адваротнае. Тады, быццам бы, да жывёліны нічога благое не прыстане, і яна будзе расці і пладзіцца

надзвычай добра». «Калі купіш маленькае парася ці парку парасятак, то ведай, што іхні катушок ні ў якім разе нельга насцілаць сенам. Як зробіш такое, то яны адразу ж пахварэюць і падохнуць праз кароткі час. Здавалася б, што гаспадар хацеў як лепей, наслаў мяккім сенам, каб ім не калола, а аказалася, што зрабіў няправільна, бо малых парасятак насцілаюць выключна саломкай. Старэйшыя людзі гэта ведалі і ніколі такую традыцыю не парушалі. Мала гэтага, маладзейшым таксама стараліся перадаць такія засцярогі, каб і ім шанцавала ў вядзенні свіней».

Любы гаспадар мог адзначыць, у якіх умовах свінні лепей растуць, прыбаўляюць у вазе, добра плодзяцца. Папярэджвалі, што калі не будзеш за сваім падворкам і жывёлай пільна сачыць, то і справы ў цябе будуць ісці абы як. Нічога путнага не атрымаецца, толькі суседзі смяяцца стануць ды іншым у якасці адмоўнага прыкладу прыводзіць.

«Свіней неабходна трымаць у чысціні. Сачыць за тым, каб у хлеўчуку ямін глыбокіх не было, каб гной там не плаваў і свінні – адпаведна. Любая жывёліна чысціню любіць. Дарма пра свіней гавораць, што іхняя стыхія – бруд. Паспрабуйце трымаць у чысціні і пабачыце, якая вялікая розніца. Мае бацькі свіней стараліся чысціць раз на тыдзень. А дзед дык яшчэ і пілавінне падсыпаў, каб вільгаць яно выбірала і каб паветра там здаровае трымалася»; «Заўсёды, колькі свіней не трымалі ў гаспадарцы, то да іх адносіліся вельмі і вельмі добра. Кармілі своечасова, глядзелі, каб насланыя былі, каб па вушы ў гразі не стаялі, каб загародка спраўная была і многае іншае таксама. Свіней не білі. Гэта забаранялася. Крычаць то крычалі, а вось біць – не! Мала гэтага, хвоснуць можна было якой галінкай, але, барані Божа, не кіем ці якімі вілкамі! Пра такога гаспадара звычайна гаварылі, што ён заможнасць і дастатак са свайго двара сам праганяе. Людзі ж гавараць абы што і проста так не стануць».

Канешне ж, ведалі і той час, калі трэба было калоць кабанчыка, свежаваць яго і гатаваць усемагчымыя стравы, рабіць прыпасы і запасы на бліжэйшыя паўгода, а то і на год. Кожны расцягваў на той час, на які дазваляла гэта рабіць ягоная заможнасць. «Кабана лепш біць маладзіком, тады сала будзе белае. Калі ж гэта зрабіць пад поўню, то сала стане дуцца і запроста заплеснее. Пры гэтым неабходна сачыць, каб сала складваў той, хто не жыве шлюбным жыццём (нежанаты член радзіны ці незамужняя), тады сала ніколі не будзе склізнуць, а застанецца ляжаць беленькае. Праўда, з часам яно ўсё роўна жаўцее – ад солі»; «Выгадаванага кабана калолі перад Калядамі, але абавязкова сачылі, каб той дзень прыпадаў на маладзік. Гаварылі, што ад белага маладзіка і сала заўсёды белае бывае. Калі ж гаспадар прапусціў той час і вымушаны быў закалоць кабана ў час поўні, то сала нельга будзе доўга захоўваць, бо яно не ўтрымаецца: стане заўчасна склізнуць, пакрывацца плесенню, чорнымі кропачкамі. І што ты тут не рабі, а выратаваць такі каштоўны прадукт не здолееш. Адно што, ператапіўшы яго на тлушч. Пры такой справе многае губляецца. Малым дзецям і жанатым або хворым на якую хваробу людзям сала складваць у кадоўбчык ці ў бочку не давалі. Верылі, што ад іхніх рук сала таксама запроста можа папсавацца. Таму на такі дзень у хаціне пакідалі каго з нежанатых ці з незамужніх сваякоў, каб яны, пад наглядам старэйшай жанчыны, усё чыста даладкавалі. Так у нашай дамоўцы заўсёды рабілася». «Кабана, добра памятаю, заўсёды калолі пад Каляды. Чаго тут асабліва памятаць, калі ж і сам так рабіў. Глядзелі, каб на небе быў маладзічок, то тады ўсе прызнавалі, што прыспеў добры час. У іншы дзень біць свінню не давалі. Хіба ўжо яна хварэла і выбіраць асабліва не даводзілася, а так, ні ў якім разе! Яшчэ і высвараць добра, што гаспадар, а не ведае, чаму кабанчыка на маладзік калоць выпадае. Гаварылі, што раз у гэты дзень, то сала ўвесь год будзе ляжаць белым – белае, як учора складзенае. Калі ж хто ўмудраўся заціснуць яго ў поўню, то праз нейкі там месяц сала, што ён складваў, есці ўжо будзе немагчыма, бо яно чыста ўсё пачарнее, шкурка паадстае і, вядома ж, пачне не вельмі прыемна пахнуць. А раз так, дык і есці ні ў якім разе не станеш. Сала складваць давалі толькі нежанатым і незамужнім. За гэтым мая жонка сачыла. Яшчэ звяртала ўвагу, каб людзі ў хаце асабліва не размаўлялі і, ні ў якім разе, не сварыліся. Бо тады сала будзе цягучае, як якімі ніткамі звітае. Складзенае і пасоленае, яно можа пасклізнуць. Гэта ўсё адбывалася і ад таго, што не слухаліся старэйшых, не рабілі так, як яны навучалі і нам падказвалі».

Не толькі жывёлы датычыліся народныя перасцярогі. Згадвалі таксама і пра іншыя гаспадарчыя справы. Напрыклад, вельмі стараліся захоўваць традыцыйныя павучанні гэтага плану, калі пачыналі капаць і звозіць, каб хаваць на зіму, бульбу. «Першы кошык бульбы ў пограб неслі ўдваіх – гаспадар з гаспадыняй. Калі ж не ставала чалавека, то за яго мог

выступаць старэйшы сын ці дачка, але абавязкова павінна было быць двое. Каб з кожнага боку дужкі каша – па чалавеку. Мала гэтага, гэты дзень павінен быў адпавядаць дню, на які ў бягучым годзе прыпадала Благавешчанне. Калі заходзілі ці апускаліся ў пограб, то бульбу высыпалі не адразу, а яшчэ папярэдзе прамаўлялі: «Благавешчанне было ў панядзелак». Пасля таго, як высыпалі і гаварылі гэтыя словы, то яшчэ тройчы хрысціліся і кланяліся ў бок свежага капца. Здзяйснялася гэта з адной толькі мэтай, каб бульба захоўвалася добра і трывала ажно да будучага году. У нас дык яшчэ клалі на дно пограба ці сусека і пару голек велікоднай асвячонай вярбы, якая абавязкова захоўвалася ў кожнай спрактыкаванай гаспадыні. Святасць голек, быццам бы, адпалохвала мышэй, пацукоў, жаб, усемагчымых кузурак ад бульбы»; «Калі накопвалі першы кошык бульбы, то яго неслі ў пограб ці да таго месца, дзе ссыпалі новы ўраджай, два чалавекі. Паважна так, няспешна, нібы ўрачыста ўсё рабілі. Калі падыходзілі да сусека, то гаспадыня ўголас казала, што Благавешчанне было ў такі і такі дзень і высыпала бульбу. Лічылася, што пры згадванні дня Благавешчання бульба будзе добра ўлежвацца ў гэтым годзе. Таксама на дно пограба ці сусека клалі што-небудзь жалезнае. Гэта рабілася для таго, каб бульба не гніла і не прарастала, а ўвесь чыста час захоўвалася цвёрдай, як маладая. Жанчыны заторквалі ці клалі ў куце яшчэ і пару свячоных вярбовых голек, якія захоўваліся ад Вялікадня ў кожнай хаціне. Трэба было ў абавязковым парадку класці дзве галькі. Адна – не спрыяла, нічым не дапамагала. Казалі, што раз так зрабіў, то можаш не асцерагацца ў гэтым годзе мышэй і пацукоў. Ім святая голька зубы завязвае. Нарыць то пяску нарыюць, а бульба будзе ляжаць цэлая, некранутая»; «Вельмі стараліся здаўна добра і старанна захоўваць на зіму бульбу. А яшчэ больш – сачыць за тым, каб ўсё рабілася так, як раней вучылі, як даўней здзяйснялі. Абавязкова першы кошык накапанай бульбы ў пограб неслі гаспадыня з гаспадаром. Той кошык і невялікі, і няцяжкі, а нясуць, усё роўна ўдваіх. Каб паказаць, што гэта здабытак іхняй радоўкі. У пограб заторквалі вярбовыя голькі, якія былі свянчоныя ў царкве на Вялікдзень і прызначаліся для таго, каб захоўваць увесь гаспадарчы набытак на працягу гэтага года. Бульба, вядома ж, не была нейкім там выключэннем, а, наадварот, лічылася надта каштоўным прадуктам, які заўсёды выратоўваў людзей у ліхую часіну. Яшчэ, памятаю, што мой дзед абавязкова ў пограб укідваў стары, заржавелы замок, якім у гаспадарцы ўжо не карысталіся. Ён прызначаўся для таго, каб ляжаць на дне пограба і засцерагаць гародніну ад мышыных і пацучыных зубоў, каб яны гэтай гародніны не псавалі і не тачылі ні ў якім разе».

Старыя людзі добра памяталі і тыя часіны, калі трэба было назапашваць корм для хатняй жывёлы і галоўнае, што неабходна было рабіць для таго, каб накошанае, згрэбленае, звезенае і складзенае, напрыклад, сена, – захавалася. Адзначалі тэрміны, прыгадвалі даты, прыводзілі ў якасці неабвержаных фактаў усемагчымыя гісторыі і здарэнні з вясковага жыцця. Па ўсім гэтым выпадала, што трэба трымацца старых правілаў, не адступацца ад традыцыйнага светапогляду, бо, у адваротным выпадку, усё ў вядзенні гаспадарчай справы можа рэзка перайначыцца ў горшы бок. Такога, канешне ж, ніхто не жадаў. «Сена, згрэбленае і складзенае ў стог паміж Купаллем і Пятром, ляжаць ні ў якім разе не будзе. Яго абавязкова спаляць перуны»; «Мае старыя бацькі пільна сачылі за тым, калі мы ішлі грэбці сена. У нас не надта прыдатная зямля на лугі ды на балоты, і таму сена стараліся нарыхтоўваць дзе толькі можна было. Мала гэтага, не задумваючыся асабліва. Прытрымліваліся адвечнага ў такой справе. Раз навучалі, то навучалі не на дрэннае. а на добрае, на тое, каб жывёла зімою стаяла не галодная, каб вясною яе на вяроўках не падымалі ды не выштурхвалі ўсёй раднёй за вароты хлява. Гаварылі ў нас такое, што калі згроб і склаў, адпаведна, сена ў стагі ў прамежак часу паміж Купаллем і Пятром, то нічога добрага ад гэтага не чакай, бо гэта забаронены перыяд і сена тое, з такой вялікай цяжкасцю накошанае і назапашанае, згарыць ад удараў маланкі. Не ў першы раз, дык у другі дакладна. У нашых суседзяў такое рабілася два разы запар. Пакуль усё ж і яны сталі як і ўсе людзі ў вёсцы глядзець на астатніх, ды рабіць гэтак, як яны»; «Сена касілі ў асноўным да Купалля. Старэйшыя тлумачылі гэта тым, што яно тады духмянае і пахкае, як чай. Каровы і коні такое сена ядзяць ахвотней і добра выпраўляюцца, прыбаўляюць у вазе. А яшчэ падкрэслівалі, што час ад Купалля і да Пятра для сена вельмі неспрыяльны. Сонца можа добра сушыць, вецер дапамагаць, але грабці накошанае, а потым і складваць яго ў стагі – даволі небяспечна. Пагарыць такое сена ад маланак. Прыгадвалі яшчэ і тое, што нярэдка і людзі гінулі ў гэты ж перыяд ад навальнічных стрэл. У нашай радні было заведзена, што калі сена прывозілі дамоў, то,

нягледзячы на тое, які дзень быў, якая часіна, усё роўна абыходзілі вакол свежага стога (стагоў) тройчы з абразом. Хадзілі па ўсходу сонца. Тады былі ўпэўнены, што нават калі трапіць сюды пярун, то ўсё роўна полымя само па сабе асядзе і стог не згарыць. Такое здаралася ў нашай мясцовасці даволі часта»; «Не раілі людзі грэбці сена, увогуле яго нарыхтоўваць, паміж святамі Купалля і Пятра. Лічылі продкі, што гэта надта небяспечна ў тых адносінах, што сена магло вельмі лёгка згарэць ад маланкавай стралы. Час гэты ў народнай свядомасці чамусьці лічыўся перуновым. А раз так, то і ўсё, што рабілася, знаходзілася ва ўладзе гэтай усемагутнай стыхіі. Продкі былі перакананы, што, парушаючы такую перасцярогу, пэўны гаспадар рызыкаваў пакінуць сваю жывёлу на зімоўку без кармоў. Такі зыход справы для селяніна нічога добрага не прадвяшчаў»; «Сена ні ў якім разе нельга было грэбці і складаць паміж Купаллем і Пятром. Гэты час залежаў, паводле народных разважанняў, ад грамавых перуноў. Усё, што было зроблена свавольна, насуперак старадаўнім павучанням, магло запроста заняцца агнём. Таму стараліся перачакаць гэтых пару тыдняў, а там ужо брацца за касьбу. Тым болей, што ў гэты час спраўныя гаспадары касілі другі ўкос – атаву. Старэйшых ніколі нельга было прымусіць нешта парушыць. Яны баяліся не толькі за сябе, але і за родных, і за гаспадарчыя справы. Кожны не жадаў па нейкай там драбніцы выпрабоўваць уласны лёс. Тым болей, што ў залежнасць ад яго таксама свята верылі».

Мала гэтага, у народным календары існавалі невялікія прамежкі часу, калі вяскоўцам, для захавання ўраджайнасці, плоднасці ў сваіх гаспадарках, увогуле не рэкамендавалася працаваць. Баяліся, як мы ўжо адзначалі, не толькі лёсу, маланкі-перуна, але і дэманалагічных істот. Ды і іншых прыродных стыхій таксама. «На русальным тыдні, пасля Тройцы, строга забараняецца працаваць. Каб за гэта град не нарабіў шкоды ў агародах і на палетках»; «Русальны тыдзень у народзе заўсёды прызначаўся толькі для таго, каб русалкі пад час яго адпачывалі і гушкаліся на бярозавым голлі. Таму і перасцерагалі ўсіх чыста маладых ды цікаўных, каб яны не ўздумалі ў гэты перыяд працаваць, бо пагражаць русалкам ні ў якім разе нельга было. У сваім зямным жыцці яны ж таксама былі людзьмі і, стаўшы дэманалагічнымі прыгажунямі, тым не меней не забываліся назіраць за тым, як паводзілі сябе іхнія родныя і блізкія людзі. Як убачаць каго за працай, то адразу ж прыпомняць яму сваю крыўду. І зробяць гэта не сваімі рукамі, а наслаўшы нечуваны град на палеткі тых, хто іх зняважыў і пакрыўдзіў. Старэйшыя, на долю каго прыпала бачыць такое, дык у адзін голас сцвярджалі, што град змешваў у суцэльную гразь зеляніну, зямлю, ваду. Вядома ж, пасля такога весці нейкую гаворку пра добры ўраджай не выпадала»; «Мне дзед некалі апавядаў, што на русальным тыдні людзі не надта імкнуліся працаваць па сваіх палетках і агародах. Асабліва сачылі за гэтым пільна гаспадыні. На іх за гэта адказнасць ляжала. Па гаспадарцы нешта рабіць – дазвалялася, а вось у зямлі корпацца – не. Баяліся адплаты з боку якраз-такі русалак. Менавіта яны за тое, што псавалі ім іхняе гадавое свята, маглі наслаць на ліхога чалавека, а заадно і на ягоных суседзяў ды аднавяскоўцаў страшную хмару з навальніцаю вялікаю і небывалым градам. Градзіны тыя, што курыныя яйкі, калі каму па галаве патрапіць, то прыглушыць ці параніць моцна на месцы».

Людзі верылі і ў тое, што на пэўныя рэлігійныя (ці народныя) святы ні ў якім разе нельга было нават мыцца, бо звязвалі з такім дзеяннем і пэўную пагрозу з боку розных дэманалагічных персанажаў ці з тым, што гэтым самым можна наклікаць на сябе і сваіх родных нейкую хваробу. «На Івана Галавасека, колькі памятаю, у нас строга забаранялася мыць галаву. Тлумачылі гэта тым, што той, хто не паслухаецца і парушыць перасцярогу, абавязкова стане хварэць каўтуном»; «Некалі старэйшыя палохалі і прыводзілі ў якасці прыкладу вядомага ўсім чалавека, каб не мылі сабе галаву на Івана Галавасека. Калі ж парушыш, то ці падучая цябе назаўсёды прыхопіць і стане раскашаваць у тваім целе ды мучыць цябе страшэнным болем, ці каўтун на валасы ўсядзецца. Гэта азначала не што іншае, як дзікі боль, ад якога раней немагчыма было пазбавіцца. Таму стараліся слухацца старэйшых. Потым ужо гаварылі, што такія перасцярогі не надта нам дапамагаюць, але гэта ўжо калі медыцына стала выратоўваць, а даўней жа толькі на свае сілы разлічвалі і таму не імкнуліся ў нечым парушаць традыцыю. У многім гэта залежала яшчэ і ад таго, што проста не жадалі сварыцца са старымі, якія наракалі за ўсялякія самаўпраўствы сваіх нашчадкаў»; «У дзень Івана Галавасека мужчыны і жанчыны толькі крыху ўмываліся. Стараліся пры гэтым рабіць так, каб вада не патрапляла на валасы. Тым болей злавалі на чалавека, які асмельваўся памыць сабе галаву. Адразу гаварылі, што ён у абавязковым парадку захварэе на

каўтун. За выратаванне ад такой хваробы ці за яе адмаўленне тады не браўся нават самы моцны знахар. Ён падкрэсліваў, што раз чалавек спецыяльна парушыў тое, чаго нельга было парушаць, то ён, толькі ён сам, а ніхто іншы, вінаваты ў гэтым і таму брацца за такое вылячэне, яму не выпадае. Маўляў, сам баіцца пакарання за дурноту іншага».

Надзвычай важнай лічылася сярод вяскоўцаў і вера ва ўсемагчымыя (і шматлікія) павер'і. Датычыліся яны самых розных аспектаў чалавечага жыцця і гаспадарчай дзейнасці сялян. Характэрна тое, што ў іх аснове таксама яскрава прасочваецца практыцызм, тое, што яны ўсе пайшлі ад назіранняў за паводзінамі людзей, жывёл, птушак, за тым, як яны рэагавалі на нейкія канкрэтныя здарэнні. Паступова, стагоддзе за стагоддзем, утварылася своеасаблівая сістэма, якая прадугледжвала не толькі шматлікасць адказаў на самыя розныя пытанні, але яшчэ і гэтулькі ж, калі не болей, новых варыянтаў утвораных значна пазней і дапаўняючых у нейкай ступені тое, што пачулі ад продкаў, што свята зберагалася і, як пэўная частка духоўнай спадчыны, было перададзена нашчадкам. Канешне ж, бясспрэчна, многае зараз можа проста выклікаць скептычную ўсмешку. Толькі ні ў якім разе нельга забывацца і пра тое, што час быў іншы, псіхалогія людзей і шляхі ўплыву на яе таксама вельмі адрозніваліся ад сучасных. Тым не меней, падаем запісанае намі, бо яно таксама нясе ў сабе шмат карыснай інфармацыі. І калі яе нельга зараз прымяняць у практычным плане, нават не абавязкова, то паразважаць аб уменні продкаў знаходзіць усемагчымыя адказы на пастаянна паўстаючыя пытанні, заўсёды карысна.

Пачнем, бадай што, з самага важнага – з таго, як жанчына хадзіла цяжарнай, і з нараджэння дзіцяці. Вось пра што гаварылі найчасцей і ў што, адпаведна, верылі: «Калі цяжарная жанчына ўбачыла пажар, то не павінна ў страху дакрануцца рукамі да твару, каб дзіця не нарадзілася з чырвонымі плямамі на целе. Калі ж пайшлі такія плямы і ўжо позна неяк выкручвацца, то маці стараецца вывесці плямы, правёўшы па твары дзіцёнка рукою нябожчыка. Пры гэтым імкнецца зрабіць так, каб яе дзеянне засталося незаўважаным, то тады, магчыма, і дапаможа. Калі ж нехта ўбачыць, то дарма ўсё. Застанецца ранейшым»; «Жанчыну, якая носіць дзіця, трэба асцерагаць і глядзець, каб яна ні ў якім разе не апынулася на пажары. Гэта надта небяспечна для будучага дзіцёнка. Яна можа запроста напалохацца. Калі ж такое адбудзецца, то дзіця будзе мець на ўсё жыццё на сваім целе «вогневыя знакі», якія не выводзяцца. Праўда, часам гаварылі, што ад такіх плямін можа дапамагаць бабка-варажбітка, якая паднясе немаўля да мерцвяка і прыхіліць яго галоўкаю да рук нябожчыка. Але гэта гаварылі, трэба рабіць толькі тады, калі дзіця яшчэ зусім маленькае і нічога не разумее, бо калі падрасце і стане цяміць, то такое дзеянне можа яшчэ больш нашкодзіць – налякаць да смерці».

Увогуле пра нейкія запалохваючыя дзеянні ў адносінах да цяжарных жанчын продкі гаварылі з вялікай доляй перакананасці ў тым, што гэта неабходна захоўваць, яго трэба прытрымлівацца і нельга адмаўляць. «Цяжарную жанчыну няможна палохаць, бо яна з пуду можа скінуць. А калі не, то яе дзіця можа стаць заікатым ці балбатуном. Гэта ж таксама дрэнныя знакі на ўсё жыццё. У гэтым былі перакананы. Тым болей, што і балбатуноў і заікатых заўсёды хапала». «Калі можна пры нейкім страшным ці нечаканым выпадку не крычаць і не гарлаць не сваім голасам, то трэба абавязкова гэта рабіць. Асабліва, калі побач знаходзіцца цяжарная. Ёй жа гэта можа прынесці вялікае гора і бяду, а будучаму дзіцёнку – яшчэ большае. Ён тады на ўсё жыццё застанецца заікастым. Калі не так, то будзе пастаянна размаўляць. Словы тыя з яго будуць сыпацца. як мак з торбы. Гэта ж не да дабра. Каго такое ўзрадуе». «Верылі ў тое, што парадзіху можа вельмі напалохаць пажар, таму стараліся не пускаць на такія вогнішчы яе, нават прымушалі адварочвацца і не глядзець на агонь. Іншая справа, калі яе неяк ненарокам палохалі. Дык тады ўжо яна, небарака, атрымлівала зляк па поўнай праграме. А раз так, то ў немаўляці на целе станавіліся чырвоныя пляміны. Магла быць і адна. Самае важнае заключалася ў тым, што яны не сыходзілі. Добра яшчэ, калі не на твары ці на якім іншым бачным месцы. Старэйшыя людзі расказвалі, як таму ці іншаму спрабавалі выводзіць такія пляміны. Толькі нічога не дапамагала. Сядзелі яны, як і да гэтага».

Зляк, як лічылі даўней, быў увогуле вельмі небяспечны для цяжарных жанчын. Яно і зразумела, атрымлівалася, што парадзіха адказвала адразу за два жыцці, ці, як падкрэслівалі нашы інфарматары, «насіла ў сабе два жыцці». Таму і раілі паболей слухацца, паменей выстаўляцца, не паказвацца лішні раз на людзі, асабліва на чужыя, са сваім жыватом, бо лёгка было ўхапіць на сябе чорны, зайздрослівы погляд, ці нават і такое было не рэдкасць, пачуць не

надта ласкавыя і спагадлівыя словы на свой адрас. Сяляне былі перакананы, што нават існуюць усім вядомыя рэчы, якія парадзіха павінна не кранаць, не пераступаць, абыходзіць (за лепшае) бокам. «Цяжарнай жанчыне нельга пераступаць цераз сякеру, кухонны нож ці шавецкія нажніцы, бо тады ў яе можа нарадзіцца дзіця з заячай губой»; «Калі наша мама была цяжарная, то яе апекавала бабуля. Яна хадзіла маім малодшым брацікам, а мне ўжо было болей дзесяці гадкоў, то я ўсё добра помню. Казала, каб ні ў якім разе не садзілася на парозе, бо нараджаць будзе надта цяжка. А яшчэ – каб не пераступала сякеру ці нож. А ножніцы каб у рукі не брала. Калі ж нешта не так учыніць, то малое народзіцца з раздвоенай губой»; «Сякеру цяжарным не давалі пераступаць. Яе прымушалі абыходзіць. Нават нельга было такой жанчыне браць у рукі, каб чаго дурнога не здарылася. Нажніцы таксама нельга было пераступаць ці адсоўваць нагою. Нож дык можна было браць, а вось пераступаць – не выпадала. За ўсім стаяла тое, што раз парушыш, дык дзіця народзіцца з раздвоенай губою. У пакаранне за такую вось простую, здавалася б, правіну».

Папярэджвалі парадзіх і пра многае іншае, што магло адмоўна адбіцца на іхнім ці на дзіцячым здароўі або прыгажосці, фізічнай сіле ці розуме і кемлівасці. «Пачуўшы любы моцны пах, цяжарнай жанчыне нельга не толькі пляваць, але нават і гаварыць ці проста згадваць пра гэта, бо ў будучага дзіцяці да самай старасці будзе моцна смяродзець з рота»; «Нельга парадзісе ні ў якім разе падыходзіць да таго месца, дзе нешта моцна смярдзіць. Калі ўжо такое, ненарокам неяк ці па пільнай неабходнасці адбудзецца, то ёй не выпадае сплёўваць з нейкай там агідай, ці гаварыць пра гэты смурод. Старэйшыя пераконвалі, што раз так зробіць, дык абавязкова ў яе народжанага дзіцяці будзе смярдзець з рота. Нічым не выведзе той пах». «Калі недзе нечым моцна ваняе, то парадзісе нельга туды падыходзіць, бо потым жа яе дзіця пакутаваць будзе. Атрымаецца так, што з ягонага рота стане ваняць. Смурод будзе ісці, як ад якой гнілой сярэдзіны, і нічым той страшны пах не вынішчыш. З самага маленства і ажно да старасці так будзе доўжыцца. На свае вушы чула, як наша бабка адну са сваіх дачок навучала».

Здаралася, што адзначалі і іншае. Згадвалі пра абставіны куды больш строгія і небяспечныя для цяжарных жанчын. Ад такіх акалічнасцей, аказвалася, магло залежаць жыццё будучага дзіцяці. Не здзіўляе, што такія запісы звязаны з нябожчыкамі, з іхнім знаходжаннем у хаце, з провадамі на могілкі, з развітаннем і непасрэдна з самім пахаваннем. «Цяжарным жанчынам нельга быць на пахаваннях. Уся справа ў тым, што потым можа нарадзіцца мёртвае немаўля»; «Некалі ў нас часта паўтаралі, што калі ў парадзіхі пamiралі нават вельмі блізкія людзі, то ёй усё роўна нельга было галасіць над нябожчыкам. Проста забаранялі рабіць такое. Тлумачылі, што раз яна так стане вырабляць, то дзіця ў яе народзіцца страшэнна крыклівае і плаксівае. Не дасць ёй ніколі спакою і адпачынку. Да самой старасці такім ужо па характары застанецца. Баяліся і сурокаў, якія жанчыне лёгка было падхапіць, знаходзячыся сярод мноства людзей. Тады б хварэла сама і, адпаведна, немаўля не мела добрага здароўя. А яшчэ сцвярджалі, што прысутнасць цяжарнай на пахаванні магла азначаць і тое, што ў яе павінна было нарадзіцца мёртвае немаўля. Таму, калі і дазвалялі ёй старэйшыя развітацца з блізкім чалавекам, дык толькі ў хаце, не галосячы, не надта ўбіваючыся і не праваджаючы да могілак. Яно і не дзіўна, бо тут супрацьпастаўляецца жывое і мёртвае, якога ўсе і заўсёды палохаліся»; «Думалі, што раз парадзіха загалосіць над труною з нябожчыкам, раз яна пачне крычаць-гаманіць, а потым яшчэ і над магілай кідацца, дык такая справа прынясе ёй вялікае гора – у яе народзіцца мёртвае малое. Усе чыста так і сцвярджалі адназначна, бо праводзілі паралель з тым, што бачылі нежывога чалавека перад сабою і тое, як убівалася над ім жанчына, якая насіла пад сэрцам дзіця».

Спрактыкаваныя людзі, нават паглядзеўшы на неба, на зоркі, на ясны месяц ці на сонца, маглі па тым, як размяшчаліся нябесныя свяцілы ці зорныя знакі, прадказаць лёс нованароджанага дзіцяці. Наіўнага тут надта многа, і, тым не меней, паўтаралі з пакалення ў пакаленне, нібы заведзеныя. А калі яшчэ іхняе прадказанне, заснаванае на аснове народных назіранняў, пацвярджалася, тады ўвогуле лічылі яго непахісным, абавязковым для далейшага захавання ў народнай традыцыі. «Калі дзіця народзіцца на поўню – будзе жыць заможна і багата; на маладзік – доўга; на сходы – будзе мець кароткае і, да таго ж, нешчаслівае жыццё»; «Немаўля, якое маці прынесла на поўню, стане ў далейшым надта багатым; калі ж нарадзіла на маладзіковую пару – стане жыць сярэдне, але затое вельмі доўга; калі ж на сходах яна разрашылася, дык такому чалавеку ў жыцці і шанцаваць не будзе. Самае галоўнае, што яму на раду будзе запісаны кароткі жыццёвы век. Як такі чалавек не будзе асцерагацца, а смерць, тым

не меней, усё роўна сваё зробіць – заўчасна яго забярэ з белага свету»; «Сама добра, калі парадзіха дзіця прыносіла на поўню. Тады ўсе чыста былі пераканаdebы, што такога чалавека наперадзе чакае вялікае шчасце і абавязковая заможнасць. Усё яму само будзе ў рукі прыходзіць. Нават і старацца асабліва не трэба будзе. Шчасцем будзе пабраны ягоны лёс. Калі ж на маладзік дзіця запішчыць у хаце, то таксама нічога асабліва благога чакаць не даводзілася, бо яно, паводле народнага, стане жыць доўгі чалавечы век, няхай сабе і не вельмі багата, тым не меней, галадаць не стане. Калі ж жанчына разрашылася на сходную часіну, то такому немаўляці на ягоным раду напісана не надта радаснае: ні ў якой важнай справе яму шанцаваць не будзе. Акрамя таго, самае галоўнае, што і пражыць яму давядзецца вельмі кароткі век. Так у нас некалі пераказвалі і верылі ва ўсё гэта. Казалі, што гэта нябесныя багі так чалавеку заранёў падрабілі. Ад такога ніхто ніколі не схаваўся і ніхто не выкруціўся».

Само нараджэнне немаўляці таксама было звязана са шматлікімі тлумачэннямі і прыкметамі, якія маглі напрамую ўказваць на будучае гэтага чалавека. Таму ўсё гэта паступова сфарміравалася ў шырокавядомы сёння радзінны абрад. «Нованароджанаму перавязвала пуп бабка. Яна ж першыя дні яго сама і купала, нікому не давяраючы такую адказную справу, якую належала рабіць толькі ёй. Глядзелі, каб керасінавая лямпа гарэла ўсе ночы, пакуль малое не ахрысцяць у царкве ці касцёле. Кума выбіраў бацька, куму, адпаведна, маці. Ахрысціць, як было заведзена, імкнуліся у першыя дзесяць дзён, бо потым, з кожным лішнім днём, на малое могуць уссядаць розныя хваробы, а найперш – сурокі. Бацькі не павінны былі хадзіць у царкву першыя сорак дзён ад нараджэння дзіцяці. Лічылі, што гэта не пойдзе на карысць немаўляці, таму і асцерагаліся»; «За бабку бралі спрактыкаваную павітуху, якая заўсёды знаходзілася ў любой вёсцы. Калі паселішча было вялікае, то іх магло быць і некалькі, ці, наадварот, адна бабка на шэраг суседніх вёсак. Прасілі пачэсна, з пашанаю, каб не пакрыўдзіць. Бабка, вядома ж, паводзіла сябе таксама, прытрымліваючыся традыцыі: крыху спасылалася на сваю занятасць, але гэта было простае аднекванне, бо праз нейкую хвіліну яна згаджалася. Вялікі грэх быў адмовіць парадзісе ў такой дапамозе. Яна перавязвала немаўляці пуп і першыя тры дні сама прыходзіла мыць малое, нібыта навучаць неспрактыкаваную маці. Трэба было, каб агонь у хаце гарэў пастаянна ажно да таго часу, пакуль немаўля не перахрысцяць, калі ж ужо звазілі туды і надзелі на шыю крыжык, то тады агонь палілі, як і раней – па патрэбе. Кумоў выбіралі з дастойных людзей, каб гэта дапамагала ў далейшым жыцці. Нездарма ж гаварылі, што добры хрышчоны бацька роднага не заменіць, але пры патрэбе дапаможа, выручыць. Тое ж самае можна было пачуць і пра хрышчоную маці. Муж выбіраў кума, а жонка – куму. Звычайна, гэта былі людзі родныя ці з блізкіх сяброў, якіх ведалі і якім давяралі, з якімі жадалі куміцца. Да сарака дзён жыцця малога, бацькі ў царкву не хадзілі. Так было заведзена з даўніх часоў. Пасля гэтага часу, то можна было ісці. Як вядома, найчасцей у царкву бегала жонка, а муж – заставаўся дома»; «У нас некалі казалі, што дзяўчына павінна першы раз хрысціць хлопчыка, а хлопец – дзяўчынку, каб потым лёгка атрымалася выйсці замуж ці ажаніцца. Калі нехта заставаўся ў вечных дзеўках ці кавалерах, то ім і прывязвалі такое няведанне ці парушэнне справы. Маўляў, за тое, што не тыя хрысцілі, то і самі цяпер пакутуйце ў адзіноце». Сталыя жанчыны, навучаючы сваіх дачок і нявестак, сцвярджалі таксама і наступнае: «Тую ваду, у якой купалася дзіця, трэба хутчэй выліць, бо яна можа тут жа дзіцяці зашкодзіць. Малому дзіцяці, як яго памылі, то трэба адразу ж накрываць галаву шапачкай ці хустачкай, то ў яго не будзе ў дзяцінстве балець галава, а яшчэ яно ад гэтага будзе разумным. Глядзелі, каб калі мылі, то ў хаце было цёпла і каб нідзе не дзьмула, бо немаўля можа вельмі запроста прастудзіцца»: «Дзіця стараліся мыць у добра натопленым памяшканні, калі гэта адбывалася зімою, і яшчэ сачылі, каб ненарокам не было якога скразняку, бо тады справа магла дрэнна скончыцца і немаўля захварэла б. Як толькі памылі, дык адразу ж на галаву павязвалі шапачку. Матуля спецыяльна нашывала такіх шапачак некалькі. З мяккага матэрыялу ці са старых рэчаў. Але таксама мякенькіх. Гаварылі, што ваду, у якой памылі малое, неабходна адразу ж выліваць. Напрыклад, калі жонка памыла і пачынала пелянаць дзіця, то муж тым часам выносіў ваду. Затрымліваць яе ў хаце нельга было з-за таго, каб малое не хварэла потым. Тут усяго баяліся. Бо ж не было магчымасці, як сёння, сядзець з ім дома, няньчыцца, а трэба было бегчы на працу. Таму і малое цягалі за сабою: і на поле, і на сенажаці. Хапала жанчынам клопату. Добра, калі дома заставаліся старыя бацькі ці можна было паспадзявацца на каго са старэйшых дзяцей, а ў адваротным выпадку, усё выпадала на адныя плечы – жаночыя».

Перасцерагалі і адносна таго, што «У нядзелю нельга купаць дзіцёнка і мыць пялёнкі. Усё тлумачылася ў такіх выпадках надзвычай проста – дзіця, з-за непаслушэнства ці з-за няведання ягонай матулі, утопіцца»; «Не давалі маладой маці купаць дзіця ў нядзелю. Як, дарэчы, і дарослым таксама. Мыліся ўсе вечарам у суботу. Тады і трэба было ўсім, без нейкага там выключэння на ўзрост, мыцца. Калі ж нехта парушаў заведзены здаўна парадак ці яшчэ ўмудраўся, спаслаўшыся на празмерную занятасць, замочваць або мыць дзіцячыя пялёнкі, то такая маці рызыкавала лёсам свайго дзіцяці. Яно магло з-за яе віны потым утапіцца. І ніхто ўжо не мог выратаваць у гэтай сітуацыі, бо яна ж сама саграшыла. Сама паставіла яго ў такое становішча». «Мыць малое таксама трэба было ўмець, бо запроста можна было яму напаскудзіць, нават не жадаючы таго. Вось нешта не так зрабіў і ўсё на тым. Таму, калі мылі, то дзіця стараліся адразу ж і апранаць, а не трымаць яго голенькім, няхай сабе і якую хвіліну-другую. Найперш апраналі шапачку, бо думалі, каб надалей малому не балела галава, каб яно было разумнае і здагадлівае. Не раілі старыя людзі трымаць даўжэй заведзенага ў хаце ваду, у якой памылі малое. Яе неабходна было вынесці і выліць, бо вада гэтая станавілася нездаровай і таму магла прынесці ў хату вялікую шкоду»; «Пялёнкі трэба мыць і сушыць толькі ўдзень, бо ўначы ў іх могуць залезці нячысцікі і перакалашмаціць ягоны сон, ці яшчэ неяк нашкодзіць. Усе жанчыны гэта ведалі, але, тым не меней, пераказвалі іншым і іх таксама перасцерагалі»; «Пялёнкі мама ніколі не мыла і не сушыла на ноч, гаварыла, што дзяцей потым будуць чэрці забаўляць і яны не стануць спаць самі і іншым адпачываць спакойна ні ў якім разе не дадуць. Звычайна яна гэтым займалася з раніцы, каб да вечара ўсё было сухое і чыстае. Часу на такую справу ў любой увішнай гаспадыні заўсёды хапала». «Пялёнак старэйшыя ніколі не давалі на ноч замочваць і вывешваць. Гаварылі, што раз так зробіш, дык сама сабе ў бядзе пасобіш. Гэта азначала ні што іншае, як тое, што ноччу пялёнкі дзіцячыя набяруцца ўсяго самага благога ў сябе і потым перададуць заадно і малому дзіцяці. Не паспяваеш, то ўсё роўна на ноч не спасылайся. Так некалі і мяне свякруха мая вучыла».

Не заставаліся незаўважанымі і іншыя дзеянні, якія адбываліся, ці якіх прытрымліваліся ў адносінах да нованароджаных малых. Кожны імкнуўся нешта прыгадаць, а нехта і нешта прыдумаць, тлумачыць па-свойму. Тым не меней, і гэта таксама тлумачылася як магічна-засцерагальнае, кананічнае. І ўспрымалася адпаведна таксама. Можна сказаць, што ўсё ўжо толькі ад таго, што датычылася дзяцей – самых дарагіх персон у любой радзіне. «Як толькі дзіцёнак родзіцца, то яго трэба першы раз падняць. Калі ён адразу ж выцягне ногі, то гэта несла сумную навіну – хутка памрэ. Калі ж ногі падбярэ, падкурчыць пад сябе, то гэта азначала, што будзе ў яго наперадзе доўгі чалавечы век, што яму наканавана лёсам толькі самае лепшае і шчаслівае»; «Бабка-павітуха адразу ж немаўля на ягоны век правярала. Калі яно закрычала толькі што нарадзіўшыся, ды яшчэ голасам зычным, громкім, то гэта тлумачылі тым, што будзе начальнікам і на ўсіх чыста стане потым крычаць, прымушаць працаваць, але само гнуцца – пацець ніколі не будзе. Калі падгінала пад сябе ножкі, старалася падкурчыць іх, нібыта схаваць пад сябе, то сведчыла такое дзеянне пра доўгі век, які яму ўжо ад нараджэння наканаваны. А вось калі яго бабка падымала на руках і немаўля выцягвала ў струнку ногі, дык гэта азначала, што яно можа зусім у хуткім часе памерці, не дажыўшы нават да сталага веку»; «Некаторыя матулі, папрасіўшы бабак-павітух праверыць сваё немаўля на лёс, самі стараліся, ад страху і трывогі, схавацца за дзверы. Бо не ўсё ў такіх справах прадказвала толькі добрае. Таму за лепшае лічылі не глядаць, а потым ужо пачуць са слоў. Бабка падымала малое і глядзела, як яно стрыжэ ножкамі. Раз ногі бегаюць весела, хуценька, жвавенькія такія, падгінаюцца пад цельца, то і малое будзе жыць доўга і шчасліва, заможным дзіцём. А калі выцягне ножкі і не паварухне нават, то тады ўцехі мала будзе – нешчаслівы лёс чакае. Мала гэтага, і век будзе нядоўгі. Гэтага менавіта мацяркі і палохаліся, што на свае вочы, нібы ў якім люстэрку, убачаць будучы лёс немаўляці».

Асабліва цікава было фіксаваць сведчанні, якія датычыліся сувязі народжанага дзіцяці з порамі года. Увогуле, атрымлівалася, што не народны каляндар прывязваўся да чалавека, а наадварот. «Калі родзіцца ўзімку малое, то ўсё жыццё будзе баяцца маразоў, мёрзнуць будзе, як ты яго не апранай. Затое работнік з яго выйдзе старанны і няўрымслівы. Хто ж родзіцца ўлетку – будзе вельмі гарачы ды сярдзіты, а заадно і нястрыманы, бы тая рабінавая ноч, але па характары і па душы сваёй – вельмі добры. Людзі хутка раскусяць, што ён толькі пакрыквае, але благога, дрэннага ніколі і нікому ў жыцці не прычыніць. Маёвыя немаўляты самыя нешчаслівыя. Яны

будуць маяцца і пакутаваць усё жыццё, як і тыя маладыя, што не падумаўшы і нікога не паслухаўшыся, бяруцца шлюбам у маі. Калі ж дзіця родзіцца па восені, як усяго многа ў гумне ды на агародзе, то ў адпаведнасці з гэтым заўсёды будзе багата і заможна жыць»; «Народзіцца немаўля зімою, у лютыя маразы і халады, то на ўсё чыста жыццё стане баяцца маразоў, бо проста будзе мерзнуць. Таму, у нас некалі гаварылі, што каб не мерзнуць, дык яны пастаянна працуюць. Таму і шчырыя ды гаспадарлівыя па сваёй натуры. Калі ж дзіця нараджалася летам, у самую спёку, дык аднагалосна сцвярджалі, што ягоная крыклівасць дасца родным ды блізкім у знакі. Крыклівы – то крыклівы. Але затое добры і спагадлівы. Таксама немалаважна. Найбольш асцерагалі тых бацькоў, у якіх дзеці прыйшліся на вясну, а менавіта – на май. Казалі, што яны і самі будуць маяцца і іншым ад іх перападзе нямала. Самай спрыяльнай часінай лічылі восень. А яшчэ, калі яна прыпадала багатая і заможная, то падкрэслівалі, што і ў немаўляці такі ж лёс выпадзе».

Нават па тым, як дзіця насіла вопратку і абутак, спрактыкаваныя вочы сталых людзей маглі многае патлумачыць, а заадно і параіць тым, хто ў гэтым не вельмі разбіраўся. «Калі дзіця хутка зношвае адзенне і абутак, якія на ім, як агнём гараць, то, як сцвярджалі старыя людзі, яно пражыве нядоўга. А калі дзіця не даношвае адзення да лапікаў і вырастае з іх, то ў сталым жыцці такі чалавек будзе жыць надта бедна, нібы ў пакаранне за неашчадныя адносіны да вопраткі ў дзяцінстве»; «Раней жа ў кожнай сямейцы ўсё чыста на ўліку было. Таму не здзіўляліся, калі меншыя даношвалі вопратку за старэйшымі. Так было заведзена спакон вякоў і гэтым не грэбавалі, а, наадварот, лічылі, што калі даношваюць за разумным і здаровым дзіцёнкам, то, адпаведна, і той, хто даношвае, будзе гэткім самым. Звярталі ўвагу абавязкова на тое, што некаторыя вельмі хутка рвалі ўсё на сабе. Вось нібы якім агнём нішчылі! То пра такіх і казалі заўсёды, што яны ад гэтага доўга не пражывуць, загінуць заўчасна. Якое дзіця не любіла даношваць абутак ці якую вопратку, а старалася выпрасіць ці выплакаць сабе новыя рэчы, то такія ўсё жыццё будуць у далейшым плакацца. Ім наканавана пражыць бедна і незаможна».

Падкрэслівалі, што «каб дзіця хутка расло, яно павінна вясной, на першыя тры грамы, перакуліцца цераз галаву тройчы па тры разы. Тады ў яго справы пойдуць да лепшага і яно пусціцца ў хуткі рост. Тым болей, што ад грому і дажджу не будзе мець ніякіх праблем са здароўем, бо веснавыя дажджы ачышчальныя і ўзмацняльныя. Іхняю вадою карысталіся ад усялякіх хвароб. Нават маглі параіць, як самы магутны сродак пры пазбаўленні ад зглазаў, ад злякаў, ад хваробы жывата і сэрца». «З першым веснавым громам і дажджом у нас звязвалі наступнае дзеянне – неабходна было малому дзіцяці выйсці пад дождж і тройчы па тры перакуліцца цераз галаву. Тады ўжо былі цвёрда перакананы, што яно стане спраўна расці і нават перарасце ўсе чыста хваробы, не будзе вось так лёгка ім паддавацца і ад іх залежаць» «Калі ні з таго і ні з сяго дзіця пачынала проста так хварэць, то заўсёды чакалі веснавой часіны, каб найхутчэй загрымеў гром. Падпільноўвалі такі момант і выводзілі малое пад дождж. Абавязкова гаварылі, што яно павінна будзе перакуліцца тры разы цераз галаву. Які б дождж не ліў, а ўсё роўна малое неабходна было прымусіць так зрабіць. Пасля ўжо старэйшыя сцвярджалі, што такое дзіця пойдзе на папраўку і не стане болей хварэць, бо яно абмылася цудадзейнай вадой першых трох грамоў. У такое дзеянне верылі і пераказвалі, прыводзілі ў якасці прыкладаў людзей, якія вылечыліся такім шляхам».

Не адназначна адносіліся продкі і да смерці, асабліва дзіцячай. Тут таксама хапала ўсемагчымых перасцярог і павер'яў. Яно і зразумела – смерць нікога не шкадавала, не абыходзіла бокам. А дзяцей было шкада найболей. «Жанчына, у якой памерла дзіця, ні ў якім разе не павінна есці яблыкі і грушы да Спаса, бо тым самым яна прынясе яшчэ большую бяду ў свой род. Казалі, што калі яна яшчэ маладая, то ў яе болей не будзе дзяцей, а калі была ва ўзросце, дык правіна за яе дзеянні магла легчы на ўнукаў. Такога баяліся. Сцвярджалі, што нават калі добра захаваешся і ўкусіш, не стрымаўшыся, грушу ці яблык, то і гэта будзе бачна пану Богу»; «Не дазвалялі ў нас, я добра памятаю, есці да Спаса яблыкі і грушы, карацей, садавіну, тым жанчынам, у якіх у гэтым годзе памёрлі малыя дзеці. З чым гэта было звязана? Казалі, што раз так зробяць, то болей дзяцей у іхніх хатах не будзе, а ва ўсіх астатніх людзей, не стане захоўвацца на зіму садавіна. Уся пагніе і счарвівее, так і не паласуецца гаспадар з такога шчодрага, здавалася б, ураджаю».

Вялікая колькасць вуснапаэтычных твораў акрэсленага намі накірунку была звязана з падтрыманнем парадку і вядзеннем дастатку ў сялянскіх хатах. Тут таксама раілі самае рознае.

«Як сонца зойдзе, то не выносяць з хаты смецце і не выліваюць ваду на вуліцу, каб праз такія дзеянні нічога дрэннага не шылася ў хату, не прыставала ўсемагчымая трасца і порча да людзей. Не аднойчы даводзілася чуць, што так з хатаў з смеццем і дабро сваё выкідаюць. Раней у гэта верылі і найбольш на дзяўчат і жанчын сварыліся, бо ж менавіта на іх ляжала адказнасць за чысціню і парадак у жылой будыніне»; «Пасля таго, як сонца зойдзе, дык не давалі мыць ці падмятаць у хаце. Казалі, што заўтра з раніцы ўсё паробіцца, а ўвечары смецця і не відаць проста. Калі ж нехта не слухаўся і падмятаў, то такога прымушалі смецце згрэбці ў кут і накрыць венікам. Выкідваць забаранялі пад страхам суровага пакарання. Не давалі выліваць і ваду, асабліва калі памыюць падлогу ці памыюцца самі. Зноў гэта пакідалі на раніцу. І ўсе слухаліся, не стараліся асабліва ў нечым пярэчыць. «Сустракаліся некаторыя іншыя, больш простыя, абмежаванні. «У чысты чацвер стараліся памыцца раніцай. Пры гэтым клалі сярэбраную рэч ці манету ў тую пасудзіну, у якой ці з якой мыліся. Гэта было зроблена для таго, каб на працягу ўсяго года заставацца чыстым. А вадой, што мылі хлебную дзяжу, бралі і пасля мылі хату. Гэтую ваду лічылі магутным сродкам пазбаўлення ад гразі, бруду і шкодных насякомых»; «Перад святам, асабліва перад Раждаством, калі чыста-начыста прыбіралі хату, то, тым не меней, смецце не выкідалі за парог, а спальвалі ў печы на ноч ці пакідалі гэту справу да раніцы, але за парог высыпаць строга забаранялі»; «Перад Раждаством ці перад Вялікаднем, калі сама гаспадыня ці яе дочкі або нявесткі прыбіралі хату, дык смецце ніколі за парог не выкідалі. Бралі, чысценька падмяталі і спальвалі ў печы. Гаварылі, што раз агонь ачышчальны і святы, то ачысціць ён і гэтае смецце. Калі ж забываліся ненарокам, ці нехта не ведаў і высыпаў за парог, а потым нарваўся ведаючы чалавек, то, адназначна, прымушалі гаспадыню пазбіраць хоць большае са смецця і ўсё роўна спаліць у печы, а потым яшчэ і пашаптаць малітву, каб не заставалася граху»; «На Спас (Макавей) абсыпалі хату асвячаным макам, каб у гэты год у ёй не надарыўся нябожчык»; «На Макавея гаспадыня, прыйшоўшы з царквы, ішла вакол сваёй хаціны па ходу сонца, абсыпала старанна яе сцены, асабліва вуглы, асвячаным макам. Калі даходзіла да парога, то парог абсыпала тройчы, і прытым яшчэ абавязкова кланялася. Пасля такога дзеяння ўсе хатнія былі ўпэўнены, што на гэты год ніхто з іх не памрэ. Нават моцна хворых пераконвалі ў гэтым. Праўда, як ведаеце, мала чым, мабыць, гэта дапамагала, бо людзі як паміралі, так і паміраюць».

Хату ж таксама браліся будаваць добра ўсё прадумаўшы, прааналізаваўшы, узважыўшы ўсе станоўчыя і адмоўныя акалічнасці, каб потым не давялося шкадаваць аб паспешным выбары, напрыклад, месца для будаўніцтва. «Калі збіраліся хату рабіць, то бралі крыху жыта і насыпалі чатыры гурбачкі ва ўяўных кутах будучага будынка. Калі прыходзілі праз ноч, а збожжа высыпалі з вечара і бачылі, што ўсе кучкі параскіданы, усё роўна, як некім разгрэблены спецыяльна, то тут, лічылі, хату нельга рабіць. На гэтым месцы была сама нячыстая сіла, яна тут раскашавала, яна і пагрэбла збожжа, пакінуўшы свае таемныя знакі на ім. Калі нехта не паслухаецца і ўсё ж пабудуецца на такім месцы, то потым ўвесь час у ягонай хаце будзе весціся праява нячыстай сілы, якая стане перашкаджаць у любой хатняй ці гаспадарчай справе. Нямала яна нашкодзіць і жывёле, і людзям таксама»; «Перад тым, як збіраліся будаваць хату, на плануемае месца прыходзіў хто-небудзь з майстроў, якія ў гэтым усім разбіраліся, і пад вечар насыпаў гурбачкі зерня па чатырох вуглах. Размерваў так, як і хаціну, а пасля насыпаў. Пры гэтым нічога не тлумачыў. Зрабіўшы сваю справу, ішоў дамоў. Раніцай прыходзіў зноў і старанна аглядаў тыя гурбачкі. Углядваўся пільна, стараючыся заўважыць якія-небудзь знакі. Калі знаходзіў што-небудзь, дык адразу сцвярджаў, што, маўляў, тут будаваць хату нельга. Месца гэтае, аказваецца, пазначана ўжо самой ведзьмай ці нячыстай сілай. Пакідаючы свае знакі на гурбачках зерня, нячыстая сіла папярэджвае, што гэта яе тэрыторыя і тут болей нікога яна трываць не стане. Калі ж знакаў не было, то чалавек уздыхваў свабодна і казаў, што ніякіх страхаў тут не будзе. Месца падабрана ўдала і можна прыступаць да будаўніцтва».

Далей – болей! «Збіралася талака ці наймалі майстроў і будавалі хату. Знізу клалі дубовыя падваліны, якія ляжаць маглі там па некалькі стагоддзяў і пры гэтым не гнілі. Спераду хаты, у правым вуглу, як уваходзіць у дзверы, клалі грошы на дубовае бервяно (падваліну), каб у доме жылося заможна і багата. Далей клалі сасновыя ці яловыя бярвенні. Калі складуць хату, паставяць кроквы, на самым перадзе кроквaў, спераду хаты, прывязвалі некалькі жытніх каласкоў разам з травою і палявымі кветкамі, каб у хаце заўсёды быў хлеб і весела жылося. Некаторыя называлі гэта яшчэ хатнім абярэгам». Калі рабілі хаціну, то ў абавязковым парадку

пад правы вугал, пад дубовую падваліну, клалі грошы. Няхай сабе самыя дробныя. Абы толькі пакласці, бо гэта азначала, што ў новай хаце людзі стануць жыць надта багата. Вядома ж, кожны хацеў сабе дастатку, таму і распытваўся ў старэйшых, як жа гэта зрабіць, каб багацце прыцягнуць у сваю хату. На кроквах, у нас называлі на каньку, прыбівалі ці прывязвалі невялічкі букецік з каласкоў жыта, травы і кветак. Такі букецік павінен быў, па першым часе, залагодзіць хатніка, які пасяляўся адразу ж пасля таго, як крылі страху. Цяпер ён назаўсёды ўжо злучаўся з новай хатай. Калі яна гарэла, то і дамавік пакутаваў, калі ў ёй усё добра ішло, дык і ён рады быў».

Час засялення ў новую хату таксама быў строга рэгламентаваны. У асноўным, яго прымяркоўвалі да асвячэння будынка. Калі гэта адбывалася, тады думалі, што наступала найлепшая часіна пераступіць парог новага будынка. У новую хату не засяляюцца да таго часу, пакуль бацюшка не асвенціць яе. Калі хату асвенцяць, то адразу ж заносяць хлеб і соль, упускаюць ката ці кошку (на ноч), каб нячыстая сіла не засялілася ні ў якім разе. Калі ж яна паспявала пасяліцца, дык палохаючыся кацінага духу, выбіралася назаўсёды прэчкі. А ўжо на наступны дзень ішлі і пасяляліся жыць у новай хаце. Такі ў нас трымаўся раней звычай»; «Абавязкова глядзелі, каб перад пачаткам прыйшоў свяшчэннік і пасвяціў новую хату. Гаварылі, што калі так не зробіш, то ў ёй ніколі ладу не стане і жонка з мужам будуць калаціцца ўсё жыццё, а калі дзеці падрастуць, то і яны ніколі не будуць слухацца сваіх бацькоў. Калі ён пасвяціў і пайшоў, то пасля гэтага гаспадыня ўносіла у хату акрайчык хлеба і соль. Да гэтага ж яшчэ прыносіла і клала ў пячную кубачку вугольчык, каб ён хоць патух у новай ужо хаце. Пускалі праз парог ката, каб гэты кот паначаваў першую ноч у хаце. Раз кот вытрымае там усю ноч, то затое, не вытрымае ніякая нячыстая сіла, якая б моцная яна ні была. Усе дэманы надта ката баяцца. На наступны дзень, ад самае раніцы, гаспадыня вяла сваіх родных у новае памяшканне. Урачыста ўсё рабілася, радасна. Самі апраналіся па-святочнаму, хораша вельмі, каб дамавіку спадабацца, каб суседзі пабачылі ды пазайздросцілі, бо ж у новую хату не часта ўбірацца даводзіцца».

Ужо перайшоўшы ў новую хату, людзі па-ранейшаму асцерагаліся ўсемагчымых адмоўных праяў, няхай сабе іх звязвалі з наканаванасцю лёсу ці з разгулам нячыстай сілы або, як любілі паўтараць продкі, разгулам чарцей. Здавён павяліся многія тлумачэнні адносна таго ці іншага дзеяння. Баяліся, каб не вылезла бокам нейкае перайначванне ці непаслухмянства. «Нельга свістаць у хаце ні ў якім разе! Бо гэтым свістам чалавек заклікае да сябе чарцей. Тады ў ягоным будынку стануць раскашаваць нячысцікі. Раней за такое вельмі моцна сварыліся і каралі»; «Надта старэйшыя людзі сварыліся на малых ці на маладзейшых за тое, што тыя пачыналі ні з таго ні з сяго свістаць у хаце. Гаварылі, што ўсе чыста чэрці на такі свіст злятаюцца ў гэтае месца. Асабліва яны раскашуюць пад час якога вялікага ветру, навальніцы ці буры. Тады ў коміне так ужо вые-стогне, што ажно на печы страшна ляжаць. Пра зімовыя сцюжы ды завеі і гаварыць не даводзіцца, бо тады яшчэ горай гаспадарам даводзілася з-за чыёйсьці дурноты».

Зноў жа, вельмі дбалі пра свой дабрабыт і багацце, каб яно, ненарокам, не збегла за парог. «Калі месці хату двума венікамі адразу, то ніколі ў ёй дабра не будзе, ніякая заможнасць тут не завядзецца»; «Нельга падмятаць хату двума венікамі, адначасова трымаючы іх у руках, бо ўсё багацце вымецеш і ніколі гаспадар багатым не стане. Нават калі хто і адмаўляўся, што трымае не два венікі, а ўсяго пару розак з другога, то і гэта не дапамагала. Не выратоўвала». Асабліва дбалі пра дзяўчат. Яно і зразумела, як даўней пацвярджаць любілі, – хлопец сабе пару заўсёды знойдзе, а вось у дзеўкі – век кароткі. Не паспела замуж выйсці, то няхай радуецца, калі ўжо потым яе які-небудзь удавец возьме і яна спазнае радасць сямейнага жыцця. Таму і сачылі, каб дзяўчаты, найперш, усё чыста выконвалі, як і водзіцца. «Дзяўчына не павінна вымятаць смецця праз парог, а павінна сабраць яго і выкінуць, бо ў адваротным выпадку замуж так ніколі і не выйдзе»; «У новай хаце, калі дзяўчына падлогу падмятае, дык павінна памятаць заўсёды, што смецце, якое сабралася, нельга ёй за парог выкідаць. Лепей за ўсё спаліць у печы ці няхай паляжыць да раніцы, ці каб гаспадыня яго цераз парог прыбрала. Раз дзяўчына не паслухаецца і зробіць насуперак усяму, па-свойму, то замужам ёй не быць».

Людзям, якія пакутавалі ад ўсемагчымых захворванняў скуры, раілі наступнае: «У Чысты чацвер (перад Вялікаднем) людзі, якія хварэлі кожнымі захворваннямі, запрагалі сваіх коней яшчэ да ўсходу сонца, абавязкова бралі з сабою кажухі. Ехалі на рэчку. Пры гэтым хворы абавязкова садзіўся ў павозку. На беразе рэчкі хворы распранаўся дагала і акунаўся ў ваду разам

з усходам сонца. Пасля гэтага хворага закручвалі ў кажух і везлі назад дамоў. Потым, на працягу двух дзён, да самога Вялікадня, хворы нічога не еў. Гэта азначала, што ён два дні галадаў. Кароста, воспа і іншыя захворванні праходзілі. «Больш проста здароўе жадалася наступным чынам: «У Вербную нядзелю гавораць: «Вярба хрэс! Не я б'ю – вярба б'е», – і тройчы сцябалі галінкай асвячонай вярбы сустрэтага чалавека».

Хваляваліся за людзей, але ніколі не забываліся і пра сваю жывёлу, пра вядзенне гаспадарчых спраў. А як жа без гэтага? Не павядзецца жывёла, дык і людзі на сабе ўсялякую псоту адчуюць, стануць хварэць, перажываць па-пустому, хвалявацца, не будзе спорнасці ў любой справе і г. д. Вельмі ж даражылі каровамі. Асабліва гаспадыні, для якіх кароўка была ледзьве не роднымі ці якімі сяброўкамі. На іх трымалася вера ў тое, што дзеці вырастуць, акрэпнуць толькі дзякуючы малаку, а хворыя паздаравеюць зноў жа дзякуючы ўсё таму ж самаму малаку. Таму і глядзелі, таму і шапталі, таму і замаўлялі, каб ненарокам усяго гэтага не страціць. «Штоб карова давала многа малака, то ў Чысты чацвер бралі ваду ў тым месцы, дзе зліваюцца два ручаі ці ручай і рэчка. І мылі гэтай вадой вымя ў каровы. Рабілі гаспадыні гэта раніцай. Вось калі сонца ўстане, то і рабілі. Стараліся, каб як мага меней людзей такую справу бачылі, каб ненарокам не сурочылі. Баяліся чужога дурнога і зайздроснага вока. На карову яно вельмі лёгка клалася. Асабліва зайздрасць»; «Чысты чацвер ён жа не толькі для людзей, але і для жывёлы існаваў таксама. Гаспадыні набіралі ваду звечара у сутоцы двух ручаёў ці рэчак і прыносілі яе дамоў. На наступны дзень, у той жа самы Чысты чацвер, з самае раніцы, калі ішлі даіць каровак, то ім старанна мылі запасенай вадой вымя. Тады былі ўпэўнены, што кароўкі не будуць хварэць і малако іхняе будзе смачнае і тлустае, а вядзьмарскія штучкі ўвесь гэты год не будуць даймаць іхнюю жывёлу». Ці такое вось сведчанне: «Ведзьмы адбіраюць у кароў малако. У купальскую ноч збіраюцца яны на лугах цэлымі гуртамі, голыя ходзяць па траве, размахваюць кашулямі ці анучамі, пры гэтым абавязкова прымаўляючы: «Малако з кветак чырвоных, жоўтых, белых, сініх, плыві да нас!» Потым анучамі збіраюць расу з траў і гавораць: «Няхай з вады малако будзе!» У гэтую ноч збіраюць яны таксама розныя зёлкі». У некаторых выпадках яшчэ больш канкрэтызавалі тое ці іншае дзеянне: «Калі карова скубяне травы, дзе збіралася раса, то яна страціць малако. Таму ў гэты дзень выганяюць скаціну на пашу тады толькі, калі раса ападзе. Маецца на ўвазе Чысты чацвер».

Спрактыкаваныя вяскоўцы падмячалі ўсемагчымыя драбніцы, якія далёка не кожны чалавек мог заўважыць. «Карову трэба купляць з вяроўкаю ад прадаўца, каб жывёла вялася, каб прыжывалася добра на новым месцы: не рыкала, не кідалася, падпускала да сябе новую гаспадыню»; «Добры чалавек, то ведае, што калі карову купіў, дык неабходна яе дамоў весці за вяроўку старога гаспадара. Той чалавек таксама павінен быць у курсе такой справы і не браць за вяроўку нейкай платы ці якога яшчэ барышу. Гаварылі яшчэ, што былому гаспадару нельга шкадаваць прададзеную жывёліну, бо яе могуць потым назад прывесці. Проста яна стане рыкаць, кідацца, не есці на новым месцы, будзе спрабаваць ударыць гаспадыню, малака амаль не даваць, а якое і ўдасца выдаіць, дык нагамі падбіваць стане і павылье. Любы сталы чалавек раней ведаў падрабязнасці такога гандлю і выбіраўся на продаж ці на куплю вельмі адказна».

Калі гаспадары станавіліся на ногі і ўсё ў іх ішло спраўна, то яны гэтым вельмі заўсёды даражылі. Пры любым выпадку навучалі і сваіх родных, але менш спрактыкаваных у такіх тонкіх справах людзей. «Акрамя гаспадыні ніхто не павінен падыходзіць да апаросненай свінні першыя тры дні. Тады свіння будзе парасіцца па тры разы на год, а парасят будзе мець не меней дзесятка за адзін раз і расці яны будуць хутка і здаровымі. Таму і баяліся, каб чужыя вочы не глядзелі на паросную свінню, не накладвалі на яе свае чараванні»; «Нават да пароснай свінні сам гаспадар першыя тры дні пасля апаросу не прыходзіў. Усім апекавалася ягоная жонка. Пра чужых людзей тут увогуле не выпадала нічога гаварыць. Баяліся, што гляне хто-небудзь злым вокам, і ўсё на гэтым. А так былі перакананы, што раз толькі жонка ў першыя тры дні падыходзіць, то свіння будзе парасіцца па тры разы на год. Пра такі паварот справы вяскоўцы ведалі і стараліся лішні раз каля хлявоў не круціцца, каб ненарокам не нарвацца на якую-небудзь непрыемнасць. Мала таго, што слова дрэннае ў свой адрас можна было пачуць, то вельмі лёгка і ў каршэнь было атрымаць ад раззлаваных гаспадароў. Асабліва ад тых, у якіх свінні на гэты час хварэлі ці не вяліся». Найбольш асцярожныя сяляне ішлі яшчэ далей у сваіх перасцярогах: «Калі свіння апаросіцца ў першы раз, парасят тады нельга ні прадаваць, ні дарыць, а то ў двары ад гэтага

перавядуцца свінні»; «У нас дзед, які жыў на сваім хутары і меў вялікую сям'ю, то парасят увогуле нікому і ніколі не прадаваў. Калі пыталіся, чаму ж ты, маўляў, так робіш, то і ён адказваў хітравата, спасылаючыся на тое, што самім есці многа трэба. Апарасілася свіння, дык увесь чыста вывадак пакідалі на свае адныя патрэбы. Таму і есці, і піць у іх заўсёды хапала. Дзед сцвярджаў, што на грошы ад свіней многа не накупіш, а на саміх свіннях на кірмашы не заробіш. Суседзі яшчэ пра яго гаварылі, што ён быццам бы крыху знахараваў і ведаў словы, якімі можна было лячыць жывёлу. Таму ў яго ні каровы, ні свінні ніколі і не хварэлі. Праўда, калі людзі звярталіся за дапамогай, то ён не адмаўляў ім. Памятаю, адной удаве нават парася падарыў. Праўда, парася тое было не малое. А сапраўдны падсвінак. Таму дзед, мабыць, ужо і не баяўся. Шкада яму стала бедную жанчыну, якая адна сама дзяцей гадавала, то і падарыў».

Глядзелі за жывёлай, хатняй птушкай, але ніколі не забываліся пра тое, што многае з раней сустрэтага і зафіксаванага магло ўказваць і на трагічныя падзеі сярод вяскоўцаў. Вядома ж, самае страшнае тут было тое, што нейкаму чалавеку была прадвешчана смерць, а ў пэўны момант нейкія прыродныя стыхіі ці паводзіны ўсё тых жа птушак і жывёл маглі лішні раз на гэта ўказаць: «Хто ўбачыць вясёлку зімой на небе, у таго хутка памінкі ў хаце па блізкаму чалавеку будуць»; «Калі зімою навальніца вялікая надарыцца, то для многіх людзей, няйначай, вайна будзе, а калі нехта заўважыць у час той навальніцы на зімовым небе вясёлку, то ў таго ў хаце нябожчык неўзабаве будзе»; «Калі сабакі пачынаюць выць без дай прычыны, то могуць наклікаць смерць ці якое іншае вялікае гора на гэты падворак. Каб такога не адбылося і сабакі перасталі выць, трэба які-небудзь хатні посуд перавярнуць дагары нагамі»; «Раз сабакі пачыналі выць, задраўшы морды ўгору, то трэба было чакаць нябожчыка, які ў гэты час ужо адыходзіў і ягоная душа пакідала свет белы. Сабакі вельмі ж чуюць гэта і ад іх нябожчыка ніколі не схаваеш. Не раз гаварылі, што сабакі свайму гаспадару смерць указваюць дакладна. Кожнаму страшнавата было такое выццё чуць, таму бралі і пераварочвалі якую-небудзь пасудзіну. Сцвярджалі, што ў такім разе сабакі заціхнуць і не будуць палохаць людзей сваімі дзікімі спевамі. Нейкае ж чуццё ў іх, як бачым, было, раз з даўніх часоў людзі ўсё гэта сталі прыкмячаць». Нават калі чалавек паміраў, то і тут трэба было ведаць, як сябе паводзіць, каб не палохацца і каб потым можна было спакойна знаходзіцца ў хаціне ці моцна спаць начамі. «Калі паміраў хазяін і жонка заставалася адна, дык, каб не баялася, нада было адразу сесці на той стулік, дзе стаяла труна. Мёртвае ўсё роўна баялася жывога і тое, што яшчэ заставалася ў хаціне, адразу ж знікала, і жанчына магла потым спакойна і надалей быць ва ўласнай хаціне, дзе яе ўжо нішто болей не магло палохаць». Калі праводзілі памерлага ў апошні шлях, трэба было захоўваць традыцыю, нічога не парушаць, не вылучацца пры гэтым, каб не трапіць на людскі язык і не паплаціцца якім горам надалей. «У час пахарон за нябожчыкам ідуць людзі, праводзяць яго ў апошні шлях. Не абганяй і не праязджай на машыне ці на кані міма працэсіі. Калі так зробіш, то ўжо ў дарозе з табою можа здарыцца якая-небудзь бяда»; «Калі нябожчыка на могілкі вязуць, то нельга абганяць працэсію, бо, як гавораць, тады на могілкі можаш патрапіць хутчэй за памерлага. У хаце таксама нельга сядзець ці ў вакно выглядваць. Трэба абавязкова выйсці на вуліцу і хоць пастаяць на той час, калі нябожчыка правязуць ці пранясуць міма. Любы нябожчык, паводле народнага, патрабуе да сябе павагі. Раз так не зробіш, то многае ў тваім лёсе і ў лёсах тваіх родных можа перайначыцца. Здавён такое вядзецца і маладых навучаць неабходна. Нясуць чалавека ў апошні шлях, то трэба і шапку мужчыне зняць, і галаву схіліць, і перажагнуцца. Жывым – жывое, а вось мёртвым – ім жа таксама пэўная павага неабходна».

Чалавек працы, які ашчадна адносіўся да свайго зямельнага надзела, бо вельмі многа ён у яго і ягоных родных забіраў сілы і здароўя, стараўся, каб усё, што было пасеяна ці пасаджана, давала добры ўраджай. Інача навошта было зямлю дарма нагружаць? Нядбайныя адносіны да зямлі-карміцелькі былі недапушчальныя ў старадаўняй сялянскай маралі. «Перш чым пасадзіць дрэва, спачатку выкопваюць амаль што мятровую ямку, потым на дно яе кладуць гліну (недзе з вядро, каб яна там пастаянна вільгаць утрымлівала), на гліну сыплюць збожжа (жыта ці пшаніцу) ці асцярожна, перад гэтым пацалаваўшы, кладуць скарынку хлеба, а таксама кладуць тры медныя манеты. Толькі пасля ўсяго гэтага ставяць саджанец, засыпаюць зямлёю і добра паліваюць. Верылі, што калі ўсё менавіта такім чынам зрабіць, то гэтае дрэва будзе даваць заўсёды шчодры ўраджай і пладаносіць будзе да самай сваёй старасці»; «Калі які гаспадар жадаў пасадзіць яблыню, ігрушу ці вішню, то ўсё рабіў, як было ў нас заведзена спрадвеку: спачатку капаў ямку,

каб дрэўцу было і глыбока, і свабодна расці. На дно насыпаў гліны і разраўноўваў яе па ўсёй ямцы. На гліну насыпаў пару жменяў зерня пшаніцы ці жыта або нават ячмяню. Калі жыта не было, ці не жадаў сыпаць, то за прасцейшае рабіў наступнае – клаў скарынку хлеба. Не кідаў, а менавіта клаў, перад гэтым пацалаваўшы. Некаторыя, дык і малітву над хлебнай скарынкай шапталі. У абавязковым парадку трэба было кінуць і тры медзяныя капейкі. Некаторыя гаварылі, што гэта для багацця. Не, гэта для таго, каб дрэва не хварэла і плады ягоныя заўсёды былі чыстыя і не чарвівыя. Медзь адпалохвае шкоднікаў. Зрабіўшы так, ставілі саджанец, засыпалі яго і потым добра палівалі, каб ажывіць і глебу, і карэньчыкі, каб яны за зямлю ўхапіліся». Раілі народныя дарадцы аберагаць фруктовыя насаджэнні і іншым шляхам: «Адзінаццатага студзеня, пасля палудня, скручваюць перавясла з жытнёвай саломы і падвязваюць імі ўсе садовыя дрэвы, каб на іх, з вясны пачынаючы, не было ні вусеняў, ні тлі. У Чысты чацвер вечарам усе гэтыя перавясла здымаюць і разам з заходам сонца спальваюць пад кожным дрэвам асобна»; «У студзені месяцы ведаючы гаспадар з самае раніцы скручваў з абмалочанай жытняй саломы звычайныя снаповыя перавяслы, але падвязваў імі свае садовыя дрэвы. Гэта рабілася для таго, каб на салому асядалі будучыя вусені і тля, каб не дабіраліся да кары і галінак дрэў. Калі надыходзіў Чысты чацвер, дык гаспадар пад самы ўжо вечар ішоў у сад, развязваў тыя перавяслы і спальваў пад кожным дрэвам. Так, думаў ён, і дрэвы будуць здаровыя, і садавіна – чыстая і не чарвівая».

Многія павер'і былі прымеркаваны да канкрэтных рэлігійных свят і асацыіраваліся іменна з імі. «За нядзелю да Вялікадня адзначаецца Вербніца. Раніцай у нядзельку неслі ў царкву вярбу, там яе асвячалі, а потым з асвячонымі ўжо галькамі прыходзілі дамоў. Вярба стаяла ў хаце да Чыстага чацвярга. У Чысты чацвер, з усходам сонца, вярбу затырквалі над дзвярыма ў хляве, дзе стаяла карова. Там вярба заставалася на ўвесь год, да наступнага Чыстага чацвярга. Калі карову вясною першы раз выганялі на пашу, то бралі гэтую галінку і сцябалі ёю жывёліну. Потым зноў заторквалі за дзверы, толькі ўжо з адваротнага боку»; «Кожная гаспадыня выдатна ведала, што асвячоную вярбу трэба заторкваць у Чысты чацвер за дзверы ў хлеў, дзе ў яе стаяла жывёла. Гэта асцерагала жывёлу ад хвароб, а саму будыніну – ад пажару. Калі карову выганялі першы раз на пашу вясною, то кожная гаспадыня, зноў-такі, павінна была сцёбнуць той галінкай жывёліну пару разоў і заторкнуць вярбу назад за дзверы. Толькі ўжо з адваротнага боку хлява».

Многа шкоды прыносілі мышы, таму любым чынам імкнуліся ад іх пазбавіцца, бо грызуны значна скарачалі восеньскі здабытак любога вяскоўца. «У суботу перад Сёмухай ламалі голле бярозы, клёна, ліпы, бэзу. Уторквалі іх па хатах за абразамі за шалёўкамі, а з вуліцы – над вокнамі. Перад вокнамі ў двары ставілі маладзенькую бярозку. Праходзіў тыдзень. У суботу абразалі галінкі і клалі іх на таку, дзе складвалі сена для жывёлы. Гэта рабілі для таго, каб тут болей ніколі не вадзіліся мышы і іншыя грызуны». «Перад Тройцай у нас некалі старэйшыя прыносілі з лесу ці адкуль яшчэ ссечаную маладую бярэзінку і ставілі яе насупраці акон. Так яна стаяла цэлы тыдзень. Глядзелі, каб малыя з яе лістоў не абрывалі і не павалілі, бо гэта тады лічылася за грэх. Калі ж праходзіў тыдзень, то з яе вострым нажом зразалі ўсе чыста галінкі і неслі ў тыя мясціны, дзе найбольш надакучалі мышы і пацукі. Звычайна, у першую чаргу, на ток, дзе потым клалі сціртy снапоў і малацілі збожжа, ды яшчэ ў засценак ці ў які-небудзь паддашак, дзе складвалі на зіму сена. Калі там убіваліся мышы, то за зіму перамалочвалі ўсё дазвання на адну пацяруху. Вядома ж, любому гаспадару гэта вялікая патрава, ад якой і скаціна галадаць стане, і людзям дастанецца». Кожнаму, канешне ж, карцела, каб жыта ў новым годзе было намнога лепшае і ядранейшае, чым у мінулым, каб ураджай быў на зайздрасць усім. І тут раілі многае: «На Вялікдзень крышачкі асвечанага хлеба ці караваю і шкарлупінне чырвоных яек не выкідваюць са смеццем, а старанна збіраюць. Перад сяўбой збожжа гэта ўсё прыносяць на сваю ніўку і закопваюць у зямлю, каб ураджай быў добрым»; «Калі за тыдзень да Благавешчання прыляціць бусел, то ў свірне на засек неабходна пакласці дошку – тады поўна гэтаксама і на пашні будзе. Ураджай слаўны ніва прынясе. А як бусел прыляціць пасля Благавешчання, дык гаспадару трэба здымаць дошкі з засекаў, бо ўраджаю добрага ў гэтым годзе не будзе». «Здаўна ў нас гаварылі, што калі бусла ўбачаць перад Благавешчаннем, дык, значыцца, гэты год выдасца спрыяльны на ўсялякі ўраджай, усё добра ўродзіць. Праўда, гаварылі таксама, што калі бусла заўважаць пасля Благавешчання, то на нешта спрыяльнае ў полі ці на лузе спадзявацца не даводзілася. Будзе неўраджай. Нічога ты не пераменіш, нічога ты не пераробіш. Так спрадвеку казалі. «Падкрэслівалі, здавалася б, самае і самае непрыкметнае. Але гэта толькі для

неспрактыкаванага вока. У астатнім жа ўсё было вядома па даўніх звычках». Калі садзіш бульбу, то ў канцы першай баразны, абавязкова спыніся, азірніся і перахрысціся на поўдзень. Потым можаш смела працягваць займацца пасадкай бульбы далей. Ураджай на гэты год табе ўжо гарантаваны». Вяскоўцы баяліся засухі, але і глядзелі, каб не надта мачыла, і хоць не ад іх усё гэта залежала. Тым не меней, стараліся прытрымлівацца даўнейшай завядзёнкі. «На святую Макрыну нельга палоць грады, таму што ўсялякая гароднiна вымакне ад вялікіх дажджоў»; «На Макрыну, нават калі выпадкова пойдзеш у агарод, ўбачыўшы якое каліва зелля, не старайся яго рваць. Няхай лепей зробіш гэта ў другі які дзень. Не ўздумай нічога палоць, бо, калі зробіш па-свойму, то ўсё ў тваім агародзе ці вымакне, ці падгніе, але ўраджаю добрага тады ўжо не чакай ні ў якім разе».

Сустракаюцца і даволі арыгінальныя запісы, якія нам раней не трапляліся. «Першы агурчык на градцы вясной павінен пасадзіць мужчына. Тады ад гэтага вырастуць вялікія агуркі і будзе добры ўраджай»; «Вясною, калі жанчына сее агуркі, то яна просіць свайго мужа, каб ён кінуў першае зернейка. Тады і ўраджай вельмі ўдасца. Яшчэ гаварылі, што і сарваць першы агурок з градкі абавязкова павінен мужчына. Тады агуркі не будуць горкія, і іх будзе зашмат». «Дзяўчына есць гатовае цеста, што засталося ў дзежцы пасля таго, як замясілі і паставілі ў печ хлеб. Адназначна сцвярджалі, што гэта вельмі дапамагала яе поспеху ў хлопцаў і яна тады ніколі не засядзіцца ў дзеўках-векавухах». Часам папярэджвалі пра вельмі небяспечнае, непажаданае, адмоўнае: «Калі пасля заходу сонца пачаць новую буханку хлеба і пакласці яе на стале – быць хутка ў хаце нястачы»; «Нельга пасля таго, як зойдзе сонца, пачынаць буханку хлеба. Няхай сабе і вельмі есці хочацца. Перабіся чым-небудзь іншым. Хапані якую цыбуліну ці агурок, але хлеба не чапай. Раз так зробіш, то хутка ў гэтай хаце надарыцца нястача або голад. Яшчэ перад гэтым будуць моцна шкрэбціся, а потым раптоўна знікнуць мышы, бо яны голад чуюць наперад».

Гаварылі і пра тое, што многае залежыць ад кананічнага захавання традыцыі, каб нішто, нават самай дробяззю, не адрознівалася ад мінулага, ад таго, як было раней: «Калі рыхтуюць куццю на Каляды, то на кожныя тры куцці ў гаршчок кладуць аднолькавае зерне. І рыхтаваць усе тры разы павінна адна і тая ж жанчына. Калі пярэймецца нехта іншы, то год будзе благім і дрэнным»; «Калі куцця ў гаршку паднялася за край, год будзе вельмі ўраджайны на зернавыя, хлебныя расліны»; «Калі куццю ядзяць, дык бяруць лыжкай не з сярэдзіны, а з краёў, нібы з павагай вялікай адносяцца»; «З якою куццёю Каляду сустрэнеш, то такі год табе і надасца. Ці багатым будзе, ці бедным. Але ўсё па тваёй неахайнасці, па тваёй уласнай віне».

Вельмі асцерагаліся і баяліся і іншага – каб якім лішнім словам або нават благой думкай не нашкодзіць каму-небудзь з людзей. Таму дзейнічалі па прынцыпу – многа разоў лепей падумаць, чым адзін раз усяго сказаць і потым не ведаць, як жа выкручвацца са створанага становішча. «Калі кажуць што-небудзь непажаданае пра чалавека, якога няма тут зараз, але затое жадаюць, каб з ім нічога не адбылося, то гавораць: «Як ён не чуе нас, дык няхай яму не шкодзіць нішто і ніколі». А калі называюць у хаце чорта, бо некаму так ужо прыспічыла, то каб не прыпёрлася нячыстая сіла, у хаце прамаўляюць: «Не ў гэтым свячоным месцы ўспамінаючы»; «Няма чалавека ў хаце пад час гутаркі і яго нечакана прыгадалі, то той, хто згадаў ягонае імя, адразу ж стараецца нібы замацаваць дабрату сваіх слоў – пацвярджае, лішні раз паўтараючы, што жадае таму чалавеку толькі дабра і шчасця, толькі добрага шляху-дарогі ці спакойнага адпачынку. Лічылася грахом прыгадаць некага і не пажадаць яму дабра. Тады маглі проста сказаць, што такі вясковец знахарыў супраць свайго суседа, аднавяскоўца або і роднага яму чалавека. Яшчэ вельмі цікава паводзілі сябе, калі, напрыклад, нейкім манерам даводзілася гаварыць пра нячысціка. То тут ужо ўсе аднагалосна сцвярджалі, каб нячыстай сілай і не пахла, што чарцей у гэтым асвячоным месцы ніколі не было і не будзе, бо тут сядзяць людзі хрышчоныя, якія нячысцікам раднёю не даводзяцца і з імі хаўрусу не вядуць. Калі так прамаўлялі, то яшчэ ў абавязковым парадку і жагналіся, каб зацвердзіць праўдзівасць і святасць сваіх слоў».

Не забываліся на Лагойшчыне згадваць і пра тое, што сяляне ведалі, як можна дадаць сабе сілы, як заставацца на працягу ўсяго жыцця (года, месяца) моцным і вынослівым. Таму старэйшыя даводзілі маладзейшым: «Хто хоча быць моцны на ногі ўвесь год, той павінен прабегчы ў бок бусла, калі ўбачыць яго першы раз вясною. Калі хто ўбачыць першы раз бусла вясною ў спакойным стане, той увесь год будзе слабы на ногі, стане адчуваць у іх знямогу і боль, а гэта значыць, што будзе вельмі стамляцца ад хады»; «Вясною, калі чалавек хоча на ўвесь год заставацца рэзвым і здаровым, то яму неабходна пільнаваць прылёт буслоў. Як толькі ўбачыць

дзе птушку, дык павінен прабегчы ў яе бок некалькі дзесяткаў крокаў. Сцвярджаюць, што тады бусел перадасць таму ўдзячнаму чалавеку сваю сілу, якую прынёс на крылах з далёкага заморскага выраю. Калі чалавек убачыў стаячую, нерухомую птушку, то яму ў такім выпадку да яе лепей не бегчы. Стаячы бусел, паводле народнага, прадвяшчае не самае лепшае. У чалавека, які пабег да яго, на працягу года будзе знямога ў нагах, будзе надта ламіць паясніцу і пры хадзьбе ён заўсёды стане адставаць ад іншых. Таму заўсёды неабходна было дзейнічаць пільна, каб не памыліцца, каб потым вяскоўцы не смяяліся, не торкалі пальцамі, што, маўляў, нічога не ведае і сам сабе за хваробай бегаў. Асабліва падвучвалі маладзейшых, каб яны за бусламі бегалі, каб ногі іхнія пастаянна мацнелі, бо за доўгае жыццё ім многа давядзецца пахадзіць».

Нават рэчы ў хаце ці на падворку стараліся раскладваць ці захоўваць у заведзеным парадку, нічога не перайначваючы, бо такое адхіленне ад устаноўленай нормы магло потым азначаць нейкую непрыемную навіну для чалавека. «Звычайна ключы не прынята класці на стол і на лаўку, таму іх вешаюць у дамоўленым месцы на сцяне, трымаюць на поясе ці ў кішэні, але калі, забыўшыся, хтосьці пакладзе ўсё ж ключы ў хаце на стале, то ў той жа дзень у хаце павінна адбыцца буйная спрэчка паміж мужам і жонкай ці паміж іншымі людзьмі, якія жывуць у гэтай хаце»; «Ключы ад хаты вяскоўцы заўсёды захоўвалі ў дамоўленым месцы. Павінны былі ведаць, што яны там знаходзяцца усе з хаты, акрамя найменшых дзяцей, якія яшчэ ні за што не адказвалі і маглі прычыніць усялякае глупства. За іх проста адказвалі старэйшыя і пастаянна сачылі за імі. Нельга было таксама ключы класці пад парог, бо гэта лічылася гаспадаркай дамавіка, і ён мог пакрыўдзіцца, што ў ягонай гасподзе нехта паклаў свае ключы. Тады ён адмовіцца апекаваць гэтай гаспадаркай, стане надакучаць начамі, будзе ўсяляк перашкаджаць у якіх справах. Ключы звычайна вешалі на сцяне пад якім прычындаллем, пад вопраткамі ці пад якімі вянкамі. Ні ў якім разе не давалі класці ці кідаць ключы ад хаты на стол. Калі паклаў нехта, то ў доме абавязкова будзе спрэчка, а калі нехта кінуў, дык тут адбудзецца спрэчка з бойкай. Таму ўсяго гэтага асцерагаліся. Мала што язык ляпнуць можа, а кулакі закрануць».

Гэтымі ж гаспадарчымі прыладамі ці тым, што заўсёды знаходзілася пад рукамі, як лічылі ў народзе, можна было спыняць, выклікаць і ўтаймоўваць самыя моцныя прыродныя стыхіі. З іншага боку, калі, напрыклад, доўга не было дажджу, то выклікаць яго таксама ведалі як. «Калі даўно не было дажджу, то збіраліся вясковыя жанчыны і ткалі палатно ці проста бралі ў кагонебудзь вялікі кавалак палатніны і рассцілалі на перакрыжаванні дарог. Гаварылі, што тут сыходзіліся не толькі дарогі, але і вятры таксама. Таму, як адзначалі ведаючыя людзі, праз некалькі дзён павінен сыпануць дождж»; «Каб пайшоў спорны дожджык, лічыцца неабходным кінуць у калодзеж жменю свежага моху, нарванага ў даліне, а таму – вільготнага, мокрага. Каб з неба пайшоў моцны дождж, трэба выкінуць у двор хлебную лапату, качаргу ці памяло. Каб наступіла працяглая засуха, то трэба ўсыпаць у бліжэйшую раку жменю замоўленага маку. Такім чынам мог запроста варажыць любы вясковы чалавек, які жадаў ці дапамагчы сваім суседзям, ці, наадварот, нашкодзіць ім».

Седзячы ў хаце, вясковец таксама мог тлумачыць вельмі многае. Прычым, распавядаць і паважна, і з гумарам. Маўляў, ведай нашых! «Калі чысціш бульбу і ўпадзе з рук бульбіна, – чакай у хуткім часе ў госці жанчыну; калі ўпадзе з рук нож, – то чакай, адпаведна, у госці мужчыну»; «Калі чысціш бульбу і ўпусціў з рукі бульбіну, то чакай неўзабаве цераз парог госця пераваліцца, а калі ненарокам выпаў нож, дык мужчына ў госці прыйдзе. Так даўней гаварылі. Зараз мала хто ў такое вось верыць, а тады то нават у вокны пазіралі, хто ж на самой справе адведае».

Гаварылі і пра многае іншае, якое таксама нібыта сыходзіла з багатых назіранняў ды з багатага практычнага вопыту: «На Шчадроўку ўвечары наразаюць хлеб на ўвесь наступны дзень, каб потым з-за гэтага цэлы год не рэзаць нічым вострым ні рук, ні ног»; «На Шчадрэц гаспадар з вечара самага рэжа хлеб і на наступны дзень. Накроіць яго лустамі, на ручнік накладзе і гэтым жа ручнікам закрые. Рабілася такое для таго, каб потым на працягу цэлага года з родных у хаце ніхто не рэзаў рук і ног»; «На Шчодры вечар, добра памятаю сама, наш бацька заўсёды рэзаў хлеб і на наступны дзень. Яшчэ нешта пры гэтым і прымаўляў. Хлеба нарэжа, папрыкладвае лустачка да лустачкі і ручнікам накрые. На стале так і заставаўся. Гэта баяліся, каб потым не рэзаць ні рук, ні ног на працягу цэлага года, ажно да наступных Шчадровак»; «На каляднай вячэры ядуць хлеб асцярожна, стараючыся не рабіць крышак, бо верылі, што з-за гэтага не стануць пладзіцца ў гаспадарцы авечкі»; «Калі вячэралі на Каляды, то глядзелі, каб з

каляднага хлеба не сыпаліся крошкі. Калі заўважалі што такое, то старэйшыя адразу ж збіралі іх у руку і, перахрысціўшыся, елі. Калі так не зрабіць, дык казалі, што ў гэтым годзе на падворку не будуць весціся авечкі, проста не стануць пладзіцца і ўсё на тым»; «Калядная вячэра была ў многім святочнай, а ў многім – варожачай, прадказваючай. Таму трэба было паводзіць сябе асцярожна і рабіць усё так, як навучалі. Напрыклад, глядзелі, каб у гэты вечар з хлеба не сыпаліся крошкі. Калі гаспадар ці гаспадыня гэтага не рабілі, а, значыцца, акуратна нарэзалі хлеба, то ў іх у гэтым годзе будуць пладзіцца авечкі, а калі наадварот, то – не. Апошняга вельмі баяліся, бо авечкі давалі значны прыбытак у любой сямейцы»; «Калі гаспадыня стане нешта шыць на Каляды, няхай сабе самае нязначнае, самае неадкладнае, то прынясе шкоду сваім свінням. У іх парасяты не будуць мець выхаду»; «Раз гаспадыня асмеліцца нешта шыць ці зашываць на Каляды, то ў яе парасят не будзе выхаду, а свінні ў гэтым годзе, калі і будуць парасіцца, то толькі адным ці двума парасятамі. Гэта ўсё толькі з-за шыцця, з-за аднаго яго»; «Шыць на вялікія святы, а тым болей на Каляды – забаранялася. Любая гаспадыня ці гаспадар гэта ведалі і сачылі за гэтым строга-настрога. Калі ж нехта аслухаецца і начне шыць, то ў яго парасяты ў свіней не будуць весціся і мець выхаду»; «На Каляды няможна нікому і ні ў якім разе пазычаць грошы, бо пасля гэтага ў вас саміх яны не стануць вадзіцца. Мне так наш дзед расказваў. Ён верыў ва ўсё такое і прытрымліваўся гэтага»; «На гадавыя святы, а на Каляды – тым болей, ні ў якім разе і нікому, нават сваім родным і блізкім, нельга пазычаць грошы. Гаварылі, што даўней некаторыя ішлі пазычаць спецыяльна, з зайздрасці да таго ці іншага чалавека, каб яму потым не шанцавала і ў яго самога пераставалі вадзіцца грошы, каб ён згалеў і не меў болей ніколі дастатку. Таму і не давалі пазыкі на Каляды. Вяскоўцы гэта ведалі і калі што якое і бралі, дык імкнуліся да Каляд ці да якога іншага вялікага свята абавязкова вярнуць пазычанае раней, каб на іх не падумалі чаго-небудзь дурнога»; «Калі на Каляды гаспадыні прасуюць, катаюць і адбельваюць бялізну, то вецер часта за гэта будзе здзіраць стрэхі з хат і гаспадарчых будынкаў, а гром часта будзе пагрымваць над гэтымі хатамі і пагражаць агнючаю стралою»; «Каляды на тое Калядамі і былі, каб на іх ніякай работы не выконвалі. Жанчынам строга забаранялася нават прасаваць, мыць і адбельваць бялізну, бо за гэта, у пакаранне, уздымаўся заўсёды вялікі вецер, які задзіраў і скідваў прэч стрэхі з будынкаў, а маланка часта біла ў гэтыя ж будынкі і спапяляла іх дазвання».

Сярод прыкмет, зафіксаваных на Лагойшчыне, таксама многа даволі арыгінальных адзінак. Праўда, яны сустракаюцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі, што і не дзіўна для такога жанру фальклору. «Як толькі цяжарная жанчына пераступіць цераз вяроўку, нітку, галлё, хмель, вязку льну, сноп канапель ці вязьмо, шыйку ўтробнага дзіцяці абкручвае плеўка, якая бывае падобная да аднае з пералічаных рэчаў. Праз гэта ў дзіцёнка сцінаецца дух, а пад час родаў яно можа запроста і задушыцца»; «Раней цяжарнай жанчыне не давалі пераступаць праз тое, што ляжала папярок яе дарогі. Заўсёды прымушалі абыходзіць. Калі ж вымушана была ўсё ж пераступіць, дык адразу ж павінна была і перажагнуцца, каб замаліць такі грэх, якая так не зрабіла, то ў яе сярэдзіне ў дзіцяці на шыі зацягвалася нітка, якая была падобна на пераступленыя прадметы. Дзіцёнку цяжка было дыхаць, а ў час родаў ён увогуле мог задушыцца пры выхадзе і нарадзіцца бездыханным»; «У старыя часы за цяжарнымі жанчынамі многае вадзілася. Іх перасцерагалі, найперш, каб яны цяжкага чаго не падымалі і не пераступалі ніколі тое, што ляжала ўпоперак іхняй дарогі. Не паслухаецца якая, то на шыі ў дзіцёнка вяроўка зацягваецца. Прама ў утробе ў маці. Малое такое і развіваецца павольна, і нарадзіцца можа нежывым. Таму і казалі, каб цяжарныя слухаліся ва ўсім старэйшых»; «Калі цяжарная перакіне сабе цераз галаву нешта з пералічаных вышэй прадметаў, то на дзіцячай шыйцы назаўсёды застанецца шнар, нібыта ад вострага парэзу. Будзе відзен ён усё астатняе жыццё. Калі ж такога шнару няма, тады ў дзіцяці могуць быць самыя розныя недахопы: хрыпаты голас, картавасць, запаволенасць у словах і іншае, што так ці інакш мае адносіны да чалавечага горла»; «Хрыпаты голас у дзіцяці можа быць ад таго, што ягоная маці, калі ім хадзіла, без дай прычыны, любіла моцна пакрычаць. Верашчыць, выжыльваецца, старэйшых не слухаецца і не здагадваецца, што ў яе малога ўсё гэта ў будучым на здароўі абавязкова скажацца»; «Калі дзіця картавіць ці заікаецца, то ў нас так раней сцвярджалі, што гэта ў пакаранне за тое, што ягоная маці, калі ім цяжарная хадзіла, любіла вельмі з некага пасмейвацца, пераймаць ці перадражніваць. Вось і дажартавалася, што на малое дзіця, у пакаранне, ёй усё і перакінулася. Гэта людзі ведалі і казалі, штоб такімі справамі не займаліся цяжарныя, бо гэта потым адзавецца ім самім»; «Ні ў якім разе

цяжарнай жанчыне не выпадала жартаваць ці перадражніваць старых ды гугнявых людзей. Ці тых, якія ад нараджэння заікаліся або картавілі. Вяскоўцы былі ўпэўнены, што за гэта яе Бог абавязкова пакарае і яна сама займее дзіця, якое не будзе выразна вымаўляць усе гукі ці таксама стане на ўсё жыццё заікастым».

Народныя прыкметы, зафіксаваныя на тэрыторыі Лагойшчыны, можна смела адносіць да агульнавядомых. Праўда, часта сустракаліся варыянты, характэрныя толькі для гэтай мясцовасці». «Вечарам шостага студзеня сяляне абавязкова глядзяць на неба, спрабуючы па тым, што там убачаць, прадказаць ураджайнасць году. Дык вось, калі на небе зорак шмат і яны вельмі выразныя, то і год будзе шчодрым, ураджайным на садавіну і гародніну. А вось калі трынаццатага студзеня зорак на небе многа, то па мясцовых лясах будзе на летнюю пору зашмат грыбоў. Так у нас спрадвеку прыказвалі-прымаўлялі»; «На Каляды ўвечары выходзілі з хаты ўсе дарослыя і глядзелі на неба, на тое, як там размясціліся і як свецяць зоркі. Калі іх было ў той вечар занадта многа, то аднагалосна сцвярджалі, што і летам ў садах ды агародах ніякай нястачы не будзе. На гэты год яна сыйдзе ўвогуле. Калі ж на Шчадроўскі вечар было на небе многа яркіх і ясных зорак, то былі ўпэўнены, што летам па лясах нарасце шмат грыбоў і чарніц. На гэта звярталі ўвагу сталыя жанчыны, якія ўжо зведалі не раз такую прыкмету ў сваім жыцці, і яна іх ніколі не падводзіла»; «Калі на дзень святой Варвары ды стаіць добрая пагода, няма ні ветру, ні дажджу, ні снегу ці якой іншай залевы, то гаспадары былі перакананы, што гэтае лета выдасца багатым на лён – ён будзе незвычайна доўгі, валакністы і яго будзе выгодна прадаваць»; «На дзень святой Варвары гаспадыні, у першую чаргу, сачылі за тым, якое надарыцца надвор’е. Калі не будзе ні дажджу, ні ветру, ніякой іншай нечаканай нябеснай вільгаці, то радаваліся. Бо гэта вельмі добры знак – на лета пашанцуе з ураджаем лёну. Ён будзе добры і мяккі, а гэта, у сваю чаргу, вялікі прыбытак у любой гаспадарцы»; «На Варвару наша старэнькая бабулька ад самага рання прападала на вуліцы і ўсё пільна зіркала на неба, ці не відаць дзе якой-небудзь хмаркі, якая б магла прынесці нечаканы дождж, віхор ці снег. Казала, што раз добрая пагодка ў гэты дзень праcтаяла, то любая гаспадыня з гэтым днём многа прыдбала. Гэта яна сведчыла пра тое, што ўраджай лёну выдасца вельмі ўдалым».

Як бы там ні было, але ўсё ж асноўную ўвагу ў сваёй гаспадарцы сяляне звярталі на жывёлу, на яе пладнасць і захаванне маладняку. Таму многія прыкметы звязаны ў народзе менавіта з гэтым аспектам дзейнасці людзей-земляробаў. «Каб выбраць удалае парася, то неабходна была вывучыць цэлую навуку. Гаспадар праводзіў рукою па спіне парасяці. Калі спіна вострая, як шыла, а не пакацістая, то такая свіння будзе да самае свае смерці, колькі б харчоў не пераводзіла, худою, несальнай. Калі ж хвост у парасяці добра закручаны, своеасаблівым пятаком, а не прамы і апушчаны да зямлі, то яно будзе добра есці і хутка стане прыбаўляць у вазе. Лыч – круглы і кароткі, то гэта вельмі добрая парода і яе неабходна разводзіць у сваёй гаспадарцы. І яшчэ за адным сачылі: калі парася забіралі з возу, прывёзшы з кірмашу, то абавязкова бралі яго за заднія ногі і пры гэтым яшчэ стараліся захапіць якую саломку з возу, на якой парася ляжала, каб разам з гэтай саломкай занесці ў свінушнік»; «Калі гаспадар ішоў купляць парася, то стараўся параіцца з кім-небудзь са старэйшых людзей, якім давяраў і на якіх спадзяваўся, што яны дапамогуць, бо выбраць парася было не так ужо і проста, як магло падацца на першы погляд. У першую чаргу неабходна было ацаніць лычык. Калі ён у парасяці кароткі, тоўсты, то і само яно будзе добрае да харчоў. Каб спіна была доўгая і каб не выпіраў хрыбетнік, бо такая свіння ніколі сала не наесць. Абавязкова пазіралі на хвост. Доўгі і прамы азначаў не што іншае, як тое, што такое парася хутка здохне. Трэба было, каб хвост закручваўся колцам, то тады ўсё будзе ў парадку. Парася неабходна было пакласці ў воз ці ўкінуць у мех з саломкай гаспадара. Верылі, што гэтая саломка хутка прызвычаіць парася да чужога хлява і яно, адпаведна, хутка асвоіцца і будзе адразу ж набіраць у вазе»; «Раз куплялі парася, то глядзелі, каб яно не было асабліва жвавым і пісклявым, бо такім жа застанецца на ўсё сваё свінячае жыццё – не дасць спакою ні гаспадыні, ні суседскім гародам. Не столькі ад яе стане прыбытку, колькі ўсемагчымых клопатаў. Таксама сачылі за тым, каб хвост не цягнуўся да зямлі, а задзіраўся да сонца, каб закручваўся, то гэта азначала, што парася будзе добрае да ежы і хутка набярэ сваю вагу, есці будзе ўсё па парадку і ў хляве ляжаць стане ціха-мірна, асаблівых клопатаў з такой жывёлінай не стане».

Але сярод жывёл на першым месцы, як водзіцца, заўсёды стаяла карова – карміцелька і надзея любой сялянскай сямейкі, якая выручала не толькі малых, але і дарослых таксама. «Калі выбіраліся купляць карову, то гаспадар з гаспадыняй ішлі ўдваіх. Яно то і правільна, бо муж ведаў нешта сваё,

а жонка – нешта сваё, якое хавалася і існавала, як сямейная таямніца па распазнанні жывёліны на малако, на ягоную тлустаць і на нораў купленай жывёліны. Па рагах каровы меркавалі, якім будзе малако. Калі яны былі доўгія і задраныя ўгару, то лічылі, што малако ў такой каровы не тлустае, як вада. Калі ж наадварот, прамыя і кароткія, то такая жывёліна дае надта мала малака. А гэта вельмі нявыгадна ў гаспадарцы. Самая добрая карова, калі рогі мае наперад выстаўленыя, сярэднія па даўжыні і падобныя яны на вілы, якімі гаспадыні ставілі свае гаршчкі ў печку. Калі карова недзе губляла свой рог, збівала яго ці за нешта чаплялася і скручвала, то былі пераканаНы, што гэта прывядзе да абавязковага зніжэння надояў малака. Да таго ж, сяляне выдатна ведалі, што рогі ў кароў болей не вырасталі і таму стараліся такую жывёліну збыць з гаспадаркі, каб сабе ці адгадаваць, ці купіць іншую, больш малочную»; «Раз карову выбіралі, то, найперш, сачылі за рагамі і выбіралі яе менавіта па іх. Калі ў каровы надта ж доўгія і задраныя ўгару рогі, то яна не будзе добрая да малака, а будзе толькі біцца-калоцца з іншымі. Калі ж рогі нібы якія пікі, настаўлены наперад, то і тут малако будзе не тлустае, а толькі тое, што белае. У каровы павінны быць рогі таўставатыя і нібы апушчаныя крыху да зямлі. Такую стараліся браць у гаспадарку. Збываць, у першую чаргу, імкнуліся тую карову, якая недзе згубіла рог, бо рогі ў каровы не адрастаюць і разам з іх стратаю, яна і траціла сваю малочнасць».

Адзначалі яшчэ вось што: «Калі кароў пасвіш, то іх ні ў якім разе нельга доўга трымаць на вадзе, бо тады і малако яны дадуць такое ж, як і вада, рэдкае і нясмачнае. Таму і сварыліся старыя людзі на пастушкоў, каб яны кароў дарма ў возера ці ў рэчку не заганялі, не трымалі іх там»; «Кароў у вадзе нельга было пасвіць, бо гэта ўплывала на тлустасць іхняга малака. Казалі, што хто жывёлу не шкадуе, дык той яе на ваду кіруе, не дае па полі ці па высокім лузе пахадзіць. Лайдаку і за каровамі раздолле. Сам праляжыць цэлы божы дзень, а жывёла няхай сабе як хоча перабіваецца. Сварыліся вельмі раней. Абавязкова гаспадары пастухоў папярэджвалі. Яшчэ ж раней часта кожны сам свае каровы пасвіў, не было вялікіх статкаў. Гэта ўжо потым іх такія ўдумалі»; «Гналі з раніцы кароў на пашу, то глядзелі якая пагода стаяла: калі сонечна, суха, то можна было жывёлу на нейкі час і на ваду загнаць, а калі – мокрая, ветраная, халодная, то ні ў якім разе не пускалі, бо вельмі баяліся, што вымя ў кароў патрэскаецца, пабалее, а малако стане рэдкім, не тлустым»; «Калі цельная карова жвавая, вясёлая, носіцца, то яна расцеліцца бычком, а раз жывёліна ціхая, павольная, ледзьве рухаецца, дык тады ў такой каровы цёлка будзе. У нашай гасподзе так даўней усе гаварылі і мала ў чым памыляліся»; «Карова запроста бычка народзіць, калі перад гэтым жвавай будзе, неспакойнай, а калі наадварот, то тады цёлачка будзе, што многія гаспадары лічылі куды выгаднейшай справай, чым першая. Калі цёлачка, то яе сабе запроста можна адгадаваць і за кароўку пакінуць, а вось раз бычок, дык кароўку маладую давядзецца ў іншых людзей купляць, а гэта справа надта адказная для любога гаспадара. Пароду ж можна было звесці і потым не аднавіць. Не пашанцуе з каровамі, то тады многага ўкусіш»; «Калі на працягу зімы начамі каровы ні з таго ні з сяго пачынаюць рыкаць, то гэта магло прадказваць не што іншае, як летам не будзе для кароў добрай пашы»; «Ноччу ў сцюжу, раз каровы пачынаюць моцна і працягла рыкаць, то нікога не пытайся асабліва – гэта яны летні голад заранёў адчуваюць і такі знак свайму гаспадару падаюць, каб стараўся хоць мінулагодняе сена прыберагчы, бо летам не ўдасца яму на новую зіму накасіць. Змізарнее тады ягоная жывёла, схуднее, прыбытку ад яе асаблівага не будзе мець»; «На жарэбнай кабыле ні ў якім разе нельга везці ката ці сабаку, бо тады тая кабыла адразу ж скіне. Не будзе мець з яе гаспадар ніякага толку»; «Жарэбную кабылу стараліся без дай прычыны, проста так, не запрагаць і вазіць на ёй усё па парадку не выпадала. Ведаючыя людзі аднагалосна сцвярджалі, што ні сабаку, ні ката, нават жартуючы, нельга было ў воз закідваць. Раз так зрабіў, то твая кабыла скіне. Не будзе яна ўжо і потым жарэбная».

Такім чынам, падводзячы вынікі пад нашымі разважаннямі адносна фальклорных запісаў, зробленых намі на Лагойшчыне, абавязкова звернем увагу на два аспекты: першае, што вяліся яны ў пэўным накірунку, адразу вызначаным намі перад пачаткам самастойнай вандроўкі-экспедыцыі; па-другое, запісаныя вуснапаэтычныя яшчэ падкрэсліваюць, што нашы продкі надавалі значную ўвагу ўсемагчымым прыкметам, перасцярогам і павер’ям, якія з цягам часу пачалі ўспрымацца вяскоўцамі проста як цікавыя сведчанні багатага духоўнага свету сваіх прашчураў, а ў некаторых выпадках – і як простыя забабоны, пераЖыткі цяжкатлумачальных або ўвогуле нетлумачальных прыродных стыхій, паводзін людзей і жывёл.

*Таццяна ВАЛОДЗІНА*

# НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА ЛАГОЙШЧЫНЫ

На Лагойшчыне, як і паўсюль на Беларусі, кожная вясковая жанчына валодала неабходнай колькасцю ведаў па захаванні здароўя, па лекаванні асноўных няцяжкіх хваробаў, догляду дзетак. Разам з тым амаль у кожнай вёсцы жылі і жывуць адмысловыя лекаркі, што дапамагалі замовамі ці больш складанымі рытуальнымі дзеямі. У рэестры лагойскіх хваробаў практычна ўсе найменні, што і ў суседніх раёнах. Аднак абмаляваць поўную карціну народнай медыцыны Лагойшчыны пакуль не атрымліваецца, бо збіранне матэрыялаў толькі пачалося.

На агульнабеларускім фоне вылучаецца блок дзіцячых хваробаў, сярод якіх побач з ужо традыцыйнымі начніцамі (шырока вядомае паланне хворага дзіцяці ў начоўках) расказваюць і пра праблемы, звязаныя нібыта са з'яўленнем поўсткі на спіне. У Лагойскім раёне яна завецца свіная шэрсць:

Эта як свінней нагой б'еш, эта яшчэ як у первай палавіне б'еш, тады шэрсць, крэкчыць дзіця, языком павядзі, дык колецца. – *А як гэта называецца?* – Свінная шэрсць. – *А як вы яе вывадзілі?* – Нада эта дзіцё лажыць пад начоўкі ў свінны хлеў і выганяць чэраз яго. Чэраз дзіця, і адтуль, і туды і адтуль, тры разы, чэраз дзіця... – *А страшна, а як абернуць карыта...* – Ну добра ж накрываеш.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах*[1].

Звалася яна свінная шэрстка. Як пакупаеш яго і станеш вот так шчакой па спіначцы – і колецца. Дзеці тады не спяць моцна. Гэта шэрстачка ім колецца. Свінная шэрстка. – *А як яе выводзілі?* – Купаючы, можа, даўна шчоткі былі, зробленыя са свінной шэрсці, і гэтымі шчоткамі, вот пакупаеш, намыліваеш плечкі яму і гэтай шчоткай вот так чэшаш.

*Зап. у 2009 г. у Засоўе ад Ванды Іванаўны Шапялевіч, 1928 г. н.*

Эта свінная шэрсць. Пад карыта кладуць і свінней пераганялі. І я Шуру клала, палажылі пад парогам, начоўкі абярнулі на яго, а-я-я, і завём парсюка. А-яй, барані Бог, правалюцца этыя начоўкі, нада ж каб парсюк перайшоў і туды і адтуль. – *Прама станавіўся на карыта?* – Станавіцца. А як жа, ён жа лезець цераз гэтыя начоўкі, а дзіця там ляжыць, страшна. – *А адкуль тая шэрсць бралася?* – Як ходзіш таўстая, а свінні між ног пералятуць. А свінням даеш, а яны цераз ногі і пойдуць.

*Зап. у 2009 г. у Пушча ад Урбан Вольгі Емельянаўны, 1917 г. н.*

Уласна ад начніц раілі вечарам узяць у падол дзіця і накрыж ісці ад кута да печы, потым з другога вугла, з трэцяга, з чацвёртага так ісці. Затым ціхенька апусціць дзіця з подала на падлогу.

ФА: зап. Чарніцкая Т. у в. Масцішча Пратасоўскай Ядвігі Францаўны, 82 гады.

Да ліку хваробаў залічвалі **капрызы**.

Кажуць, дубчык з веніка нада выцягнуць, і дзе во як ідзеш, бярэзіна нахіліўшыся, гэты дубчык адламаць і гэтым дубчыкам. – *А тады той дубчык куды?* – А ня ведаю, куды яго, можа, у печы палілі.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах.*

Каб засцерагчы дзіця ад нядобрых вачэй, у кашульку ўшпілялі шпільку, на падазроны пагляд прамаўлялі: «Соль у вочы, галавешку ў зубы», а пры першых жа сімптомах **сурокаў** абціралі падалом, але «жэншчыну добра мужчынскімі трусамі сціраць». Запарвалі траву, якая завецца сурочнік, «беленькім такім цьвіціць». Сваю ролю адыгравалі і замовы. Жанчыны ахвотна расказваюць гісторыі пра сурокі дзяцей, унукаў і іх лекаванне пры дапамозе магічнага слова:

Гэта дзіця ў крык, і чарнеець, і я нашу, і яна носіць. І ніхто рады не даець. Тады яна кажаць: схадзі ты, у цябе ж там ёсь загаворы, вазьмі ты загавары над ім. А ў яго вушка і шчочка аж чарнеюць, крычыць гвалтачку. Я прынесла, пагаварыла над ім, а ён спаць, на падушку палажылі, заснуў і спаў, а праснуўся – як нідзе і не было.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах.*

Ад урокаў соллю абносілі, абнясеш і во грубка топіцца, на жыр сыпнеш навотліў, і ўсё. – *Свянцонай соллю?* – Проста соллю, дзе ты тады возьмеш тую свянцоную. Як у мяне было малыя

[1] Запіс Валодзінай Т. У далейшым, калі збіральнік не агавораны, прыводзяцца запісы аўтара.

дзеці, зрабілі, што і бацюшкаў і ксяндзоў нідзе не было, нада было крысціць украдкай. Дзяўчына ў мяне як радзілася, дык у Ліцьвічы ноччу прыехаў бацюшка, дык ноччы хрысцілі, ноччы насілі хрысціць. У тоя ўрэмя, вокны закрыюць, эта ў 1952 гаду.

*Зап. у 2009 г. у Засоўе ад Ванды Іванаўны Шапялевіч, 1928 г. н.*

Узяць у руку соль і абносіць вакол галавы і гаварыць:

Сем уракло, адна адраку.

Зрабіць гэта нада тры разы, а потым сыпнуць гэту соль на агонь у печы.

*ФА*[2]*: зап. Анімаховіч А. у в. Ляўданшчына ад Анімаховіч Алены Іосіфаўны, 1932 г. н.*

Бывала, мая мама гаварыла, што малых дзяцей надта ўрокі бралі. Тады як родзіцца дзіцё і такія ўрочлівыя, тады сваей слінoй і во гэтым пальцам, бальшым, сваей сліной змазываеш яму губкі і лобік. Каб урокі не бралі. – *А якой рукой*? – Правай.

*Зап. у 2008 г. у Ліпкі ад Паўловіч Ніны Сцяпанаўны, 1924 г. н.*

Не меншую небяспеку для дзіцяці ўяўляе і **спалох**, ратавацца ад якога можна, як лічылася і лічыцца, толькі магічнымі спосабамі. Шырока вядомае пераліванне вады праз клямкі, лекаванне замовамі.

Ад спугу нада ўзяць кубачак вады і на ўсе чатыры вуглы, як хрысцішся, перанясці і гэту вадзіцу даваць піць. – *Ад абраза начаць?* – Ад абраза. Ілі як начынаеш тапіць печ, як толькі дым гэты начынаець паказавацца, тады кубачак бярэш із вадой і гэты пераймаеш дымок. І гэта піць давалі. Я гэта і сама рабіла сваім дзяцём.

*Зап. у 2009 г. у Засоўе ад Ванды Іванаўны Шапялевіч, 1928 г. н.*

Я помню, мая мама і бабушка, як толькі затопяць печ, цераз первы дым перанімалі, у будні дзень, не ў свята, цераз первы дым прапусціць ваду і сказаць:

Пуд, пуд, астанься тут.

Дык і я так сваім рабятам робіла. Як толькі пакоціцца первы дымок, пераліць з кружкі ў кружку. Тады ей абмывалі. Эта ад пуду. – *А можа пад стол лазілі?* – І пад стол лазілі накрыж праз чатыры нагі. Тры разы. І ваду тожа перанімалі пад сталом.

*Зап. у 2008 г. у Ліпкі ад Касабука Марыя Сяргееўна, 1946 г. н.*

Эта ад іспугу сцень выбіралі. Я свайго хлапца вазіла, надта іспуглівы быў, я вазіла да бабкі. Яна брала тарэлачку, туды налівала ваду ў гэту тарэлачку, а тады шчэпачкі так і так клала, накрыж этыя шчэпачкі лажыла. А тады злівала мне гэтую вадзічку ў баначку, каб я эту вадзічку давала яму піць. Бывала грычыць, як гарыць над галавой. А яна паліла гэтыя палачкі. І пакуль этыя палачкі пагарацъ, яна нагаваравала. – *Прама над вадой паліла палачкі?* – Вот тарэлачка, абыкнавенная тарэлачка, туды налівае ваду, накладае палачак, тоненька кладзе накрыж, а тады паля гэтыя палачкі. – *Попел туды і сыпецца?* – Так і сыпецца, дзетка, а тады сцэдзя ў баначку і дае піць. І памагала. – *А што той за сцень?* – Хто яго ведае. Ён абычна іспуг. А чаму ён так называецца...

*Зап. у 2008 г. у Ліпкі ад Паўловіч Ніны Сцяпанаўны, 1924 г. н.*

**Валасень** (запаленне косткі на пальцах, кастаеда) на Лагойшчыне ўяўляецца вынікам прыдзіву, але традыцыйна выліваецца на каласы.

Венічак з каласкоў звязаць і тады выліваць. Лыжачкай ліць і гаварыць: валасень вадзяны, валасень прыдзіўны, валасень урочлівы. Валасень, вылівайся, і ніколі не адзывайся. У мяне ў самой быў валасень у во гэтым пальцы. Хрэсьбіны спраўляла, сама меньшай дачцэ, а мне палец гэты – местачка нямашака, такая боль. Прышоў сасед, а я на печы ляжала, не магла даць рады. Як у ваду гарачую палажу, тады лягчэй. А ён кажа: нясіця вады ў міску, ладная міска, я ўлажыла. Ён з веніка наламаў розачак, ці ён іх там лічыў ці не, і лыжку, і давай мне выліваць. Раз выліў і ўсё мне адвалілася, і боль гэта, і тут усё прарвала, нейкая як ня гной, а як сываратка кароўя. Палілося з гэтага пальца, і скура злезла.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах.*

Валасень загавараваюць, настаяшча як валасінкі выліваюцца з таго пальца. Ён надта балючы, паглядзіш, як мучаецца хто, ай.

*Зап. у 2008 г. у Ліпкі ад Паўловіч Ніны Сцяпанаўны, 1924 г. н.*

Пра **каўтун** засталіся не толькі ўзгадкі, гэтая хвароба пакінула пра сябе нядобрую памяць, сустракаецца і зараз. Прычына яе бачыцца ў моцным спалоху, неспакойным жыцці.

[2] ФА — Фальклорны архіў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта (кіраўнік У. А. Васілевіч)

Чула, чула, з пуду і растройства гэты калтун саўецца. У нас з Пушчы жэншчына, яна ходзіць і нагамі, усё, і рукамі ўсё, а каўтун на галаве. У яе сын утапіўся, шукалі, шукалі, шукалі яго, назаўтра раніцай нашлі, ваенны быў. *– І што з тым каўтуном?* – Тры гады з этым каўтуном. Людзі яго загавараваюць, а не нада яго знімаць. Тры гады яго носюць, а тады адстанець ад галавы, атойдзець, тады яго знімаюць. Хацелі ей у бальніцы зняць, яна плакала, не далася, казала: я тады памру.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Астроўкі Браніславы Лявонцьеўны, 1922 г. н.*

У сястры быў. Нерв такі, беспакойная жызь. Надзя, саседка, як спужалася і ўсё. *– І што тады. Ці яго абразалі?* – Яго нада два гады вынасіць, а тады знімаюць. Ёсь такія людзі, што знімаюць, умеюць. Была такая баба, што ўмела. *– А тады яго, той каўтун, дзе дзявалі?*– Вот ніколі не папыталася. Пэўна, паліла ў печы.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н. нар.у Гаравіцах.*

Быў, звіваюцца валасы ў камень. І врачы не зразаюць, наверна, ён з іспугу. Ён расцець, расцець і атрасцець, саўсім на канчыку, я відзіла ў бабы. Тады знімаюць, ці яго ў печ кідаюць, ці нясуць на крыжавыя дарогі.

*Зап. у 2009 г. у в. Пушча ад Урбан Вольгі Емяльянаўны, 1917 г. н.*

І цяпер ёсь. Зразу мала звіваюцца, а после як саўюцца, ды ўсе ўместа. Надта галава тады баліць. Не кажды ж зніме эты каўтун. А як зніме ня той, як яму патрэбна, тады саўсім мучаецца чалавек, і калекам астаецца, рукі, ногі атымаюцца. Як поўнасцю сазрэе, нада знаць калі яго зняць. І з прыгаворамі.

*Зап. у 2008 г. у в. Ліпкі ад Паўловіч Ніны Сцяпанаўны, 1924 г. н.*

**Грыжу** ў пупу, як і грызь у суставах ад празмернай работы «загрызалі».

А мне адна жанчына расказывала, што была пахавая грыжа. А адна жанчына ў нас жыла, вот абыкнавенная серка са спічак, гэтай серкай прыкладываюць эту пахавую грыжу.

*Зап. у 2008 г. у в. Ліпкі ад Паўловіч Ніны Сцяпанаўны, 1924 г. н.*

Грызь грызу, за сіняе мора пашлю, за сінім морам калода кісне, і ты, грызь, кісні. Тры разы. А тады тры разы перагаварыць: «Як этаму суку не зелянець, так этай болі не балець. Нада зубамі грызці і пляваць на сук, на сукі які сук, на палене ці на сцяне». І тры разы перагаварыць.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах.*

Каб звесці **ячмень** з вока, адлічвалі зярняткі ячменю ад дзевяці і назад (дзевяць, восем, сем...), затым тымі зярняткамі абводзілі каля хворага вока і кідалі курам. У асобных выпадках агаворваецца, што зярнятка давалі здзяўбаць менавіта чорнай курыцы.

Для Лагойшчыны характэрны распрацаваны комплекс уяўленняў, звязаных са стаматытам у дзіцяці, так званай малочніцай. Цікавыя і адзінкавыя для тэрыторыі Беларусі суаднясенні стаматыту з катом.

*А як бела ў роце ў рабёначка?* – Эта каціная малако называецца. Было і ў маіх. Нейкай шарсцяной трапкай станеш выціраць і праходзіць. *– А чаго яно каціная? Ці яно ад катоў робіцца?* – Эта, кажуць, як кот перабяжыць паміж ног. Як матцы перабяжыць бярэменнай.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах.*

*Як у роце белая ў рабёнка, што тады?* – Труць каціным хвастом, мёдам. *– А як называецца?* – Бела. Так і скажуць, бела ў роціку.

*Зап. у 2009 г. у в. Пушча ад Урбан Вольгі Емяльянаўны, 1917 г. н.*

**Жабка.** Як слюна цячэць. Нарывы ў роце. Эта мая мама так робіла. Жабку загаварала, ці эта дух, ці хто яго ведаець. Яна бярэ свечачку і гэтай свечачкай у роціку загаваравая эту жабку. Эта пашці толькі ў дзяцей. Я трошкі помню: «Скачы, жабка, па мхах, па балатах, па лясах, дзе звяры ня ходзюць, дзе птушкі не лятаюць». «Во. *– А ад чаго жабка бывае?* –Бальшынство ад прастуды. *– А тую свечку яна паліла*? – Дзетачка, эта свечка – на Вадохрышча, на Грамніцы, тры разы нада яе прасвяціць, а трэцці раз у посны дзень. І з гэтай свечачкай загаваравала. Плача дзіця, а тут чужая баба ды з агнём, дзіця плача. А яна яму там загаваравая. А тады свечку патуша і фукая этым дымком у роцік. І той свечкай вакруг галавы абводзіла».

*Зап. у 2008 г. у в. Ліпкі ад Паўловіч Ніны Сцяпанаўны, 1924 г. н.*

У комплекс народнамедыцынскіх парадаў уключалася і рэгламентаванне адымання ад грудзей, правільна абраная пара забяспечвала дзіцяці добрае гадаванне, а маці – адсутнасць болю ў грудзях. Глядзелі, каб не адымаць «на голы лес».

*А як адымалі ад грудзей, можа, глядзелі пару?* – Нада глядзець пару. У Калядоўку нельзя,

будзець задушлівае дзіця. – *А на месяц ці глядзілі, ці поўным ці маладзіком?* – Можна, поўным. Трэццяя нядзеля – яна ўрэдная. – *А як паследні раз давалі, можа, садзілі на стол ці на кажух?* – Садзілі. Яйцо давалі. – *На кажуху? А вараная ці сыроя?* – Вараная. І кніжку давалі, каб добра ўчыўся.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах.*

**Барадаўкі** адносяцца да ліку нястрашных немачаў, пазбавіцца ад іх з дапамогаю магічных дзеяў мог кожны.

Я сагнала, у мяне было на гэтай руцэ, аж поўсць у іх парасла. Вот простынь, мацер'ял, выцягнуць нітачку каб была, як прадуць, і вузельчыкі вязаць, вязаць: дзевяць, восем, сем, шэсь, пяць, чатыры, тры, два, адзін і ўсё. І дзе вароты круцюцца, там устаўлены, там завесы і нітачку туды. І ўсё. Цёмныя сталі мае барадаўкі, і прапалі, нідзе няма.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Астроўкі Браніславы Лявонцьеўны, 1922 г. н.*

Можа эта пагаворка якая. А гаварылі: вот глядзі, як на небе звёздачка і падаець, спраўляйся тады змахнуць рукой барадаўку. І як лішай, на вакне як пот вялікі, тады ім выцірай, скрэбаеш і вымазаваеш, дзе яно што ёсь.

*Зап. у 2009 г. у в.Засоўе ад Ванды Іванаўны Шапялевіч, 1928 г. н.*

Барадаўкі лічаць, а тады гарох ці ў калодзец ці дзе капаець са стрэх, каб згніла, колькі барадавак, столькі і гарошын укінуць.

*Зап. у 2009 г. у в. Пушча ад Урбан Вольгі Емяльянаўны, 1917 г. н.*

**Наход** – высыпка на целе – да гэтага часу звязваецца з тым, што ў лазню зайшла жанчына з месячнымі. Каб пазбегнуць яго, астатнія жанчыны мусілі выйсці з лазні і зайсці толькі пасля яе.

**Залатнік** «на гарэлцы загаваравалі, на солі, на хлебе, не на вадзе».

*А як залатнік такі бываець?* – Тожа шэпчуць, прыпечак падымалі. Падняць тры разы, яе ж не падымеш, печ, але возьмешся за яга і ўжо пацягнеш. Тры разы.

*Зап. у 2009 г. у в. Пушча ад Урбан Вольгі Емяльянаўны, 1917 г. н.*

Калі разаўецца рука, яе перавязваюць адмыслова падрыхтаванай ніткай.

Ад веніка, як даўна былі вязаныя венікі. Бярэш гэтую ад веніка і туганька перавязаваеш руку і ходзіш, пакуль пройдзець трохі. – *А спіна як баліць?* – А што ей зробіш?... Старэйшыя нешта клалі на парог і пераступалі цераз яго, а ці памагала яно. Неяк жа іскалі сабе рады.

*Зап. у 2009 г. у в. Засоўе ад Ванды Іванаўны Шапялевіч, 1928 г. н.*

Як гром первы пачуеш, становішся і стараешся стоўб падняць, эта ад спіны, сама абыкнавенны стоўб.

*Зап. у 2008 г. у в. Ліпкі ад Паўловіч Ніны Сцяпанаўны, 1924 г. н.*

На Лагойшчыне, як і паўсюль на Беларусі, пры лекаванні звярталіся да моцы аб'ектаў сакральнай геаграфіі – святых крынічак, прыкладам, у в.Горн, святых камянёў.

У нас як ідзеш, Рубеж ці як называецца, дык там ляжаў камень, і на гэтым камені слядок, настаяшчы слядок, дык гэта кажуць – Божы слядок. – *А ці расказваюць пра яго што? Што ішла Божая Маці ці што?* – Кажуць жа, што Бог ступіў на гэты камень і аказаўся слядок. Настаяшчы слядок. – *А ці казалі, можа, вадзічкай з гэтага каменя абціраліся ці што?* – Як ідзём у ягады ці што, вочы памыем і самі памыемся з гэтага слядка. Вада там стаяла.

*Зап. у 2009 г. у в. Літвічы ад Леановіч Ядвігі Паўлаўны, 1932 г. н., нар.у Гаравіцах.*

Ад **галаўнога болю**: «Боль Марыя Ірадаўна, удзі сегодня, прыйдзі вчэра. Амінь», перахрысціцца.

ФА: зап. у 2005 г. Аўчамчук Н. у в. Красная Зара ад Сівец Вольгі Антонаўны, 1942 г. н.

Ад ста хвароб кожны вечар перад сном трэба казаць:

Як сонца заходзе, хай чары і хвароба ад (імя) адходзе.

ФА: зап. у 2005 г. Апімаховіч А. у в. Баброва ад Залуцкай Яніны Яфімаўны, 1921 г. н.

## НАРОДНАЯ МІФАЛОГІЯ ЛАГОЙШЧЫНЫ

### Персанажы ніжэйшай міфалогіі

Без 15 мінут дванаццаць з'явілася белая жанчына з вялікімі зубамі, а потым мужчына. Точна ва ўсім белым. Эта таму, што наша хата на быўшым кладбішчы стаіць. Тут раньшэ трупы былі.

Быў у нас багаты бацька. Вот ён паміраў і матка колькі не плакала, ён не гаварыў, дзе паклаў грошы. Тут мой брат пабег на рэчку адзін раз і там убачыў бацьку. Бацька пагладзіў яго па галаве. А пасля гэтага прысніўся ён маткі і сказаў, што грошы на чардаку ў гарохавай крупе. Што-та ё?

*Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на*
*ад Шавель Галіны Іванаўны, 1932 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Доміным А., Елавой Н. (2008 г.)*

**Вадзянік**

Ён жыве ў вадзе. Ён увесь зялёны. Ёсць вадзянікі, што жывуць у ціхай вадзе. Это ціхоні. Еслі паможаш вадзяніку, то ён этім і адплаціць. Ён будзе памагаць лавіць рыбу. Калі чалавек будзе тануць, ён яго выратуе.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н.,*
*(нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на)*
*студэнткамі Пінчуковай Н., Канцавой М.*

У нас іх называлі вужакамі. Як сходзіш памыцца летам у балатнянку, дык там маглі сустрэць і іх. Тыя напугаюць так, што хадзілі к бабкі Фёкле шаптаць. Я вот не знаю, как ані выглядзелі, ну все баяліся.

*Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на*
*ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,*
*студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)*

**Ведзьма**

Эта жанчына, якая кульгае, у яе зросшыя брові, вусы або барадаўкі. А яшчэ ведзьма – эта ў якіх адзін глаз аднаго цвета, а другі – другога.

*Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на*
*ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,*
*студэнткамі Кананеравай С., Гусціновіч І.*

Жыла ў нашай вёсцы адна жанчына. Вот хадзіла ана голая, у белую простыню заматаная, па полю і забірала малако ў кароў.

*Запісана ў в. Завішына Лагойскага р-на*
*ад Коразюк (Бахар) Яўгеніі Іванаўны, 1936 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)*

Ведзьму цягне на Купалле па чужых дварах хадзіць. Нічога нельзя её даваць, бо яна ўрочлівая баба. На Купалле тыркалі за шалёўкі крапіву-жычку, каб ведзьма ў хату не ўлезла.

*Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на*
*ад Навойчык Валянціны Мікалаеўны, 1943 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)*

Дзеўкі верылі ў ведзьмаў, яны шлі, вяночкі плялі, я не верыў. Хараводы вадзілі, пелі песні ў асноўным токі дзеўкі.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Зялёнага Баляслава Пятровіча, 1934 г. н.*

Бралі муравейнік з лесу і перасыпалі ім вуліцы. Што значыць чараўніца малако абірае і яе ўжо карова не пойдзе, а стаяць будзе. Вось у мяне быў случай. Я неяк карову даіла. І я толькі карову за цыцку, а тут жаба-рапуха ў даёнку ўпала. Мы з братам яе схапілі і пад карыта пасадзілі. А самі пайшлі. А тая жаба вылезла з-пад карыта. Патаму, што эта не жаба, а ведзьма была.

А патом яшчэ былі ведзьмы. Вот на празнік вялікі, на Паску, прыйшла ка мне нейкая за вуглямі. А я ж малая яшчэ была, не ведала, што нельзя. А я пайшла, кароўку падаіла, прыхожу, а ў мяне малако ўсё скісла. Гэта ведзьма была.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Мароз Надзеі Фацееўны, 1925 г. н., студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В., Трубкінай Т., Чамярыцкай К., (2008 г.)***

А вот у мяне было. Паехалі мы как-то ў Беразіно. Там лячыў дзядзька. І вы знаеце што, адкуль ён гэта ведаў. Вот знают жа людзі. Яны ўсе ўдзіўлены. Прыехалі мы туды, а тады запрашчалася лячыць людзей. Мы як прайшлі, і бабка невысокая, а як начала на нас: «А вы хочаце майго старога ў цюрму загнаць». А ён лячыў нейкую бабу. І што вы думаеце?! Нейкі стол такі высокі і нейкія скамейкі. Мы селі ўчатырох, як прыйшлі. Ён прыходзя. А тады вот так вот як сядзела я, ён мне рукой па плячы хлоп і кажа:

– Ну, што, маладзіца, двое дзяцей маеш і ўжо рады шукаеш.

Адкуль ён знаў за сто з гакам кілометраў, што ў мяне двое дзяцей. І мяне ўзяў первую. Даў мне кружку літровую, налітую вадой. Сам ззаду. Мне было дзіка страшна. Слова скажа, малітву ўслух гаварыў, слова скажа і воздух глытае. Тады кончыў малітву.

– А дзіцятка, а дачушка, а што ж ты каму каму зрабіла?!

– А мы парасё купім – пад яблыню, карову завядзём – палавіна саскоў не доіцца. Нікак не можым нічево завесці. І гэтый дзед сказаў як завесці, як парасё гадаваць. І сказаў сільнейшага шукаць, калі ён не памог. І я да яго ездзіла 6 нядзель. І калі ён пашчытае па календару і гавора. Я гавару: «Дзедушка, я не магу. Тры разы як ездзіла, дык страшная рвота была». Ён мне завязаў каўтун. За гэтых 6 нядзель косы ўжо трохі адралі. Ён ужо ножніцы падняў і гавора: «Я знаю, што я дзелаю, і што з ім рабіць». І я ўжо ехала 4, 5, 6 раз, я ўжо шуціла ў аўтобусе. 6 разоў я ездзіла. Сёмы раз ён ужо даў мне ваду і сказаў пабрыць галаву, вымыць гэтай вадой галаву, сказаў куды выліць. І сказаў: «Я чым магу, тым памагу, а шукай сільнейшага». А вот кагда ў мяне не работала левая старана, дык мужык вазіў мяне ў Калодзішча. Там была нейкая ці цыганка, ці сербіянка. І вот яна сказала, што ў мяне ў падушцы. Адну распарола – нічога няма. Ну, думаю, збрахала. А яна сказала, гнёны гвозд, 20 зярнят пшаніцы, пясок з кладбішча, чорны волас і трапачка, калі не парвалася ад даўнасці. І што вы думаеце, як стала я пер’е з падушак мыць, гвозд туды – шась! Гэта нада было відзець! Вось вялікі гвозд загнёны, запакованы ў пяску.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Сансевіч Ніны Фёдараўны, 1938 г. н.***

**Дамавік**

Гаворацъ, што гэта маленькі дзядок з сівой барадой. У каждай хате ёсць дамавік. Калі хазяйка добрая, акуратная, тады дамавік добры. Дамавік жыве пад веніком. Еслі яму што-небудзь не нравіцца, то ён начынае біць пасуду, раскідаць мусар, пугаць дзяцей.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на ад Петрашко Лідзіі Лявонцьеўны, 1932 г. н., (нарадзілася ў в. Хадакі Лагойскага р-на), студэнткамі Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Калі што ў хаце прапала, то трэба так казаць: «Дамавік, дамавік, палажы на месца». А калі ў хаце пасуда б’ецца, родныяругаюцца – трэба задарываць дамавіка.

***Запісана ў в. Завішына Лагойскага р-на ад Карзюк (Бахар) Яўгеніі Іванаўны, 1936 г. н., студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)***

Вот штось у мяне прападзець, я кажу: «Дамавік украў». Дамавік ходзіць па дамах і там украдзець, і тут украдзець – ён злодзей быў.

***Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Ганны Канстанцінаўны, 1940 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Дамавы – эта дух такі. От у хатах трэск, стук – эта ўсё дамавы робіць. Пад прыпечак залезе, скавараду выкіне. Паб'е што-небудзь. Яны не паказваліся. Проста духам прыдаваліся. Бацюшка прыглашалі і самі маліліся і толькі пасля гэтага знік.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.***

**Лясун**

Я думаю, што лясун – гэта вялікае нейкае сушчаство, якое жыве ў лесе. Калі ён зліцца, то путае сцежкі чалавеку, а чалавек ходзіць 2–3 дні каля сваёй мясцовасці, а яшчэ выдзірае древы з карэннямі. А таксама ён можа прыносіць людзям дабро: памагаць сабіраць людзям ягады або грыбы.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Нячысцікі**

Нячысцікі ёсць, але ж яны жывуць у неасвяшчонай хаце, там яна ўся нечысць і пасяляецца. Нячысцік баіцца храста. Калі хату пасвяціць, то нічога не паселіцца.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны 1922 г. н.***

**Русалка**

Эта дзяўчыны, якіх пракляла маці. Яны жывуць у вадзе, цела іх палавіна з дзяўчыны, а другая палавіна – рыбій хвост. Яны заманівалі прыгожых дзяўчат на раку і тапілі іх.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Кузьміч Надзеі Мікалаеўны, 1925 г. н.,***
***студэнткамі Пінчуковай Н., Канцавой М.***

Галубаглазая, з доўгімі валасамі, добрая. Чалавечая ў яе толькі галава, а ўсё астальное ад рыбы, хвост сярэбраны.

***Запісана ў в. Завішына Лагойскага р-на***
***ад Карзюк (Бахар) Яўгеніі Іванаўны, 1936 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

**Хлеўнік**

Мы верылі ў хлеўніка, патаму што мамка хадзіла к Фёкле адрабляць нагаворы. У нас Багуцкая – ведзьма. Як на скаціну гляне, дык рапухі паўзуць у хлеў. Мамка пойдзе ў хлеў і просіць хлеўніка, каб той зашчыціў нашу кароўку. Хлеўнік – гэта невідзімы чалавечык старэнькі.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Булыга Надзеі Пятроўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай ГДУ імя Ф. Скарыны Атрохавай В. (2008 г.)***

## Рэчыўны свет

Еслі ў жэншчыны ўмірал ребёнок – нельзя да Спаса есць яблак.

***Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на***
***ад Пятроўскай Канстанціны Іванаўны, 1931 г. н.,***
***Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

### Булаўка

Эта, каб не сурочылі. Прышпіліваюць, у асноўным, бярэменныя жэншчыны.

***Запісана в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Дрозд Галіны Антонаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

### Валасы

Няльзя выкідваць валасы, бо птушка саўе гняздо і будзе галава балець. Іх нада спальваць.

***Запісана в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Дрозд Галіны Антонаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

### Венік

Ребёнка нельзя біць венікам, штобы он не был худым і глупым.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

### Гарбуз

Кагда невеста атказывала жаніху, ана лажыла на стол гарбуз, стол был пусты.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

### Драч

Калі нявеста адмаўляла жаніху, то ў іх воз кідалі драч.

***Запісана в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Дрозд Галіны Антонаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

### Зубы

Кагда ў ребенка режуцца зубкі, то рубашку самую ніжнюю парваць нада і спаліць. Штоб былі без болі зубкі, якія рэжуцца.

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

### Іголка

Каб казу не зглазілі, трэба было ўзяць іголку і закалоць яе пад ашэйнік. Тады ўсё харашо будзе.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Падбярозка Сцяпана Антонавіча, 1933 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

### Нож

Нож нельзя аставляць ноч'ю на стале, патаму шта будзет сварка.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Соль**

Калі рассыпіш соль, нада вадой яе паліць, штоб не была гора і слёз. Соль выкарыстоўвалі, калі шапталі. Соль няльзя даваць з дому, а то будзе гора і сварка.

*Запісана в.Пуцілава Лагойскага р-на*
*ад Дрозд Галіны Антонаўны, 1932 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.*

**Хлеб**

Няльзя хлебам кідацца, штоб гора не было і голаду ў сям'і.

*Запісана в. Пуцілава Лагойскага р-на*
*ад Дрозд Галіны Антонаўны, 1932 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.*

**Шапка**

Шапку нельзя круціць на руке, бо будзет балець галава. Нельзя сідзець в шапке за сталом, гаварят, цёшча будзе глухая.

*Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на*
*ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.*

## Жывёльны свет

**Жаба**

Нельга браць жаб у рукі, бо барадаўкі будуць. Нельга давіць жаб, бо будзе дождж.

*Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на*
*ад Акуліч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.*

**Сабака**

Калі сабака вые ўверх, то гэта к пакойніку ці к пажару.

*Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на*
*ад Акуліч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.*

## Легенды пра паходжанне свету

Бог ішоў па зямлі, а бабы жыта жалі. А жыта было ну дабро, аж ад самага нізу колас. Дык некаторая гультайка кажа: «Божа мой, як у рукі колецца. Хай жа ж быў каласок маленькі, а не вялікі, хай нам было лепей брацца за яго жаць». А ішоў дзед стары – гэта быў Бог, і кажа: «Чакайце, бабкі, я вам зраблю, што будзе колас маленькі». І сасмаргаў гэты колас ад нізу ледзь не да верху. Але сталі каты і сабакі прасіцца, выць: «Астаў, Божанька, хаць на нашу долю». Дык і цяпер кажуць, што гэты каласок сабачая і кацiная доля.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жылянінай Клаўдзіі Іванаўны, 1927 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Зялёнка Т., Вярцінскай В. (2005 г.)*

Раней колас быў ад зямлі, на ўсю сцябліну. Па зямлі хадзіў Бог, праведываў. У адной бабы пытаецца: «Ці добры ўраджай?» А яна абызвала яго. А коцік маленькі ў гэты час замяўкаў. Дык Бог аставіў каласок уверсе – для коціка. А для людзей не аставіў. Вось і гаворуць: каласок – на кацiную долю.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жылянінай Галіны Іванаўны, 1930 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Зялёнка Т., Вярцінскай В.*

Некалі чалавек абідзіў Бога. Каласы раслі ад зямлі, да верху быў колас. І вось, каб наказаць чалавека, Бог захацеў сасмаргнуць колас, зярняты. Але сталі выць сабакі, каты, штоб гэтага не рабіць. І Бог аставіў каласок уверху для іх і кажуць, што мы на кацячай і сабачай долі.

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Грынкевіч Аляксандры Міхайлаўны, 1935 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Зялёнка Т., Вярцінскай В. (2005 г.)*

Марыя ішла з Хрыстом і схавалася пад бярозкай. А веткі прама апусціліся. Таму і кажуць, што бяроза вельмі добрае дрэва, бо спасла свенчу матку.

Казалі, што Хрыстос усё дужа панімаў. І яму сказалі: «Раз ты так панімаеш, дык зрабі так, каб пайшоў дождж». Ён прыйшоў і кажа: «Давайце спярша паядзім, прынясіце віна». Віно прыняслі, паставілі на стол і сталі ўгашчаць Ісуса Хрыста. Ісус Хрыстос кажа: «Выпіце ўсе па румачцы». Усе госці, што былі, выпілі, а ён адкрыў акно і выліў сваю румку на двор. Як выліў на двор, прайшло пэўне, мінут дзесяць-пятнаццаць і пайшоў дождж. І такі ўжо дождж вялікі, што ўсе паверылі – Ісус праўду кажыць.

*Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на*
*ад Паплёўка Ганны Марцінаўны, 1926 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляўданскай Н. (2006 г.)*

Свет стварылі Адам і Ева. Яны сначала былі ў раю. Там быў сад. Усе дрэўцы былі з пладамі, іх можна было кусаць. З аднаго дрэўца няльзя было кушаць, а Адам скучаў.

Дачка мне расказвала гісторыю адну пра рай. Адзін чалавек быў у коме 2 нядзелі. Ён расказваў: «Іду па бальшому калідору, адкрываю дзверы. Стаіць стол і за ім сядзяць красівыя, прыбраныя мужычкі. Жэншчыны сядзяць аддзельна. Малыя дзеткі кветкі паліваюць – гэта анёлкі. Яшчэ дзверы. Там смала кіпіць. І адкуль ён пачуў голас маткі, спужаўся і прачнуўся».

*Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на*
*ад Турчыновіч Міхаліны Венедзіктаўны, 1926 г. н.,*
*(нарадзілася ў в. Каргавішча),*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.*

## Міфалогія

– Ці верыце вы ў Бога?
– У Бога веру.
– А ў нячыстую сілу?
– Ёсць, мусіць, нячысцікі.
– Ці верыце вы ў несмяротнае жыццё?
– Дух у чалавека ёсць, што зрабіў, тое там і палучыш.
– Ці прадзначаны чалавечы лёс?
– Уся судзьба чалавека прадсказана. Чалавек раждаецца і свечка яму запальваецца. Сколькі ёй гарэць, столькі і жыць. Як памрэ малады, дык кажуць: «Ну… яго свечка згарэла.»

*Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на*
*ад Міхневіч Валянціны Мікалаеўны, 1938 г. н.,*
*Луцкай Зінаіды Мікалаеўны, 1941 г. н.*

Некалі сню: у Гваздзецкага ў садзе чорная зямля і на ёй як нейкія клыкі чорныя – Гваздзецкі памёр.

Тады сню: у Вячоршачынным садзе нейкі чорны конь стаіць, а гэта ж к смерці – Васіль павесіўся.

А нейк сню: Антон Ціхановіч коні з гары гоня – цэлы табун. Тожа гэта к смерці: нехта тады ў Лагазе памёр.

А то сніла: нейкая баба ка мне чорная прыйшла. Прыйшла і каля ложка стала. Высокая, чорная. Я крычу: «Ты, ідзі адсюль! Чаго стаіш?» Яна і знікла. Гэта ж смерць па мяне прыходзіла, а я ўзяла і прагнала яе. Вось як.

Калі сніш вошы – то ў цябе нешта ўкрадуць, калі пусты посуд – тожа, калі зубы – нехта родны захварэе, калі зубы з крывёю – нехта памрэ, калі вяселле і коні – таксама к смерці; ягады і яблыні, рабіна, каліна – да смерці.

Калі ў абычныя дні сніш радасць, то будзе гора. А з чацвярга на пятніцу сны збываюцца, толькі калі што добрае да 12 гадзін на наступны дзень раскажаш, то не збудзецца.

З чацвярга на пятніцу
Я лажусь на задніцу.
Хай прысніцца мне ў сне
Той, хто думае пра мяне,
Той, хто думае пра мяне.

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на***
***ад Пунтус Вольгі Паўлаўны, 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А. (2000 г.)***

**На выкліканне дажджу**

Каб выклікаць дождж, сабіраліся мужчыны, рабілі дзеравянны крыж. Жанчыны пралі пражу, у адзін дзень трэба было аснаваць, выткаць і вышыць ручнік, бралі ніткі ішлі і цягнулі гэтыя ніткі вакол вёскі, на перакростку дарог укапывалі крыж, абвязвалі ручніком, верылі, што пойдзе дождж. Былі выпадкі, што к вечару пайшоў дождж.

***Запісана ў в. Акцябр***
***ад Багуцкай Кацярыны Мікалаеўны, 1928 г. н.***
***Новак В. С.***

Каб выклікаць дождж, у калодзеж кідалі мак. Калі была граза, то свечку палілі ў хаце, а еслі молнія, то рэзінавыя сапагі на разеткі надзявалі.

Каб засцерагчыся ад пажару, то абнасілі абраз вакол гэтага месца, каб агонь на чыстае поле пайшоў.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы***
***ад Грынь Ганны Пятроўны, 1953 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Нарбутава)***
***Новак В. С.***

Калі доўга дажджу не было, казалі, трэба кінуць утры студні маку, але ні з кім пры гэтым не размаўляць, не аглядвацца. Хадзілі кідаць мак адвячокам.

Калі грымоты на вуліцы, то запальвалі свечку-грамнічку, каб дым на вуліцу пайшоў – адкрывалі дзверы.

***Запісана ў в. Рэпішча***
***ад Зінькевіч Раісы Пятроўны, 1952 г. н.***
***Новак В. С.***

*Наталля ПАНКОВА*

# ЯК ПРЫКАЗВАЛІ НА ЛАГОЙШЧЫНЕ

Урадлівая і шчодрая зямля Лагойшчыны не менш за іншыя рэгіёны Беларусі багатая на прыказкавыя творы. Сведчаннем таму сталі запісы фалькларыста і даследчыка вуснай народнай творчасці Адама Варлыгі (сапраўднае імя Язэп Гладкі), ураджэнца вёскі Міхалкавічы, што і ляглі ў аснову дадзенага артыкула.

Занітаваны навукоўцам матэрыял, які быў адлюстраваны ў выданні «Прыказкі Лагойшчыны» (1966) і дадатку да «Прыказак Лагойшчыны» (1972) каштоўны, на нашу думку, не толькі сам па сабе, але і каментарыямі, дадзенымі навукоўцам, бо сённяшні чытач не заўсёды можа зразумець сэнс выразаў, што адносяцца да так званых малых фальклорных жанраў. Напрыклад, цяжка вытлумачальным здаецца выслоўе «Памажы падняць, дык будзем міняць», калі б не каментарый А. Варлыгі: «Прыказваецца таму, хто ўвічавідкі хоча ашукаць. З казкі: Гандляр коньмі прасіў гаспадара памагчы падняць ягонага каня, і тады ён памяняе гэтага каня на гаспадаровага».

Варта адзначыць, што многія прыказкавыя выразы, па заўвазе фалькларыста, паходзяць менавіта з казак. Так, калі нейкая хвароба ці пашкоджанне паўстала ад неахайнасці, на Лагойшчыне прыказвалі: «Трэба вехця й нажа, дык будзя добрая дзіжа». На першы погляд малазразумелы выраз тлумачыцца казкай: У бабы сапсавалася дзяжа і хлеб не ўдаваўся. Яна папрасіла святара адправіць над дзяжой малебен, на што той заўважыў, што дзяжа абкарэлая гнілым цестам і, правячы малебен, спяваў: «Трэба вехця й нажа, каб была добрая дзіжа». А выраз «Як Бог да Шлёмкі, так і Шлёмка да Бога», які ўзгадваюць, калі багаты ашукае беднага, а апошні пачынае помсціць, паходзіць з казкі-выпадку: Шлёмка прасіў у Бога, каб той дапамог выратавацца ад рэкрутчыны, але хлопца злавілі і аддалі ў маскалі. Пасля гэтага Шлёмка ў суботу схапіў тапор і пачаў секчы дровы. На заўвагу, што гэта грэх, адказаў: «Як Бог да Шлёмкі, гэтак і Шлёмка да Бога».

Здаецца, няма такога выпадку на свеце, ніводнай сферы дзейнасці, ніводнага перыяду жыцця, які б людзі не суправаджалі прыказкай ці прымаўкай. Гэта і павучанні моладзі («Ня будзь ні горак ні салодак»), назіранні за прыродай («Прышла Прачыстая, дык і бярозка чыстая»), рысы характару («У скупога купца ні грошы, ні тавару»), праца і матэрыяльны быт («Працуй, нябожа, дык і Бог дапаможа»), дом і Радзіма («У родным краі як у раі»), замужжа («Хто ажаніўся, той каіцца, а хто ні ажаніўся, той галіцца», выхаванне дзяцей («Тады дзіця трэба вучыць, як перак лаўкі ляжыць»), філасофскія разважанні пра жыццё і смерць («Сьмерць і радзіны ні глядзяць добрай гадзіны»), старасць («Старой бабца хораша й у шапца»), багацце і беднасць («У дастатку рыбку скоблюць, а ў ністачы з луской ядуць»), шчасце і гора («У бядзе жаласьнікаў шмат, а памагаць некаму»), рэлігію («У Бога веру, а Богу ня веру») і інш.

Разам з тым, сярод запісаных даследчыкам выразаў сустракаецца шмат прыказак і прымавак, якія не нясуць у сабе выразнага павучальнага зместу, а хутчэй з’яўляюцца сведчаннем практычнага складу розуму простых людзей і наяўнасцю дасціпнага гумару ў іх. Напрыклад, выслоўе «Нясі, Божа, ніжанатага ды багатага» прыказвалі дзяўчаты, калі нехта позна стукае ў дзверы, з надзеяй, што можа гэта сваты. Калі чалавек прыкідваецца хворым, яму прыказваюць: «Памёрці не памрэш, а часы патрэш». А пры застоллі кажуць: «Піця, жылы, а як памром, дык і колам ня ўб’ём». Выраз «Посьля сьмерці мной хоць плот падатры» ўжывае чалавек, якога крыўдзяць і цешаць пры гэтым, што ўслабяць пасля смерці.

Варта адзначыць, што найбольш часта ў прыказкавых выслоўях сустракаюцца сутыкненні такіх катэгорый, як агульнае і прыватнае (у якасці прыкладаў можна разгледзець прыказкі тыпу «Ні шукай мора, бо ў лужыня ўтопішся», «Ні хваліся сам, ніхай цібе людзі пахвалюць», «Па нітачца клубочка шукаюць»), прычыны і выніку («На лечаным кані мала езьдзюць», «Поўная бруха да вучэньня глуха» ), колькасці і якасці («Ні май чалавека за поўчалавека», «Сем жыдоў ня воз, абы конь павёз», «Ні хаваўшы малога, ня мець і вялікага», «У двух – рада, а ў трох – здрада»), формы і зместу («Пень вялік, алі дуплінават», «Што галава, то й розум», «Ці мой грош шчарбаты?»).

Выразнай уласцівасцю многіх прыказак і прымавак Лагойшчыны з’яўляецца схаваны ў іх пераносны сэнс, намёк на нешта іншае. Напрыклад, выслоўе «На пахілая дрэва й козы скачуць»

выклікае асацыяцыю з кволым чалавекам, на якога нападаюць нават слабыя злачынцы; а прыказку «Пашоў пасол, уваліўся ў расол» ўжываюць, калі доўга адсутнічае пасланы кудысьці чалавек. Выразны пераносны сэнс маюць таксама такія выразы, як «Раньняя птушка зубкі цярэбя, а позняя вочкі трэ», «Сеўшы між вароны, трэба грагаць як і воны», «Стол хлеба ні паесьць» і многія іншыя.

І ўсё ж разгледжаны матэрыял паказвае, што некаторыя прыказкавыя творы, захоўваючы сваю мастацкую завершанасць, не выклікаюць пабочных асацыяцый, а ўспрымаюцца ў сваім простым сэнсе: «Німа горшай балесьці, як калі хочыцца есьці», «Ні пытай старога, а пытай бывалага», «У гаспадыні работа адна, трэба яе рабіці штодня», «Ні так жывём, як хочым, а як выпадая», «Падарожны за сабой хаты ня нося». А ў некаторых прыказках і прымаўках асацыяцыі ўзнікаюць часцей без дапамогі нейкіх своеасаблівых вобразаў, а хутчэй са зместу саміх выразаў. Так, прыказка «Ня ўсё тоя смачна, што соладка» можа ўжывацца і ў простым сваім сэнсе, характарызуючы нейкую салодкую, але не смачную і не карысную страву, але яна (прыказка) выклікае і пэўную асацыяцыю, звязаную з чалавекам, у якога лісьлівыя словы, але дрэнныя думкі. Выслоўе «Пустыня ніколі ня стыня» таксама можа ўспрымацца літаральна, але гэты ж выраз на Лагойшчыне прымянялі і ў дачыненні да пустога чалавека, які ніколі не стане паважаным.

Такім чынам, у прыказкавых выразах часцей за ўсё адбываецца пераасэнсаванне пачатковых значэнняў. Напрыклад, прыказкі «Пазнаюць сокала па палёту, а саву па пагляду», «Палезшы за жукам, будзеш у брудзе», «Сабака сам сена ня есьць і каню ня дае» – вынік назіранняў за паводзінамі гэтых птушак і жывёл. Інфармацыя аб іх нібы супастаўляецца з пэўнымі жыццёвымі абставінамі і, дзякуючы гэтаму, выслоўі набываюць выразны афарыстычны характар.

Прыказкі і прымаўкі Лагойшчыны сталі выразным сведчаннем таго, што моўны малюнак сусвету аб'ектыўна адлюстроўвае асаблівасці светаўспрымання носьбітаў пэўнай культуры, нават калі размова ідзе пра такія блізкія народы, як рускія і беларусы. Парэміі пэўнага рэгіёна не толькі адлюстроўваюць нейкую тыповую сітуацыю, але і выконваюць ролю сімвалаў, эталонаў, якія абумоўліваюць іх культурна-нацыянальтую спецыфіку. Напрыклад, жартаўлівы выраз «Нуда горш кароcты», па сведчанні аўтара, ужываўся, калі хлопец пажыве ў Расіі і часта пачынае казаць: «Ну да!». А стары яму ў адказ заўважае: «Нуда горш кароcты» (нудой на Беларусі называлі меланхолію ці вашывасць). Відаць, стары чалавек, не зразумеўшы сэнс рускага выразу, пачаў спачуваць маладому, што той пакутуе на вошы. Спецыфіку харчавання беларусаў паказвае прыказка «Цура цурыць, а хлеб ляціць» (цура – страва; хлеб, накрышаны ў падсоленай вадзе), а выраз «Посьля кашы німа пашы» выяўляе звычай беларусаў падаваць кашу апошняй стравай.

Мова прыказкавых выразаў, запісаных фалькларыстам, надзвычай багатая, трапная, сапраўды народная. Залежыць яна часцей за ўсё ад таго, якое моўнае выражэнне набывае закладзеная ў прыказцы думка, наколькі ўмела адабрана і да месца ўстаўлена слова, якой сваёй гранню яно заіграе. Менавіта таму прыказкі і прымаўкі хаваюць у сабе старажытныя пласты лексікі (войт, падпанак, сірмяжка, андарачак), дыялектызмы ( на гародзя, бацячка, нішчасьця, даходзя, зялезца, штося), неалагізмы (гвазьдзіць (калі бруд замярзае і робіцца як цвікі), шэтар, пэтар (калі весела і шумна), даваха (той, хто дае), уежна (ёсць што паесці), павара (працэс прыгатавання ежы), тпрулячка (зварот да каня), запазычанні (мысіль, мяньціць, відзіць, уныя). Часам народ шукае найбольш прыгодных для дадзенай падзеі спосабаў слоўнай перадачы інфармацыі, што выклікае з'яўленне сінанімічных выразаў. Пацверджанне гэтаму знаходзім і ў аналізуемым матэрыяле. Напрыклад, пра тое, што толькі здаецца добрым аўтар згадвае тры выслоўі: «Ня ўсё тоя золата, што блішчыць», «Ня ўсё тоя смачна, што соладка», «Ня ўсё тоя хараша, што чырвана». Пра безвыходную сітуацыю падаюцца наступныя выразы: «Улез, як сучка ў жбан», «Улез, як сьвіня ў рэпу», «Улез, як у нерад, ні ўзад, ні ўперад» і інш.

Як бачым, прыказкі і прымаўкі Лагойшчыны адрозніваюцца вялікай тэматычнай шматграннасцю і разнастайнасцю, мова іх сакавітая і надзвычай выразная. Дзякуючы намаганням А. Варлыгі, які, жывучы за мяжой, па памяці запісаў гэты фальклорны скарб, мы можам паспрабаваць спасцігнуць народную свядомасць жыхароў гэтага рэгіёна Беларусі і самім стаць больш мудрымі, бо калектыўны практычны вопыт людзей назапашваўся стагоддзямі і засяроджваўся ў традыцыі, якая выступала і выступае зараз фактычна адзіным, дастаткова надзейным падмуркам у існаванні любога чалавека, якому па прыродзе сваёй неабходна мець такі маральна-этычны кодэкс.

## МАЛЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫЯ ЖАНРЫ:
## ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Скоры паспех – людзям на смех.
Дождж ідзе не тады, як просяць, а тады, як жнуць і косяць.
Хараша гарачка пры лоўле блох.
Да Міколы не бывае ні вясны ні лета ніколі.
22 мая Мікола – галодны, а 24 – халодны.
Ждзі Пятра – з'ясі сыра.
Прыйшоў Ілля – прынёс гнілля.
Прачыстая – трэба, каб было поле чыстае.
Адзін з сошкай, а сем з ложкай.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Фярко Сяргея Пятровіча, 1937 г. н.***
***(нарадзіўся ў в. Асінавік Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.),***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Фярко В. (2000 г.)***

Давай, баба, каўбасу, бо я хату разнясу (прымаўка на Каляды).
Грамніцы – прайшло палавіна зіміцы.
Піліпаўка дзяцей адзяе.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Жылянінай Клаўдзіі Іванаўны, 1927 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Зялёнка Т. (2005 г.)***

Як свеціць сонца і дождж – гавараць, што гэта сіраты плачуць.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Жылянінай Паліны Іванаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткамі БДПУ імя М. Танка Зялёнка Т., Вярцінскай В. (2005 г.)***

Плямы на месяцы – гэта брат брата забіў і каля яго стаяць 2 вядзёрцы крыві.

Як свеціць сонца і дождж – гэта цыганкін дождж. Цыган жонку б'е, а з ёй жыве і цалуе, або гавораць, што сіроты плачуць.

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Аляксандры Міхайлаўны, 1935 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Зялёнка Т., Вярцінскай В. (2005 г.)***

Не бойся ні чорта, ні круга, не будзеш прасіць хлеба ў друга.
Дзе радзіўся – там і прыгадзіўся.

***Запісана ў в. Завішына Лагойскага р-на***
***ад Карзюк (Бахар) Яўгеніі Іванаўны, 1936 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Еш капусту з грыбамі, а дзяржы язык за зубамі.

***Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на***
***ад Мароз Настассі Ігнацьеўны,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Лапуцкай С. (2003 г.)***

Хто торбу нося, той есці ня прося.

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на***
***ад Пунтус Вольгі Паўлаўны, 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А. (2000 г.)***

На Яна баба за ягады п'яна.
Хто рана ўстае, таму пан Бог дае.

Хлеба – як спажыць, адзежы – як знасіць.
Калі пан з паноў, то дась валоў, калі пан з мужыкоў, то не дась валоў.

***Запісана ў в. Нарбутава Лагойскага р-на***
***ад Гусакоўскага Івана Іванавіча, 1922 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Домінам А., Елавой Н. (2008 г.)***

Не роўны лес – не роўныя людзі.
Замуж выйсці трэба знаць: позна легці і рана ўстаць.
Хазяйства вадзіць – не гразнаму хадзіць.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,***
***Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Век жыць – не мех сшыць.
Век пражыць – не поле перайсці.
На Яна за ягады баба п'яна.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Мялешка Ганны Васільеўны, 1927 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Прыйшоў Пахом
Агуркі сей мяхом.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Вішняк Фаіны Станіславаўны***

Муж любіць жонку здаровую, а брат сястру багатую.

***Запісана ў в. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Жоравай Вольгі Сцяпанаўны, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мусько К. (2003 г.)***

Сена на Юр'я каб было і ў дурня.

Мая маць брала вербачку пасвяцонаю і біла кароўку. Потым прыходзіла ў хлеў і пырскала пасвяцонай вадой вуглы ў хляве.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Валянціны Адольфаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткамі Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Прыйшоў Пятрок – апаў лісток.
Прыйшоў Ілля – апалі два.
Прыйшла Прачыстая – бяроза чыстая.
Прыйшла другая Прачыстая – поле чыстае.
Прыйшло Уздвіжжа – апошнюю капу з поля здвігай.
Пасля Саракоў – сорак маразоў.
Марац укусіў за палец.
Прыйшлі Грамніцы – скідай рукавіцы.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кудыбінай Т. М.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І. (2000 г.)***

Пяцьдзесят лет пражыць – не пяцьдзесят слоў сказаць.

***Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на***
***ад Рутакоўскай Наталлі Аляксандраўны, 1933 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Пабываў, дзе Макар цялят не пасціў.
Еш часцей, работай, мёрзні, на хаду німножка спі.
Да Юр'я далжно было быць сена ў дурня.
Май, каню дай, сам на печ уцякай.
Як асіны лісток затрасецца, тады бык напасецца.
В марце зімы не гонюць, а ў маі трава не расце.

***Запісана ў в. Цыннае Лагойскага р-на***
***ад Пустаход Аляксандра Сямёнавіча, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бердычавец Т., Домiным А., (2008 г.)***

Пасадзі свінню за стол – яна і ногі на стол.
Хто летам позна ўстае, той і лета не бачыць.
Бот не князь, абуў – і ў гразь.
Нічога само ня зробіцца.
І сабака на таго ня брэша, чый хлеб есць.
Абы здароўе, а работа будзе.
Дурнога салаўя дурная песня.
Дзе сем нянек, там дзіця плача.

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Надзеі Раманаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Мікуліч Н. (2005 г.)***

*Алена АЛФЁРАВА*

# ЗАГАДКІ

Загадкі – фальклорны жанр, здольны ў згорнутым выглядзе кандэнсаваць даволі значны аб'ём культурнай інфармацыі. Гэта адзін з самых старажытных жанраў, у якім захаваліся архаічныя рытуальна-міфалагічныя ўяўленні. Менавіта ў загадках закладзены той пласт духоўнай нацыянальнай культуры, тыя нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці, што адрозніваюць нашу культуру ад культур свету. У загадках, як адзначаў А. І. Гурскі, «адбіліся не толькі эмпірычныя веды чалавека аб прыродзе і рэчах, не толькі жыццёвы і працоўны вопыт многіх пакаленняў, але і мудрасць народа, яго тонкая назіральнасць і надзвычайная здольнасць да мастацкага, вобразнага асацыятыўнага мыслення, яго невычарпальная фантазія, досціп і гумар» [2, с. 207]. Менавіта такая паэзія, рытмічная і рыфмаваная гармонія садзейнічаюць таму, што і сёння не страчана цікавасць да загадак з боку не толькі старэйшага, але і малодшага пакалення. Так адбываецца сувязь паміж пакаленнямі, перадача традыцыі, адметных нацыянальных ведаў, што выклікае зварот да сваёй культуры. З загадкамі кожны чалавек знаёміцца яшчэ ў дзяцінстве, атрымліваючы пачатковыя веды пра такі паэтычны сродак, як метафара, бо яшчэ Арыстоцель казаў, што «з добра складзеных загадак можна запазычваць цудоўныя метафары» [1, с. 178]. Так дзіця пачынае пазнаваць чароўны паэтычны свет беларускага фальклору, створанага на непаўторнай беларускай зямлі. Жывёльны і раслінны свет Беларусі падказаў цудоўныя вобразы, праз якія загадваюцца адушаўлёныя і неадушаўлёныя аб'екты, і праз якія ў тым ліку перадаецца ўяўленне пра навакольны свет. Напрыклад, дзверы загадваюцца праз вобразы лісіц і свінні (*«Паміж лісіц свіння вісіць»*); дзядоўнік паўстае ў выглядзе незвычайнага дуба (удала выкарыстаны прыём гіпербалізацыі): *«На гары гаранскай стаіць дуб шатанскі, хто за яго прымецца, той скрывіцца»* [3, № 520]. Поўнымі такой жа паэзіі, хараства, адлюстраваннем народнай духоўнай культуры з'яўляюцца загадкі, запісаныя на Лагойшчыне. І тут адзначаецца тая неперарваная сувязь паміж пакаленнямі, бо загадкі запісваліся як ад дарослых, так і ад дзяцей (8-10 год). Рытміка, рыфма, незвычайныя метафары, метанімія, гукапіс, словатворы, трапна заўважанае падабенства загаданага аб'екта і яго метафарычнага вобраза садзейнічаюць таму, што загадкі лёгка запамінаюцца і бытуюць у дзіцячым асяродку.

Загадкі, запісаныя на Лагойшчыне, адносяцца да разнастайных тэматычных груп пра: неба і нябесныя свяцілы, час, стыхіі і з'явы прыроды (сонца, неба, дзень, ноч, год, вецер); раслінны свет (лён, грыб, мак, агурок, качан, жолуд, морква, цыбуля, елка); жывёл, насякомых, птушак, рыб (карова, жук, павук, пчала, птушка, рыба); часткі цела чалавека (вочы); прадметы хатняга ўжытку, часткі жылля, інтэр'ер (печ, агонь і дым, замок, стол, дзверы, чапяла, нажніцы); прылады працы (барана, серп); шляхі зносін (дарога); культурныя аб'екты (кніга).

Усе гэтыя загадкі ахопліваюць той набор аб'ектаў, які акаляў чалавека, быў для яго вельмі важным і неабходным, але здзіўляе тут менавіта паэтызацыя, здавалася б, на першы погляд звычайных рэчаў. Пры гэтым неадушаўлёныя прадметы ў паэтычным свеце загадак становяцца адушаўлёнымі (ноч – карова; ножкі стала – чатыры браты) і наадварот, жывыя істоты пераўвасабляюцца ў нежывыя матэрыяльныя аб'екты (карова – гара (капна), свіння – лазня (пуня), бочка [3, № 1005, 1006, 1079, 1084]). У гэтых пераўвасабленнях якраз і заключаецца адна з таямніц такога жанру, як загадкі, яго непаўторнасць і адметнасць. Вобраз у загадках узнікаў дзякуючы пільнаму воку назіральніка, які пераўтвараў свае назіранні ў прыгожыя метафары, прыкмячаючы найбольш характэрныя рысы загаданага аб'екта і, разам з тым, нібы пераўвасабляючы яго ў адметны метафарычны вобраз, часам цалкам фантастычны: *«Кацілася кадушачка, ні звер, ні птушачка, ні агонь, ні вада. Адгадаць – нікагда. (Сонца)»*. Такія прыродныя з'явы, як, напрыклад, вецер, якія нельга ўявіць праз пэўны матэрыялізаваны вобраз (чалавека або жывёлы), у большасці выпадкаў выступаюць праз характэрныя для іх дзеянні, што дапамагае стварыць у загадцы дынамічную сітуацыю: *«Без рук, без ног, но бежыт»*.

У загадках, запісаных на Лагойшчыне, адлюстраваліся вельмі старажытныя міфалагічныя ўяўленні, асабліва ў варыянтах пра прыродныя аб'екты і з'явы. Так, ноч уяўлялася каровай – жывёла, якая лічылася атрыбутам і ўвасабленнем багоў (*«Прыйшла чорная карова ды ўсіх людзей*

*пабарола»*); год атаясамліваецца з яйкам, якое зносяць птушкі, па колькасці роўныя месяцам і тыдням. Само яйка ўспрымалася як сімвал новага жыцця, з яго, паводле міфалагічных уяўленняў, узнік свет, зямля і неба [4, с. 681] (*«Дванаццаць арлоў, пяцьдзесят дзве галкі знеслі адно яйцо»*); печ, агонь і дым выступаюць у якасці сямейнікаў з характэрнымі для іх рысамі (*«Маці таўстуха, дачка краснуха. А сын перабор выскачыў на двор»*); неба – покрыва зямлі, якое ўвасабляецца праз розныя культурныя рэаліі, у прыватнасці, дзяружку (*«Сіняя дзяружка весь свет пакрыла»*). Паколькі гэтыя загадкі адны з найбольш старажытных, іх метафарычныя вобразы сустракаюцца ва ўсіх славянскіх народаў, у некаторых варыянтах маючы і некаторыя адметныя нацыянальныя адрозненні пры захаванні агульнай функцыі. Так, праз сямейныя адносіны ва ўкраінскіх, польскіх, славацкіх і чэшскіх загадках выступаюць (у параўнанні з беларускімі) неба, зямля, дым (вецер), ноч і іншыя прыродныя аб’екты, што таксама выявіла першапачатковыя міфалагічныя веды. Хутчэй за ўсё, падобныя загадкі былі вядомы і беларусам, але паступова пачалі выяўляць менавіта прадметы інтэр’ера, дзе такія адносіны былі больш празрыстымі і зразумелымі. Функцыя неба – абарона зямлі, яе покрыва. Ва ўкраінскіх загадках метафарычны замяшчальнік неба – тыповае стэпавае жыллё – шацёр. У польскім варыянце адлюстраваліся сакральныя ўяўленні, што сфарміраваліся пазней у параўнанні з рытуальна-міфалагічнымі ўяўленнямі: неба атаясамліваецца з касцёлам (і наадварот, касцёл – гэта нябесныя сутарэнні). У беларускіх загадках неба выяўляецца праз дзяружку, палатно – вырабамі з ільну. Гэтая расліна і сёння з’яўляецца адным з сівалаў Беларусі. Для нашага народа ён адыгрываў вызначальную ролю ў гаспадарцы: з яго ткалі ручнікі і посцілкі, лён з’яўляўся матэрыялам для адзення, служыў ежай для жывёлы і для людзей, з валокнаў рабілі вяроўкі і г. д. Таму не дзіва, што гэтая раслінная культура і вырабы з яе сустракаюцца не толькі ў метафарычнай частцы загадкі. Існуе вялікая колькасць загадак, дзе лён выступае ў якасці аб’екта загадвання. На Лагойшчыне адзін з запісаных варыянтаў прапануе вобраз жывёлы (у іншых тэкстах беларускіх загадак гэта лось): *«Галаву ядуць, косці выкідваюць, а скуру надзяваюць»*.

У сваю чаргу адметная асаблівасць агурка (вялікая колькасць насення) дазваляе загадаць яго праз матэрыяльны аб’ект – хату (горніцу) з вялікай колькасцю насельнікаў. Пры гэтым у загадках перад намі выступае не звычайнае жыллё, што адразу скіроўвае шукаць адказ сярод іншых аб’ектаў: *«Без акон, без дзвярэй, поўна хата людзей»*.

Характэрны знешні выгляд капусты і цыбулі дазволіў загадаць іх праз вялікую колькасць адзення, а цыбуля мае і іншую прыкмету – здольнасць выклікаць слёзы, што таксама не засталося па-за ўвагай загадак: *«Лата на лаце, без іголкі шыта. (Качан)»*; *«Сядзіць дзед у сто шуб адзет. Хто яго раздзявае, той слёзы пралівае. (Лук)»*.

У беларускіх загадках пра жолуд удала спалучаюцца перанос па форме або функцыі (дзве часткі – начоўкі; сярэдзіна – саланіна) і гіпербалізацыя (з маленькага плода можна зрабіць шмат прадметаў): *«Пайду ў лес, высеку цяльпельж. А з таго цяльпельжа будзе века і дзяжа, дзве порцыі саланіны і двое начовачак»*.

У загадках пра жывёльны свет пры характарыстыцы метафарычнага вобраза на першае месца выступаюць яго адметныя рысы або дзеянні. Так, здольнасць птушкі нараджацца двойчы (першы раз – калі зносіць яйка, другі – з’яўленне з гэтага яйка) адзначана ў большасці беларускіх загадак: *«Два разы раджаецца, ні разу не хрысціцца, адзін раз памірае»*.

Жук у адной з загадак, запісаных на Лагойшчыне, загадваецца толькі праз акцыянальныя характарыстыкі: *«Ляціць – вые, сядзе – землю рые»*. Фантастычны і супярэчлівы вобраз у загадках пра павука, дзе суб’ект выконвае дзеянні без патрэбных для гэтага прылад працы і частак цела: *«Без станка і без рук, а кросны тчэ»*.

Зразумела, найбольш шанаванай свойскай жывёлай з’яўлялася карова, без якой нельга было ўявіць паўнавартаснае жыццё сям’і, яе дабрабыт. Таму гэтая істота і стала аб’ектам загадвання ў шматлікіх варыянтах. Пры гэтым у большасці беларускіх загадак яна пяшчотна называецца «рыкуляй». Існуе безліч варыянтаў, што, з аднаго боку, здаюцца незразумелымі (праз выкарыстаныя ў іх словатворы), а з другога – садзейнічаюць стварэнню адметных тэкстаў, што выклікаюць і ўсмешку. Адзін з такіх адметных варыянтаў зафіксаваны на Лагойшчыне: *«Чатыры хадаталі, два бадаталі, два талімухталі і талімахталі»*. Семантыка гэтых словатвораў празрыстая: ад дзеясловаў «хадзіць», «бадаць» і «матаць». Але пры дапамозе адметнага словаўтварэння ствараецца непаўторная прыгожая загадка.

Такая ж адметна рэгіянальная і загадка пра пчалу, што ўяўляе невялікі верш з прыгожай дакладнай рыфмай і вобразам «гераіні», якая прамаўляе ад першай асобы:

*Не хадзіце, дзеці, каля саду,*
*Як увіджу, так і сяду.*
*Я такую вуду маю,*
*Як закіну, не выймаю.*

Адной са сфер, у якой даволі яскрава выяўляюцца адметныя нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці, выступае сфера матэрыяльнага побыту: жыллё, прадметы інтэр'ера і побыту, прылады працы. Таму такая адметнасць адлюстравалася і ў культуры духоўнай, у тым ліку ў загадках, як у дачыненні да адгадак, так і ў адносінах да метафарычнай часткі. Так, нацыянальна і рэгіянальна адметнай з'яўляецца загадка пра чапялу, што выступае праз некалькі маркіравана зніжаны вобраз з адметнай колеравай характарыстыкай: *«Чорная балда па пячы гайда»*. У дачыненні ж да такога прадмета працы, як серп, наадварот, выкарыстоўваюцца эпітэты з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі: *«Маленькі, гарбенькі ўсё поле абышоў і дамоў прыйшоў»*. У абодвух выпадках на магчымую адгадку, акрамя пазначаных колеравых і знешніх рыс, паказвае таксама і месцазнаходжанне загаданых аб'ектаў.

У той жа час ёсць агульнаславянскія варыянты загадак, напрыклад, пра нажніцы і замок. Гэтыя загадкі ўзгадваюцца аднымі з першых. У тым ліку і дзецьмі. У варыянце з адгадкай «нажніцы» лёгка пазнаецца загаданы аб'ект па апісанні яго знешняга выгляду без выкарыстання метафарычнага пераносу: *«Два кальца, два канца, а пасярэдзіне гвоздзік. (Нажніцы)»*. А вось загадка пра замок падае цудоўны паэтычны вобраз, дзе перанос адбываецца па функцыі, але з выкарыстаннем адмоўных часціц, што выключае з ліку магчымых адгадак адушаўлёных істот: *«Не лае, не кусае, а ў дом не пускае»*.

Разнастайныя варыянты пра кнігу падаюцца ў выглядзе вершаваных твораў, дзе адлюстраваны і яе функцыянальнае прызначэнне, і знешні выгляд. Усе гэтыя варыянты запісаны ад бібліятэкара, што адпаведным чынам паказвае на суадносіны прафесіі і зместу загадак: *«Белае поле, чорнае насенне, / Хто яго сее, той разумее»*; *«Не куст, а з лісточкамі, / Не чалавек, а расказвае»*.

Сёння адной з асноўных сярод шматлікіх функцый загадак, на наш погляд, застаецца эстэтычная, побач з выхаваўчай, бо менавіта праз загадкі можна пазнаёміцца не толькі з цудоўнай мовай, уменнем у трапнай кароткай фразе стварыць непаўторную маляўнічую карціну. Маляўнічая прырода Лагойшчыны, яе спакойны ландшафт і гармонія наваколля не маглі не паўплываць на выкарыстаныя ў фальклорных творах, у тым ліку і ў загадках, вобразна-паэтычныя сродкі. Яны садзейнічаюць эстэтычнаму, у тым ліку і патрыятычнаму выхаванню, выклікаюць павагу да роднай культуры, да сваёй малой радзімы, імкненне зберагчы яе, каб перадаць наступным пакаленням.

**Літаратура**

1. Аристотель. Поэтика / Аристотель // Античные теории языка и стиля / под общ. ред. О. М. Фрейденберг. – М. – Л., 1936. – С. 174–188.

2. Гурскі, А. І. Загадкі / А. І. Гурскі // Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка; Т. В. Валодзіна [і інш.]; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск, 2004. – С. 167–250.

3. Загадкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 363 с.

4. Мифы народов мира: энциклопедия: в 2 т. / гл. ред С. А. Токарев. – М., 1998. – Т. 2: К–Я.

## МАЛЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫЯ ЖАНРЫ:
## ЗАГАДКІ

Дванаццаць арлоў, пяцьдзесят дзве галкі знеслі адно яйцо. (Год)

Вісіць світа не рукамі звіта. (Павуціна)

Ляцела сарока, за ёй сорак. Колькі ляцела сарок? (Дзве)

Ехаў не дарогай, сцёгаў не пугай, шыбаў не палку, злавіў не галку, шчыпаў не пер'е, еў не мяса. (Рыба)

*Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на*
*ад Войніч Алены Уладзіміраўны, 1936 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Макей І. (1992 г.)*

Галаву ядуць, косці выкідваюць, а скуру надзяваюць. (Лён)

* * *

Быў я на копанцы,
Быў я на хлопанцы,
Быў на пажары,
Быў на базары.
Молад быў – людзей карміў,
Стары стаў – не патрэбны стаў.
Мае косці выкінулі ў яму,
Іх і сабакі не ядуць. (Гаршок гліняны)

*Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на*
*ад Грынкевіча Івана Міхайлавіча, 1923 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шавель Т. (2000 г.)*

Пад прыпечкам, пад чарапочкам б'е чорт малаточкам. (Часы)

*Запісана ў в. Бяларучы Лагойскага р-на*
*ад Андросавіч Леаніды Васільеўны, 1927 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кульба В.*

* * *

Вісіць, баўтаецца, усе за яго хватаюцца. (Рушнік)

*Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на*
*ад Жылянінай Клаўдзіі Іванаўны, 1927 г. н.,*
*студэнткамі БДПУ імя М. Танка Зялёнка Т., Вярцінскай В. (2005 г.)*

* * *

Маленькае, кругленькае, а за хвост не паднімеш. (Клубок нітак)

Чатыры паненачкі ў адну даёначку. (Вымя каровы з малаком)

Стаіць Кася, на полі расцiглася,
Як устане, дык неба дастане. (Дарога)

*Запісана ў в. Дамашы Лагойскага р-на*
*ад Старэвіч Кацярыны Іванаўны, 1914 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кутас В. (2000 г.)*

Ходзе тота каля плота і пытаецца, ці дома ляпёта. (Воўк і сабака)

*Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на*
*ад Гатоўка Елізаветы Мікалаеўны, 1911 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Рубін Ж.*

* * *

Прыйшоў ён да яе,
Абмацаў яе, пастаяў ля яе
І ўзлез на яе.
І сядзеў да поту,
Пакуль не сагнаў ахвоту. (Печ)
Ляжыць бася – расцяглася,
А як устане –
Дый і неба дастане. (Дарога)
Ляжыць не бяжыць, а як устане, дык і да неба дастане. (Дарога)
Прыехалі камісары, усё поле пакрамсалі. (Барана)

***Запісана ў в. Жасцінае Лагойскага р-на***
***ад Жук Юзэфы Міхайлаўны, 1911 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Рудак Т.***

Лата на лаце, без іголкі шыта. (Качан)
Паміж лісіц свіння вісіць. (Дзверы)
Чорная балда па пячы гайда. (Чапяла)

***Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на***
***ад Давідовіч Ганны Аляксандраўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н. (1998 г.)***

Не хадзіце, дзеці, каля саду,
Як увіджу, так і сяду.
Я такую вуду маю,
Як закіну, не выймаю. (Пчала)

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

Два разы раджаецца, ні разу не хрысціцца, адзін раз памірае. (Птушка)

Пайду ў лес, высеку цяльпельж. А з таго цяльпельжа будзе века і дзяжа, дзве порцыі саланіны і двое начовачак. (Жолуд)

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Філіповіч Веры Пятроўны, 1916 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Войцік А.***

Сіняя дзяружка весь свет пакрыла. (Неба)
Без рук, без ног, но бежыт. (Вецер)
Сідзіт красавіца в цемніцы, а каса на ўліцы. (Морква)
Без акон, без дверэй пална горніца людзей. (Агурец)
Сто адзёжак і все без засцёжак. (Лук)
Зімой і летам аднім цветам. (Ёлка)

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Гусак Аляксандра Пятровіча, 1999 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Полна бочачка віна, нідзе дырачкі няма. (Яйцо)
Два кальца, два канца, а пасярэдзіне гвоздзік. (Нажніцы)

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Рабчуна Ягора Аляксандравіча, 2000 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Кананеравай С., Гусціновіч І.***

Чатыры хадаталі, два бадаталі, два талімухталі і талімахталі. (Карова)
Прыехала Альжушка ў сямі кажушках. Хто яе ўбачыць, той і заплачыць. (Цыбуля)

***Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на***
***ад Лобань С., 1922 г. н.***

Прыехала Альжушка ў сямі кажушках.
Хто яе ўбачыць, той і заплачыць. (Цыбуля)

***Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на***
***ад Лобань С. А., 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук М. (1997 г.)***

Маленькі, гарбенькі ўсё поле абышоў і дамоў прыйшоў. (Серп)

***Запісана ў в. Скарады Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык Жанны Канстанцінаўны, 1968 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

У нашага Янука доўгая рука. (Калодзеж з жураўлём)
Сіненькі, гарбаценькі ўсё поле абскачыць. (Серп)
Хоць сам худ, а галава з пуд. (Бязмен)
Вісіць сіта – не рукамі, не нагамі звіта. (Павуцінне)
Кацілася кадушачка, ні звер, ні птушачка, ні агонь, ні вада. Адгадаць – нікагда. (Сонца)
Ідуць чатыры браты, у адзін след ступаюць, адзін аднаго не даганяюць. (Колы)

***Запісана ў в. Слабада Лагойскага р-на***
***ад Матрашылавай Ганны Сцяпанаўны, 1902 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Бурдыка І.***

Два стаяць,
Два ляжаць,
Пятый ходзіць,
Шостый водзіць,
Сёмый песенькі пяець. (Дзверы)

***Запісана ў в. Убалацце Лагойскага р-на***
***ад Аўхачовай Ганны Ігнатаўны, 1930 г. н.***
***(раней пражывала ў в. Селішча Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.),***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук М. (1997 г.)***

Не лае, не кусае, а ў дом не пускае. (Замок)
Два кальца, два канца. А пасярэдзіне гвоздзік. (Ножніцы)
Сядзіць дзевіца ў цямніцы, а каса на вуліцы. (Морква)
Сядзіць дзед у сто шуб адзет. Хто яго раздзявае, той слёзы пралівае. (Лук)

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Нікіцінай Тамары Вікенцьеўны, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М., Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

Белае поле, чорнае насенне,
Хто яго сее, той разумее. (Кніга)
Не куст, а з лісточкамі,
Не чалавек, а расказвае. (Кніга)
Яны чорныя, крывыя,
З нараджэння ўсё нямыя,
А калі пастануць поруч,
Як жывыя загаворуць. (Літары)

Не світа, а сшыта,
Не куст, а з лісточкамі,
Маленькага росту.
Хто яе знае, той розум мае. (Кніга)

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад бібліятэкара Вязовіч Марыі Іванаўны, 1951 г. н.***

Дванаццаць арлоў, пяцьдзесят дзве галкі знеслі адно яйцо. (Год)
Вісіць світа не рукамі звіта. (Павуціна)
Ляцела сарока, за ёй сорак. Колькі ляцела сарок? (Дзве)
Ехаў не дарогай, сцёгаў не пугай, шыбаў – не палку, злавіў – не галку, шчыпаў – не пер’е, еў – не мяса. (Рыба)

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Войніч Алены Уладзіміраўны, 1936 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Макей І. (1992 г.)***

Галаву ядуць, косці выкідваюць, а скуру надзяваюць. (Лён)

***Запісана ў в. Буда Лагойскага р-на***
***ад Грынкевіч Івана Мікалаевіча, 1923 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шавель Т. (2000 г.)***

Ляціць – вые, сядзе – землю рые. (Жук)
Прыйшла чорная карова, ды ўсіх людзей пабарола. (Ноч)
Усю зямлю прайшоў, чорну шапачку знайшоў. (Грыб)
Поўна дзеўка круп, а на версе – струк. (Мак)
Два браты цераз мяжу жывуць, а адзін аднаго і не відзяць. (Вочы)
Без акон, без дзвярэй, поўна хата людзей. (Агурок)
Ані шпунта, ані дна, поўна бочачка віна (Яйцо)
Без станка і без рук, а кросны тчэ. (Павук)
Маці таўстуха, дачка краснуха. А сын перабор выскачыў на двор. (Печ, агонь, дым)
Не брэша, не кусае, а ў хату не пускае. (Замок)
Пад адной страхой чатыры браты стаяць. (Стол)

***Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на***
***ад Макейчык Ніны Васільеўны***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.***

Белае поле, чорнае насенне,
Хто яго сее, той разумее. (Кніга)
Не куст, а з лісточкамі,
Не чалавек, а расказвае. (Кніга)
Яны чорныя, крывыя,
З нараджэння ўсё нямыя,
А калі пастануць поруч,
Як жывыя загаворуць. (Літары)
Не світа, а сшыта,
Не куст, а з лісточкамі.
Маленькага росту.
Хто яе знае, той розум мае. (Кніга)

***Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на***
***ад бібліятэкара Вязовіч Марыі Іванаўны, 1951 г. н.***

## Дражнілка

Лапаць-лапаць – няма чаго ляпаць.
Як у пяце, так і ў носе,
Які спляце, такі і знося.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***
***ад Лапцэвіч Ганны Антонаўны, 1931 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)***

## Забаўлянка

У цёмным лесе мур мураваны,
Мур мураваны, не пабелены.
А ў тым лесе жыла хайка,
Ня ўмела пеці і спяваці.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Залуцкай Таццяны Міхайлаўны 1922 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны***

## ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

### Гульні

Звычайна мы іграем у краскі. Вядушчый – чорт. Чорт прыходзе да мачахі. I гаварыць: «Шуба, шапка і пальто, на табе і сто». А мачыха выбірае краску. Сціталкі. «Ехала белка на цялежцы, прадавала ўсем арэшкі, каму два, каму тры, выхадзі із круга ты, а із круга не ўйду, усе арэшкі пагрызу».

«Чыкі-брыкі, пальчык выкінь». Выігрывает тот, у кого меньше засталося пальцаў на руцэ.

### Вершы

Верабейка ціў – ціў,
Колас дзюбкай ухапіў,
Патаму што ён быў добры,
Па зярнятку ўсём дзяліў,
Елі зерне ўсё са смакам,
Шчабяталі: дзякуй! Дзякуй!

***Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на***
***ад Анішкевіч Юлі, 1998 г. н.***

### Калыханка

Пашлі, каток, на масток
Лавіць рыбку за хвасток.

Люлі-люлі, прыляцелі гулі,
Селі на варотах у чырвоных ботах.
Селі на варотах, сталі сакатаці,
Што дзіцяці даці.
А ці даці піражок,
Даці абараначку – дзеткам на забавачку.

***Запісана ў в. Асінцы Лагойскага р-на***
***ад Солуб Лідзіі Іванаўны, 1946 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С.,***
***Якавеніч А., Богдан Н. (2008 г.)***

### Жарты

З кепскай гаспадыняй кепска жыць вядома,
А ні з ёю ў людзі, а ні з ёю дома.
Не жыццё, а мука, хоць скачы ты жабай,
Калі не ўдасца табе твая баба.
Нават пабажуся, што ў ніякім чыне
Не крану і пальцам гэтай гаспадыні.
Пойдзе яна карову даіць – малако цурыцца
Болей на даёнку, а на спадніцу.
Пойдзе печку паліць – пашчыпае смолку,
І дроў на чалеснік пакладзе без толку.
Стане часаць галову – у галаве як маку,
Знаць, век не часала – косаў а ні знаку.
Так, з ёй ўсё жыццё пратаўчэшся, і няма чаго дабра,
Пакуль жыць з ёй сабярэшся – паміраць прыйдзе пара.

***Запісана ў в. Дамашы Лагойскага р-на***
***ад Старэвіч Кацярыны Іванаўны, 1914 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кутас В. (2000 г.)***

Дзяўчыны і жанчыны хадзілі па вуліцэ ўтраём, абдымаючы заборы суседзей, прыгаворваючы: «Вашы заборы трысуцца – нашы куры нясуцца.

Пашла курыца ў аптэку, закрычала: «Ку – ка – рэ – ку! Дайце пудры і духоў для прыманкі петухоў».

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойсккага р-на***
***ад Паўлавай Мар'і Ігнацьеўны, 1940 г. н.***

**Калыханка**

Пусть приснятся Олечке
Ласковые сны,
Белки и медведи,
Волки и слоны.
Будет наша Олечка
Крепко, крепко спать,
Будет наша Олечка
Быстро подрастать (…)

Когда я была маленькая, мне мама ещё рассказывала такую сказку:
Идёт бычок качается,
Вздыхает на ходу.
Вот досточка кончается,
Сейчас я упаду (…)

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Мерыневіч Вольгі, 2000 г. н.***

**Лічылкі**

Вода не вода – вода свабода. (Калі гулі гуляюць у даганялкі).
Чыкі – брыкі, пальчык выкінь.
Ехала белка на цележкі,
Прадавала всем арэшкі.
Каму два, каму тры,
Выхадзі із круга ты.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Гусак Аляксандра Пятровіча, 1999 г. н.,***
***студэнткамі Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Дзіцячыя песні**

Я бегу па полю, а в руке сачок,
Он такой голубой.
От него не скроется ні жучок, і нікто другой.
Рапс, парарурарурапс, парурарурапс.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Гусак Аляксандра Пятровіча, 1999 г. н.,***
***студэнткамі Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Лічылка**

Вышел немец із тумана, вынял ножык із кармана. Буду рэзаць, буду біць, с кем астаця дружыць.

Ехала машына цёмным лесам за какім-та інцересом. Інц-інці-інцірес, выході на букву с. А на буквачкі звезда, там, дзе ходзят паезда. Еслі поезд не прайдзёт, пасажыр с ума сайдзёт. Вот і поезд не прашол, пасажыр с ума сашол.

***Запісана ў в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Рабчуна Ягора Аляксандравіча, 2000 г. н.,***
***студэнткамі Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Калыханка**

Баю, баюшкі, баю,
Не лажыся на краю,
Прыйдзя серынькі ваўчок
І ўкусе за бачок.

***Запісана в. Пуцілава Лагойскага р-на***
***ад Дрозд Галіны Антонаўны, 1932 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Пінчуковай Н., Канцавой М.***

**Калыханка**

Люлі, люлі, люлі,
Паляцелі куры.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі сакатаці,
Што вам куры даці.
Насыплю гароху –
Хай ядуць патроху.
Насыплю жыта
Поўнае карыта.

***Запісана ў в. Штанюкі Лагойскага р-на***
***ад Крэнь Марыі Станіславаўны, 1938 г. н.***

**Калыханкі**

Люлі-люлі-люлі,
Усе дзеці паснулі,
Адзін мой сыночак
Не спіць, не гуляе –
З катком размаўляе.

***Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на***
***ад Жаўняровіч Т. І., 1923 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н.***

А-а-а, малое,
На лета – другое.
А гэта ўжо падрасце
І конікаў павядзе,
На пастачку пагоніць
І дубчыкаў наломіць,
І ягадак набярэ,
І дамоўкі прынясе,
Дась татачку – каласку,
Што ў сінім паяску,
І мамачцы-любцы,
Што люляла ў люльцы.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Шыла Л. Н., 1969 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л.***

Люлі-люлі, спацькі,
Няма дома бацькі,
Пайшоў у арэшкі,
Шукаючы сцежкі.

Шукаў-шукаў, не знайшоў,
Заплакаў, дамоў прыйшоў.

***Запісана ў в. Бяларучы Лагойскага р-на***
***ад Мароз Н. П.,1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кульба В.***

Люлі-люлі, спацькі,
Няма дома бацькі,
Пайшоў бацька на таржок
Купіць Сашку піражок
І бараначку на забавачку.

***Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на***
***ад Давідовіч Г. А., 1932 г. н.***

Ай, люлі-люлі,
Прыляцелі куры.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі сакатаці,
Што дзіцятку даці?
Даці, даці млечка,
А ў руку яечка.
А гэтага мала –
Даць кусочак сала.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Кізінай С. А., 1917 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Атрашкевіч. Ф.***

Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі куры.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі сакатаць,
А што курам есці даць?
Ці аўса каласа?
Ці ячменю жменю?
Ці жыта карыта?
Ці гароху троху?
Ці грэчанькі ражку,
Маленькай на кашку?

***Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на***
***ад Макейчык Н. В., 1966 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.***

Ой, люлі-люлі,
Прыляцелі куры.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі сакатаці,
І дзіцяці нельга спаці.

***Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на***
***ад Лобань С. А., 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Райчук М.***

Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі сакатаці,
Што курам даці?
Каня варанога,
Трошку гарошку,
Жменьку ячменьку,
Каробу бобу,
Паўмеха грэчкі,
Каб нясліі яечкі.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кудыбінай Т. М., 54 гады,***
***Зап. Кудыбіна І. П. Ф. 1, воп. 6, № 444.***

Люлі-люлі-люлі,
Падраў каршун куры.
Паклаў у радочак
На цэлы гадочак.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Папроцкай А.І., 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэвіч С.***

Люлі-люлі-люлі,
Паляцелі куры.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі сакатаці,
Што сыночку даці:
Ці курку-сакатушку,
Ці авечачку-бляюшку,
Ці цялушачку-брыкушку.

***Запісана ў в. Траянец Лагойскага р-на***
***ад Жаўняровіч Т.І., 1923 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н.М.***

Люлі-люлі-люленькі,
Ды ляцелі кураньkі,
Ды ляцелі кураньkі вон, вон.
Вы нясіце хлопчыку сон, сон.
Люлі-люлі, бай-бай,
Хутчэй, малы, засынай.

***Запісана ў в. Мачужычы Лагойскага р-на***
***ад Ванзонак Н. М., 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Турбал А.***

А псік, а псік, коця,
Не спі на рабоце,
Спі ў новенькай хатцы
На белай краватцы.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кудыбінай Т. М.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

Люлі-люлі-люляю,
Наб'ю катка, налаю,
Каб ён рана не хадзіў
І дзіцятка не будзіў.

***Запісана ў в. Акцябр Лагойскага р-на***
***ад Макей М. Ф., 1910 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Макей І.***

А псік, каток, пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток,
Падумаў, падумаў,
Ці самому есці?
Ці Кацюшы несці?
Адзін разок укушу
І Кацюшы занясу.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кудыбінай Т. М.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

Ходзя коця па плоце
У чырвонай капоце.
Зваліўся ў крапіўку,
Папёк свае лапкі,
Палез на палаткі
Пагрэць свае лапкі.
Лапкі сталі грэцца,
Няма дзе дзецца.
Палез бы да лоўкі,
Баіцца кароўкі.
Палез бы на вышкі,
Дык баіцца мышкі.

***Запісана ў в. Карбачоўка Лагойскага р-на***
***ад Жалабковіч В. І.***

Баю-баю, каточак,
Злізаў бабчын мядочак.
Сама бабка злізала,
На каточка сказала.
Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
Сам не ведаў, што рабіць:
Ці самому есці?
Ці дзіцятку несці?
Сам трошачку ўкусіў
І дзіцятку прынасіў.
Апсік, апсік, коця,
Мой сынок спаць хоча.
А ты, каток, не вурчы,
А ты, каток, памаўчы.

***Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на***
***ад Саевіча М. Я.,1930 г. н.***

**Забаўлянкі**

Ішоў Бай па сцяне
У чырвоным жупане.
Нёс сямёра лапцей
І жане,
І сабе,
І дзяцёнку,
І кацёнку па лапцёнку.
Баіць, ці не?
Бай.

*Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на*
*ад Давідовіч Г. А., 1932 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н.*

Чыры-чыры барана –
Зарэзалі рака.
Каму ножкі,
Каму рожкі,
А Танічцы... хвосцік.

*Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на*
*ад Кішкурна А. А.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясюкевіч Т.*

Тра-та-та,
Тра-та-та,
Пайшла баба за ката,
За ката-катовіча,
За ваўка-ваўковіча.
За новыя сені –
Ваўкі бабу з’елі.

* * *

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Навару гарошку,
Сам з’ем трошку,
Каню дам ложку.
Дарожка крывая,
Кабылка храмая,
Запрагу цялежкі,
Пааеду ў арэшкі.
Зарэжу барана,
Паеду да пана.

*Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на*
*ад Кудыбінай Т. М.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.*

Ідзець каза рагатая,
Бадаць дзіця пузатае,
Закалю цябе рагамі,
Затапчу цябе нагамі,
Хвосцікам замяту,
Закалю, закалю, закалю.

*Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на*
*ад Лобань С. А., 1922 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук М.*

А шэрая козанька
Тапу-тапу скоранька,
Пераскочыла праз плот
Ды пабегла ў агарод.
Аб’елася цыбуліны –
Крычыць, бяжыць па вуліцы;
Аб’елася часнаку –
Крычыць, бяжыць па таку.

***Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на***
***ад Радкевіч П. А., 1918 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Хадаровіч Т.***

Ладу-ладу-ладкі,
Паеў кот аладкі.
Котка перапечкі
Пацягала з печкі.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Фярко М. І., 1907 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Фярко В.***

Ласачка-Парасачка, дзе была?
– У Бога.
– Што рабіла?
– Кросны ткала.
– Што зарабіла?
– Кусок сала.
– Дзе дзела?
– Сама з’ела.
– Чаму мне не пакінула?
– Забылася.
– Каб ты ўдавілася.
– Я ў норку ўцяку.
– А я за хвосцік злаўлю.

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на***
***ад Кудыбінай Т. М.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кудыбінай І.***

Чыкі, чыкі, сарока,
Паляцела далёка.
Села ў пана на таку,
А пан кажа: «Засяку!»
А там людзі гамоняць,
Яе з лесу гоняць.

***Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на***
***ад Папроцкай А. І., 1927 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Тамашэвіч С.***

**Заклічка**

Дожджык, дожджык, секані,
Я паеду на кані,
Богу маліцца,
Цару кланіцца.
А ў Бога сірата,

Адкрывайце варата,
Ключыкам, замочкам,
Шолкавым платочкам.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на
ад Фярко М. І.,1907 г. н.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Фярко В.***

**Дражнілкі**

Во пайшла Алёша
З батонамі.

* * *

Андрэй-варабей
На кані катаўся,
Рукі, ногі атарваў,
Без трусоў астаўся.

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на
студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А.***

Андрэй-трыбуха
З’еў карову і быка,
Семсот парасят,
Адны ножкі вісят.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на
ад Сасноўскай Г. С.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л.***

Андрэй-верабей
На кані катаўся,
Як убачыў кулямёт,
Сразу іспугаўся.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на
ад Сасноўскай Г. С.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л.***

Васю, Васю, Васіля,
З’еў карову і цяля,
А тады яшчэ падрад
З’еў дванаццаць парасят.

***Запісана ў в. Праходы Лагойскага р-на
ад Лазар Л.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Лагойкінай Н.***

А ў Колі на насу
Кошкі елі каўбасу.

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на
студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А.***

Нінка-свінка,
Спераду карзінка,
Ззаду барабан,
Вось і выйшла, як кабан.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на
ад Сасноўскай Г. С.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л. В.***

## Песенька

Зайчык маленькі,
Чым ты жывенькі?
Тымі пірагамі,
Што ў нас пад нагамі.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Фярко М. І., 1907 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Фярко В.***

## Лічылкі

Кацілася ягадка
Круга гароду.
– Хто яе пойме?
– Царскі сын.
Выйшаў, выйшаў,
Ён пайшоў,
На баярскі двор сыйшоў.

***Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на***
***ад Макейчык Н. В.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.***

Цок, цок, цумане,
Абер, фабер, дурмане.
Інкі, фінкі, драмацінкі,
Ін, фін, прач адзін.

***Запісана ў в. Касцюкі Лагойскага р-на***
***ад Лазоўскай В. П., 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ахрамейка Ю.***

Цыкаў, цыкаў матацыкл,
Усе дарогі перацыкаў.
Ён паехаў у Ленінград
Выбіраць сабе нарад:
Красны, жоўты, галубой –
Выбірай сабе любой.

***Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на***
***ад Макейчык Н. В.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаварковай Т.***

Энікі, бэнікі, елі варэннікі,
Энікі, бэнікі, клёц,
Выйшаў пузаты матрос.

***Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на***
***ад Лобань С. А., 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Райчук М.***

## Гульні

**«Чысло»**

Выбіраюць кіраўніка гульні. Ён загадвае любую лічбу, а потым падыходзіць да кожнага з удзельнікаў гульні і пытаецца, якую ён загадаў лічбу. Той павінен сказаць лічбу, якую, на яго погляд, мог загадаць кіраўнік. Калі той называе лічбу меншую за тую, якая загадана, то кіраўнік гаворыць: «Больш» і ідзе да наступнага. Калі ж большую, то гаворыць: «Менш». Гульня працягваецца да тых пор, пакуль лічба не будзе адгадана. І той, хто яе адгадае, становіцца на месца кіраўніка.

**«Палачка-выручалачка»**

Збіраецца як мага больш дзяцей і па іх колькасці бярэцца столькі ж палачак. Яны кладуцца на дошку, якая ляжыць на вялікім палене. Выбіраецца «кіч» – чалавек, які будзе шукаць дзяцей. Потым нехта разбівае палачкі і ўсе ўцякаюць. «Кіч» павінен пазбіраць іх усе і толькі тады пачаць шукаць удзельнікаў гульні. Калі ён каго знойдзе, ён павінен прыбегчы да дошкі і «застукаць» знойдзенага. Але калі хто-небудзь з нянайдзеных разаб'е дошку з палачкамі, то ўсе злоўленыя ўцякаюць зноў, а «кіч» пачынае шукаць іх спачатку.

**«Пятно»**

Спачатку выбіраецца чалавек, які будзе «пятном». Гэта робіцца пры дапамозе лічылкі, і хто першы выйдзе, той і стане «пятном». Ён бярэ мяч і лічыць да дзесяці. За гэты час удзельнікі гульні павінны ўцячы як мага далей ад «пятна». Калі ён закончыў лічыць, ён бяжыць за імі і, калі ў каго пападзе мячом, то ўжо той становіцца «пятном». Гульня працягваецца да тых пор, пакуль дзеці не заморацца.

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на***
***ад Шынкарэнка І. С.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шынкарэнка І.***

**«У золата»**

Усе дзеці стаяць у рад. Адзін гулец дзеліць золата:

– З кута іду, золата нясу,
Адгадайце, паненачкі,
Каторай палажу.

Хавае каму-небудзь золата, адыходзіць і крычыць:

– Золата, ка мне!

Той, у каго золата, павінен бегчы да вядучага. Усе сочаць за суседзямі, каб затрымаць. Калі яго не затрымалі, то ён становіцца вядучым. Гульня працягваецца.

***Запісана ў в. Заполле Лагойскага р-на***
***ад Давідовіч Г. А., 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Давідовіч Н.***

**«Граблю зямлю»**

Збіраюцца дзеці, малююць вялікі круг. Дзеляць круг па клінах. Кожны становіцца ў свой круг і называе сваю «зямлю» назвай горада, вёскі ці краіны. Лічаць, хто пачынае першы. Той першы крычыць «граблю зямлю (*напрыклад*) Азію!» і кідае палку. У гэты час ён сам і ўсе астатнія адбягаюць хутчэй ад круга, а той, у каго «грабяць», зямлю, павінен хуценька ўзяць палку і сказаць «стоп!» У таго ўдзельніка, хто адбег ад круга менш за ўсіх, ён кідае палку. Калі пацэліў, то спрабуе «адграбіць» ад яго кліна як мага больш зямлі. Пры гэтым той, хто «грабіць», павінен стаяць на сваім кліне. Калі ён не пацэліў, то «грабіць» той, у каго ён кідаў. У каго не застаецца зямлі – выбывае з гульні. А хто назбіраў сама болей зямлі – пераможца.

**«У вуглы»**

Дзеці з дапамогай лічылкі выбіраюць «квача». Той становіцца каля сцяны якога-небудзь хлява, ці хаты, ці альтанкі, ці каля іншага прамавугольнага будынка. Усе астатнія становяцца каля супрацьлеглага боку будынка і глядзяць з аднаго і другога вугла. «Квач» далічвае да дзесяці і бяжыць у любы бок – дзеці ад яго ўцякаюць. Так бегаюць вакол будынка, пакуль «квач» некага не дагоніць. «Квач» можа развярнуцца і пабегчы ў іншы бок – дзеці павінны быць пільнымі. Калі «квач» каго-небудзь дагнаў – той становіцца «квачом».

**«У варанога каня»**

Выбіраецца з дапамогай лічылкі «калдун». Ён лічыць да дзесяці, усе разбягаюцца. «Калдун» павінен каго-небудзь дагнаць і дакрануцца – «закалдаваць». Той, каго «закалдавалі», стаіць на месцы і крычыць: «Раскалдуйце меня – варанога каня!» Хто-небудзь з удзельнікаў павінен да зачараванага дакрануцца – тады той будзе адчараваны і зможа зноў уцякаць. Але «калдун» сочыць за тым, каб

гэтага чалавека не адчаравалі. Калі ён «закалдуе» усіх, то перамагае, і тады выбіраецца новы «калдун».

**«У маскоўскія хованкі»**

Выбіраецца пры дапамозе лічылкі вядучы. Ён адварочваецца ад удзельнікаў спіною. Хто-небудзь піхае вядучага ў спіну. Вядучы павінен адгадаць, хто гэта. Пры гэтым усе дзеці крычаць: «Я-я-я...». І паказваюць на сябе. Вядучы спачатку кажа, дакуль трэба бегчы таму, хто будзе шукаць, і спрабуе адгадаць, хто стукнуў. Калі ён адгадвае, то той, хто стукнуў, бяжыць, калі не – бяжыць сам. Той, хто шукае, павінен дабегчы да вызначанага месца і далічыць да дваццаці, і прабегчы назад. За гэты час усе паспяваюць схавацца. Калі ён нікога не знойдзе – становіцца вядучым. Калі знойдзе некага аднаго, а іншыя паспеюць адстукацца *(трэба прыбегчы да месца, дзе стукалі ў спіну вядучаму, пастукаць аб што-небудзь драўлянае і крыкнуць: «Тук-тук, сам за сябе!»)* – то вядучым становіцца той, каго знайшлі. Калі шукальнік знайшоў некалькі чалавек, то вядучым становіцца апошні, каго знайшлі. І гульня ідзе далей.

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А.***

**«Хто абгоніць»**

Па знаку гуляючыя скачуць на адной назе да лініі фінішу *(8–12 м)*, намагаючыся абагнаць адзін аднаго.

***Запісана ў в. Чудзенічы Лагойскага р-на***
***ад Абмётка Г. В.,1986 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Абмётка Г.***

**«У варанога каня»**

У гэтай гульні па лічылцы выбіраецца адзін удзельнік, які будзе даганяць усіх астатніх. Калі ён даганяе каго-небудзь, то той застаецца на сваім месцы і гаворыць: «Раскалдуйце меня – варанога каня». Астатнія ўдзельнікі павінны як-небудзь дабегчы да яго і дакрануцца, гэтым самым раскалдаваць стаячага, і ён пачынае разам з усімі бегаць. Удзельнік, які даганяў, павінен закалдаваць усіх удзельнікаў і, хто першы быў закалдаваны, той і будзе даганяць. Калі ўдзельнікаў шмат, то выбіраюцца два чалавекі.

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на***
***ад Гаўрыльчык А. Ф.,1982 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гаўрыльчык А.***

**«Трэці лішні»**

Усе ўдзельнікі гульні разбіраюцца па два чалавекі і становяцца ў круг. Двое застаюцца: адзін уцякае, другі яго даганяе. Той, хто ўцякае, мае права стаць перад любой парай гуляючых. Чалавек, які атрымоўваецца трэцім, павінен уцякаць і сам куды-небудзь становіцца, каб больш дзяцей пагуляла. Даганяючы павінен дакрануцца да таго чалавека, якога даганяе. Калі яму гэта ўдаецца, то даганяючы сам павінен уцякаць і куды-небудзь станавіцца. Чым хутчэй змяняюцца ўдзельнікі, тым гульня становіцца больш цікавай, вясёлай і энергічнай.

**«Абутак»**

Усе прысутныя садзяцца на лаўку і выбіраюць вядучага. Вядучы называе любую літару, і ўсе ўдзельнікі павінны знайсці на сабе якую-небудзь вопратку ці рэч на гэту літару. Калі не знаходзяць, то аддаюць адзін свой туфель. Пасля таго, як вядучы забярэ ўвесь абутак, ён яго хавае і перастаўляе як ён пажадае. Кожны ўдзельнік па чарзе кажа лічбу, і вядучы прыносіць туфель пад гэтай лічбай. Перамагае той, у каго пара туфлей сходзіцца, ён жа і становіцца вядучым. Для ўсіх, у каго абутак не сышоўся, выбіраюць люстэрка *(аднаго з удзельнікаў)* і пытаюцца ў яго, што зрабіць таму ці іншаму фанту. Затым гульня пачынаецца спачатку.

***Запісана ў в. Косіна Лагойскага р-на***
***ад Сасіноўскай Д. У.,1985 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сасіноўскай Д.***

### Страшылка

Ну, мы натомімся ў полі, дык вечарам развлякаліся: пелі, расказвалі сказкі, страшныяісторыі. Напрымер, вот такая історыя: жыў малады хлопец у лесе. Дык такі красівы быў, што страх. З нашай вёскі пашла маладая дзеўка ў лес па грыбы. Той убачыў яе і пачаў хадзіць у нашу вёску. Прыйдзе, пахватае самых красівых, незамужніх толькі. Дык усе прыгожыя баяліся хадзіць у лес.

***Запісана ў в. Церахі Лагойскага р-на***
***ад Нікіцінай Тамары Вікенцьеўны, 1930 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Булахавай М., Шурмелем С., Атрохавай В. (2008 г.)***

## НАРОДНАЯ ПРОЗА

### Разумны певень

Вот ахотнік пайшоў на ахоту. Хадзіў, хадзіў, пару сабак, нікога не ўбіў, не застрэліў. Палзёць к яму змяя. Ён толькі забіць яе, яна: «Слухай, ня бі мяне, я дам табе такую травіну, што будзеш знаць усё, што прырода гавора». Яна пакруцілася, дала травіну. «Вот, глядзі. Як каму скажаш пра травіну, адразу памрэш».

Прыходзіць вечар. Разлажыў касцёр. Чуе, як яго сабакі паміж сабой гамоняць: «Хазяін наш нікога не забіў, а нам заўтра трэба дзіч ганяць, адзін хай збегае дадому пад’есці, другі хай хазяіна ахраняе!» Адзін сабака збегаў. Другі пытаецца: «Пад’еў?» – «Не, не пад’еў, толькі ногі набіў». – Гаспадыня вады не прынесла, з’есці не зрабіла». Ахотнік думае: «Ну, падажджы. Я прыйду заўтра, дам табе вады». На другі дзень пахадзіў па лесе, забіў нешта. А вяртаецца дамоў. Жонцы кажа: «Чаму сабаку не пакарміла? Чаму вады не прынесла? З’есці не прынесла?». Баба кінулася яму ў ногі: «А мой ты чалавечак, адкуль ведаеш? – «Я табе не скажу, бо адразу памру». – «Памірай, але скажы», – прычапілася да мужыка.

Ён не вытрымаў. Памыўся, лёг на лаву паміраць. А ў хату якраз певень зайшоў. Толькі муж рот раскрыў, каб бабе праўду сказаць, а певень як закрычыць: «куд-куды! І цюк мужыка ў галаву, – лёг паміраць, і будзе жонцы праўду казаць?!»

Такая гісторыя была.

***Запісана ў в. Нарбутава Лагойскага р-на***
***ад Гусакоўскага Івана Іванавіча, 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шэцька К. (2003 г.)***

### Легенды пра паходжанне назваў

Некаторыя лічаць, што Лагойск бярэ назву ад ракі Лагазінка, якая працякае ў некалькіх кіламетрах ад горада. Другія звязваюць паходжанне назвы Лагойск са словам лог. Можа і сапраўды, таму што Лагойск размешчаны ў лагчыне, якая акаймавана ўзвышшам.

* * *

Па дарозе на вёску Гасцілавічы ўзвышаецца так званая Паненская гара. Сцвярджаюць, што тут калісьці было паселішча нашага продка – першабытнага чалавека. Выбраў ён гэтае месца не выпадкова: да гары цяжка падступіцца. А вось што гаворыць паданне аб ёй: быццам калісьці, многа-многа гадоў таму назад, на вяршыні гэтай гары юнак прызнаўся паненцы ў каханні, а калі атрымаў адмову – скінуў яе з высокай гары. З таго часу гару і сталі называць Паненскай.

***Запісана ў г. Лагойск***
***ад Русак Тамары Ермалаеўны, 1941 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сялюк А. (2003 г.)***

Раней была паляна ў лесе, дзе раней калісьці жыў Бараноўскі, потым перад вайной пераехаў. Будынкі ўсе людзі разабралі. А месца так і засталося Бараноўскім.

***Запісана ў г. Лагойск***
***ад Усцін Веры Васільеўны, 1939 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Беланоўскай М. (2003 г.)***

Багданаўкай называецца месца сярод лесу, дзе калісьці стаяла хата Багдана, які служыў у графа Тышкевіча.

### Паненская гара

Аднойчы князь паляваў і, стаміўшыся, прысеў на пні і прыснуў. Князь прысніў, што ў гэтых мясцінах у бліжэйшай вёсцы жыве вельмі прыгожая дзяўчына, у якую ён закахаўся ў сне. Праснуўшыся, князь загадаў служкам адшукаць дзяўчыну і прывесці яе на гару, каб ажаніцца з ёй. У вёсцы праведалася пра гэта непрыгожая дзяўчына, і вырашыла пайсці да

князя. Калі яна прыйшла да яго, ён стаяў спіной, а калі дзяўчына паклікала яго, то князь так напалохаўся гэтай брыдоціны, што аж скінуў яе з гары. Вось з таго часу яна (гара) завецца Паненскай.

*Запісана ў г. Лагойск*
*ад Біцуковай Вольгі Канстанцінаўны, 1939 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Мазгуновай К. (2004 г.)*

Па берагах рэчкі Вячы цягнуцца заліўныя сенажаці, якія ніжэй па цячэнні пераходзяць ва ўрадлівыя землі, дзе здаўна аселі вёскі: Пільніца, Мачаны, Вяча, Алекшычы, Беларучы. Мястэчка Беларучы – самае старое паселішча. А за ракой, за паўкілометра ад вёскі, узвышаецца высокая круглая гара – Салаўіная. Гэтую гару ад падножжа да вяршыны скрозь пакрываюць зараснікі алешыны, чаромхі, лазы – недаступныя птушыныя ўгоддзі, у тым ліку, канечне, і салаўіныя. Пачынаючы з першых цёплых вечароў разліваецца на ўсю акругу птушыная песня. Акрамя спеву, каля падножжа гары увесь час чутна і іншая песня: звонкі голас ручая, што збягяе па камянях, якому даюць ваду крыніцы. Упадае ручай у Вячу. Але спачатку ён стромка абрываецца, потым каля падножжа цячэнне трошкі запавольваецца, хаця паток усё роўна гучна цурчыць па камянях і ўзбівае белую пену, што сплывае ўніз. Вось за гэтыя белыя пеністыя «ручнікі», што ўвесь час трымаюцца на вадзе каля падножжа Салаўінай гары, ручай і назвалі Белым. Першы пабудаваны каля ручая хутар быццам таксама называлі Белы ручай. А пазней гэтая назва пераўтварылася ў Беларучча – Беларучы.

**Мачаны**

Даўней людзі жылі з працы рук сваіх, для гаспадарчых патрэб ўсё выраблялі самі. Каб пашыць адзенне, патрэбен быў матэрыял. Ніткі для тканіны рабілі з канаплянага валакна. У кожнай вёсцы, на кожнай сядзібе вырошчвалі дзеля гэтага каноплі. Потым трэба было іх добра вымачыць, каб аддзялялася валакно. У вёсцы гэтай былі вялікія сажалкі. Сюды з навакольных вёсак прывозілі людзі мыць каноплі. Адсюль і пайшла назва – Мачаны.

**Ніўкі**

Так называліся невялікія плошчы, асвоеныя для гаспадарчай дзейнасці, для вырошчвання розных культур. Часцей за ўсё гэта былі лясныя расцяробы. Вёска з такой назвай знаходзілася ў 5 кіламетрах ад Лагойска, у акружэнні лясоў. Несумненна, што ўзнікла яна на расцяробах раскарчаванай і прыстасаванай для земляробства зямлі.

*Запісана ў г. Лагойск*
*ад Сасноўскага Браніслава Уладзіміравіча, 1921 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчун Н. (2007 г.)*

Фэлінкаў ельнічак – на яго зямлі лес вырас. А Яськаў ельнік, дык Яська, на маёй памяці, памёр, а сам ельнік дык і невядома калі там вырас.

А там потым, як дойдзеш да возера, дык там ямы Фелінкавы. Яны прадавалі гліну і ямы капалі. Дык цяпер Глінішча. У вайну нас туды павялі (жанчын) і хацелі забіць усіх.

*Запісана ў в. Ляўданшчына Лагойскага р-на*
*ад Анімаховіч Алены Іосіфаўны, 1932 г. н.,*
*Анімаховіча Эдуарда Пятровіча, 1937 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Анімаховіч А. (2005 г.)*

Першапачаткова на месцы Бягомля раслі вялікія лясы, дзе вадзілася шмат розных злодзеяў. Не адзін чалавек быў там абакраны. І таму патрэбна было праязджаць іх вельмі хутка. Бягом, каб застацца з усім сваім. Таму лічаць, што Бягомль пайшоў ад словаў бег, бегчы.

* * *

У далёкія царскія часы існавалі астрогі, дзе вялі сваю службу салдаты з розных месцаў краіны і куды прывозілі розных, павінных у нечым. І на месцы гэтых астрогаў ўзнікла вёска

Астрошыцы – ад назвы «астрог» ці «астрож». А ўсё кіраўніцтва царскай абароны размясцілася недалёка ад гэтага месца і ўтварылі невялікі гарадок. І гэтая мясцовасць пачала называцца Астрашыцкі гарадок (вёска) – 5 км ад Астрошыц.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Фярко Сяргея Пятровіча, 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Беланоўскай М., (2000 г.)***

**Пра Сасноўку і П'яны лес**

За Бягомлем ёсць адно мястэчка. Даўней яно мела назву П'яны лес. Справа ў тым, што ў той час, як былі купцы, ў гэтай мясцовасці (у лесе) размяшчалася карчма, дзе яны збіраліся заўсёды і выпівалі. Потым гэты лес, гэтае мястэчка пераіменавалі ў Сасноўку, таму што там растуць адны сосны.

***Запісана ў в. Астрошыцы Лагойскага р-на***
***ад Фярко Сяргея Пятровіча, 1937 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Фярко В.***

Вёска Барсукі – у гэтай мясціне вадзілася шмат барсукоў. У гэтай мясціне жыло шмат людзей з прозвішчам Барсук.

**Вёска Жардзяжжа**

Існуюць 3 версіі паходжання назвы гэтай вёскі:

1. Укапывалі сталбы, а да іх прыбівалі жэрдзі і сушылі такім чынам сена;
2. Месца, якое было агароджана жэрдзямі і служыла для выпасу дамашняй жывёлы;
3. Некалі на гэтым месцы жыў пан Жардзецкі і ў яго была добрая сядзіба, каля якой быў добры сад, і дагэтага часу захаваліся яблыні, грушы…

Вёска Пячное – на гэтым месцы жыло шмат мужчын, якія маглі вельмі добра рабіць печы. Менавіта адгэтуль і пайшла назва вёскі.

Вёска Пунішча так названа таму, што на гэтым месцы было пабудавана шмат пунь. І да гэтага часу там, як нідзе ў іншых вёсках, знаходзіцца шмат пунь, куды звозяць сена нават з суседніх вёсак для калгаснай жывёлы.

Вёска Харошае – існуе легенда, што некалі даўно праз гэтую мясціну праязджаў нейкі чалавек. Стаміўшыся ад дарогі, ён зайшоў у адну хату і папрасіўся пераначаваць. Гаспадары не адказалі ў просьбе гэтаму чалавеку, а нават яшчэ і пакармілі яго. Тады незнаёмы чалавек падзякаваў гаспадароў і сказаў, што тут жывуць добрыя людзі. З той пары і пачалі называць гэтую мясціну Харошае.

Вёска Станавішча – на гэтым месцы людзі доўга не затрымліваліся. Яны пераязджалі ў іншыя мясціны. Менавіта ад асновы становішча – месца часовага пражывання людзей і пайшла назва вёскі.

***Запісана ў в. Жардзяжжа Лагойскага р-на***
***ад Белага Язэпа Антонавіча, 1906 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кавальчук Н.***

**Вёска Харошае**

Вось як тлумачыць назву падання. Нікога не засталося на радзіме ў адстаўнога салдата Івана Харошага. Аднойчы салдат убачыў хутар пры гасцініцы і вырашыў заначаваць, пастукаў у хату, увайшоў. За сталом сядзіць стары дзядок. Расказаў салдат пра сябе, а дзядок яму адказвае: «Заставайся ў мяне. Я хутка памру, а хата твaёй будзе». Так і застаўся на хутары Іван Харошы. Быў ён чалавек майстравы, займеў шмат сяброў, ажаніўся. Нарадзіліся ў яго сыны. Кожны з сыноў меў прозвішча Харошы. Пажаніліся сыны. Пабудавалі свае хаты. Утварылася вёска. Людзі назвалі яе Харошае.

***Запісана ў г. Лагойск***
***ад Сілаўкі І. І.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кагулевіч Т. (1994 г.)***

**Draздзішча**

Паляна ў лесе, дзе некалі жыў Дрозд са сваёй сям'ёй. Потым некуды з'ехаў. На тым месцы, дзе стаяла хата, засталася куча камення. А паляна атрымала назву Драздзішча.

*Запісана ў в. Глебаўшчына Лагойскага р-на*
*ад Усцін Веры Васільеўны, 1939 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Беланоўскай М. (2003 г.)*

**Весніно**

Вёска мая завецца Весніно. Гэтую назву яна ўзяла ад рэчкі Вяснянкі, якая працякала за вёскай. Але цяпер, на жаль, ад яе нічога не засталося. На месцы гэтай рэчкі ўтварылася доўгая лагчына, якая цягнецца вельмі далёка. Яна пралягла каля трох вёсак, каля лесу. Яшчэ старэнькія бабулі расказвалі, што калі былі вялікія дажджы і рэчка разлівалася, то на схілах пагоркаў знаходзілі ўсялякія рэчы. Аднойчы знайшлі чарапаху. Цяпер на месцы гэтай рэчкі, на пэўным яе вучастку, цячэ невялічкая крынічка. Наша вёска падзяляецца ўмоўна на 2 часткі. Іх раз'яднаюць могілкі, на якіх раней стаяла невялічкая каплічка, але яе разбурылі ў савецкі час. Жыхары адной часткі завуць жыхароў другой часткі тагосельцамі, як бы таго сяла. Але на самой справе гэта адна вёска.

Праз рэчку і далей цягнецца дарога, якая злучае нашу вёску і суседнюю (Баяры). Яе празвалі Кавалёвай сцежкай, бо яна адыходзіць ад пагорка, на якім раней жыў каваль і стаяла яго кузня.

Непадалёк ёсць лес, які завецца Баравые. Гэта вельмі вялікі лес: калі ісці праз яго ў адным напрамку, спатрэбіцца цэлая гадзіна. Назвалі гэты лес таму, што гэта сапраўдны бор, у якім вельмі многа ягад.

Непадалёк ад нашай вёскі ёсць другая, якая завецца Баяры. Шмат год таму тут жылі баяры. І сапраўды – цудоўная мясціна. Гэта вёска стаіць на вялікім пагорку, з якога вельмі далёка відаць. Нават можна ўбачыць салют у Мінску. Гэта як бы цэнтр усіх вёсак нашай мясцовасці.

*Запісана ў в. Весніно Лагойскага р-на*
*ад Макейчык Ніны Васільеўны, 1937 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Кавальчук Н.*

**Святая сасна**

У пушчы стаіць дрэва, на яком вісіць ікона Маткі Боскай. Вакол сасны стаяць велізарныя драўляныя крыжы.

*Запісана ў г. Лагойск*
*ад Біцуковай В. К.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Маргуновай К. (2004 г.)*

**Гладшчына**

Гладшчына (раней Залужжа) – гэта пасярод лесу два гектары зямлі. Яно, месца, мокрае такое, што як хадзілі ў касцёл, дык вады па калена. Дык Гладкі, чалавек, паклаў там кладкі. Ён быў, гэты Гладкі, бедны чалавек, але ён зрабіў добрае людзям, за тое і кусок зямлі так назвалі.

*Запісана ў в. Ляўданшчына Лагойскага р-на*
*ад Анімаховіч Алены Іосіфаўны, 1932 г. н.,*
*Анімаховіча Эдуарда Пятровіча, 1937 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Анімаховіч А. (2005 г.)*

**Легенда пра Вячу**

Жыў калісьці пастух па імені Вячаслаў. Ён ноччу пасвіў вясковых коней. Аднойчы цыганы задумалі ўкрасці ў яго коней. Яны вырашылі, што адзін цыган будзе забаўляць пастуха, а іншыя – красці. І вось ноччу цыган падышоў да вогнішча, ля якога грэўся пастух і павёў з ім размову. Спытаў, адкуль ён, як зваць, а затым пачаў спяваць і прытанцоўваць каля агню.

Эх ты, Вяча, мой ты Вяча,
Паглядзі, як цыган скача,
А вы, хлопцы-малайцы,

Выбірайце жарабцы
І скачыце за раку,
Я вас хутка даганю.

Паспяваў цыган, паскакаў, развітаўся з пастухом і знік. Як стала віднець, пастух недалічыўся коней. Даведаўшыся пра гэтую гісторыю, жыхары з суседніх вёсак смяяліся з яго і казалі: «Эх ты, Вяча, Вяча».

З тых часоў і пачалі вёску называць Вячай.

Рудня – такіх вёсак у нашым раёне некалькі. Адна з іх паблізу Лагойска, па суседству з Панізоўем, другая – на тэрыторыі Чырвонашвабскага сельсавета. Ёсць Завішынская Рудня і Новаганцавіцкая Рудня. Характэрна, што вёскі з такой назвай знаходзяцца паблізу балот, або ў забалочаных нізінах, дзе ў старажытнасці здабывалася балотная руда. Нашы далёкія продкі ўмелі выплаўляць з яе жалеза, з якога выраблялі гаспадарчыя прылады. Месцы гэтыя і сталі называць Рудкам або Руднямі.

**Панізоўе**

Праз вёску працякае рака Гайна. У даліне і пачалі сяліцца калісьці людзі, з іх сядзіб утварылася часам немалая вёска. Места ж было ва ўсіх адносінах выгоднае: у рэчцы вадзілася шмат рыбы, зусім побач вялікія лясы. Назва ж вёскі не выклікае сумнення – на нізу, па нізоўі.

**Юркавічы-Ганявічы**

Вёскі знаходзяцца амаль што побач, на першы погляд, нічым не адрозніваюцца, аднак адлік існавання вядуць з далёкага мінулага. Ганявічы былі вядомы яшчэ з часоў Чартарыйскіх. Назва ж вёскі звязана з тым, што тут сяліліся людзі, гнаныя за пэўную правіннасць. Высылка іх сюды была як кара: мясціна была мала абжытая, акружаная дрымучымі лясамі, сяліцца даводзілася на дзікай пустэчы.

Наконт Юркавічаў: паданне сведчыць, што сярод гнаных пасяленцаў быў стары чалавек па імені Юрка. Ён не ўжыўся з маладымі нашчадкамі і вымушаны быў адасобіцца, шукаць новае месца. Ён збудаваў недалёка ад Ганявіч жытло і пачаў тут гаспадарыць. Па імені першага пасяленца і сталі называць вёску Юркавічы.

***Запісана ў г. Лагойск***
***ад Сасноўскага Браніслава Уладзіміравіча, 1921 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчун Н. (2001 г.)***

**Шлятчына**

Гэта месца ў лесе, ну, каля возера нашага. Там жыў пан, яго, можа, выслалі. Там яшчэ мама мая служыла тры гады, у Шляцкага.

***Запісана ў в. Ляўданшчына Лагойскага р-на***
***ад Анімаховіч Алены Іосіфаўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Анімаховіч А.***

**Рудня**

Назва ад слова руда. У вёсцы ёсць месца, дзе знаходзілі руду. Руду выбівала на паверхні рэчкі. Рудой красілі кросны ў чорны цвет.

***Запісана ў в. Мяхеды Лагойскага р-на***
***ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

**Лагі**

Назва вёскі паходзіць ад слова «лог». Сама вёска знаходзіцца ў лагчыне.

***Запісана ў в. Лагі Лагойскага р-на***
***ад Цімафеевай Ніны Аляксандраўны,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

### Крайск

Некалі была вёска Райск. Калі была вайна, дзялілі зямлю і ад вёскі засталіся адны краі. Таму і вёску назвалі Крайск.

***Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на ад Казак Марыі Міхайлаўны, 1929 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Лапнеўскай І. (2006 г.)***

### Цагліна

Цагліна – месца, дзе людзі звычайна бралі гліну, каб потым можна было зрабіць цэглу.

***Запісана ў в. Глебаўшчына Лагойскага р-на ад Усцін Веры Васільеўны, 1939 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Беланоўскай М. (2003 г.)***

### Вёска Завішына

Жылі два паны, а што, дык я не знаю. Там бровар быў. На бровары гарэлку гналі гэтым панам. Я дык не дай Бог, сяджу, на абраз гляджу, але раскажу. Старыя людзі казалі, што ўначы здані на бровары былі. Уключаць яго чэрці, і, як людзі, таксама гарэлку гоняць. Прыйшоў дзед і дадаў: «Нап'юцца ўсе, дык і чэрці потым водзяцца». А яшчэ казалі, што шмат вішняў раней было ў гэтым месцы, адусюль ездзілі за вішнямі. Прыгожа ж так, кажуць, было, калі квітнелі яны, а потым вымерзлі, а вёска ўсё роўна Завішына засталася.

### Месца Зацішша

Жылі там паны Кучынскія. Ты ж бачыла, там цяпер каменне і фундамента кусок. Яны ж бачныя былі очань. Гэта ж трэба ведаць, у тыя часы такая хата была ў іх. Там такая нізь зразу і ціха ўсягды, дык і зацішша таму. Каровы туды як сыйдуць, дык 100 гадоў шукаць будзеш. Адны там ліпы і кусцікі стаяць.

### Рэчка Звонка

Хто яго ведае, хто мне гэта расказваў. Наша рэчка затое Звонка называецца, што быў там калісьці касцёл. Яго разварочвалі (развароўвалі) і нехта звон украў і схаваў. А потым ужо знайшлі там, у рацэ, гэты звон, дык і назвалі затое Звонка.

Далей за Звонкай жыў чалавек Качан, дык і называецца цяпер тое месца Качаноўшчына. Там адна хата ў лесе была, чалавек ён небагаты быў. Потым пляменнік яго каштан там пасадзіў. Я ўжо не відзела той хаты, толькі каштан там расце. А цяпер зарасло ўсё, так што і каштана таго ня відна.

Баброва – гэта вёска. Там калісьці рэчка цякла, ці баброў шмат вадзілася. Дык рэчка Баброўка стала, цяпер ўжо высахла яна. А яшчэ, на другі бок рэчкі вёска Забаброўкай стала звацца, а цяперака кажуць: другое Баброва.

Лысая гара – гэта месца такое. Ну, як тут казаць, на ёй, на гары дрэў зусім не было і казалі ўсе: лысая, лысая. Яна вялікая такая, як хата, а дрэў не было, не раслі яны там чамусьці, не ведаю, можа месца зачаравана было.

### Вёска Ляўданшчына

Тут жылі Ляўданскія браты, разышліся, панастрайвалі хат абы-дзе. Але гэту вёску ад нашай фаміліі назвалі. Вось і Антошка наш, які спявае і на гармоніку грае, таксама Лядоўскі.

Вёска Рудня затое так называецца, што бабы знайшлі там руду. І бабы хадзілі туды, мяшкі нітак красілі. Пакладуць на ноч, і выходзілі ніткі рудзенькія. Там яшчэ геолагі капалі – не знайшлі нічога. А бабы ў рудзе ніткі красілі. Во як!

### Тартак

Тартак – гэта лес такі, там яшчэ вайной парцізанскія атрады былі, шылі там адзёжу, рэчы ўсякія рабілі. Яшчэ чула, кіно злажылі пра гэта, «Тартак». Дык той чалавек, што кіно зняў, са мной разам вучыўся. Можа яму запалі ў сэрца гэтыя мясціны, дык ён і зняў кіно.

***Запісана ў в. Ляўданшчына Лагойскага р-на ад Апімаховіч Алены Іосіфаўны, 1932 г. н., Апімаховіча Эдуарда Пятровіча, 1937 г. н., студэнткай БДПУ імя М. Танка Апімаховіч А. (2005 г.).***

### Вёска Старамлын

Назва паходзіць ад слоў стары млын. Калісьці ў вёсцы быў млын.

***Запісана ў в. Мяхеды Лагойскага р-на***
***ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

### Закрынічча

Гэта вёска размешчана ў мясцовасці, дзе некалі было шмат крыніц. А крыніцы славіліся тым, што ў іх заўсёды была вада вельмі чыстая і халодная. Людзі называліся закрынічанцамі, а вёска – Закрыніцца.

***Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на***
***ад Саевіча Міхаіла Яфімавіча, 1930 г. н.***

### Вёска Трохгранны Дуб

Трохгранны – гэта значыць, што вёска як бы стаіць на трох граніцах, мяжах.

***Запісана ў в. Лагі Лагойскага р-на***
***ад Цімафеевай Ніны Аляксандраўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

### Вёска Швабы

Мяркуюць, што назва вёскі паходзіць ад прозвішча Шваб. У вёсцы жыло і зараз шмат шмат людзей з гэтым прозвішчам.

***Запісана ў в. Лагі Лагойскага р-на***
***ад Цімафеевай Ніны Аляксандраўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)***

### Вёска Ізбішча

Назва вёскі Ізбішча пайшла ад фаміліі пана Ізбіцкага, які тут жыў многа гадоў назад. Яго маёнтак знаходзіўся каля сажалкі. Людзі жылі хутарамі. Яны будавалі свае хаты недалёка ад маёнтка. Пан ім даваў працу. Мястэчка расло. Хутка яно вырасла ў вёску Ізбішча.

### Рэкта

Каля балоцістага месца пастухі пасвілі кароў. Месца было нялюднае, толькі звяры маглі прабірацца тут. Раптам азарылася неба і паявіўся яркі свет. Людзі ўбачылі лік святой, які апусціўся з неба. Гэта быў вобраз святой Божай Маці. Людзі ад здзіўлення не маглі варухацца. Праз хвіліну вобраз падняўся ў неба і знік. Калі пастухі падышлі да гэтага месца, дзе яна спускалася, яны ўбачылі маленькую крынічку. Месца гэтае назвалі Рэктай. З таго часу крынічка лічыцца святой, і месца святым.

Зараз кожны год на другі дзень Тройцы людзі збіраюцца тут. Яны моляцца, п'юць ваду, мыюць ліцо і рукі.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***
***ад Кізіны Ніны Макараўны, 1925 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук С. (2005 г.)***

У даўні час існаваў маёнтак Вяпраты. Назва пайшла ад таго, што тут вадзілася шмат дзікоў-вепрукоў. Зямля была там неўрадлівая, камяністая. А ніжэй па рачулцы знаходзіўся заліўны луг. Паступова людзі пачалі перасяляцца на гэта месца і распрацоўваць зямлю. Стаў вельмі добра расці хлеб, ён заўсёды быў на стале. Людзей пачалі называць калачоўцамі (пры калачах). А мясцовасць – Калачы. Так і сталі называць вёску – Калачы.

***Запісана ў в. Барыскі Лагойскага р-на***
***ад Янушкевіч Міхаліны, 1910 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ананіч П. (1994 г.).***

### Паходжанне вёскі Крайск

Згодна легендзе, на месцы сучаснай вёскі стаяў невялікі гарадок. Людзі жылі добра: гандлявалі, займаліся рамёствамі, палявалі, лавілі рыбу. Называлі яны свой горад Райскам, бо

жылі, як у раі. Але пачалася вайна. Сышліся рускія і шведскія войскі. Шмат людзей загінула. Быў знішчаны і горад Райск. Ад горада засталася толькі адна крайняя вуліца. Адсюль нібы і пайшла назва вёскі Крайск.

*Запісана ў г. Лагойск*
*ад Сілаўкі І. І.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1994 г.).*

Крайск – тут здаўна існаваў манастыр, якому нейкі час належала паселішча. Фашысты падчас вайны акружылі мястэчка і ўсіх, хто не паспеў, не мог схавацца, сагналі ў царкву і падпалілі. Назву вёскі легенда звязвае і з ваенным ліхалеццем. Згодна легендзе, на месцы Крайска, на беразе ракі Крашчанкі, стаяў невялікі гарадок. Некалі ў лясным зацішку далёка ад княжага вока жылі добра. Палявалі, лавілі рыбу, гандлявалі. Таму і называлі гарадок Райскі. Але пачалася вайна. Людзей загінула столькі, што ад пралітай крыві выйшла з берагоў Крышчанка. Быў знішчаны і горад Райск, засталася толькі крайняя вуліца. Адсюль нібы і пайшла назва – Крайск.

*Запісана ў в. Крайск Лагойскага р-на*
*ад Анкуда Сафіі Юльеўны, 1931 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчун Н. (2007 г.).*

**Легенда пра Кулікова балота, або як мужык стрэльбу вымяняў**

Жыў у вёсцы заўзяты паляўнічы. Звалі яго Мішка. Не было такога выхаднога, каб ён не выпраўляўся на паляванне. Аднойчы ён цэлы дзень ганяў па лесе зайцоў ды так захапіўся, што не замеціў, як стала цямнець. А вяртацца дадому трэба было праз Кулікава балота. Гэта не асабліва радавала яго. Але што ж зробіш, у лесе не застанешся начаваць. Пасвістываючы для смеласці, Мішка крочыў праз балота і ўжо віднеліся агні ў хатах, як выходзяць насустрач трое дужых маладых хлопцаў. Прывіталіся. Распыталі пра паляванне. Мішка ахвотна ім расказаў. І тады хлопцы і кажуць: «Слухай, чалавеча, бачым, ты заўзяты паляўнічы. Давай з табой стрэльбамі мяняцца. Твая, вунь ужо, адслужыла свой век, наша ж новенькая, на, паспрабуй, прыцэлься!» Мішка задаволенна ўсміхнуўся, хуценька скінуў стрэльбу з плеч і ўзяў тую, што прапанавалі хлопцы. Прыцэліўся ў бярозу, што стаяла на ўскрайку балота. Бабахнуў раз, другі, трэці і застаўся задаволены. Тут жа састаяўся абмен.

Ледзь не на крылах ляцеў Мішка дадому. Прыйшоў, павесіў стрэльбу на цвік, павячэраў, лёг спаць. А ледзь толькі на дварэ завіднела, усхапіўся і давай жонцы расказваць, што з ім здарылася вечарам. Паслаў яе ў сенцы, каб паглядзела на стрэльбу. Жонка выйшла, да тут жа ўскачыла назад у хату: «Пра якую стрэльбу ты гаворыш? На цвіку вісіць нейкая пуга». Мішка не зразумеў, якая пуга і хуценька ўсхапіўся і пабег ў сені. Сапраўды, на цвіку вісела пуга. Не раздумваючы доўга, ён схапіў яе і пабег да балота. Прыбягае да таго месца, дзе ён з хлопцамі прамяняўся і бачыць: стаіць пад бярозай яго стрэльба, а на стрэльбе тры свежыя зарубіны.

Пачухаў патыліцу паляўнічы, схапіў стрэльбу ды хутчэй дадому. З таго часу ён баяўся пазніцца ў лесе.

*Запісана ў г. Лагойск*
*ад Кранцэвіч Любові Браніславаўны, 1936 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Рубін Ж. (2007 г.)*

Недалёка ад вёскі Сямкова знаходзіцца вёска Прудзішча. Вельмі даўно на гэтым месцы жылі хутаране, якія зрабілі на развілцы запруду. Людзей, якія там жылі, сталі называць прудзішчанцамі, а вёску Прудзішчам.

Людзі раней пражывалі на хутарах на вялікай адлегласці адзін ад другога. Потым пачалі ствараца вёскі і людзі з хутароў сваё жыллё перацягвалі ў адно месца, там, дзе была лепшая зямля, бліжэй да ракі. Вёска пачала называцца Прысёлкі, г. зн. прыселеныя ўсе да аднаго месца.

* * *

Паненская гара – вось што гаворыць паданне аб гэтай гары. Многа-многа гадоў таму назад, на вяршыні гэтай гары юнак прызнаўся дзяўчыне ў каханні, а калі атрымаў адмову, скінуў яе з высокай гары. З таго часу гару пачалі называць Паненскай гарой.

* * *

Людзі раней жылі хутарамі. Жылі так спадары Іваноўскія, Буйніцкія, Тарлецкія. І цяпер месцы, дзе жылі хутаране, называюць Буйнішчынай, Іванаўшчынай, Тарлеўшчынай, хоць ад хутароў захаваліся толькі падмуркі.

### Сямкова

Людзі кажуць, што на гэтым месцы першым пасяліўся Сёмка і жыў хутаранінам, як і многія іншыя. Яго хутар быў размешчаны каля рэчкі і таму паступова вакол яго пачалі будавацца другія хутары. Гэтак была створана вёска, якая стала называцца Сямкова, у гонар яе першага жыхара.

***Запісана ў в. Прудзішча Лагойскага р-на***
***ад Саевіча Міхаіла Яфімавіча, 1931 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ляшчун Н. (2001 г.).***

Раней на месцы вёскі Аўгустава быў Дзяржынск.

На тым месцы, дзе быў хутар Радзікоўшчына, зараз знаходзяцца могілкі.

Бацянаўка – гэта месца, дзе знаходзяцца равы.

Калатоўка – гэта лес вельмі страшны, там водзяцца ваўкі і ўсе, хто ідзе ў лес, адразу пачынаюць калаціцца.

Кірпічны лес – у гэтым лесе раней выдзелывалі кірпіч.

Беланоўская пасека – раней тут жыў памешчык Беланоўскі.

Маліноўскі лес – раней там жыў Маліноўскі, і ён у лесе гнаў смалу.

Ліпнёвы горы – раней там раслі прыгожыя ліпы, а зараз тут катаюцца на лыжах.

***Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на***
***ад Жалабковіч Валянціны Пятроўны, 1936 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сялюк А. (2001 г.).***

Лагаза наша ўжо памаладзела, старых надта няма, ды й усе прыезджыя. Бацька мой казаў, што вёска так завецца, бо знаходзілася дзярэўня сярод логу, у лагчыне, у нас шмат ляшчыны расце.

Самы вядомы лес у нас – Лісі лог. Кажуць, што раней тут было шмат лісаў, цяпер ужо нету, толькі норы засталіся і назва.

А Гаенскі лес – таму што за ім ідзе вёска Гайна. Яшчэ ёсць Смалярскі лес, не ведаю, чаму так завецца.

Тое поле, што каля Кузевіч, Піліпаўкай завецца. Тут жа раней было балота, дзе вадзілася шмат ваўкоў. На Піліпаўку яны збіраліся, і на дай Божа тут каму хадзіць. А цяпер балота асушана, ваўкі можа і ёсць, хто яго знае, толькі шкоды яны не робяць.

А яшчэ поле ёсць – Машэрава. Тут жа некалі сам Машэраў хадзіў. Ён на верталёце прыляцеў прама на поле. Цяпер і завецца поле Машэравым.

Тое поле, што знаходзіцца між Лагазой і Гарадзішчам, Загор’ем завецца, таму што такія тут горы, што раней сарэўнаванні на лыжах праводзілі. Цяпер тут толькі дзеці проста так сабе гойсаюць.

А сажалка ёсць Шкрабава. Хлопчык тут утапіўся – па прозвішчы Шкраб быў. Вось цяпер і клічуць мае ўнукі: «Пойдзем на Шкрабаву сажалку на рыбу!»

***Запісана ў в. Лагаза Лагойскага р-на***
***ад Папкоўскага Анатоля, 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Масцеравай А. (2000 г.).***

Вёска Казыры праізашла ад слова «козырь». Кажуць, што жыхары гэтай вёскі любілі іграць у карты.

Вёска Медунова – кажуць, што раней там была вялікая пасека. Вёска ганарылася цудоўным мёдам.

Вёска Загараддзе – за горадам было паселішча, агароджанае плотам, дзе жылі парабкі князяў Тышкевічаў.

Раўкі – такое месца: равы, равы, нават няма роўнага месца.

Культура – у 1932 годзе на месцы поля быў пасаджаны лес (як казалі «акультураная» зямля).

Лагер – гэта мясцовасць, дзе знаходзіўся лагер пленных немцаў. Гэтыя немцы рубілі лес, рабілі аднаўленчыя працы. Нават лічаць, што яны будавалі дарогу Мінск-Масква.

Сапун-гара – гара такая высокая, што калі падымаешся, то абавязкова сапіш.

Калыскі – паміж ірвамі перапады.

Чорная дарога – у лесе, дзе жоўты пясок, праходзіць дарога з чарназёму.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на***
***ад Ліс С. С., 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Азановіч В., (2000 г.).***

**Косіна**

Гэта вёска мае такую назву, што стаіць на касі балот.

На паўднёвы захад ад Косіна знаходзіцца вёска Кавалёўшчына. Гэта вёска ўтварылася з маленькага хутара, на якім жыў вядомы ў гэтай мясцовасці каваль. Да яго звярталіся з бліжэйшых вёсак, таму што ён быў выдатным майстрам сваёй справы. Потым людзі пачалі сяліцца на гэтым хутары. Ён рос. І ператварыўся ў вёску Кавалёўшчына.

Крыху бліжэй да Косіна, чым Кавалёўшчына, знаходзіцца пасёлак Чарняхоўскі – гэта яго сучасная назва.

А раней гэтае месца называлася Спіртазаводам. Гэта назва і цяпер бытуе сярод жыхароў. Гэта было не так даўно, калі жыў у гэтай мясцовасці пан Шмыт. Ён быў вельмі багаты. У яго быў спіртзавод. Каля гэтага завода былі домікі, у якіх жыла прыслуга. Потым тут пачалі сяліцца іншыя людзі, але ўсё гэтае сяленне так і называлася – Спіртзавод.

На паўночны захад ад Косіна знаходзіцца вёска Падонкі. Гэта было багатае памесце пана. А ў пана быў блудны сын. Гэты сын не ўмеў весці гаспадарку і толькі жыў у сваё задавальненне. Так ён прапіў і праіграў у карты ўсё памесце. Толькі застаўся адзін будынак – хата аб’ездчыка. Толькі такому гаспадару не трэба быў аб’ездчык, бо ён прагнаў свайго апошняга падчынённага і сам пасяліўся ў гэтым доме. Назваў жа ён свой астатак падонкамі. Так і засталася гэтая назва.

Далёка на поўнач ад Косіна знаходзіцца вёска Загор’е. Гэта маленькая вёсачка.

Крыху далей ад Косіна ёсць вёска Прудзішча. Кажуць, што калі там жыў пан, то зрабіў вельмі вялікі пруд. У ім ён захоўваў у бочках садавіну і агародніну. Так і называецца гэта мясцовасць, на якой знаходзіцца вёска, Прудзішча.

У гэтым жа баку знаходзіца вёска Мглё. Гэта вёска знаходзілася за балотам (цяпер асушаным) і была заўсёды ў тумане, як у імгле.

На поўдзень ад Мгля размешчана вёска Каменка. Гэта назва замацавалася таму, што на гэтай тэрыторыі было вельмі многа камянёў. Потым іх значную колькасць вывезлі, але шмат і засталося да сённяшніх дзён.

На ўсход ад Косіна знаходзіцца вёска Замасточча. Так яна называецца таму, што знаходзілася на востраве сярод балот. І каб падтрымліваць сувязь са светам, жыхары кожную вясну пракладвалі мост. Так і прымацавалася назва.

Акрамя вёсак, што знаходзяцца вакол Косіна, ёсць яшчэ розныя мясціны з цікавымі назвамі. Так, у бок Замасточча, дзе раней былі непралазныя балоты, ёсць такая мясціна, што называецца Чысцікам. На гэтым месцы было возера. Потым яго зацягнула і ўтварылася балота. Ды такое глыбокае, што нават кусты не раслі, а толькі рэдзенькая траўка. Таму і называецца Чысцік, бо без кустоў і зараснікаў. Зараз, праўда, гэтых балот ужо няма, бо іх асушылі, але назва засталася.

Там жа, пад Спіртзавод, цякла некалі рака. Яна мела форму крука. У гэтым месцы людзі атрымоўвалі сенакос. А само месца назвалі Крукаўкай.

Дзесьці паміж Чысцікам і Крукаўкай знаходзіцца Хвашчова. Гэта такая бедная зямля, дзе растуць толькі хвошч, конскае шчаўё і вобаратнік.

Убок Падонак таксама цікавая мясціна. Там ёсць узгоркі. Гэтая мясцовасць называецца Каралінай. На гэтых землях жыла пані Караліна, гэта былі яе землі.

Бліжэй да Косіна ад Караліны знаходзяцца Вісельнікі. Гэта такі зусім маленькі лясок. А так завецца таму, што ў 1906 годзе там павесіўся панскі слуга Шыптыцкі, які павінен быў заплаціць пану, а грошай у яго не было. Яго пахавалі пад тым жа дрэвам, бо самазабойцаў на кладбішчы не хароняць. З тых пор называецца так мясціна тая.

Паміж Каралінай і Вісельнікамі знаходзіцца Амшарына. Кажуць, што раней тут цякла рэчка Амшарына. Потым там утапілася дзіця цыганкі, і гэта цыганка закалдавала рэчку і яна перасохла. А места, дзе яна цякла, называюць Амшарына.

Убок Прудзішча знаходзіцца вялікі лес, які завецца Купрэйшчына. Там была вёска, дзе жыў вельмі багаты пан Купрэйчык. Гэты лес быў ва ўладаннях Купрэйчыка. Ён цяпер называецца Купрэйшчына.

За Амшарынай знаходзіцца гара, якая называецца Калатоўкі. Там абівалі цапамі каноплі і лён. Гэта месца і назвалі Калатоўкі.

***Запісана ў в. Косіна Лагойскага р-на***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Красоўскай Л.***

Ці то праўда, ці то не, але часта можна пачуць у вёсцы расказ пра тое, як былі пабудаваны могілкі. Старыя людзі кажуць, што гэта было так.

Прыязджала ў вёску Гарадзішча Кацярына ІІ. На абед засталася яна ў меснага пана. Застолле было на славу. Тут і стравы заморскія, і садавіна дзіўная, і віны лепшых сартоў. Спадабаўся такі прыём Кацярыне, і вырашыла яна пасля сабе што-небудзь пакінуць. Загадала яна сваім салдатам шапкамі нанасіць могілкі. Працы было шмат, але за абед яны паспелі. З таго часу стаіць высокі курган, на якім хаваюць людзей, а ўнізе – глыбокая яма, як раз у размер кургану. Гэта з ямы салдаты зямлю насілі на могілкі. Пасля на могілках была пабудавана царква, і нават быў ход пад зямлёй, які злучаў дзве царквы. Але на жаль, у гады вайны вёска была спалена часткова, і царква згарэла таксама. Але лічаць, што ход пад зямлёй існуе і цяпер, але яго пакуль ніхто не знайшоў.

***Запісана ў в. Гарадзішча Лагойскага р-на***
***ад Шалковіч К. К., 1912 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шалковіч Н.***

**Казакоў вугал**

Гэта месца ўяўляе сабой поле і на ўскрайку знаходзіцца курган. Там, у гады паўстання Багдана Хмяльніцкага, было забіта шмат казакоў і пахавана там.

***Запісана ў в. Выгарка Лагойскага р-на***
***ад Гайчук Яніны Антонаўны, 1928 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук С. (2005 г.)***

**Вёска Корань**

Раней, калі будавалася вёска, тут было вельмі цяжка працаваць, бо ў зямлю паўрасталі карэнні дрэў. Кажуць, людзі, якія працавалі тут, і пачалі называць вёску Коранем.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Мароз Ганны Іванаўны, 1936 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л., (1995 г.)***

Тут раней, казалі. Шмат лесу было, а калі пачалі людзі сяліцца, многа каранёў выкарчвалі. Таму і Корань.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Соф'і Іосіфаўны, 1935 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К., (2008 г.)***

З царквы ехала вяселле. Маладыя захацелі пабудаваць сабе хату на паляне каля высокага дуба. Пабудавалі яны хату. Сталі жыць. Потым да іх пачалі прысяляцца сваякі. Утварылася цэлае паселішча.

Аднойчы маланка разбіла дуб, ён паваліўся і патрушчыў некалькі хат. Сам дуб праз нейкі час звезлі, а корань доўга-доўга тырчаў з зямлі. Спачатку коранем называлі толькі тое месца, а потым пачалі называць усю вёску.

***Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на***
***ад Малашэўскай Яўгеніі Канстанцінаўны, 1946 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л., (1995 г.)***

**Легенда пра паходжанне назвы в. Корань**

Першыя пасяленцы пачыналі сяліцца радам з бальшым дубам, на яго корні, ад таго і Корань.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Закрэўскага Івана Аляксандравіча, 1931 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,*
*Трубкінай Т., Чамярыцкай К., (2008 г.)*

**Вёска Штанюкі**

Раней ў гэтай вёсцы жыў чалавек, які добра шыў штаны. Ён вельмі любіў выпіць, таму добра шыў толькі за бутэльку. Калі яму за працу плацілі гарэлкай, то ён ішоў на гару (там было яго любімае месца) і ў адзіноцтве піў. Адсюль назва: вёска Штанюкі і Штанюкоўская гара.

**Гара Гладкая**

Некалі тут, на гары, жыла сям'я Гладкіх. Усе людзі называлі гэтую гару – Гладкая. Потым іх хата згарэла, самі гаспадары некуды з'ехалі, а назва за гарой так і засталася.

**Вёска Лозкі**

Тут расло шмат лозаў, і ўсе людзі з навакольных вёсак хадзілі туды драць лазу.

**Вароньчыха**

Раней там жыў пан Воронька. Гэта месца называлі Вароньчыкаў хутар. Зараз ніякіх збудаванняў там наогул няма, а месца ўсё называюць Вароньчыха.

*Запісана ў в. Корань Лагойскага р-на*
*ад Слабко Таццяны Андрэеўны, 1947 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Ясяновіч Л. (1995 г.)*

Я жыву ў вёсцы Аўгустава. Раней зямля, дзе стаіць вёска, належыла графам Тышкевічам. І толькі потым яна была выкуплена зажытачным селянінам, якога звалі Аўгуст. І зямля гэтая пачала называцца Аўгуставай, а потым, з цягам часу, і вёску пачалі называць Аўгустава. Але так яна пачала называцца толькі пасля вайны. У 30-я гады сюды прыехалі вайскоўцы і раскулачылі Аўгуста. Тут быў заснаваны калгас імя Дзяржынскага. Так жа і назвалі вёску, але так яе звалі толькі ў раёне, а карэннае насельніцтва працягвала зваць вёску Аўгустава. І толькі ў 56 годзе вёске было вернута афіцыйнае імя.

*Запісана ў в. Аўгустова Лагойскага р-на*
*ад Мароз Галіны Іванаўны, 1947 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Пацеевай І.*

**Хадакі**

Некалі на месцы, дзе зараз стаіць вёска Хадакі, быў сплашны лес. А тады ішоў чалавек і згубіў у ручаіне свой з нагі чаравік. Там яго і пакінуў. (Чаравік – хадак).

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Кізінай Соф'і Аляксандраўны, 1917 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Атрашкевіч В., (1995 г.)*

**Хадакі**

Мясцовасць атрымала назву ад слова хадзіць. Калі была Швецкая вайна, то шведы хадзілі праз гэту мясцовасць і спыняліся на начлег. Мясцовыя жыхары пачалі іх называць хадакі. Так і засталася, што гэту мясцовасць называюць «Хадакі».

*Запісана ў в. Хадакі Лагойскага р-на*
*ад Гуніч Ніны Іванаўны, 1913 г. н.*

**Трубачызна**

Гэтае месца людзі назвалі па фаміліі пана Трубача. Ён быў вельмі багатым. Пасля яго смерці з'явілася легенда: аднойчы ішла жанчына каля гэтага мястэчка і ўбачыла вогненны шар. Кажуць,

што калі б яна падсунула хусцінку пад гэты шар, з яго пасыпаліся бы грошы.

*Запісана ў в. Выгар Лагойскага р-на*
*ад Гайчук Яніны Антонаўны, 1927 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук С., (2005 г.)*

**Паходжанне вёскі Акалова**

Назва нашай всёскі паходзіць вось адкуль. Некалі тут збудавалі вялікі касцёл. І жыў тут такі чалавек з фаміліяй Околовіч. Возможно, і от него появілась назва вёскі.

*Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на*
*ад Жылача Анатолія Сяргеевіча, 1927 г. н.*

Назва нашай вёскі паходзіць вось адкуль. Існаваў толькі пасёлак, самой вёскі яшчэ не было. Пастроілі потым касцёл. Каля яго людзі сталі сяліцца. А калі кто-небудзь прыязджаў, у гэту вёску ўпершыню, то спрашваў дзе, напрыклад, жыве той селянін. Адказвалі так. «Жыве ён окала касцёла».

Вось адкуль і пашла назва вёскі».

*Запісана ў в. Акалова Лагойскага р-на*
*ад Бурлакова Яўгена Уладзіміравіча, 1928 г. н.*

**Мяхеды**

Назва вёскі Мяхеды паходзіць ад прозвішча Мяхедаў ці Мяхеда. Такое прозвішча меў упраўляючы пана, які жыў калісьці ў гэтай вёсцы.

*Запісана ў в. Мяхеды Лагойскага р-на*
*ад Мароз Марыі Сцяпанаўны, 1933 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Нагулевіч Т. (1995 г.)*

**Старая ферма**

Невялікая паляна ў лесе, дзе некалі да вайны стаяла ферма. Падчас вайны яна была разбурана. Пасля вайны пабудавалі новую ферму, а ад гэтай застаўся часткова толькі падмурак. А месца сталі называць старой фермай.

*Запісана ў в. Глебаўшчына Лагойскага р-на*
*ад Усцін Веры Васільеўны,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Беланоўскай М. (2003 г.)*

**Юльянава**

Вёска **Юльянава** Лагойскага р-на. Напісана, што на Беларусі шмат вёсак. І сярод іх маленькая вёсачка з пяшчотнай дзявочай назвай – Юлья нова. А назваў яе так князь, які валодаў гэтымі землямі, у гонар сваёй дачкі, Юльяны.

Сам князь жыў за мяжой. А ўпраўляў гэтымі землямі ўпраўляючы Дрэшар, ён слядзіў за парадкам, за зямлёй.

Чуя набліжэнне рэвалюцыі князь вырашае распрадаць гэтыя землі. Прыехалі купцы з Мядзельшчыны. Купілі па невялікаму кусочку зямлі. Першымі жыхарамі былі: Шабан Сямён, Батура Матвей, Жыла Фёдар, Плешак Рыгор, Хільчан Несцер, Кукса Грыль, Блізнік. Сталі будавацца, вялі сельскую гаспадарку, вырашчвалі гародніну, бульбу, лён, гадавалі скаціну, авечак кароў, каней.

У 1931 годзе арганізаваўся калгас «Ільіч», першым старшынёй калгаса быў Кукса Аляксандр. З песнямі хадзілі на работу, было хоць і цяжка, але святкавалі дажынкі, зажынкі, Купалле, Вялікдзень, Новы год. Было шмат моладзі, прывозілі кіно – перасоўкі, кіно было нямое. Хадзілі ў школу спачатку ў Акалова, а потым ў Плешчаніцы. Да вайны толькі Кукса В. А. скончыў 10 класаў у 1938 г. У 1939 г. паўшоў у армію, там і застала яго вайна.

*Запісана ў в. Юльянова Лагойскага р-на*
*ад бібліятэкара Вязовіч Марыі Іванаўны, 1951 г. н.*

**Чаму вёска Ляды так называецца?**

Спачатку быў дрымучы лес, а потым яго выразалі і пасяліўся Ляд, пагэтаму так і вёску назвалі.

*Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на*
*ад Пятроўскай Канстанцiны Iванаўны, 1931 г. н.,*
*Навiцкай Галiны Канстанцiнаўны, 1961 г. н.,*
*студэнткамi Кананеравай С., Гусцiновiч I.*

**Гiсторыя вёскi Кацялi**

Вёска Кацялi так называецца, бо калiсьцi тут жыў пан Кацельскi i трымаў ферму. З-за гэтай фермы ўсе мясцовыя жыхары называюць вёску фермай, а не Кацялi. Дзесьцi ў 70-я гады недалёка ад вёскi была крынiца з хрустальна чыстай вадой, якая славiлася сваiмi лекавымi якасцямi. Менавiта за гэтай крынiцай знаходзiлася ферма.

*Запісана ў в. Кацялi Лагойскага р-на*
*ад Ярашонак Сафii Анатольеўны, 1943 г. н.,*
*ЯрашонакМiхаiла Iванавiча, 1944 г. н.*

**Зарэчча**

Наша мясцовасць знаходзiцца каля маленькай рачулкi, якая калiсьцi да мелiярацыi была вялiкай. Рака мела назву «Талва, а вакол балота «Гаць».

*Запісана ў в. Зарэчча Лагойскага р-на*
*ад Шавель Алены Уладзiмiраўны, 1943 г. н.*

**Легенда аб паходжаннi вёскi Стрый**

380 лет таму назад была гэта вёска пад Прагонам. Яе перааснаваў нейкi Стрыж, у гонар якога стала так называцца.

*Запісана ў в. Стрый Лагойскага р-на*
*ад Рутакоўскай Наталлi Аляксандраўны, 1933 г. н.,*
*студэнтамi ГДУ iмя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавенiч А., Богдан Н. (2008 г.)*

## КАЗКІ

### Як мыш з арлом ваявала

Мыш з арлом ваявала. Арлу крылы паад’ядала. Не можа арол ляцець, бо крылаў не мае. А ідзе малады ахотнік і хоча страляць яго.

– Не страляй мяне, вазьмі мяне, кармі мяне, кажа арол. Але ахотнік бярэцца за ружжо.

– Не страляй мяне, вазьмі мяне, кармі мяне, зноў кажа арол. Але ахотнік згадзіўся толькі пасля таго, як арол трэці раз сказаў гэтыя словы. І ўзяў яго, прынёс дадому, пасадзіў яго ў клетку. Карміў яго паўгода, але крылы не выраслі. Карміў, карміў ён яго і ў адзін дзень у яго выраслі крылы. Вынес ахотнік арла на двор, а ён паляцеў, не відаць, высока-высока. Спугаўся малады ахотнік. Думае: і за душой нічога няма праз гэтага арла, і арла ўпусціў.

А арол прыляцеў і кажа:

– Ну што, спугаўся, ахотнік? Я тожа, як ты хацеў страляць мяне.

– Садзісь мне на плечы, – кажа арол.

Нёс, нёс яго, па калені вада, па плячы вада, па шыю вада.

– Ну што, спугаўся, ахотнік? Я тожа, як ты хацеў страляць мяне.

Прынёс ён яго ў залаты дом, а там яго сястра родная жыла. Яна, як увідзела брата, стала радая. Накарміла брата і ахотніка, а потым ахотніка замкнула, а брата схавала, бо яе мужык павінен быў вярнуцца. Мужык прыляцеў, а яна кажа:

– Я сёння сніла, што брат прыляцеў зноў. Жылі ахотнік і арол там паўгода. Яны пазамарваліся і людзьмі сталі. Арол кажа ахотніку:

– Як будзем адходзіць, скажы сястры, хай дасць тую штучку, што брат казаў. Ахотнік так сказаў. А яна кажа:

– Ты з братам не варт той штучкі.

І паляцелі яны праз лясы, горы. Лес, горы, цемра. Стаіць дом сярэбраны. Паляцеў туды арол, а там жыла другая яго сястра. Яна і кажа:

– Каго ты прынёс?

Арол адказаў, што яго хацелі страляць, а ён спас. Яна пакарміла брата і ахотніка. Мужыка дома не было. Яна схавала брата і ахотніка пад сем замкоў. А калі прыляцеў мужык, яна кажа:

– Я сніла, што мой брат прыйшоў, але не адзін.

– Ну і добра, што прыйшоў, – адказаў мужык.

Былі яны тут цэлы год. Частавалі іх лепш, чым у залатым доме. Трэба адхадзіць ужо, і арол кажа:

– Дамоў я цябе не павяду, толькі дарогу пакажу, а як будзеш адыходзіць, скажы маёй сястры: «Дайце тую штучку, што брат казаў». Яна дала яму закрытую банку і сказала адкрыць толькі тады, як дамоў прыляціць.

Ішоў, ішоў ахотнік і захацелася яму есці. Узяў ён тую баначку і адкрыў. І стала ўсё тое, што была: і валы, і дамы, толькі жонкі няма і радні. Бяда яму. Сядзіць ён і плача. А тут і валы, і авечкі, і ўсё хазяйства, а сабраць усё гэта ён не можа. Тады выходзе чалавек і кажа:

– Чаго ты плачаш і гаруіш?

Ахотнік расказаў яму пра сваё гора, на што той кажа:

– Я дапамагу табе, але за гэта ты аддай мне тое, што дома не аставіў.

Ахотнік згадзіўся. Але гэта быў чорт. Ён пахадзіў, памахаў і ўсё сабраў. Прыходзіць ахотнік дадому, а там усе весяляцца. Ён пытае, што за гулянка. Людзі кажуць, што нарадзіўся ў яго сынок (а ў іх не было дзяцей). Стаў расці хлопчык не па днях, а па часам. Сын пытае ў бацькі, чаму ён такі сумны, і бацька расказаў яму, што ён яго прадаў. «Не гаруй», – кажа сын.

Калі сыну споўнілася дваццаць гадоў, ён пайшоў да ксяндза. Ксёндз даў яму кадзіла, аршын і вады свянцонай, казаў, што як прыйдзеш, то мерай, мерай усё і кажы, што будзеш будаваць тут касцёл, каб людзі прыходзілі маліцца.

Хлопец пайшоў і стаў рабіць тое, што сказаў яму ксёндз. І так адпугнуў ён чорта, і павесялеў яго бацька, і памаладзеў, і ўсё ў ніх было. Хлопец вырас, ажаніўся, і дзяцей, і ўнукаў гадавалі. І сёння жывуць.

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Філіповіч Веры Пятроўны, 1916 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Войцік А.***

**Казка**

Жыў бацька і дзядзька. У бацькі быў сын, ды захацеў ён стаць злодзеем, каб лёгка дабро атрымліваць, амаль нічога не робячы. А ў дзядзькі быў бык. І вось захацелася хлопцу яго ўкрасці. Ён расказаў аб гэтым бацьку. Той падумаў-падумаў ды і пайшоў да брата. Прыйшоў і кажа:

– Братка, прадай ты мне свайго быка.

– Добра, прадам.

– Але мы яго забяром ноччу.

– Ну, добра.

Так і дамовіліся.

Прыходзіць ноч. Бацька кажа сыну, што можна ісці ўжо красці, і яны пайшлі. Выкралі быка, зарэзалі адразу, аблупілі. Раніцой зварылі боршч. Перш чым сядаць есці, бацька прапанаваў памераць каркі. Памерылі, а ў сына аказаўся большы, чым у бацькі. Селі есці. Ядуць. Бацька есць спакойна, а сын толькі на дзверы і паглядае. Так прайшоў дзень. На другі дзень яны зноў мераюць каркі. А яны ўжо роўныя. Што ў бацькі, што ў сына. І зноў дзень ядуць. На трэці дзень мераюць каркі: аж бацькаў карак значна большы.

Тады бацька і кажа:

– Вось, сынок, я еў спакойна, бо ведаў, што бык куплены, таму і карак у мяне большы. Лепш зарабіць і есці спакойна, чым трэсціся ўвесь час.

Так сын і не стаў злодзеем.

**Паданне**

Жыў старык са старухай. Добра жылі, ніколі не руганіся. Што ні пасылаў чорт, каб звесці іх, нічога не атрымлівалася. І вось зноў ляціць нячыстая сіла і гавора:

– Што ні хажу, то ніяк не зведу.

А насустрач ідзе жанчына.

– Каго, што? – спрашывае яна ў яго.

– Чалавека, – гавора, – таго і таго з саседзяй.

– А што ты мне дасі? Я зведу.

– Падару табе жолтыя бацінкі, харошыя, еслі ты звядзеш.

– Ну скажы мне прыкметы.

– У яго ёсць на шчацэ барадаўка, на барадаўцы тры валасіны.

Вось яна заходзя ў гэту дзярэўню і пытае, дзе жыве такі і такі дзед, у якога на шчацэ барадаўка, а на барадаўцы тры няшчасныя валасіны. Там жыве. Паказалі. Харашо. Заходзя яна ў хату. Топя печ хазяйка. Жэншчына ёй і кажа:

– Мая сястрыца, мая даражэнькая, твайму хазяіну сёлета планета памерчы. Ну, еслі б гэту планету можна зрабіць што, то ён будзе яшчэ жыць гэтулькі, колькі пражыў.

Ну жонцы хочацца, каб ён пажыў. Ну, харашо.

– А што можна зрабіць.

– У яго ёсць барадаўка?

– Ёсць, ёсць!

– Тры валасіны на барадаўцы ёсць?

– Ёсць, ёсць!

– Гэта планета яго смерці, тры валасіны. Каб гэтую барадаўку зрэзаць, но штоб ён не знаў. Як засне, заснуўшы. Зробіш, будзе жыць яшчэ гэтулькі.

– Харашо.

Пасядзелі, пагаварылі. Потым пайшла да хазяіна, калі хазяйка пайшла ўпраўляцца.

– Хазяін. Ты слушай, глядзі, жонка цябе на етых днях хоча зарэзаць.

Ён у галаву сабе ўзяў. Ну, прыходзіць жонка:

– Дзедачка, чарку вып’ем?

– Ну, добра.

Сеў, выпіў.

– Мне неяк захацелася спаць. Пайду спаць.

Лёг, ня спіцца яму, вочы заплюснуў.

– Буду спаць.

– А я пасуду памыю, тое, сёе, тады прыйду да цябе спаць, – кажа старая.

Стары ляжаў, ляжаў, а тады ўзяў ды і захроп. Ага, раз захроп, значыцца, заснуў. Яна брытву ўзяла і да дзеда, а ён падхапіўся ды і ізбіў яе да паўсмерці. От што.

Кагда чорт ёй дарыў бацінкі на асінавым суку праз лазовы куст, баяўся да яе падыйсці.

**Паданне**

Памёр дырэктар, начальнік міліцыі і п'яніца, усе ў адзін дзень. Вось надыходзіць час ісці да апостала. Начальнік міліцыі ідзе першы. Апостал глядзіць – начальнік міліцыі:

– Добра пажыў, наверна, ні аднаго абабраў. У ад.

Другім ідзе дырэктар.

– Таксама галубчык, таксама добра пажыў, ні аднаго пакрыўдзіў. У ад.

Трэці п'яніца. У яго ў грабу бутэлька была, ён за гэту бутэльку і да апостала.

– Твая прафесія? – пытае апостал.

– П'яніца.

Апостал паглядзеў па сваёй кніжцы, нідзе няма.

– А што гэта за прафесія такая, раскажы.

– П'ю гарэлку, назаўтра галава баліць.

– І так усё жыццё?

Зноў шукае гэту прафесію апостал, нідзе няма. П'яніца яму прапаноўвае чарачку. Ну той згадзіўся. І так накачаў п'яніца апостала. Назаўтра яму так дрэнна было. Ён і кажа:

– Ты ўсю жызнь так мучыўся. У рай.

**Паданне**

Былі дзве жанчыны. Адна была такая, што нікому не адказавала, а другая аднаму была вернай. Памерлі яны ў адзін дзень. Прыйшоў час і яны пайшлі да раю. Прыйшлі, а там брама. Часавы. Хадзілі вакол, а там высокія сцены і нідзе да іх праходу няма. Тая жанчына, у якой палак было многа, яна гэтых палак натыркала і палезла ў рай, а другая села і плача. Тут ідзе рота салдат, спыніліся каля яе.

– Чаго ты плачаш? – пытае камандзір.

Яна яму расказала.

– Станавіся ззаду і ідзі за намі. Ідуць. У брама часавы пытаецца:

– А гэта хто?

– Яна ў нас палкавая.

***Запісана ў в. Нарбутава Лагойскага р-на***<br>
***ад Гусакоўскага Івана Іванавіча, 1922 г. н.,***<br>
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Бярдычавец Т., Доміным А., Елавой Н., (2008 г.)***

**Легенда**

Пані, што жыла ў мурэ ў Малых Нястанавічах. Строіла капліцу. Там было яе памесце. Але не дастроіла і памерла. Пры будаўніцтве капліцы ў гліну дабаўлялі яйкі, каб доўга стаяла. Гавораць, што яна там у серадіне пахаронена.

***Запісана ў в. Малыя Нястанавічы Лагойскага р-на***<br>
***ад Івашкевіч Соф'і Антонаўны, 1914 г. н.,***<br>
***Амбражэй Алы Аляксандраўны, 1936 г. н.,***<br>
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)***

**Легенда**

Людзі расказвалі, што калі хлопцы памыліся ў бані, то ім патрэбна было потым у поўнач вярнуцца ў баню і забраць адтуль тры камені, тады ім з'явіцца дзяўчына, з якой яны ажэняцца.

Аднойчы хлопцу паабяцалі тры літры гарэлкі. Каб ён схадзіў у баню за трыма камянямі. Калі ён зайшоў туды, яму з'явілася дзяўчына. Якая схапіла яго за руку і спытала, ці жэніцца ён з ёю. Хлопец вельмі перапужаўся, сказаў, што жэніцца. Потым дзяўчына знікла. Хлопец вырашыў, што яму не патрэбна ні тая гарэлка, ні тая дзяўчына. І больш ён у баню не вернецца. Тая дзяўчына яго прыследавала. Яна павяла яго да ксяндза. А ён сказаў хлопцу, што той павінен

ажаніцца з гэтай дзяўчынай у той бані. Так яны і зрабілі. У той час, калі хлопец з дзяўчынай знаходзіліся ў бані, ён заўважыў, што ў яе капыты і хвост. Тады хлопец выскачыў з бані і падпаліў яе. Баня згарэла разам з дзяўчынай. А тая страшная істота ўцякла.

*Запісана ў в. Ляда Лагойскага р-на*
*ад Навіцкай Галіны Канстанцінаўны, 1961 г. н.,*
*Пятроўскай Канстанціны Іванаўны, 1931 г. н.,*
*студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Мхаян Г., Таўтын С., Якавеніч А., Богдан Н., (2008 г.)*

Гэта было на Вялікую Куццю. Жыў пан з паняй і давай гадаць. У іх была служанка, і ей захацелася пагадаць. Ну, яна ўзяла лесвіцу і палезла на гару. А там паставіла зеркала (як было яшчэ відаць). У двінаццаць часоў ночы палезла яна на гару, глядзь у зеркала, а там пан стаіць. Яна як крыкнула, ускочылі пан з паняй. Пані, як увідзіла, што ў зеркалі пан, там і памёрла. А пан са служанкай і ажаніўся.

**Прымхліца**

Мой бацька паехаў у млын на кані. Заехаў у пушчу. Перад гэтым змалоў у млыне. А гэта было дзе-та пад поўнач. Снег кругом, но дарога была харошая, а конь у яго такі ўжо быў здаровы, красівы. І ён повен воз гэтага зярна вёз. Глядзіць: уперадзі агеньчыкі ў лясу (знай: гэта ў пушчы). Яму ўжо такі страх узяў. І кажа: гляджу, а дарогі як ёсць раздваіваюцца, адна дарога і другая. Дзве дарогі. Гэта ж ваўкі ідуць наўстрэчу. Да не адзін, іх там нескалькі штук, цэлая шайка. Ён едзе, усё ўжо, што будзе далей. А тады, слава Богу, ваўкі пайшлі па адной дарозе, а ён як даў на кані і ўдраў.

*Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на*
*ад Турчыновіч Міхаліны Бенядзіктаўны, 1926 г. н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Аўрамчук Н. (2005 г.)*

**Народныя апавяданні**

Мама мне расказвала пра дзядзьку, да свайго. Быў у яго дом на выгане. Ён і лён там сушыў, ці дабро ў восецы, бо і цапы там былі, ну, ведаеш такія цапы? Наставяць снапы і малоцяць на таку цапамі.

Ну і тады ляжыць дзядзька на палку і глядзіць, каб не загарэлася, дабра ж многа было, цэлая восець. Ён ляжыць і бачыць: улятае ... (аж страшна ў хаце гаварыць) чорт і кажа дзядзьку: «Сідар памёр, а мне тапор астаўся». Тады ён, ну матчын дзядзька, глядзіць, што будзе далей. А чорт паляцеў і прынёс ахапак рэпы і абірае рэпу чырвоным тапаром, каб есці. А дзядзька цапам як шухнуў чарту па галаве і збіў капялюш, чорт і паляцеў.

Развіднела ўжо, чорт вярнуўся, лётае за дзядзькам і гавора: «Аддай капялюш, аддай». Ды ён (дзядзька) аддае, а чорт не бярэ. І яму набаялі, каб ён у трубін укінуў капялюш. Ну дзядзька пайшоў і ўкінуў, а чорт схапіў шапку і кажа: «Дагадаўся, нехта падсаветаваў». А так бы ён (чорт) яму галаву адарваў.

Мне казалі, мама казала, далёкі гэта быў год, я не была шчэ, але праўда была, бо ён жа сваяк маёй мамы быў.

Ён усё ведаў, гэты дзядзька. Сядуць каля яго дзеці, і мама мая, а ён ім і кажа такое: «Я не дажыву, а вы гэта ўбачыце. Будуць усе ў воздуху лётаць, без коней араць будуць па зямлі, не нагамі толькі будуць хадзіць». Дык вот бачыш, і праўду казаў. Цяпер жа гэтыя самалёты і машыны, а поле ўжо гэтымі трактарамі аруць, і дабро камбайны гэтыя рэжуць, а не сярпы. Во як!

* * *

Ну, ты знаеш жа, у нас кірмаш – гэта не там, дзе ўсё прадаюць. У нас кірмаш – гэта святое месца. Там, у нашым бару была крыніца, хто яе ведае, як яна абразавалася. Але людзі ўстанавілі туды бочку, абдзелалі яе як калодзец. Дык там на Сёмуху святкавалі заўсёды. У гэты калодзец ахвяру кідалі манетамі, ксяндзу спавядаліся. Вот так усе прыходзілі і зблізу, і дажа здалёку, збіраліся ў адзін гурт і гэтак там весяліліся. Патом ужо на траўцы і скакалі, і песні пелі.

А яшчэ забыўся сказаць, што каб да гэтай крыніцы падысці, наўкола трэба было рэчку перайсці. Шырынёй яна была 10 метраў і толькі адно бервяно пакладзена. Ды патом ужо людзі гаварылі, што толькі пакуль гэту рэчку перойдзеш, дык ужо ўсе грахі адпусцяцца.

* * *

Гэта так расказвалі. Даўней хадзілі купцы, ці хто. Ну дык ішоў такі чалавек, тожэ ён проста бедны быў. Зайшоў у пустую хату, нікога дома не было. Прыйшоў гэты чалавек, узлез на печ і ляжыць. Чуе ён: разбойнікі ідуць. Дык ён згаварыў палавіну гэтай малітвы, а другую палавіну не паспеў. Зайшлі разбойнікі, пачакалі, каб ён заснуў. Яны залезлі на печ, а там палова чалавека ляжыць жывога, а палова жалезнага. Яны кінулі яго і не сталі чапаць, пабаяліся і ўцеклі. Гэта за тое так сталася, што ён толькі палову малітвы згаварыў, а каб усю, дык увесь бы жалезны стаў і абараніўся.

Ну вот і пайшла з таго гэта малітва. Людзі вераць, што калі яе скажаш, дык нічога не случыцца. Я ее кожны дзянёк гаварыла. Дык калі мая кароўка мяне спужала цэпам і панесла па полю, дык я жывая асталася, а так бы памерла, калі б малітвы не гаварыла.

* * *

Ну, панімаеш, вот Рудня, Завішына і Ляўданшчына – гэта ўсё як бы нашы вёскі, што адна ад адной па два кіламетры. Дык калі ў нашых былі вечарынкі, мы добра зналі. А вот калі, напрымер, ужо ў далёкіх вёсках, дык нас прыглашалі, бумажкі нам прысылалі. Бывала, што і ў далёкія дзярэўні ішлі на вечарынку.

Вот выбіралі хоць якую хату, каб бальшэйшую толька. Ішлі туды, але перад гэтым дамаўляліся да каго. Хто-небудзь казаў, што сёння ў маёй хаце будзе. Я дык аднажды ў сваю не пусціла, хоць і прыдлагалі яе. Дык, што ты думаеш, мяне на вечарынку тую тожа не пусцілі. Той, хто даваў хату, дык нічога не трэбавалі, только каб потым памылі хату.

Ну, вот прыйдзем у хату, лампу керасінную паставім на каміне, бо света ж не было, і пачынаем. Калі ў нашых дзярэўнях было, дык амаль усягда нам Антоська іграў, на гармоніку. Але, бывала, што і Антаневіч з Будзеніч іграў, і Чарнуха на скрыпцы, і дажа на цымбалах ігралі. А тады ўжо складаліся і плацілі музыку. Ці гарэлкі хлопцы яму купяць, ці дзеўкі яек збяруць, вот так і плацілі. Вот Антоську нашаму дык мы з хлопцамі дажа лес вазілі. У яго дык вечарынкі ўсюды ладзілі: і ў хаце, і на дварэ. Ён казаў, што яго хата самая звонкая. Вот так і танцавалі, а бабы старыя збяруцца, укругавую пасядуць і да дня. Тут натанцуешся з дзеўкай, каб мінуту сесці, а тут бабы пасядуць. І пелі проста так, канешне, усякія песні, але дзе ты тое ўспомніш.

Бывала, што і б'юцца ўсе. Як зачэпяць адзін аднаго, дык тады, што петухі, іх проста вадой разлівалі. Бывала, што і пілі трохі. Калі дзе ўсе зложацца на бутылку, дык яшчэ ж і гарманіста трэба напаіць.

Галоўнае, канешне, танцы. Так красіва танцавалі. Усё танцавалі: і польку, і краковяк, і вальс, само сабой, і падіспана, каробачку, гапака дык утраіх танцавалі (дзве дзяўчыны і хлопец пасярод), і страданіе, і месяц, і барыню. І так пекна танцавалі, адзінакава ўсе, не тое, што зараз. І пад кожны танец пасля была ці прыпеўка, ці песня. А пелі, дык ці ўсе разам, ці адзін хто-небудзь, у каго лучшэ палучалася. Вот, напрымер, у нас пад «Вальс» Ванька гэту пеў: «Круціцца, верціцца шар галубой...», ну, ты ведаеш, гэта ізвеснае.

А вот пад «Полечку» дык вабшчэ кожны сваю прыпеўку пеў, іх столькі было:

Полька тая,
Полька гэта,
Што за добрая кабета.
Ах, ты полечка-трасуха,
Да чаго ж ты давела:
Маць паследнюю кароўку
На бацінкі прадала.

А вот калі «Падіспана» танцавалі, дык пелі:

Гэты падіспанчык
Харашанькі танчык,
Яго танцаваць
Очань легко:
Два шагі ўперад,

Два шагі ўзад,
Перавярнуцца і снова пачаць.

Очань добры танец «Месяц» быў, спакойны такі, очань красівы. Дык пелі тады вот так, ты запішы, няхай прападавацель твой пасмяецца:

Што за месяц,
Што за ясны,
Ноччу свеця, а ўдзень не.
Што за міленькі дружочак:
Уночы прыйдзе, а ўдзень не.

Ну, ужо вечарынкі гэтыя, бывала, як натанцуешся, дык ногі не нясуць. Але танцавалі да таго, пакуль на работу не ісці. Спаць мы ўжо не лажыліся, так лягчэй было.

* * *

Адзін раз вайной я з мамай вышла начаваць у вулачку. Я ад мамы нікуды не адыходзілася, у яе ўсе паўміралі, а я асталася. Але як ляглі мы, камары як далі. Я кажу, што не вытрымаю, не пераначую, і пайшла ў хату. А мама так баялася, што мяне немцы заб'юць. Але ты знаеш, кожную ноч партызаны прыходзілі. Вайна жэ ішла. А паліцаі толькі раз прыехалі. І тады я глянула ў той канец, пад Рудню, кажу маме: «Некага забілі». І праўда, ляжыць хлапец прыгожы, галаву яму прабілі, мазгі ляжаць на зямлі, валасы вецер калыша. Яго матка прышла, мазгі ў тапку сабрала.

Але я страху не баялася, дурная была. Не баялася я, што і застрэліць могуць. І старыя людзі ў нашай вёсцы надта не баяліся. І зараз раскажу табе, чаму і што ўсе рабілі для гэтага.

Нашы людзі ля крыжоў (ну, у нас жа ёсць у вёсцы два крыжы, у двух канцах) усю Маёўку маліліся 30 дней. Трэба было хадзіць то да аднаго крыжа, то да другога. А потым, як прайшло 30 дней, то сплялі мы вянок доўгі з розных квят, абразы ўбралі прыгожа і двух дзяўчат падабралі роўных, такіх высокіх, каб няслі іх (ну, абразы). А потым усе пайшлі. І так пелі святое, і неслі спачатку крыж, потым абразы, вянок. І ўсе ішлі і спявалі. І трэба было ўсю вёску абысці так. Гэта ты знаеш, каб нічога не зрабілася. І ў нас нічога праз усю вайну не зрабілася: ні хата не згарэла, нішто.

***Запісана ў в. Ляўданшчына Лагойскага р-на***
***ад Анімаховіч Алены Іосіфаўны, 1932 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Анімаховіч А. (2005 г.)***

**Пагалоўшчына**

У пару майго дзяцінства школьнага, тады ж не было забіць парсюка ці свінню падзеяй. Ну, забівалі тую свінню і звалі сваякоў, гасцей і садзілі за стол. Куплёнага нічога не было на стале, толькі сала, капуста квашаная, самагонка, есцественна, і гэта называлася пагалоўшчына. І яшчэ нада было па куску гэтай вось свежаніны аднесці самым блізкім суседзям, і калі дажэ вот есць далёкая радня на вёсцы, то тожа трэба было. І гэта называлася аднесці дармавізны.

***Запісана ў в. Расохі Лагойскага р-на***
***ад Паўтарачанка Аляксандры Міхайлаўны, 1948 г. н.,***
***студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны Ларковай Н., Нікалаенка В.,***
***Трубкінай Т., Чамярыцкай К., (2008 г.)***

**Пра бацяна**

Ішоў чалавек. Звалі яго Сцяпан. Насустрач яму ідзець Бог з мяшком. А ў мяшку былі ўсялякія мошкі, жабы, вужакі. І вось аддаў Бог гэты мяшок Сцяпану і кажыць: «Занясі і кінь яго ў раку, толькі не глядзі, што там». Але Сцяпан захацеў паглядзець, што ў мяшку, і развязаў яго. А як развязаў, дык усе мошкі, жабы, вужакі і паразбягаліся. За гэта Бог ператварыў Сцяпана ў бацяна. Ходзіць той цяпер і збіраець, пакуль усё гэта не пазбіраець.

***Запісана ў в. Сакавічы Лагойскага р-на***
***ад Лобань С. А., 1922 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Гайчук М. (1997 г.)***

Была ў нашай вёсцы мельніца і возера ля яе. Жыў і памешчык і меў аднаго сына. І ўтапіўся яго сын у возеры. Пані пракляла тое возера. Яно зацягнулася і засталася выемка на гэтам месцы. Дом пана пасля вайны яшчэ стаяў, але потым яго разбурылі.

***Запісана ў в. Атрубак Лагойскага р-на***
***ад Кучынскай Ядзвігі Станіславаўны, 1930 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Акуліч Т.***

Малады сын аднаго вельмі багатага селяніна Логвіна вырашыў, што перш чым абзавясціся жонкай і сваёй гаспадаркай, па свеце пахадзіць, на людзей паглядзець. Тры гады вандраваў Іван. Аднойчы апынуўся ён на беразе прыгожага возера, якое было размешчана сярод лясоў. Іванку вельмі тут спадабалася, і ён далей не пайшоў. Калі вярнуўся дахаты, то даведаўся аб тым, што яго родныя за гэты час памерлі. Ён пагараваў, пагараваў і пайшоў назад да возера, якое так спадабалася хлопцу. Там ён знайшоў сваю суджаную і стаў з ёю разам жыць, дзетак гадаваць. Доўга толькі іхняя сям’я жыла каля возера, але з цягам часу сталі іншыя людзі хаты будаваць. Паселішча ўзнікла. Толькі возера тое за многія стагоддзі зусім з твару зямлі знікла. А невялікую вёсачку месцячкоўцы назвалі Лагвойск, у памяць пра Іванку, які вёў свае карані ад бацькі Логвіна.

***Запісана ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага р-на***
***ад Аўсейкі Валянціны Дзям’янаўны, 1937 г. н.***

**Анекдот**

Прыехаў зяць да цёшчы ў госці. Цёшча бутылачку на стол паставіла і маленькія румачкі. Гаворыць цешча: «Каб таму ручкі адсохлі, хто іх рабіў». А зяць і кажа: « Каб таму вочы вылезлі, хто іх купляў».

***Запісана ў в. Чырвоная Зара Лагойскага р-на***
***ад Акуліч Соф’і Карлаўны, 1940 г. н.***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Сяргейчавай В. (2000 г.)***

Зяць захацеў купіць машыну. Ведаў, што ў цёшчы грошы ёсць. Кажа: «Далечы, цёшча, купіць машыну». А яна: «Адгадай загадку, тады дам: адзін наперад, чатыры назад».

А тады цёшча забылася, зяць купіў машыну. Цёшча і просіць: «Зяцёк, каб ты мяне куды звазіў?» А ён і кажа: «Адгадай загадку: пяць налева, пяць направа». Яна думала-думала – не адгадае. Тады зяць ручкі злажыў: «Як памрэш, тады на кладбішча зважу».

***Запісана ў в. Гайна Лагойскага р-на***
***ад Кохана Сяргея Мікалаевіча, 1922г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Кур’ян Н. (2005 г.)***

Прыйшоў аднаго разу мужык да свайго пана. І пан у яго пытаецца:

– Худа жыць, Мікітка?

– Худа, мой панок... (Цяжка, знаеш, чалавеку рабочаму, усё трэба рабіць ад усходу да заходу.)

– Памрэш, Мікітка!

– Хрэна, мой панок!!!

***Запісана ў в. Мятлічыцы Лагойскага р-на***
***ад Падбярозкі Марыі Антонаўны, 1920 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Шарыпавай В. (2006 г.)***

Едзе кум і кума на цялеге. Едуць цераз лес. Кум гавора куме: «Як захочаш, што робіш кума?». «Я дык тады пазяваю». Кума у кума пытае тое ж, а ён тады: «Я тады краснею». Едуць па лесе, а там лужа. Звалілася калясо. Злез кум, пачаў плячом падпіраць і закраснеўся. А кума на вазе: «Хаў». Тут кум пугаю на яе: «Я тут кішкі рву, а ты хаўкаеш».

***Запісана ў в. Атрубак Лагойскага р-на***
***ад Пракопчык Валянціны Станіславаўны, 1938 г. н.,***
***студэнткай БДПУ імя М. Танка Акуліч Т. (2000 г.)***

Ідзе салдат, насустрач яму мужык і пытаецца ў салдата:
– Куды ідзеш?
– Ваенна тайна.
– А што нясеш?
– Патроны.

***Запісана ў в. Красная Зара Лагойскага р-на
ад Акуліч Соф'і Карлаўны,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Савіцкай Ю.***

**Анекдот**

– Я ўсё хвалюся, што я такой. Ну я такой, я такой.
– Ну ладна, пайдзем у грыбы, ты ж такой.
Хадзілі, хадзілі. Ідуць назад.
– Я такой.
Яна кажа:
– Каб я знала, што ты такой, я б штаны дома не здымала.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на
ад Шалупінай М. М. 1926 г. н.
Запісала Каранчук В.***

**Анекдот**

– Ну, ты такі ж ужо граматны, ну не пі ты гарэлкі! Ты ж будзеш такім ужо генералам, можа, яшчэ вышэй – міністрам.

А ён кажа:

– Я, як вып'ю гарэлку, 100 грам, мне кажацца, што я вышэй за ўсіх генералаў.

***Запісана ў в. Казыры Лагойскага р-на
ад Шалупінай Н. Л., 1926 г. н.,
студэнткамі БДПУ імя М. Танка Каранчук А. і Азановіч В.***

**Анекдот**

Трое прохожих пообедали на постоялом дворе и отправились в путь.
– А что, ребята, ведь мы, кажется, дорого за обед заплатили?
– Ну, я хоть и дорого заплатил, – сказал один, – зато недаром!
– А что?
– А разве вы не приметили? Только хозяин засмотрится, я сейчас схвачу из солоницы горсть соли, да в рот, да в рот!

Поздно вечером пьяный спрашивает у прохожего:
– Выручи, друг, посчитай сколько у меня шишок на лбу?
– Три.
– Ага, значит, ещё два столба, и я дома…

***Запісана ў в. Родзевічы Лагойскага р-на
ад Яскевіч В.М., 1927 г. н.,
студэнткай БДПУ імя М. Танка Курыбінай І.***

*Яўген ГАНЧАРЭНКА*
*(з кнігі «Світанак над Гайнай»)*

## ДЗЯМІДАВА ГАРА

На дваццаць другім кіламетры ад Лагойска па барысаўскаму напрамку побач з шашой знаходзіцца ўзвышша, пакрытае лесам, багатае грыбамі, суніцамі. Цікавяцца гэтым месцам і паляўнічыя. Мясцовыя жыхары яго называюць Дзямідавай гарой. А чаму гэтак называюць, многія з нас не ведаюць. Калі хто і цікавіцца, дык чуе, што дзяды і бацькі так называлі, і мы – завём.

І вось аднойчы мне давялося пачуць ад старэйшых людзей цікавую гісторыю пра Дзямідаву гару. Праўда гэта, ці не, але мне захацелася расказаць аб гэтым. Я не абуруся, калі хто мяне і паправіць, галоўнае, што я хачу зрабіць, – гэта абудзіць у людзей цікавасць да сваёй малой Радзімы, роднага кутка, дзе жылі дзяды, бацькі, дзе і зараз жывуць родзічы і проста знаёмыя людзі – аднавяскоўцы.

Побач з узвышшам, якраз зразу справа ад шашы, размясцілася вёска Ганевічы. Вёска як вёска, нічога ў ёй асаблівага няма, і такіх вёсак шмат на Беларусі. Жывуць тут сумленныя і працавітыя людзі. Мясцовых жыхароў, а таксама і тых, хто жыве ў вёсцы Юркавічы, якая знаходзіцца недалёка, лагайчане называюць ганяўцамі. За такую мянушку ніхто не скардзіцца і не злуе. Жыхары вёсак Ганевічы і Юркавічы адносяцца да гэтай мянушкі спакойна і нават з усмешкай. Мястачковыя выдзяляюцца сярод насельніцтва Лагойшчыны гонарам, чалавечай годнасцю, адзінствам у справах і ў думках, кемлівасцю. Характэрнай рысай ганяўцоў з'яўляецца іх еднасць – яны вельмі добрыя сябры. Старыя расказвалі, што калі хто-небудзь захоча аб чым даведацца, то жыхары гэтых вёсак нічога нікому не раскажуць, не пакажуць і не дадуць парады. Так склалася, што на працягу вякоў у гэтых вёсках улада была ў саміх вяскоўцаў. Усе жылі і працавалі па аднаму, толькі ім вядомаму закону. Гэта не значыць, што яны не падпарадкоўваліся дзяржаве. Не. Людзі былі тут паслухмяныя, але іх вясковае жыццё працякала па толькі ім вядомаму сэнсу. Для чужых, з іншых вёсак, было шмат таямніц і сакрэтаў. Надта цяжка было атрымаць у іх давер і пашану. А калі хто і атрымліваў і ганяўцы прымалі гэтага чалавека, то лепшых, чым яны, сяброў нідзе не знайсці. Усім няхітрым сялянскім жыццём кіравалі самыя паважаныя людзі. Ужо ў наш час, у гады шасцідзесятыя-сямідзесятыя, казалі, што быў у іх свой «Сталін», свой «сельсавет» і свой «камсамол».

Без дазволу гэтых людзей у вёсцы ніхто нічога не рабіў, але ніхто не адчуваў ніякага прымусу. Чаму так было? Некаторыя казалі, што гэта набылося вёскамі на працягу доўгіх гадоў пры цяжкім становішчы таго часу, у якім прыйшлося жыць і змагацца за жыццё ўсім жыхарам. Была і другая думка наконт гэтага. Такая асаблівасць у ганяўцоў склалася пад уплывам таго, што тут здаўна сяліліся розныя беглыя людзі: ад прыгону, ад судоў, тыя, хто хаваўся, і інш. У вернікаў, а гэта былі ў асноўным каталікі, у весцы Юркавічы быў нават свой невялікі касцёл.

У кіламетрах сямі ад Ганевіч знаходзіцца вёска Швабы. На гэтым месцы калісьці сяліліся жыхары з Расіі, Украіны. Была і ў іх свая царква. Тутэйшых людзей чамусьці называлі гацукамі. Калі гацук – дык са Швабаў, калі са Швабаў – дык значыць гацук. Людзі як людзі, сумленныя, працавіты, дружныя. Усе разам жылі, хадзілі па грыбы і суніцы, палявалі, у Цне лавілі рыбу, займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам. Ва ўсіх быў аднолькавы лёс і адзіныя на ўсіх цяжкасці сялянскага жыцця.

– У гады Вялікай Айчыннай вайны я і мае браты Якаў і Пётр былі ў партызанскім атрадзе. Вялікую дапамогу лясным солдатам аказвалі мірныя жыхары. Яны забяспечвалі прадуктамі, адзеннем, адным словам, чым маглі.

Гітлераўцы з асаблівай жорсткасцю распраўляліся з партызанскімі сем'ямі. Каб пазбегнуць гэтага, нашы сем'і хаваліся ад акупантаў у лясах. У многіх былі малыя дзеці, і ім было вельмі цяжка.

У сорак трэцім, падчас чарговай аблавы, я і мае браты пакінулі свае сем'і ў лясной вёсцы Кроква Чырвонашвабаўскага сельсавета. Іх узяла да сябе, нягледзячы на тое, што ў самой на руках было грудное дзіця, жыхарка гэтай вёскі Мальвіна Антонаўна Саўрыцкая.

Мы заўсёды з цеплынёй успамінаем высакародны ўчынак М. А. Саўрыцкай. Дзякуючы яе смеласці і дабраце пазбеглі фашысцкай расправы тры партызанскія сям'і.

Сёння ў кожнай вобласці, у кожным раёне Беларусі шмат жыве такіх людзей. Добра, што на такіх прыкладах вучацца нашы ўнукі, дзеці. Хочацца, каб усе маладыя ведалі пра сваіх землякоў, бераглі сваю Радзіму і рабілі, каб яна была не толькі прыгожая, але і моцная. Моц любой дзяржавы – гэта людзі.

Трэба ўсё рабіць, каб не было ў моладзі абыякавасці да мінулага, каб наша моладзь ведала пра герояў, якіх сёння ўжо няма з намі. Каб кожны абеліск, кожная магілка былі дагледжаны, пафарбаваны, прыбраны і каля іх заўсёды былі кветкі.

Нездарма кажуць, калі чалавека помняць, то ён як бы і жыве сярод нас. І столькі будзе жыць, колькі будуць яго помніць.

Дык няхай у нашай памяці жывуць доўга тыя, хто гэта заслужыў. І твае людзі, мая родная Лагойшчына.

## З ЗАПІСАЎ УЛАДЗІМІРА ЛЯЦКАГА

## КАЗКІ

### Лісіца і дрозд

Дрозд звіў гняздзечка, нанес яечак, вывеў дзетак. Лісіца ўвазнала, ўляцела:

– Дрозд, дрозд, скінь дзяцёнка, а то сасонку падгрызу, цябе з’ем і дзяцей паем.

Ён плакаў-плакаў, плакаў-плакаў, ды і скінуў дзяцёнка. Ну, лісіца гэта хлап! – З’ела і ўсе. На заўтра апяць прыбягае:

– Дрозд, дрозд, скінь дзяцёнка, а то сасонку падгрызу, цябе з’ем і дзяцей паем.

Ён апяць плакаў-плакаў, плакаў-плакаў і скінуў. Прылятае сарока, і ён усё плача.

– Чаго ты, дрозд плачаш?

– Ой, як жа мне не плакаць, лісіца ўтравілася, дык во ўжо двох дзяцей скінуў – з’ела, а ішчэ прыбяжыць і будзе казаць, што сасонку падгрызу і цябе з’ем і дзяцей.

– Дурань ты, дрозд! Яна будзе казаць, а ты скажы: «Пацалуй у зад»!

От прыбегла лісіца, апяць гэта. Ён:

– Пацалуй у зад!

– Хто цябе наўчыў? Сарока?

– Хто научыў – абы научыў.

Пабегла лісіца ў лес, разінула рот і ляжыць. А сарока прыляцела – ды ў язык. А яна тады хоп! Яе ў рот. Тады сарока:

– Ну, што ты, лісіца дурная, ты ж хоць скажы: «Божа благаславі», а як не скажаш, дак удавішся.

От, лісіца ўжо хацела глытаць, а тады: «Божа багасла...»

А яна пырх! – і паляцела, і выскачыла сарока.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***

### Пра лесніка і яго сыноў

Жыў у лесе ляснік. У яго быў харошы дом і было тры сына: Дзям’ян, Сцяпан і Іван. Ну вот, ён пасеяў ячменю, аўса. Прыходзіць з поля і гаворыць:

– Сынкі, хто-та ў лесе есць ячмень і авёс. Нада ісці папілнаваць. Нада табе ісці, большы, Сцяпан.

Пайшоў большы сын у лес, нічога не знайшоў. Адпраўляе ляснік другога. Пайшоў другі. Хадзіў, хадзіў у лесе, нічога не знайшоў. Адпраўляюць Івана. А ён самы меншы быў, яны яго звалі дурачком. Вот той пайшоў, зрабіў вышку на елцы, на той вышцы пасядзеў. Пайшла чарада свіней дзікіх. Ён свіней убіў, прышоў дамоў, гаворыць:

– Папа, я свіней убіў.

Браты рагочуць з яго. І праўда, пайшлі глядзець. Ну, яны прыйшлі дамоў і напалі на Ваню:

– Ваня, ты такі, ты гэтакі.

Іван сабраўся, ружжо на плячо і пайшоў. Пайшоў і сабачку з сабой узяў. Ішоў-ішоў, найшоў зайчыка, найшоў лісіцу. Усім ім стужачкі красныя на шыі пазавязваў і пайшоў. Ішоў-ішоў, прыйшоў к высокай гарэ к крутой. Там сядзіць чалавек і плача. Іван спрашвае:

– Чаго ты плачаш?

Ён гаворыць:

– Знаеце, што маю дачку ўкралі і некуды звезлі – не знаю сам. Калі б хто пайшоў, палавіну б свайго царства аддаў.

Іван гаворыць:

– Я пайду, найду.

Пайшоў. Ішоў-ішоў к сіняму мору. На сінім моры стаіць вышка вялікая. Вот ён падышоў і там стаў гаварыць.

Гаварыў-гаварыў і дазнаўся, што дачка яго там. І лёг аддыхаць. Лёг, аддыхае. Мора завалнавалася. Аж выходзіць кракадзіл з мора і гаворыць на яго:

– Я цябе з’ем.

А Іван гаворыць:

– Не, ты мяне не з’ясі. Я цябе ўб’ю.

Іван яго забіў і тую дачку дастаў, у лодку пасадзіў і павёз. Найшоўся там другі чалавек. І забыўся Іван кальца залатога там, дзе яна была. Вярнуўся па кальцо. А той у лодку пасадзіў царэўну і павёз. Завёз дамоў гасудару і давай свадзьбу спраўлаць. А Іван астаўся там. А потым прыехаў са сваімі звяркамі. А там ужо свадзьба ідзе. Давай Іван прасіцца, а яго не пускаюць. А потым яго пусцілі. Ён звяроў сваіх у баню зачыніў і пайшоў. У парозе пасадзілі яго, сталі частаваць. А ён гаворыць:

– Я хачу з маладой выпіць.

А ў яго кальцо не залатое на руцэ. Вот ён падышоў і давай піць з той маладой. Маладуха як убачыла кальцо, і ўсё, і пачапілася на яго. Гаворыць:

– Во хто мяне спас, а не той.

Тады таго гасудар прычапіў к каню к хвасту і ў чыстае поле пусціў. І конь яго растрапаў. А там свадзьба гуляіць. Ужо пайшла царэўна за Ваню.

І я там была, і віно піла, але толькі ў роце не было, па барадзе цякло.

***Запісана ў в. Горна Лагойскага р-на***

## Пра Івана-Царэвіча

Жыў-быў цар. У яго было тры сына. Ну, і ён меў залатую яблынку ў саду сабе. Кожну ноч крадзе хто-то яблычка з яблынкі. Дак цар кажа сынам:

– Вы старажыце, хто-та крадзе?

Пайшоў старшы сын старажаваць, заснуў да не чуў – украдзена яблычка залатое. Потым пайшоў сярэдні сын, тожа заснуў – яблычка ўкрадзена залатое. Потым пайшоў самы меншы ўжо Іван-царэвіч старажыць. Ну, ён старажыў, старажыў, не спіць. Што гэта? Увесь сад асвяціла, толькі на гэту яблынку падляцела пціца. А ён ужо баяўся, да рукавіцу надзеў на руку і хацеў яе схваціць; толькі за хвост схапіў, яна вырвалася, а пяро адно асталося ў яго руках. А яблыка ўжо не ўкрадзена.

Прайшло дні тры. Ён захацеў у сваей комнаце развярцець платка, паглядзець, што тэта за пяро. Як ён развярнуў – асвяціла ўсю святліцу. І цару, і царыцы ўжо проста ў вочы дало. Цар і кажа:

– Што гэта такое?

Дак ён:

– От я, тата, ў саду злавіў пціцу, і пяро асталося гэтакае.

Цар кажа:

– Ну, ладна, гэта Жар-пціца. І вы, сыны, едзьце шукайце гэтае Жар-пціцы.

Даў ім па руж’ю, па каню. А Івана-царэвіца не пускаюць, дак ён кажа:

– Не, тата, я паеду. Дай і мне, ўсё адно я паеду.

Ну, цар даў і яму усё. Яны едуць-едуць, дак дарогі тры і напісана: «Хто на гэту дарогу паедзе – будзе голад, а на гэту паедзе – будзе холад, а на гэту паедзе – воўк каня з’есць».

Паехаў старшы на гэту, дзе голад, сярэдні паехаў, дзе холад будзе вельмі, а Іван-царэвіч меншы паехаў, дзе воўк каня з’есць. Ён як пад’ехаў к лесу – выбягае серы воўк. Ну, ён злез з каня, воўк з’еў каня. Ён і пайшоў. Яму жалка стала, што ён аддаў каня, не біўся дажа. Абагнаў воўк яго да кажа:

– Куды ты, Іван-царэвіч, страмішся?

Дак ён кажа:

– Я іду, ацец мой сказаў Жар-пціцу шукаць.

– Садзісь на мяне, я цябе давязу. Толькі ты ідзі ў сад, але не бяры з клеткаю, толькі бяры яе адну, а клетку не бяры.

Ён як увайшоў у сад царскі, дак тамака ўжо яму клетка панаравілася, стража прачнулася, схвацілі яго. Цар кажа:

– Чый ты сын, адкуль ты?

Ён расказаў, дак цар:

– А я з тваім айцом харашо жыву, а ты вор. Дак ты мне дастань залатагрывага каня, я цябе аддам Жар-пціцу з клеткаю.

Ну, паехалі яны з гэтым воўкам ізноў. Воўк кажа:

– Ты ідзі ў канюшню, толькі не бяры ўздэчкі. Каня бяры за грыву, вядзі.

Іван-царэвіч як увашоў, уздэчка панаравілась яму лепш за каня. Ён затронуў уздэчку, стража прачнулася, і яго схвацілі – к цару прывялі. Ён кажа:

– Адкуль ты, чый сын?

– Я з такога-такога царства, такога-такога цара сын.

– Ой-я-яй! Да твой ацец такі харошы, а ты вор. Ты мне найдзі Пракрасную Елену прывядзі, дак я табе дам каня з вуздэчкаю.

Ужо воўк кажа:

– Ну, я думаю, што з табою гора набяруся. Цяпер, – кажа, – я цябе садаводам устрою. І ты сад засадзі цару харошы. І будзе Пракрасная Елена з мамкай і нянькай праходзіць, я накідаю ягад сонных, дак гэтыя мамкі і нянькі паснуць, а ты падойдеш туды. Я падскачу, ты хватай яе, як можаш, і на мяне саджай.

Ну, так і было. Воўк яго садаводам зрабіў. Ён пайшоў засадзіў сад харошы. І гэта ўжо Пракрасная Елена праходзіць, аглядае сад, а воўк ягад такіх накідаў. Так мамкі-нянькі ідуць, як з’есць, так і засне. Падходзіць пад забор – ні адсуль, ні адтуль воўк пераскаквае цераз забор. Ён хватае гэту Пракрасную Елену, на ваўка садзіцца, ён цераз забор пераскочыў, паехаў. Воўк ужо бачыць, што жалее ён Елены пушчэй, чым Жар-пціцы і каня. Дак ён кажа:

– Ну, ладна. Я зраблюся Пракраснаю Еленаю, а ты сядзі ў кустах. Ну і вядзі мяне туды.

Ён павеў Пракрасную Елену, гэта ж воўк, не Елена. Гэта цар схваціў яе і свадзьбу спраўляе, і за стол саджае, пад вянец вядзе. Ну, сядзіць, адкрытае акошка. Яна сядзела, патом ні адсюль, ні адтуль кульнулася яна – воўк пабег. Гэты цар:

– Страляйце яго!

Ну, не застрэлілі, ўцек воўк. Конь патрэбен ужо. Воўк зробіцца ўжо залатагрывым канём, ён павеў яго к цару. Завеў к цару, сеў праязджаць гэты цар – ні адтуль, ні адсюль воўк пабег. Цар крычыць:

– Страляйце! Страляйце!

Куды ж ты яго застрэліш – не! Ужо у Івана і конь, і Пракрасная Елена. Ужо гэты воўк перавярнуўся залатагрывым канём, завеў ён яго, дзе Жар-пціца. Цар аддаў яму Жар-пціцу з клеткаю. Яны ж паехалі. Яны паехалі. Гэты воўк кажа:

– Ты, Іван-царэвіч, аддаў мне каня так. Я табе службу саслужыў, цяпер ідзі сабе з богам.

Яны пад’ехалі к той дарозе, дзе раз’язджаліся, аддыхнуць трэба. Ляглі, пазасыналі. Прыехалі яго браты, угледзелі, што ў яго Жар-пціца і жонка такая харошая, і конь залатагрывы. Яны ўзялі яго засяклі. Атабралі гэтае, а Бяссмертны Кашчэй быў і ад іх атабраў усё. Ну, ужо і вароны косці разнеслі гэтага Івана. Воўк вярнуўся, пазнаў па касцях, што гэта Іван. Сабраў косці ў кучу, сеў і пілнуе. Прыляцеў воран, хацеў толькі косць кляваць. Воўк узяў ворана зхваціў. Воран загаварыў з ім да кажа:

– Што ты хочаш?

А воўк:

– Нічога не хачу. Хачу, каб мне растушчае, крапушчае і жывушчае вады прывез тры бутылачкі.

Дак ён када:

– Ладна, я прынясу.

– Нет, – кажа, – дай мне ў заставу што.

Дак ён варанёнка даў.

– От, дзяржы вараненка гэтага, я прынясу.

Ну, ён дзяржыць гэтага варанёнка. Воран паляцеў, тры бутылачкі прынёс гэтае вады. Воўк варанёнка разадраў, растушчаю, вадою крапянуў – зраслося цела, крапушчаю – ён ужо акрэп трохі, а жывушчаю – дак ён і паляцеў. Ну, дак воўк косці пакрапіў. Гэты Іван устаў да паглядзеў – німа нічога. А воўк сядзіць ля яго.

– Ох, як я праспаў!

Дак воўк кажа:

– Ты праспаў! Каб не я, то твае косці вараннё разнесла ўжо.

– А куды мне ісці?

– Я, – кажа воўк, – не знаю, твае браты цябе забілі, аднялі ад цябе і жонку тваю, і каня, і Жар-пціцу. А ты цяпер ідзі куды хочаш.

Іван і пайшоў у дарогаю так. Тыдзень, ідзе ён дарогаю, стаіць хатка над морам. Яна к мору дзвярыма павярналася. Так ён:

– Хатка, хатка, павярнісь мне ліцом, штоб я к табе ўвайшоў.

Ну, ён уваходзіць у хатку тую, яна павярнулася, ён уваходзіць. Ляжыць Баба Яга Касцяная нага, а нос у паталок урос. Ён сказаў: «Здраствуйце». Дак яна:

– О-о-о! Я сто лет ляжу, не віджу рускага чалавека, а рускі чалавек сам ка мне прыйшоў.

Дак ён кажа:

– Ох ты, баба! Ты б мяне пабаніла да накарміла, да тады распрасіла.

Яна яго пабаніла, накарміла і ўсе распрасіла. Ён ей расказаў усе. Яна тады кажа:

– Нет, я, мае дзеткі, не знаю такога. Ёсць у мяне сястра сярэдняя, жыве там і там, дак яго яна знае. На табе клубочак і па гэтым клубочку ідзі к маей сястрэ.

Ён па гэтаму клубочку пайшоў назаўтра к гэтай сястрэ. Хатка тожа над морам, дак ён зноў:

– Хатка, хатка, павярнісь ка мне дзвярыма, каб я к табе ўвайшоў.

Ён уходзіць, баба ляжыць, Баба Яга Касцяная нага, а нос у паталок урос.

– Дзвесце лет праляжала тут, рускага чалавека не відала, рускі чалавек сам прыйшоў.

Дак ён кажа:

– Ах ты старая ведзьма, ты б жа мяне абагрэла, накарміла, напаіла да спаць улажыла, да тады распрасіла.

Ну, дак яна гэтак, і пабаніла дажа яго, і накарміла, і спаць улажыла. Назаўтра распрасіла яго. Ён расказаў, як усе было. Дак яна кажа:

– На табе клубочак гэта, у нас есць меншая сястра, яна павінна знаць гэта, а мы не знаем.

Ён пайшоў за гэтым клубочкам і зайшоў тамака тожа, зайшоў у дом, дак сястра іх сказала:

– Трыста лет праляжала, не відала рускага чалавека, а рускі чалавек сам прышоў.

Дак ён і той так атвеціў. Ну, і тая накарміла яго, ўсе ён расказаў ёй, і яна яму дала каня.

– От гэты конь цябе пераплыве мора, і тамака Бяссмертны Кашчэй забраў усё тваё, і ён, – кажа, – за морам жыве, а тамака ў яго пад дубам яшчык зроблены, а ў гэтым яшчыку заяц, а ў зайцы вутка, а ў вутцэ яйцо, а ў яйцы смерць Кашчэя.

Ну, дак Іван-царэвіч паплыў на кані, едзе на гэтым кані, дак вельмі ўжо воўк душыць. Ён яго аслабаніў, гэтага сабаку. Потым едуць далей, так арол душыць вутку. Ён аслабаніў вутку. Едуць далей, у сеці ўблыталася шчука вялікая, так трапешчыцца. Ён і шчуку аслабаніў, у мора выпусціў. Потым яны пераехалі мора з канём з гэтым. Стаіць дуб такі; ён стаў секчы, высек яшчык. Сekануў яшчык – заяц пабег. Ён спужаўся, ні адсюль, ні адтуль сабака ў зубах зайца яму нясе. Разарваў ён гэтага зайца – вутка паляцела. Ён зноў спужаўся – паляцела вутка. А потым арол вутку схваціў, яму ўсе адно прынес. Ён разадраў гэтую вутку – яйцо ўпала ў ваду. Ну ўжо канец! Прапала ўсё! Ні адсюль, ні адтуль шчука яму прыносіць яйцо. Ён за гэта яйцо, пайшоў. Пайшоў: ляжыць змей дванаццаці гадоў. Зарычаў вельмі ўжо крэпка. Ён там яйцо ак даў у лоб, змей зарычаў і сканаў. Тады ён уходзіць туды, яго Пракрасная Елена ходзіць там, і яна яго ўгледзела добра. Ён яе ўзяў, так яна кажа:

– Яшчэ ж ёсць на дубе самагуды, што яны самі іграюць да гуляюць, дак ты яшчэ з імі.

Ён зняў гэтыя самагуды. Конь яго пераплыў з гэтаю Пракраснаю Еленаю, ён ужо уходзіць к цару, яго бацька сустрачае, не пазнае дажа. І ўжо заплакаў бацька, дак кажа:

– А ты, мой сынок, што хочаш з гэтымі братамі рабі, забі іх.

Дак ён кажа:

– Не, не нада біць, пусцім па свету іх.

А сам з Пракраснаю Еленаю ажаніўся там, і бацька ўсе гасударства яму аддаў. Сталі яны жыць-пажываць і дабро нажываць.

*Запісана ў в. Горна Лагойскага р-на*

**Буду цябе жаніць, як запахніць хлеб**

Даўна было, даўна, многа гадоў прайшло, жыў на свеце адзін цар і быў ў цара адзін сын. Сын у цара вырас вялікі і пекны царэвіч. Цар радавался сваім сынам. Царэвіч любіў ездіць на паляванне. Аднаго разу царэвіч прышоў да цара-бацькі і кажыць:

– Папа, я буду жаніцца.

А цар-бацька гаворыць сыну:

– Сынок мой, табе яшчэ не пара жаніцца, тады ты будзеш жаніцца, як табе запахніць хлебам.

Здзівіўся царэвіч, пачуўшы словы бацькі.

– Як можыць запахніць хлеб?

Аднаго разу паехаў царэвіч на паляванне, заехаў далёка ў лес і заблудзіўся. І ніяк з лесу не можэць выехаць на дарогу. Колькі царэвіч ні ехаў па лесе, і ніяк выехаць не можэць. Ды ўжо стала і цямнець, і конь змучыўся, і царэвіч хочэць есці, ды нічога не зробіш. Выехаў царэвіч на прасеку, злез з каня, пусціў каня на траву, а сам лег трохі аддыхнуць. Так царэвіч прабыў усю ноч на прасецы. Стала світаць. Сеў царэвіч на свайго каня і паехаў далей па лесе. Цэлы дзень царэвіч праездзіў па лесе і ніяк не мог выехаць з лесу. Зноў стала цямнець. Царэвічу прыйшлося і другую ноч начаваць ў лесе. Пераначаваў царэвіч і другую ноч у лесе. І есці яму хочацца, ды німа чаго. Устаў царэвіч, толькі начало віднецца. Сеў на свайго каня і паехаў па лесе, каб выехаць з лесу. Што далей царэвіч ехаў, тым болі станавіўся больша заросшы лес, і нідзе лесу канца не было. Праездзіў царэвіч і трэці дзень па лесе. І заступіла ноч, і прыйшлося царэвічу і трэцю ноч начаваць у лесе. Царэвіч крэпка згаладаў, сеў ён пад дрэвам і відзіць: сядзіць лясная яблыня і на ёй многа яблыкаў. Царэвіч нарваў яблыкаў, паеў іх трохі, і ўжо не так яму стала хацецца есці. Назаўтра рана, чуць стала віднецца, царэвіч сеў на свайго каня і паехаў зноў шукаць якой трапінкі, каб выехаць з лесу. Едзіць царэвіч лесам, і збоку павеяў вецер. Царэвіч пачуў запах хлеба. Ён павярнуў каня ў той бок, з каторага пачуў запах хлеба, і неўзабаве выехаў на прасеку. Відзіць царэвіч, на прасецы стаіць невялікі домік, і з каміна ідзець дымок. Царэвіч пад’ехаў да доміка, злез з каня і пайшоў у домік. Прыйшоў да дзвярэй доміка, пастукаў у дзверы і пачуў з доміка голас:

– Заходзьце, калі ласка.

Царэвіч зайшоў у домік і папрасіў паесці. Далі царэвічу паесці. Паеў царэвіч, падзякаваў за яду і відзіць – такая пекная дзяўчына. Вот царэвічу гэта дзяўчына падабалася. Царэвіч пачаў гаварыць з дзяўчынай і стаў у дзяўчыны пытацца, з кім яна жывець, хто ў яе ёсць. Дзяўчына сказала царэвічу:

– Я жыву са сваім бацькам, болі у нас нікога німа, толькі мы ўдваіх жывём.

Царэвіч стаў пытацца ў дзяўчыны:

– А дзе твой бацька і чым ён займаецца?

Дзяўчына сказала царэвічу:

– Мой бацька служыць ў пана за лесніка, і ён цяпер пайшоў у лес. Ён зараз прыдзіць есці.

Царэвіч гаворыць дзяўчыне:

– Вы мне крэпка падабаліся, я хачу бы з вамі жаніцца.

Дзяўчына кажыць царэвічу:

– І вы мне падабаліся, і калі мне бацька пазволіць ісці за вас замуж, то я і пайду за вас.

Вот прыходзіць дзяўчыны бацька і відзіць: стаіць прывязны конь каля плота. Заходзіць бацька дзяўчыны ў дом. У дому відзіць: сядзіць пекны малады хлопец. Бацька дзяўчыны сказаў хлопцу:

– Добры дзень, маладзец.

– Добры дзень, папаша.

Бацька дзяўчыны пытаецца ў хлапца:

– Чаго прыехаў, па якіх справах?

А царэвіч гаворыць старому:

– Я заблудзіўся ў лесе і ніяк не магу выехаць з лесу і трапіў на гэты хутарок.

Стары ляснік пытаецца ў хлапца:

– А хто вы есць, адкуль?

А хлопец кажыць лесніку:

– Я есць царскі сын, паехаў на паляванне, заблудзіўся і выехаў на гэты хутарок і хачу прасіць вас паказаць мне дарогу.

– Добра, – гаворыць ляснік, – пакажам дарогу.

Вот царэвіч кажыць ляснiку:

– Дзе я ні ездіў, а такой дзяўчыны не відзеў, і я хачу ўзяць вашу дачку сабе за жонку.

– Добра, – кажыць стары ляснік, – я вам не аддам сваю дачку замуж, хоць вы царэвіч, бо, жывучы, усяк бываіць. Вы сягоння царэвіч, а заўтра можаце быць нічым. Навучыся якога-небудзь рамясла, тады прыязжай у сваты і будзіш маім зяцем, а пакуль не навучыўся якога-небудзь рамясла, то не прыязджай.

Задумаўся царэвіч, што такое багацце маіць, а стары ляснік не хочыць аддаць за яго сваю дачку, трэбуіць, каб навучыўся якога-нібудзь рамясла. А так палюбіў царэвіч лесніка дачку, што проста без яе не можэць жыць. Вот дзяўчына вывела царэвіча на дарогу, і царэвіч паехаў дамоў. Едучы дамоў, усе думаў, якога рамясла навучыцца і надумаў: «Навучуся я плясці кошыкі».

Прыехаў дамоў царэвіч і расказаў цару аб сваім здарэнні: як яму запахнуў хлеб. А цар яму сказаў:

– Вот цяпер табе пара жаніцца.

Царэвіч узяўся плясці кошыкі, і так ён скора навучыўся рабіць кошыкі, ды такія добрыя. І думаіць царэвіч:

– Хоць рамясло невялікае, але ж рамясло. Можа і пойдзіць дзяўчына за мяне замуж.

Царэвіч сеў на каня і паехаў да дзяўчыны. Прыехаў царэвіч да дзяўчыны, зайшоў у хату, прывітаўся, а стары ляснік пытаіць у царэвіча:

– Ну, царэвіч, навучыўся якого-нібудзь рамясла?

А царэвіч гаворыць лясніку:

– Навучыўся рабіць кошыкі.

Ляснік кажыць:

– Ну, гэта ўсё-такі рамясло, цяпер я магу аддаць сваю дачку за цябе замуж.

Царэвіч узрадаваўся, што дзяўчына пойдзіць за яго і астанецца яго жонкай. Царэвіч сеў на каня і паехаў да свайго бацькі-цара. Прыехаў царэвіч дамоў і сказаў бацьку свайму:

– Вот, бацька, я буду браць бедную сабе жонку, аднаго лесніка дачку, яна такая пекная, што я не магу без яе жыць.

Бацька – цар падумаў трохі, паглядзеў на сына і кажыць сыну:

– Ну, сын, хадзі за мной.

І павёў за сабой ў пакой. А ў пакоі многа вісела партрэтаў, і ўсе былі пекныя царэўны. Вот цар кажыць сыну:

– Выбірай якую хочаш, і паедзем у сваты, любая за цябе пойдзіць.

Царэвіч абышоў усе партрэты і гаворыць цару:

– Мне ніводная не падабаецца. Я толькі хачу ўзяць за сабе жонку леснікову дачку. Яна мне крэпка падабалася.

Відзіць цар, што сына не угаварыць, і мусіў згадзіцца з сынам і пазволіць жаніцца з лесніковай дачкой. І кажыць сыну:

– Ну, няхай будзіць па-твоему, жаніся на лесніковай дачцэ, відаць, твая доля гэткая, што браць табе нада бедную дзяўчыну.

Вот цар і царэвіч сабраліся і паехалі ў сваты да лесніковай дачкі. Прыехалі да дачкі лесніка. Цар з сынам пагаварылі, калі будуць спраўляць вяселле. Цару то не нада строіць, у цара ўсяго хапаіць поўна – і піцця, і яды. Цар з сынам сталі ззываць гасцей на вяселле. Калі ўжо сабраліся госці і пачалі гуляць вяселле, дзве нядзелі пілі, елі, гулялі вяселле. А калі кончылася вяселле, царэвіч з маладою сваёй жонкай сталі добра жыць.

Стары цар памер. Астаўся па бацьку правіць страной царэвіч і ў яго ўсё добра выхадзіла. Але не доўга служыла іх шчасце. Вот адзін цара старога дарадчык стаў зайздросціць маладому цару. Ён хацеў разлучыць з жонкай маладога цара і сам хацеў узяць цара маладую жонку.

Аднаго разу злы дарадчык гаворыць маладому цару:

– Вот, твая царская міласць, толькі, цар, на мяне не гневайся. Я вам скажу праўду. Як ваша царская міласць быў выехаў глядзець свае войска, то ваша жонка запершы ў пакоі з другім вашым дарадчыкам. Як выйшаў другі дарадчык і сказаў мне: «Я скора буду сам царом», вот і паказаў мне вашай жонкі партрэты. І дарадчык хочыць цара забіць, а сам стаць царом.

А другому дарадчыку сказаў:

– Ты знаеш, цябе цар, сказаў, заб’ець, за што, я не знаю. Як пазавець цябе ў пакоі да сябе, так табе будзіць і ўсе, лепш ты не чакай, пакуль цябе цар пазавець, а ўцякай.

Вот другі дарадчык цара, як сказаў яму першы дарадчык, спужаўся і ўцёк ад цара, каб цару і на вочы не паказвацца. Цар сказаў пазваць другога дарадчыка. Пабеглі цара слугі шукаць другога дарадчыка, а яго ўжо нідзе не было і сляды яго застылі. Прыходзяць царскія слугі і кажуць цару:

– Нідзе нет другога дарадчыка.

Вот цар і паверыў першаму парадчыку, што дарадчык цару гаварыў праўду. Узлаваўся малады цар на сваю жонку, што гэта была праўда, што яго жонка хочыць забіць яго. Надумаўся цар забіць сваю маладую жонку, пазваў першага дарадчыка і гаворыць яму:

– Я цар і за тваю праўду аддаю табе ўсё царства і будзь царом.

А сам сказаў сваёй жонцы:

– Адзявайся, пойдзем, дзе-небудзь паходзім.

Маладая царыца нічога не знала, што цар яе хочыць забіць, адзелася і пайшла з маладым царом. Выйшлі яны з горада і пайшлі да мора. Дайшоўшы да мора, малады цар з царыцай – сваёй жонкай – пайшлі па берагу каля мора, па абрывістым берагу. Прыйшлі на высокі абрыў. Малады цар, нічога не кажучы царыцы, выняў нож, каб царыца не відзела, і ўдарыў царыцы ў бок нажом і піхнуў з абрыва ў мора. Царыца і паляцела ў мора, а сам пайшоў куды вочы глядзяць. Пры абрыве ля мора, каля скалы на вадзе быў паросшы мох, такі густы, што па ім можна было ісці, як па падушцы. Царыца звалілася на гэты мох і не патанула ў моры. Але царыца была крэпка раненая нажом і не магла ўстаць. Недалёка на моры рыбакі лавілі рыбу, і адзін рыбак увідзеў: нешта ляжыць на моху, нібы чалавек. Ён паказаў і другім рыбакам. Кажыць рабакам:

– Паглядзіце, вунь на моху ляжыць чалавек, падплывем і паглядзім, можа, яму нада якая дапамога.

Рыбакі завярнулі сваю лодку і падплылі да моха, і ўвідзелі, што на моху ляжала дзяўчына. Падышлі рыбакі да дзяўчына, агледзелі і бачаць: яна ў крыві ляжыць, чуць жывая. Дзяўчына не магла ўжо гаварыць. Рыбакі забралі яе ў лодку чуць жывую і павязлі з сабой. Давязлі да доктара, доктар агледзіў дзяўчыну, перавязаў ёй рану, прабітую нажом, але дзяўчына яшчэ не магла гаварыць, толькі знаць, што жывая. Доктар шчыра стаў дзяўчыну даглядаць, стараўся вылечыць. На трэці дзень ёй стала трохі лепш, яна сказала некалькі слоў шэпатам, ну так, што іх няможна было зразумець. Доктар рабіў усе магчымасці, каб вылечыць, і рыбакі прыходзілі дзяўчынку адведваць, як яе здароўе. Ну, ні доктар не знаў, ні рыбакі, што дзяўчына была жонкай цара, і яна ім не гаварыла, што яна жонка цара. Яна сказала, што нейкія разбойнікі яе ўдарылі нажом і кінулі ў мора. Дзяўчына была надзвычай пекная, і з кожным днём яна паздараўляла. Рана ў баку, прабітая нажом, стала скора зажываць і скора зусім зажыла. Ну, дзяўчына была яшчэ слабая. Доктар і рыбакі дзяўчыне давалі самыя лепшыя спажывы. Дзяўчына скора стала набіраць сілы, а рыбакі былі другога царства. Лавілі рыбу. Як дзяўчына зусім вылечылася і акрэпла, тады рыбакі пагаварылі з дзяўчынай і сказалі ёй:

– Мы цябе, цяпер як ты здаровая, завязём сваёму цару. Цар наш стары і прасіў, каб яму хто прывёз добрую дзяўчыну, няхай бы была ў мяне.

Дзяўчына з рыбакамі сагласілася, каб яе завязлі да іхняга цара. Рыбакі зявязлі дзяўчыну да цара, і цар аставіў дзяўчыну ў сваіх пакоях.

– Ну, дзяўчына, ты будзеш маёй дачкой, глядзі ўсяго. Я цар, я ўжо стары, я скора памру, а табе ўсе застанецца, і ты будзеш управляць усім маім царствам.

Падзякавала дзяўчына цару і стала жыць за дачку. Цару падабалася дзяўчына, і ён глядзеў на яе, як сваю родную дачку. Дзяўчына памагала старому цару управляць царствам. А царэвіч, яе мужык, прыйшоў у гэта царства, дзе была яго жонка, спаткаўся з п’яніцамі і стаў разам піць гарэлку. Прапіўшы ўсё, што было ў яго і ў п’яніцаў, нада было брацца за работу. Вот царэвіч гаворыць п’яніцам:

– Пойдзем у лес, там будзем плясці кошыкі і прадаваць.

П’яніцы гавораць царэвічу:

– Мы іх не ўмеем рабіць.

А царэвіч кажыць:

– Я вас навучу, я ўмею кошыкі плясці.

І яны пайшлі ў лес, зрабілі сабе з лапак будку, каб было зацішна ад ветру, і ўзяліся за работу – плясці кошыкі. Ну, п’яніцы не зналі, што гэта царскі сын з імі разам робіць кошыкі, і так спрытна ў яго выходзіць работа і сваім друзьям паказваіць, як нада рабіць. Вот некалькі

зрабілі кошыкаў і панеслі прадаваць у горад. Кошыкі былі добра зроблены, і яны скора іх прадалі. Набралі гарэлкі, закускі і пайшлі ў лес, выпілі і паклаліся спаць. Назаўтра, сколькі ў іх асталося, кончылі выпіць і ўзноў узяліся за работу. Нарабілі кошыкаў, прадалі, купілі гарэлкі і закусілі. І так яны жылі. Абарваліся, адзежу сваю парвалі, і так абарваныя хадзілі. Што заробяць, усё прап’юць.

Аднаго разу жонка царэвіча пайшла на кірмаш. Увідзела кошылі, падышла паглядзець, каб купіць кошык. Паглядзела на кошыкі, добра зробленыя. Вот дзяўчынка купіла некалькі кошыкаў і добра за іх заплаціла і за гэтымі абарванцамі пазнала свайго мужа. А муж яе не пазнаў. Ну, дзяўчына нічога не сказала, што яна яго жонка, купіла ўсе кошыкі, аддала слугам нясці кошыкі на царскі двор. Мужу свайму сказала:

– Вы мне яшчэ зрабіце некалькі кошыкаў. І прынясёш іх на царскі двор.

І сказала, на які дзень.

– Добра, – сказалі п’яніцы, – мы зробім вам кошыкі і прынясём на царскі двор.

Вот п’яніцы прапілі грошы і пайшлі ў лес і пачалі рабіць кошыкі. Нарабілі кошыкаў, паняслі на царскі двор. Дзяўчына забрала ў п’яніцаў усе кошыкі і добра за іх заплаціла, а свайму мужу купіла добры касцюм і дала яму надзяваць. Быўшы царэвіч не знаў, што гэта яго жонка жывець. Ён думаў, сваю жонку зарэзаў нажом і ўкінуў у мора. Дзяўчына сказала (хоць ёй і не нада былі кошыкі) зрабіць болей і прынесці кошыкі на царскі двор. Тут п’яніцы пайшлі прапілі ўсе грошы і прапілі касцюм, што купіла дзяўчына свайму мужу, і зноў узяліся за сваю работу. Нарабілі кошыкаў і паняслі на царскі двор. Дзяўчына заплаціла за кошыкі і відзіць: яе муж быў абарваны, так і есць абарваны. Вот дзяўчына пытаіцца ў мужа:

– Чаму ты абарваны? Я табе купіла добры касцюм, а ты абарваны.

– Ён гаворыць:

– Ну, што ж зробіш, не хапіла ў нас грошай на гарэлку. Мы прадалі касцюм і прапілі.

Засмяялася дзяўчына, заплаціла за кошыкі п’яніцам, а свайму мужу сказала:

– Хадзі за мной.

І павяла яго з сабой у свой пакой. Прыйшлі ў пакой, сказала яму сесці. Сеў быўшы царэвіч. Вот яна ў яго пытаецца:

– Скажы мне, хто ты есць?

Хоць яна і знала, хто ён есць, ну ўсё-такі спыталася. І гаворыць яму:

– Кажы мне ўсю праўду. Я табе дала новы касцюм, а дзе ты яго дзеў?

Вот быўшы царэвіч пачаў гаварыць:

– Праўда, вы далі мне новы касцюм, ну я яго прадаў і са сваімі друзьямі прапіў. Мы разам робім кошыкі і іх прапіваем. У мяне нікога нет. Я адзін, і ў іх нікога нет. Вот што мы заробім, усё прап’ем.

А, дзяўчына пытаецца ў царэвіча:

– А дзе твая сям’я, дзе твае бацькі?

– У мяне бацькоў няма, – гаворыць царэвіч, – я адзін.

А яна яму гаворыць:

– Ты такі ўдалы юнак і ўзяўся рабіць кошыкі. Што цябе заставіла да гэтай работы?

А ён гаворыць:

– Гэта мяне няшчасце заставіла рабіць кошыкі. Я бы памёр з голаду, каб не стаў рабіць кошыкі.

І начаў ёй гаварыць, як было. Вот царэвіч гаворыць:

– Я быў у другім царстве, і я быў цара сын. Я жаніўся і камандываў царствам. Бацька мой памёр, і я быў царом. І жылося добра. Я сабе ўзяў жонку бедную, лясніка дачку, і яна была пакуль добрая і справядлівая. Я паехаў паглядзець сваё войска. Вярнуўся я дамоў. Вот тут і спаткала мяне бяда. Прыходзіць да мяне мой першы дарадчык і гаворыць мне: «Твая жонка любіцца з другім тваім дарадчыкам. Вот не прагоніш, цар, дарадчыка, яны цябе атравяць». Я падумаў пазваць другога дарадчыка і сказаў слугам пазваць яго ка мне. Прыходзяць слугі і гавораць: «Нідзе дарадчыка няма». Вот я і падумаў, што першы дарадчык мне праўду сказаў, што мая жонка хочыць мяне атравіць. Я за яго праўду аддаў яму ўсё царства, а жонку сваю я надумаўся забіць. І я гэта зрабіў. Каля мора я ударыў ей у бок нажом і піхнуў яе ў мора, а сам пайшоў куды вочы глядзяць. І прышоў ў ваша царства. Спаткаўся я з п’яніцамі і стаў піць гарэлку. Колькі ў мяне было грошай, я іх усе прапіў з п’яніцамі, ну што болей німа грошай і німа

за што піць. Вот я кажу сваім п'яніцам: «Знаеце, хлопцы, я прыдумаў работу. Пойдзем у лес, будзем рабіць кошыкі і прадаваць, і будзіць за што выпіваць». Загласіліся мае хлопцы. І мы пайшлі ў лес і заняліся рабіць кошыкі і прадаваць. Вот так я цяпер і жыву.

– Вот, цар, пазаві сваіх хлопцаў, з каторымі ты рабіў кошыкі.

Цар пазваў сваіх хлопцаў, з каторымі плёў кошыкі. Тут дзяўчына ўсіх угасціла і адзела ў новыя касцюмы. Ну, царэвіч нічога не знаў, што гэта яго жонка яшчэ жывець і ён з ей гаворыць. Толькі падумаў: «Вот добрая царава дочка, пачаставала нас і ўсіх адзела».

Дзяўчына аставіла іх начаваць. Назаўтра гаворыць:

– Ну, хлопцы, ці пойдзеця вы рабіць кошыкі, ці будзеця ў мяне памагаць глядзець гаспадарку? Я вам усім дам работу. І будзеця ў мяне жыць.

Хлопцы сагласіліся ў царавай названай дачкі жыць і рабіць работу. Дала хлопцам дом добры, і яны памагалі рабіць работу на царскім двары. Разам робіць і царэвіч усякія работы. Вот аднаго разу дзяўчына пазвала царэвіча ў свой пакой і кажыць яму:

– Ты быўшы цар, я цяпер зрабіўся п'яніцай і зарэзаў сваю жонку, а хачу вярнуць табе тваё царства. Ён вялікі абманшчык, ён сам хацеў любіць тваю жонку. Ну, яна твайго першага дарадчыка прагнала, а ён сваю віну зложыў на другога дарадчыка і аўладзеў тваім царствам, а твая жонка ні ў чым не была вінавата, і другі твой дарадчык не вінават. Вот я табе цяпер скажу, хто я есць: я есць лесніка дачка, я твая жонка тая, каторую ты ўбіў нажом пры моры і скінуў у мора. І я ні ў чым не была вінавата.

Царэвіч і спужаўся, што яго яна заб'ець за тое, што ён яе хацеў зарэзаць. А яна сказала царэвічу:

– Ты цяпер нічога не бойся, я цябе караць на буду. Вот рана, што была прабіта нажом.

Царэвіч стаў перад ей на калені і дзякаваў за тое, што яна яго не карала. Дзяўчына пазвала цара, каторы ўзяў яе за дачку, і расказала ўсё цару, як гэта ўсё было і за што ён яе хацеў зарэзаць. Стары цар гэта ўсё паслухаў і сказаў:

– Цяпер гэта бяда ўжо невялікая, можам яе наладзіць.

І стары цар выправіў свайго пасланца ў другое царства па першага дарадчыка, каторы ўжо быў царом, каб новы цар прыехаў да яго. Ён маіць пільную патрэбу пагаварыць з новым царом. Першы дарадчык, які ўжо быў царом, з вялікай ахвотай сабраўся і паехаў да старога цара папытацца, што стары цар хочыць пагаварыць.

Вот стары цар вежліва пераняў новага цара і павёў у пакой да сябе і пачаў гаварыць з новым царом і стаў пытацца ў новага цара:

– Вот скажы мне, новы цар, вы былі ў маладога цара дарадчыкам, а цяпер сталі царом. Па якой выйшла ў вас прычыне? Як вам малады цар парадаў усё царства, а дзе ён сам дзеўся?

Першы дарадчык кажыць старому:

– Я не знаю, дзе малады цар падзеўся са сваёй жонкай, нідзе іх не чуваць. Мне сказаў: «Будзь царом у маім царстве» Вот вам мой адказ на ваша пытанне.

– Ну, вот і добра, – сказаў стары цар, – а я ўсё знаю і пазваў цябе, першага дарадчыка, каб сказаць усю праўду, а ты мне ўсё зманіў. Мы зараз усё будзем знаць. Вы зрабіліся царом і ўпраўляеця гасударствам, а гэта ўсё абманам. Вы абманулі маладога цара і зрабіліся царом. Вы не знаеця, дзе малады цар дзеўся, вы яго і жонку зацелі збавіць са свету.

Тут першы дарадчык пабялеў: маной свет пройдзеш, а назад не вернешся. Стары цар пазнаў маладога цара і жонку яго. Прыйшоў малады цар з жонкай да першага дарадчыка. Тут першы дарадчык стаў на калені і стаў цалаваць маладому цару ногі і пачаў прасіць маладога цара, каб яму ўсю віну дараваў. Малады цар маўчаў, нічога не сказаў, ці даруіць паршаму дарадчыку, ці не даруіць яму яго віну. Тут жа цара маладая жонка сказала першаму дарадчыку:

– Ніякага табе даравання нет, бо ты хацеў загубіць нас дваіх, а загубіў трэцяга – другога дарадчыка. Ты наманіў маладому цару, што я люблюся з другім дарадчыкам і што цара я хачу загубіць, а мы сам хацеў мяне браць, а цара загубіць. Я цябе прагнала з пакоя, каб болей цябе і не відзець. Вот мана твая ўся і выкрылася. Цяпер мы будзім цябе судзіць.

Тут стары цар пазваў сваіх слугаў і сказаў першага дарадчыка звязаць.

Слугі звязалі дарадчыка. Стары цар з маладым царом і яго жонкай паехалі ў царства маладога цара і павязлі з сабой дарадчыка. Прыехаў малады цар у свае царства, прывёз з сабой і дарадчыка. Як увідзеў народ маладога цара, ўсе сталі па дародзе сыпаць кветы, спатыкаць

маладога цара. І ўсе былі рады. Вот малады цар са старым царом і жонкай прызвалі сваіх слуг і сказалі слугам сазваць народ. Слугі сазвалі народ. І малады цар вывеў свайго першага дарадчыка перад людзьмі і сказаў, як яго абмануў першы яго дарадчык.

– І прашу вас усіх людзей: скажы, як яго пакараць?

Усе людзі закрычалі:

– Нада яму адсеч галаву, такому благому чалавеку.

І малады цар пазваў свайго ката і сказаў:

– Першаму дарадчыку адсеч галаву!

І кат вострым мячом адсек першаму дарадчыку галаву, а малады цар са сваёй жонкай зноў стаў управляць сваім царствам і памагаць старому цару упраўляць яго царствам. І так яны жылі шчасліва. Калі стары цар другога царства зусім састарэў, ён сказаў маладому цару:

– Ты мой сынок. Я ўжо скора памру, а ў мяне нет ні сына, ні дачкі. Я прыняў тваю жонку за дачку і глядзеў, як сваю родную дачку. Цяпер вам усе мае царства астаецца. Жывіця і ўпраўляйця, гэта ўжо ваша царства. Не крыўдзіця людзей і жывіця шчасліва.

Вот пры гэтых словах стары цар памёр. І другое царства асталося маладому цару. І малады цар стаў упраўляць двумя царствамі.

***Запісана ў в. Акулова Лагойскага р-на***

## Пра Пятра пра Вялікага

Жыла ў адной вёсцы жанчына, бедная. Нарадзілася ў яе дзіцё. І вот нада ёй завесці перахрысціць яго к папу, і ніхто не йдзе ў кумы. Выйшла на вуліцу і стаіць у слязах, аж ідзець Пётр Вялікі.

Спрашуець:

– Чаго так скучна стаіш?

А яна яму атвечаець:

– Не найду кума, ніхто не йдзе, бедная, а дзіця ж нада перахрысціць.

Ён ей гаворыць:

– Толькі кума нет, а можа і кумы?

– Кума ёсць, толькі кум.

Гаворыць Пётр:

– Вядзі куму, запрагай каня, я паеду за кума.

А баба гэта не знала, што цар. Ну, сабраліся і паехалі да папа, значыць, хрысціць ребёнка.

Прыехалі да папа, а поп п’яны ляжыць. От Пётр разлаваўся, што п’яны, і сказаў служанцы там:

– На другой раз, як прыеду, яму даю тры загадкі, штоб ён мне разгадаў, а еслі не адгадаець, я яго расцярзаю. Колькі на небе звёзд? Колькі я стою? (Сам на сябе Пётр Вялікі). Што я думаю?

І паехаў дамоў.

Поп гэты зваўся Калістра. І быў у яго брат такі ж самы, адзін на аднаго пахожы. Як поп пазнаў, што яму такія тры загадкі далі, калі прачнуўся, стаў бедаваць – дзе ж ён адгадае такія загадкі? Пайшоў к брату па раду. Брат сказаў:

– Я выручу, адгадаю ўсе тры загадкі. Палавіну жалаванья, што палучаеш за папа, дасі, сам буду адгадваць.

Гэты завярнуўся, поп паехаў дамоў.

Прыязджаюць Пётр Вялікі, значыць, хрысціць рабёнка. Ну, зразу заходзіць, дзе поп жыве. Увайшоў, паздароўкаўся, а не знае, што з братам паповым здароўкаецца, спрашуець:

– Разгадаў загадкі мае?

– Будзем, – гаворыць, – разгадваць.

Спрашвае цар:

– Колькі я стою?

Ён гаворыць:

– Пяць капеек.

Цар тады спрашвае:

– Пачаму я толькі пяць капеек?

Ён яму атвячаець:

– Патаму, што цар нябесны ўсяго стоіў трыццаць срэбнікаў, а ты зямны цар і, значыць, пяць капеек.

От, цар спрашуе цяпер:

– Сколькі на небе звёзд?

А ён узяў сшытку карандашом надзеўб і кажа:

– Пяць мільёнаў. Не верыш, сашчытай, – кажа, – калі няправільна.

– А што я, – кажа, – думаю?

Ён яму атвячае:

– Ты думаеш, што я поп Калістра, я не поп, а брат яго.

– Ну, а пачаму вы адгадалі, а не поп?

Ён гаворыць:

– Патаму што не поп быў п'яны, а я брат яго.

Ну, і ўсе – рашчот. Перахрысціў і паехаў дамоў.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***

## Як дурань служыў у папа

Жыў дзед з бабаю. Было ў іх тры сына – два разумныя, адзін дурны. Разумныя ўсюды хадзілі на работу, нанімаліся і малаціць, і араць, і касіць, а дурань сядзеў на печы, грэўся, нічога не рабіў. Вот маці выпраўляе аднаго разумнага:

– Пайдзі ты к бацюшку ці к каму-небудзь, к пану, паслужы. Заробіш грошай і хлеба, прывязеш дадому, будзе хаця нам што есці.

Пайшоў ён. Ідзе ён, ідзе, ідзе да ідзе – едзе бацюшка. Ён яму пакланіўся, бацюшка злез з воза і кажа:

– Куды ты ідзеш?

Ён гаворыць:

– А вот іду каб дзе-нібудзь астацца служыць.

Ён кажа:

– Аставайся ў мяне.

– Добра, астануся.

– Але ж хто на каго зазлуе, той таму нос адрэжа.

Ну і згадзіўся разумны астацца ў бацюшкі. Сеў ён на воз і паехаў к бацюшку дадому. Прыязджаюць, селі павячэралі, бо ўжо было цёмна. І гаворыць бацюшка:

Ідзі ж лажыся спаць, бо заўтра я цябе заране пабуджу ўставаць малаціць.

Пайшлі яны леглі спаць. Праспалі трохі. Ужо бацюшка яго і будзіць:

– Уставай, ідзі малаціць.

Ён устаў, бачыць: яшчэ вельмі рана, яшчэ пеўні не спявалі, ну пайшоў малаціць. Малаціў-малаціў, малаціў-малаціў – стаміўся. Ніхто яму не нясе ні есці, ні піць, а яму ўжо захацелася і вады і яды. Ізноў стаў малаціць. Малаціць, малаціць, вялікую ўжо кучу намалаціў жыта. Толькі нарэшце як развіднелася, прынесла яму матушка ў збаночку вады.

– Можа вы, дзетка, піць хочаце?

– Не, – кажа, – я піць не хачу, я хачу есці.

І бацюшка стаіць за дзвярамі, пытае:

– Можа вы, дзетушка, сярчаеце?

– Не, сярчаць не сярчаю, але й добрага слова на уме не маю.

– Раз жа ж ты добрага не маеш слова на ўме, значыцца, ты на мяне злуеш, значыцца, я табе і нос адразаю.

Ён узяў яму і адрэзаў нос. Пайшоў той дадому без носа. Прыходзіць ён дадому, маці ўжо плача, што без носа і платы ніякай не прынёс. Німа чаго есці. Маці гаворыць на другі дзень на другога сына свайго:

– Ідзі сынок, ты. Можа ты шчаслівейшы, от і заробіш што, прывязеш.

Пайшоў ён. Ідзе ён, ідзе да ідзе – ізноў бацюшка той самы едзе, едзе сабе слугу шукаць.

– Куды ж ты, – кажа, – дзіця, ідзеш?

– А вот іду, каб дзе астацца служыць.

– Аставайся ў мяне.

– Ну добра, астануся.

– Садзіся на воз.

Сеў ён на воз, паехаў. Едуць яны, едуць, прыехалі яны, на папоўскі двор заехалі. Гэтак сама было ўжо цёмна. Яны зайшлі ў хату, павячэралі, трохі пагаварылі. Бацюшка кажа:

– Лажыся спаць, бо заўтра заране я буду будзіць цябе малаціць.

Лёг ён спаць. Паспаў трохі, тут ужо бацюшка і гэтага будзіць, кажа:

– Уставай, ідзі малаціць.

Пайшоў ён. Малаціў-малаціў, малаціў-малаціў, і гэтаму таксама захацелася і есць, захацелася і піць. Чакае-чакае, каб яму прынеслі есці, не дачакаецца ніяк. После ўжо развіднелася добра, пад часоў дзесяць, прыносяць яму ваду ў збаночку і бацюшка, і матушка. Так матушка пытаецца праз дзверы:

– Можа ты, дзетачка, піць хочаш?

– Не, – кажа, – я піць не хачу, я есці хачу.

А бацюшка кажа:

– А можа ты, дзетачка, сярчаеш?

Ён кажа:

– Не, сярчаць не сярчаю, але добрага і слова ў мыслях не маю.

Той бацюшка і гэтаму нос адрэзаў. Пайшоў ён дадому без носа. Прыходзіць дадому, плача ўжо тая маці: два сына разумныя, і абое без носу.

На трэці дзень дурань кажа:

– Я пайду.

На яго кажуць:

– Куды ты пойдзеш? Разумныя прыйшлі без носа, а ты, дурань, і без галавы прыйдзеш!

– Да не, – кажа, – не прыйду без галавы. Я прыйду з носам і з галавою.

Пайшоў ён. Ідзе да ідзе, ідзе да ідзе. Як тому бацюшку дак трэба быў слуга, дак ён і шукаў, ізноў ехаў на возе.

– Куды ж ты, дзятачка, ідзеш?

– А вот, – кажа, – іду, каб дзе астацца служыць.

– Ну, аставайся ў мяне.

Сеў на каня і паехалі яны, прыязджаюць на двор і к бацюшку, злез з воза. Тады павячэралі, было ўжо позна, леглі спаць. Праспаў той дурань трохі, бацюшка будзіць:

– Уставай, – кажа, – ідзі малаціць.

Пайшоў той дурань, малаціў-малаціў, малаціў-малаціў. А ён быў дужы, намалаціў вялікую кучу збожжа. Пассыпаў гэта ўсе ў мяшкі, пассыпаў да коней запрог і паехаў і прадаў усе гэта. Накупляў сабе і булак, і сыра, і сала, і масла, і гарэлкі купіў. Малаціў-малаціў, малаціў-малаціў, зноў намалаціў добрую кучу. Думае: «От, каб хто вады прынёс, хаця каб мне разок глынуць!».

Ну, не за доўгім часам прыносяць яму воду. Матушка кажа:

– Можа вы, дзетачка, піць хочаце?

Дак ён:

– О, матушка, так піць хачу, дай хаця душу адвесці.

Ну, узяў напіўся, а бацюшка кажа:

– А можа вы, дзетачка, хочаце есці?

– О-о, батюшка, есці я не хачу, калі хочаце, дак і вас угашчу.

– А што ў цябе есць есці?

– А зайдзі, бацюшка, паглядзі.

Як зайшоў батюшка, паглядзеў: дак у яго многа ўсяго паразложана.

– А дзе ж ты гэта ўзяў?

Ой, батюшка, дзе я ўзяў? Я ж зране ўстаў, малаціў-малаціў, малаціў-малаціў да пассыпаў усё ў мяшкі, да коней тваіх запрог да павёз і прадаў, ды і накупляў сабе гэтага. Можа, вы, батюшка, сярчаеце?

– Не, не сярчаю, дзетачка, нада ж пакушаць, на работу ж нада рабіць.

Ага! Ну што ж, пашоў той бацюшка ў хату.

– Што ж, – кажа, – будзе. Ён жа будзе кожны дзень малаціць і кожны дзень будзе прадаваць вазіць. Трэба яго як прагнаць са двара.

– Ну, гаворыць матушка, – хай памалоціць, хваціць і з нас, хваціць і з яго. Ён ужо ж больш не павязе, ужо ж накупляў сабе яды.

Вось ён малаціць назаўтра ўжо ўстаў, цэлы дзень малоціць і есць тую яду. Ну ўжо і нічога. Напаследак бачыць, што яда ўжо канчаецца. Гэтак намалаціў усё і паехаў прадаў, сам сабе грошы ўзяў у кашалёк. Думае: «Я пайду дадому ўжо».

Матушка кажа:

– Не, трэба яшчэ трохі падзяржаць, хай ён паедзе ў млын, хай ён змеле нам гэта. Дак ён змалоць змеле, там мо яго чэрці разарвуць.

Ну паехаў ён малоць, адправілі яго. Прыязджае на мельніцу. Цёмна, поўнач была. Той дурань ужо сеў, дастаў скварку, пячэ на агні. Прыбягаюць у дванадцаць часоў чэрці. Паглядзелі яны, што дурань пячэ скварку, а яны ўзялі жабы паўспіралі на палачкі, пякуць. Так той дурань кажа:

– Дайце мне вашай скваркі пакаштаваць.

Дак чэрці кажуць:

– А дай жа ж ты нам свае.

Да ўжо даюць яму пакаштаваць, так ён у таго ўкусіць і таго ўкусіць.

– Дай жа ж ты нам сваё.

Дак ён ім як суне гарачае скваркі, дак чорт і адскочыцца, як суне, дак і адскочыцца. А чэрці тыя ўсе ў кружок ды сціскаюцца пад яго, сціскаюцца. А ён тое сала пячэ да ў іх соўвае, да ў іх соўвае. Ужо і пеўні заспявалі, чэрці тыя паўцякалі, прышоў мельнік. Дурань змалоў, тую ж муку ён узяў сабраў усю ў мяшкі, паехаў і прадаў. Сабе грошы пабраў, а прыйшоў да попелу нагроб у мяшкі і завёз к бацюшку попелу на двор. Сонца хараша свеціць, матушка выйшла ды кажа:

– Што гэта ў нас на двары робіцца? Нейкага пылу, нейкага попелу!

А дурань тыя мяшкі вытрасае, той попел на двары пад акном, нарабіў немаведама чаго. Што ж рабіць із тым дурнем, трэба як яго дадому адправіць. А старая ўжо пападдзя-маці ды кажа:

– А я палезу на яблыну (а было лета якраз, цвіла яблына) і буду кукаваць, а ты, сынок, скажаш: «От табе ўжо пара дадому, ужо й кукуля кукуе. Ужо ты ў нас перазімаваў, работу ўсю парабіў і едзь дадому ўжо».

Ну што ж. Палезла тая матушка на яблыну кукаваць, так ужо жонка гаворыць:

– Вот што, мілы чалавек, ты ўжо ў нас усю работу парабіў, табе пара дадому.

Так дурань кажа:

– Усю не ўсю, ужо араць трэба ехаць. Я яшчэ вам заару.

А тады поп:

– Не, мы самі будзем араць, ужо зязюля кукуе, значыцца, мы ўжо слугаў сваіх адпраўляем дадому.

Дык ён кажа:

– Ну, я яшчэ заару.

А тады:

– А я ж пайду паслухаю, ці гэта зазюля.

І яны не бачылі, як ён узяў стрэльбу са сцяны. Думае: «Пайду ж я застрэлю гэтую зязюлю, калі яна кукуе, каб мне тут пабыць, заработкі добрыя».

Прыйшоў і выстрэліў у гэтую кукулю. І тая ўжо маці бацюшкава аб зямлю скацілася. Ён прыбягае у хату:

– Батюшка, бацюшка, я вашу матушку забіў.

Дык ён кажа:

– Матушку забіў?

– Ну да, можа вы, батюшка, сярчаеце?

– Не, не сярчаю, яе жыцця гэтакая.

Ну што ж. Згаварваюцца яны ўжо з жонкаю, што ж рабіці.

– Ну, адпраўляймо яго, хай едзе араць, а там мядзведзь ходзіць на нашу паласу, ён там яго і задушыць.

Паехаў ён араць. Арэ ён, арэ на валох. Прыходзіць мядзведзь з лесу:

– Чалавеча, чалавеча, дай мне вала.

– Пачакай, – кажа, – я вось даару, тады я табе вала тога аддам.

Ну, а згаварвалі, ішлі на ахоту, на мядзведзя, паны ішлі. Трэба забіць, бо мядзведзь ходзіць на поле, людзей душыць і валоў душыць – нельга араць. От, ён чуе ражок трубіць:

– Туру-туру! Не бачылі зайцоў, ваўкоў, мядзведзяў – паляванне будзе!
А мядзведзь кажа:
– Чалавеча, чалавеча, палажы мяне на воз.
Дык ён кажа:
– Не бачылі, пане.
– А што ў цябе на возе?
– Калода, пане.
– Каб калода, то ўвязана б была!
Мядзведзь кажа:
– Чалавеча, чалавеча! Прывяжы мяне.
Той чалавек узяў увязаў яго. Зноў чуваць ражок:
– Туру-туру-туру! Не бачылі зайцоў, ваўкоў, мядзведзяў – паляванне будзе!
– Не бачылі, пане.
– А што ў цябе на возе?
– Калода, пане.
– Каб калода, дык тапор бы ўсячаны быў!
– Чалавеча, чалавеча, ўсячы ў мяне тапор.

Той чалавек як стукнуў яму тапаром, дык і засек таго мядзведзя. Ну што ж. Зaараў ён усё, думае: «Я ж і пяшком зайду! А вас, валоў, я вазьму парэжу, у барозны пакладу, і будзе добра расці картофля!» Паклаў ён валоў у баразну, заараў іх пяском добра і прыходзіць дадому.
– Ну што, заараў?
– Заараў. І мядзведзя забіў, паляваў.
– А дзе ж валы?
– Я ж як кончыў араць, дык я ж іх пазабіваў і ў баразну пазаварочаў – лепш ураджай будзе. Можа, вы бацюшка сярчаеце?
– Не, – кажа, – не сярчаю, дзетачка, лепш расці будзе ўсё.

Так ужо зноў у бядзе. Гэткую ж ён ім порчу носіць дома. З матушкаю зноў дагаварваецца, як жа яго збыць, дзе дзець.
– Давай мы напяком сухароў мяшок да сабяромся, сыдзем з гэтуль. Дак ён пажыве, пажыве адзін ды пойдзе ад нас.

Вот яны напяклі, а ён гэта чуе, што яны гэтак сабіраюцца. «А, – думае, я ж вас ашукаю!» Напяклі гэтых сухароў, і матушка мяшок увяла, і бацюшка, паставілі ў сенах, завязалі, выйшлі на двор і гукаюць яго:
– Мы ўжо на гэты час сыходзім, як усё паворана, усё пароблена. Так што і ты ідзі ўжо дадому. І мы пойдзем.

От ужо яны недзе зайшлі сабірацца, адзежу сабіраць, а ён у гэты час улез у адзін мяшок, завязаўся і сядзіць. Сабраліся яны, прыйшлі. Бацюшка ўжо паддаў сваёй жонцы мяшок, а яна бацюшку на плечы, пайшлі яны. Ідуць, ідуць, ідуць яны. Бацюшка стаміўся, ён не знае, што ён дурня нясе ў мяшку. А той дурань у мяшку: «Кэс!» Батюшка кажа:
– Уцякайма скарэй, недзе ж даганяе!

Ідуць яны, ідуць-ідуць, а той дурань «Кэс!» у мяшку крапчэй. Яны яшчэ хутчэй ісці. Стаміўся той батюшка, а дурань у мяшку як зарагоча! Той батюшка мяшок паставіў на зямлі, глядзіць – дурань у мяшку. Кажа:
– Як жа гэта ты завязаўся? Як жа гэта ты пайшоў з намі?
– Бацюшка, дарагі, дзе вы, там і я, – дурань кажа.
– Ну што ж, – кажа, – пойдзем далей.

Ну, ідуць яны, ідуць усе утраіх. Ужо звечарэла, стала цёмна. Адышліся яны ўжо ў бок ад гэтага дурня, дак ужо дагаварваюцца з жонкай:
– Што ж нам рабіць?
Паглядзелі, там якраз выйшлі на луг, было возера.
– Давай мы ляжам ля возера спаць, – ён кажа на сваю жонку. – Я лягу з краю, а дурня возьмем пасярэдзіне, а ты ля дурня ляжаш. І тады, як дурань засне, я ўстану, лягу ля цябе, штурхану цябе, а ты дурня, укінем яго ў возера і утопім.

Той жа ж дурань пачуў гэта, не спіць ён, ніяк не засынае. Чуе, і бацюшка захроп, і матушка захрапла. Так ён тую матушку штрухець у бок, а матушка паднажала і разам з дурнем штурхець бацюшку – і утапілі ж таго бацюшку яны. Ён усхапіўся:

– Ах, дарагая матушка, бацюшка ж прапаў, утапіўся бацюшка.

А ўзяў тую і матушку ўтапіў і кажа:

– Вы мяне ашуквалі ўсё ўрэмя. Вот вам, – кажа дурань ўночы.

Ідзе ён, ідзе да ідзе, а там праходзіў гасцінец. Па гасцінцы і людзей чуе, нейкія людзі з мяшкамі ідуць. Ён узлез на хвойку, бачыць: паселі яны там, ля той хвойкі. А гэта былі жулікі. Павытрэсалі з мяшкоў грошы і лічаць, ужо дзеляць тыя грошы. Ён сядзіць, сядзіць на той хвойцы ды давай шышкамі паляць у іх. Яны гавораць:

– Скарэй шчатайма, ужо зараз будзе развідневацца, ужо птушкі шавяляцца і раса ападае, і шышкі падаюць – скарэй.

А пасля ён узяў да галіну вялікую. Як адламіў да як кінуў на тых дурняў, так яны падумалі німаведамі што, тыя жулікі. Яны ўцякаць, а ён за тыя грошы, у мяшок патаптаў і прынёс да дому. І грошай прынёс многа, і з носам прышоў, і з галавою.

***Запісана ў в. Горна Лагойскага р-на***

### Як чалавек дурняў шукаў

Жыў-быў чалавек, у яго дачка была адна толькі. А прыйшоў адзін у сваты к ёй. Гэта маці загадала ёй:

– Ідзі ты ў пограб, піва налі.

Яна пайшла піва наліваць і ўгледзела над дзвярыма матыку. Села, гэта піва цячэ, яна думае: «Ох, як у мяне дачка будзе, я адпраўлю піва наліваць, а матыка ўпадзе да заб’е маю дачку».

Села і плача. Маці сядзела, сядзела, потым прыбегла, бачыць: дачка плача. Яна расказала гэта, і маці плача. Сядзіць бацька з жаніхом. Жаніх кажа:

– Што яны там робяць, я пайду пагляджу.

Ну, і гэтаму кавалеру расказала, і гэты кавалер сеў, плача з імі. Бацька адзін сядзеў, сядзеў, прыйшоў ён:

– Чаго вы тут плачаце?

Яны яму кажуць:

– Унь, як я пайду замуж да радну дачку (гэта ўжо дачка яго так кажа), а там матыка вісіць, прыйдзе мая дачка піва наліваць, матыка ўпадзе да яе заб’е.

– Тфу! Пайду ў белы свет. Калі найду дурней за вас, вярнуся назад, а як не найду, не вярнуся.

Ну, і пайшоў, ужо і аслабеў трохі, хадзіў цэлу нядзелю. Прыблудзіў ён к панскаму двару, сеў ён на лавачку, сядзіць. Выйшла пані, у яе сын памёр. Так яна прысела к яму:

– Адкуль ты, чалавеча?

– З таго свету?

Дак яна:

– А мо бачылі майго сына Магамета?

– Бачыў.

– А як ён там жыве?

– Ён добра жыве, але свайго дома не мае.

– А колькі дом харошы пастроіць будзе каштаваць?

– Ну, як сярэдні, то тысяч дваццаць, а як харошы, то і сорак трэба.

Яна пабегла, адлічыла яму гэтых сорак тысяч і дала. Ён барджэй, адкуль у яго сіла паявілася, пайшоў. Ідзе, прыязджае пан.

– Быў, – кажа пані, – з таго свету чалавек да й бачыў нашага сына Магамета. Дык яму і добра, але, кажа, німа свайго дому, дак харошы дом пастроіць сорак тысяч, я яму дала.

Дак пан:

– Ох! У каторы ён бок пайшоў?

– От так пайшоў.

Пан пайшоў на скакуну ўжо сваім, на кані ляціць. Мужык азірнуўся – аж пыл ідзе. Бачыць: чалавек на палянцы арэ лысы. Ён пабег к яму і кажа:

– Чалавек, едзе пан-хам і знімае лысым галовы. На маю шапку адзень, лезь на дуба, а я буду за цябе пахаць.

Ён стаў пахаць. Пад'язждае гэты пан:

– Ці не бачыў ты, чалавеча, праходжага чалавека?

– А онь, – кажа, – на дуба палез.

Дак ён на гэтым скакуну:

– Злязай, я табе галаву зніму!

А гэты чалавек лезе далей да:

– Паночак, я не лысы, я не лысы!

Дак ён:

– Падсадзі мяне, я яму зніму галаву ўсё адно.

Ён яго ўссадзіў трохі на галіну, гэты пан пакарабкаўся, а ён на гэтага скакуна і паскакаў. Пан ўжо дагадаўся, што той самы, ну да злез ужо, бачыць, што бяда, пайшоў дадому і кажа на жонку:

– От, цябе абмануў і мяне абмануў. Ад цябе грошы забраў, а ад мяне скакуна атабраў.

А ён вярнуўся да дому з гэтымі грашыма і з усім. Паставіў дом харошы, стаў жыць да кажа:

– Дурней вас знайшоў, дак вярнуўся.

***Запісана ў в. Ізбішча Лагойскага р-на***

## Як салдат скупую гаспадыню перахітрыў

Ішоў салдат у водпуск. А пасцілі хлопцы каровы і злавілі саву. Іван і Сцяпан пачалі біцца за гэту саву. Той «мне», той «мне». Ішоў салдат ды кажа:

– Што вы, хлопчыкі, робіце?

Адзін кажа:

– Я лавіў, лавіў, а ён адбірае, не дае савы.

– Дык што, – кажа салдат, – а дам вам за яе капейкі, вы не будзеце біцца за яе.

Да аддаў за яе капейкі, узяў саву і пайшоў. А хлопцы ўзялі капейкі і сядзяць.

Ідзе салдат. Усюды цёмна. А ў адной хаце свет свеціцца. Ён падышоў (а хвіранак не было даўней) ды стаіць з гэтай савою. Бачыць, што бацюшка сядзіць у аднае бабы. А на стале ўсяго, ўсяго, што душа прымае. А яе чалавек павёз у млын малоць муку ды доўга нямашака. Дык яны ўхаджваюцца ўдваіх. А салдат стаіць за сцяною ды выглядвае.

А калі скрыпнулі варота, дык яна барджэй, усё пахавала са стала! Яна не бачыла салдата, але так пахавала. Гарэлку ў ложак, каўбасы ў печку, а бацюшку пад печ. А гэты салдат усё выглядвае. Зайшоў у хату, салдат кажа:

– Чаму не даеш есці мужу?

Дык жонка:

– Ну, нейкі ж там квас ёсць.

– Які квас. Дай што-небудзь больш.

Да як пацісне саву, дык яна: «Ку-гу».

– А што яна гаворыць?

– Чуствуе гарэлку ў ложку.

Паглядзеў дзядзька, праўда. А салдат трошкі пасядзеў, пасядзеў і зноў пацісне.

– Гэта што?

– Там у печы скваркі нейкія, каўбасы, – кажа салдат.

Праўдзіць сава. Сядзеў, сядзеў ды зноў салдат як пацісне моцны, дык сава як зараве.

– А гэта што?

– У вас бацюшка ў падпечку.

Паглядзеў гэты хазяін. Праўда. Да ўжо добрую бярэзіну ўзяў, а салдат кажа:

– Не, чакай.

Тады хазяін просіць салдата:

– Дай мне гэту саву.

Да пайшлі ў сенцы, да пакінулі гэту саву. А сава ўзялася лапамі за стол ды сядзіць. Хазяйка падскочыла к саве ды стук рукой аб зад. А сава схапіла яе за спадніцу ды дзяржыць лапаю.

Усхапіўся бацюшка, падняў кол, а тут як ускочыць гэты дзядзька ды схваціў бярэзіну, ды як пачаў хрысціць сваю жонку. Дык гэты салдат крычыць:

– Дзядзько, дзядзько, не чапай, бо ты мне папорціш гэтую саву. Яна ў мяне ўсё знае, расказвае, дарагая сава.

Пайшоў салдат, а гэты гаспадар бяжыць за ім ды кажа:

– Колькі заплаціць за яе? Прадавай саву.

– Я не прадам яе, бо яна вельмі добрая, гэта сава.

Але прадаў саву гаспадару і пайшоў сваёй дарогай.

***Запісана ў в. Акулова Лагойскага р-на***

## Дванаццаць братоў і сястра

Жыў адзін чалавек з сваёй жаной. І малі дванаццаць сынавей і адну дачку. Харашо жылі, друг друга ўважалі, дружна жылі, як паложана. Хлопцы, кожны з сыноў, мелі лошадзь, і бацька меў сабе лошадзь. Кожны быў ахотнік. Умярла маці, астаўся адзін бацька. Ну, і дзеці асталісь, значыць, дванаццаць братоў і сястра. І так уважалі брацця сваю сястру, што яны гатовы былі яе на руках насіць. Паскольні яна адна, яна ім мыла ўсё, сцірала і гладзіла ўсё харашо, за імі ўхажывала. Што ж, пажыў нямножка стары бацька, гаворыць:

– Знаеце, дзеці, што?

– А што, папа?

– Пазвольце мне ўзяць старуху яшчэ. Я не магу без старухі жыць.

Ну, хлопцы пабяседавалі самі з сабой, паразгаварывалі, пасаветваліс.

– Ну, што ж, – гавораць, – вазьмі.

Бацька запрагае лошадзі, паехаў за старухай. Аддае каманду сынаўям.

– У таком, таком месце мяне ў лесе ўстрэціце. Асядлайце лошадзі, пад'едзеце мяне ўстрэціць.

Ну, раз далі сагласіе, нада ўстрэціць. Вот праз час, калі ўжо бацька павінен быў пад'ехаць, асядлалі лошадзі і паехалі. Ужо бацька едзе са старухаю. Ну, бацька аж дванаццаць сынавей меў – большая гордасць, адзін у адзін сынаўя, красівыя, дастойныя, парадачныя.

Гаворыць:

– Знаеш што, старуха, то сынаўя мяне ўстрачаюць. Сматры, якія на лашадзях.

– Сматры, – гаворыць яна, – вон пабегла ў лес дванаццаць ваўкоў.

Яна калдунья была, ператварыла іх у ваўкоў. Ён відзеў, што павінны былі па'ехаць. І тут раз! Не стала іх. Ператварыла ў ваўкоў. Беспакоіцца старык:

– Што мне дзелаць? Як мне будзе жыць без сваіх сынавей?

Ужо прывычка: бацьку мець дванаццаць сынавей і потым згубіць іх. Ён ужо не даволен быў. А сястра трыжды. Сястра да таго змучылася, што не знае, што дзелаць.

– А дзе брацця?

Гаворыць бацька:

– Я замеціў глазамі, быдта ўстрачалі. Потым, – гаворыць, – не стала іх. Дзе дзяваліся, не знаю.

Пабыла трое сутак сястра дома, гаворыць:

– Ну, што ж, айцец, я пайду шукаць браццяў. Мне не жыць без браццяў. Пайду іх шукаць.

Сабралася і пайшла. Ішла яна доўга ці коратка, пападае ў адзін лес. Па трапіне прыходзіць к дому. Старушка ў доме.

– Куды, маладая дзевушка, шагае? – спрашуе старушка.

Гаворыць яна:

– Знаеце што, бабушка, у мяне было дванаццаць браццяў.

– І што ж?

– Іх не стала. Айцец паехаў, узяў сабе другую жану, мачыху. Яны паехалі ўстрачаць айца з мачыхай, і іх не стала. Я рашыла іх шукаць. Няхай я загіну, але найду іх. Можа бы вы што-небудзь мне падсаветавалі? – спрашвае сястра.

Кажа бабка:

– Я нічога не знаю. Прайдзі, – гаворыць, – далей па трапінке, я тябе ўкажу, там мая старшая сястра, яна, можа быць, табе што-небудзь падскажа пра іх.

Ну, направіла да сястры. Пайшла яна па трапінке. Прыходзіць, такжа заходзіць да другой старухі. Папрыветствавалась.

– Куды ж ты, дзевушка, ідзеш?

– Ой, бабушка, іду шукаць брацця̆ў сваіх! Было ў мяне дванаццаць брацця̆ў, іх не стала. Дзе загінулі, можа быць, у людзей добрых папытаю да найду іх.

– Ой, – гаворыць, – мілая дзевушка, твае брацця ваўкамі ў лясу бегаюць. Табе цяжка к іх дастацца, іх выручыць. Яны знаходзяцца ў таком-таком месце, я знаю аб іх. Яны толькі бываюць тры часы людзьмі ноччу. А калі прыходзяць з палявання, яны адзін другога рвуць, злыя такія, што адзін другога рвуць, пакуль не стануць людзьмі. Ну, я цябе напраўлю. Ідзі вот па трапінке, і калі яны стануць людзьмі, тады ты можаш абраціцца к ім.

Паблагадарыла сястра за брацця̆ў і пайшла. Ішла, ішла доўга ці коратка, абарвалася па лесу, пашарпалася. Прыходзілася ёй начаваць у лесе, паўсюду. Прыходзіць да логвішча. Па камандзе старушкі яна залазіць на дзерава. Залезла на дзерава, ажыдае, калі яны паявяцца. Яўляюцца. Злыя такія, без канца края адзін другога рвуць, клочча ляціць з іх. Потым чэраз кароткі час сталі людзьмі. Гаворыць старшы брат:

– Як жа жыве наша сястра? Яна адзінокая без нас. Як яна, бедная, перажывае. Як было б інцярэсна нам яе ўвідзець, а ёй нас.

Вот тады яна зладіць к ім, цалуецца, прыветствуецца. Ну, яна канешне, плакала крэпка.

– Не плач, сястра, ну што здзелаць. Гэта мачыха ператварыла нас, – гавораць, – у ваўкоў. Яна – калдунья. Табе прыходзіцца страдаць з-за нас.

– Як жа вас спасці, брацця? Пасаветуйце мне.

– Нет, сястра, ты нас спасці не можаш.

– Чаму?

– За каждага з нас ты павінна быць за аднаго года немкай. Дванаццаць лет ты павінна быць немкай, нямой, не разгаварываць ні з кім, што бы ў цябе не случылася, якія б ні былі беды, ты не павінна ні з кім разгаварываць, толькі іваць і ўсё. Дванаццаць лет ні адзін чалавек не можа выдзержаць быць нямым.

– Я абяцаю быць дванаццаць лет за вас нямой, што бы не случылась.

Ну, падходзіць урэмя, што яны ператвараюцца ў ваўкоў.

– Сястра, хавайся ад нас, – камандуе старшы брат.

Яна пайшла, залезла ў дупло.

Якісьці граф стары хадзіў на ахоту з сабакамі. Сабакі ўслыхалі, што нехта ёсць у дзераве, давай лаяць. Ён хацеў страляць у дзерава, потым давай расматрываць. Пасматрэў: што-та ёсць там. Палез: ёсць.

– Вылязай!

Яна абарваная, усё на ёй абарванае. Яна яму кіўнула, што мне кінуць. Той кінуў ёй плашч свой, яна вылазіць. І была бальшой красаты. Панаравілась яму да бязумія. Што ён ні скажа, яна ўсё панімае, а што яе спрашуе, яна нічога не атвячае. Толькі ківае ў атвет яму. Дальше што. Граф ажаніўся з ёй, хаця родныя не разрашалі яму ажаніцца. Яна далжна была імець рабёнка. Паяўлаецца мачыха: знала аб гэтым, што яна далжна была імець рабёнка, што яна нямая радзі брацця̆ў. Паяўляецца ў доме і гаворыць:

– Я магу прыняць у вас роды, я слыхала, што ў вас прадстаяць роды, я акушэрка, магу пряныць роды ў вас.

– Пажалуста, пажалуста.

– Толькі ніхто не должан прысутстваваць, калі я буду прынімаць роды.

Яна ж відзіць, што мачыха, а сказаць не можа, што нельзя яе вызваць з кварціры. Яна нічога не можа атвеціць. Нарадзіўся мальчык. Мачыха січас жа адкруціла галаву і бросіла. І нарабіла крыку:

– Вой-вой, я толькі адвярнулася, а нямая ўдушыла рабёнка.

Яна хоча, штоб загаварыла, застаўляе яе. Нічога не гаворыць.

Пішуць графу пісьмо радныя: «Твая жана імела рабёнка-сына, але удушыла, немая». Ён атвячае: «Да майго прыезда нічога не далжно быць, не трогайце».

Ну, вот ён прыехаў, прашчае ўсё гэта за яе красату, за яе атнашэнне – усё жывуць. Зноў прыходзіць урэмя, што далжна была яна імець другога рабёнка. Зноў яўляецца акушэрка гэта сама, мачыха. А яго не было дома, яна папрасіла з кварціры выйсці і другога рабёнка удушыла. Зноў нарабіла крыку:

– Ваша нямая ўдушыла рабёнка. Што вы яе дзержыце, для чаго яна вам нужна, гэта немка. У вас такое высокае званне і дзяржаць такую нямую. Яе нямедленна нужна ўнічтожыць.

Ужо ж канчаецца дванаццаць лет, вот-вот, мачыха гэта знае.

Яўляецца муж. Ну, началі ўсе нападаць на яго: для чаго табе нужна яна, нада яе растраляць, немку унічтожыць. За двое дзяцей нада яе ўнічтожыць.

Ну, здзелалі такое віднае места, уродзе трыбуну, ну, і масы штоб усе відзелі, за што яна расстрэляна.

Скончылась дванаццаць лет. А яна апусціла галаву і ажыдала ўжо смерць, паміраць – растраляюць. Глянула яна, відзіць брацця ў. Яна абазвалась:

– Я ні ў чом не віноўна, што мяне расстрэльваеце. Віноўна, – гаворыць, – вот гэта старуха, мачыха мая, акушэрка, каторая ўнічтожыла мне два сына. Сама задушыла, на мяне віну вазлажыла. Вунь скачуць мае дванаццаць брацця ў, каторых яна ваўкамі ператварыла.

Было ўсё восстаноўлена правільна. Значыць, за гэту мачыху, на пару жарабцоў прывязалі і яе разарвалі. І асталася сястра жыць з браццямі і жывуць па сённяшны дзень.

***Запісана ў в. Акулова Лагойскага р-на***

*Алена ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАЯ*

# З МАТЭРЫЯЛАЎ ФАЛЬКЛОРНАГА АРХІВА ІНСТЫТУТА МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ НАН БЕЛАРУСІ

Фальклорна-этнаграфічная калекцыя з Лагойшчыны невялікая па колькасці і складае 58 адзінак, запісаных этнамузыколагам П. П. Альхімовічам у 1973 годзе. Гэта былі першыя экспедыцыі, скіраваныя на збор твораў у пэўных раёнах. Наладжваліся яны тагачасным аддзелам славістыкі, арганізаваным у 1972 годзе. У аддзеле было набыта пэўнае тэхнічнае абсталяванне, і фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы фіксаваліся ўжо не толькі алоўкам, але і на магнітафон. Тагачасная тэхніка была недасканалая, але, дзякуючы нашым намаганням, накіраваным на захаванне фанаграм, арыгіналы і зараз знаходзяцца ў добрым стане, хаця ўжо залічбаваны на сучасныя носьбіты (гэта забяспечыць іх існаванне на многія дзесяцігоддзі).

Акрамя доўгатэрміновых экспедыцый, у 1973 годзе наладжваліся камадзіроўкі і выезды на некалькі дзён, але пры актыўнай працы яны давалі добрыя вынікі. Так, за 5 дзён працы у Лагойскім раёне П. П. Альхімовічам абследавана 5 вёсак: Жасцінае, Баяры, Камена, Гарадзішчы, Ліцвіны.

У названых вышэй вёсках запісаны як каляндарна-абрадавыя, так і пазаабрадавыя, сямейна-бытавыя песні, прысутнічаюць пэўныя каментарыі і тлумачэнні пры выкананні песень.

Статыстыка паказвае колькасць запісаў і іх жанравы склад:

в. Баяры – усяго зафіксавана 14 твораў. З іх: ражаство – 2; калядных – 3; масленічных – 3; цярэшак – 2; велікодных – 2; вясельных – 2.

в. Гарадзішчы – усяго зафіксавана 15 твораў. З іх: хрэсьбінных – 2; балады – 4; пазаабрадавых – 9;

в. Жасцінае – усяго зафіксавана 13 твораў. З іх: цярэшак – 2; пятроўскай – 1; купальскай – 1; жніўнай – 1; вясельнай – 1; балады – 4; пазаабрадавых – 3;

в. Камена – усяго зафіксавана 10 твораў. З іх: велікодных – 2; Пятроўскіх – 2; балады – 4; пазаабрадавых – 3;

в. Ліцвіны – усяго зафіксавана 6 твораў. З іх: цярэшак – 2; жніўных – 2; пазаабрадавых – 1; хрэсьбіны – 1;

Ражаство, што адкрывае каляндар, прадстаўлена творам, які можна лічыць узорам:

Чыстая дзева, Чыстая дзева
Сына радзіла, сына радзіла.
Хрыстос радзіўся, Хрыстос радзіўся,
На хвалу хваліўся.
(запісана ў в. Баяры ад Е. К. Курыловіч)
(АІМЭФ НАН Бел., ф. 20, воп. 73, ст. 4)

Калядныя тэксты, класічныя, поўныя, даюць дэталёвыя апісанні:

Каляды, калядачкі,
Вазілі бліны і аладачкі.
У маляваным вазочку,
На вараненькім канёчку
(запісана ў в. Баяры ад Л. Ф. Міхед, Е. К. Курыловіч)
(АІМЭФ НАН Бел., ф. 20, воп. 73, ст. 4)

Спраўляюць на Лагойшчыне і Цярэшку. Толькі скардзяцца сталыя жанчыны, што моладзі стала мала на вёсцы, а якая «жаніцьба Цярэшкі» без хлопцаў і дзяўчат? І зноў-такі запісаныя творы паўнавартасныя, значныя і даволі рэдкія. Пры аналізе аднаго з іх праглядваюцца варожбы, якія прыходзяцца на гэты каляндарны перыяд. У тэксце ўзгадваецца Дунай, які часта выступае ў розных іпастасях, а ў дадзеным выпадку выступае ў выглядзе «вялікай вады», якая сімвалізуе хуткую змену сацыяльнага статусу дзяўчыны, яе хуткае замужжа:

Я й свайго мілага
Цераз Дунай вадзіла.
Вадзіла, гаварыла,
Жаліцца дазволіла.
(запісана ў в. Ліцвіны ад У. І. Церах)
(АІМЭФ НАН Бел., ф. 20, воп. 73, ст. 3)

«Цярэшка» – абрад вельмі мудры. Ён пралічвае наперад і прагназуе адну з самых галоўных сфер чалавечага жыцця – шлюб, сям'ю, але кпіны і весялосць не апошнія ў гэтым складаным і сур'ёзным абрадзе, і таму гучыць наступнае:

Цярэшка валочыцца,
Жаніцца не хочыцца.
Жанісь, мой міленькі,
Жанісь, удаленькі.
(запісана ў в. Жасцінае ад Е. К. Жук, М. П. Жук, А. Г. Галоўка, С. Вільтоўскай)
(АІМЭФ НАН Бел., ф. 20, воп. 73, ст.3)

Бадзёры настрой, весялосць працягваюцца па зімовым часе, але «Цярэшка» саступае месца Масленіцы, якую на Лагойшчыне таксама адзначаюць. Як вядома, на Масленіцу ўшаноўваюць маладых, што ўзялі шлюб летась, а Маслянка калісь супадала з адыходам старога года і сустрэчай Новага года і Часу, таму песні-прывітанні моладзі складаюць значную частку Масленічнага цыклу:

І вароты скрыпяць, і марозы чуваць,
А ў нашага Віцячкі ды кажушка нету.
Йна пры бочку ляжыць, як каліначка гарыць,
Йна сама не самляе, яго сагрэе.
(запісана ў в. Баяры ад Е. К. Курыловіч)
(АІМЭФ НАН Бел., ф. 20, воп. 73, ст. 4)

Да масленічных на Лагойшчыне ў вёсцы Баяры адносяць баладу пра ператварэнне дзяўчыны па сваёй волі ў вярбу, каб пазбегнуць замужжа са старым і нялюбым. Заўважым, што сустракаецца вельмі рэдкі для характарыстыкі Масленіцы эпітэт «святая»:

На святую Масленіцу
Пайшла дзеўка па ваду [вадзіцу].
(запісана ў в. Баяры ад Е. К. Курыловіч)

З велікодных песень запісана толькі адна, з даволі распаўсюджаным сюжэтам:

Цераз морачка глыбокая
Ляжыць кладачка шырокая.
Алілуйя, алілуйя, алілуйя!
(запісана ў в. Камена ад Т. Т. Дрозд)
(АІМЭФ НАН Бел., ф. 20, воп. 73, ст. 3)

З распаўсюджаных толькі на Беларусі восеньскіх песень у в. Жасцінае запісана адна, якую можна лічыць проста класічнай – «А на ўдоўшчынай гарэ мядзведзь карчом арэ».

Сярод балад, запісаных у гэтай невялікай экспедыцыі на Лагойшчыне, прыцягвае ўвагу адна, у якой распавядаецца пра смерць казака. Традыцыйна, у фальклорных тэкстах месца здарэння пазначаецца так: «А ў нашай дзеравушке», «А ў горадзе…». У дадзеным выпадку першыя радкі балады наступныя:

А ў Амерыцы случылася бяда,
Там забілі маладога казака.
(запісана ў в. Камена ад Т. Т. Дрозд)

Тлумачэнні выканаўцаў адносна згадвання нехарактэрнага месца страшнага здарэння былі такімі: напачатку XX стагоддзя мноства сталых мужчын і моладзі ехалі ў Амерыку ў пошуках працы і заробкаў, але не заўсёды гэтыя пошукі былі выніковымі, шмат трагічных і сумных гісторый захоўвае памяць кожнага рода, сям'і, вёскі. Менавіта такі неардынарны факт знайшоў сваё адлюстраванне ў баладах.

З сямейна-абрадавых песень на Лагойшчыне запісаны вясельныя і хрэсьбінныя, але абмежаваны час экспедыцыі і пара, у якую яна праходзіла (пачатак мая, калі ўсе заняты ў полі і на агародах), не далі магчымасці сабраць большы па аб'ёме матэрыял.

*Міхаіл МІХАЙЛЕЦ*

# ФАЛЬКЛОРНАЯ КАЛЕКЦЫЯ МІНСКА-МАЛАДЗЕЧАНСКАЙ ЭКПЕДЫЦЫІ 1945 ГОДА

У фальклорнай калекцыі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваюцца пажухлыя пажаўцелыя лісты паперы, запоўненыя дробным спорным почыркам – унікальныя запісы вуснай народнай творчасці, зробленыя летам 1945 года ўдзельнікамі Мінска-Маладзечанскай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі, супрацоўнікамі Акадэміі навук БССР. Толькі-толькі скончылася страшэнная вайна, краіна яшчэ ляжала ў руінах, а нястомныя збіральнікі скарбаў народнага слова ўжо распачалі сваю працу, каб зберагчы для нашчадкаў «душу народа», якая выяўляецца ў фальклорных творах.

Удзельнікі гэтай першай пасляваеннай фальклорнай экспедыцыі па Беларусі наведалі тагачасныя Барысаўскі, Плешчаніцкі, Крывіцкі, Куранецкі, Лагойскі, Маладзечанскі, Бягомльскі раёны Мінскай і Маладзечанскай абласцей. Вынікам экспедыцыі стаў збор амаль 500 твораў розных жанраў. Большасць матэрыялаў з Лагойшчыны паходзіць з тэрыторыі тагачаснага Плешчаніцкага раёна, асабліва шмат запісаў паходзіць з вёсак Акалоўскага, Крайскага і Ізбіцкага сельскіх саветаў. Матэрыялы экспедыцыі склалі справы 1, 2, 3, 6 першага вопісу восьмага фонду фальклорнай калекцыі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. У першую справу ўвайшлі запісы, зробленыя М. Я. Грынбалатам; у другую – запісы тэкстаў песень, зробленыя М. Я. Грынблатам і Л. Г. Альтшулер-Савікоўскай, а таксама нотныя запісы песень, зробленыя Г. І. Цітовічам; у трэцюю – запісы Л. Г. Альтшулер-Савікоўскай; у шостую – запісы М. С. Меерovіч.

У тагачасных умовах даследчыкі былі строга абмежаваныя ў сваёй дзейнасці, ім трэба было не толькі збіраць традыцыйныя народныя фальклорныя творы, але і тагачасны «савецкі фальклор», які быццам бы адлюстроўваў стаўленне народа да тагачаснай улады, праслаўляў «правадыроў» і Партыю, шчаслівае жыццё народа пад яе кіраўніцтвам. Усё гэта паўплывала на збіральнікаў народнага слова – савецкія песні, асабліва прысвечаныя Вялікай айчыннай вайне, складаюць пераважную большасць сярод сабраных твораў. Большасць з іх не ўяўляе вялікай мастацкай каштоўнасці, з'яўляючыся пераробкамі вядомых савецкіх аўтарскіх песень. Самую вялікую цікавасць сярод гэтага матэрыяла ўяўляюць песні паланянак і палонных, а таксама сучасныя сказы, шмат з якіх прысвечана розным падзеям партызанскага руху. Гэты матэрыял яшчэ чакае на сваіх даследчыкаў.

У той жа час удзельнікі экспедыцыі сабралі і значную калекцыю традыцыйных фальклорных твораў, частку з якіх мы прапануем чытачам. Акрамя народных песень у яе ўвайшлі казкі, гульні, творы дзіцячага фальклору і інш.

## 1. Дзіцячая гульня-карагод «Лянок»

Дзяўчынкі бяруцца за рукі і ствараюць кола. У коле – адна дзяўчынка. Хор-кола спявае, дзяўчынка ў коле адказвае-прыпявае, дэманструючы рухамі працэс апрацоўкі лёну.

Хор: Пад зялёнай лён, лён,
Пад дубровай лён, лён,
Раскажы нам, маці,
Як пад лён араці.
Маці: Вось так, Кацярына мая,
Вось так, ты дачушка мая,
Вось так шырынёю,
Вось так далінёю.
Хор: Пад зялёнай лён, лён,
Пад дубровай лён, лён,
Раскажы нам, маці,
Як лянок сеяці.
*Прыпеў*
Далей усё паўтараецца ў такім самым парадку, змяняюцца толькі запытанні:

– Як лянок рваці
– Як лянок абіваці
– Як лянок слаці
– Як лянок падымаці
– Як лянок мяці
– Як лянок трапаці
– Як лянок прасці
– Як лянок ткаці
– Як кашульку шыці.

*Запісаў М. Я. Грынблат 26.07.1945 ад дзяўчынак 8–10 гадоў у вёсцы Навасёлкі Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 1, л. 31–32*

**2. Тэатралізаваная песня-гульня «Дзядулька»**

Адна дзяўчынка апранута «дзедам» – у вывернутым кажуху, зімовай шапцы і з сівой барадой, другая – старой «бабай».

«Дзед» сядзіць на нізкай лавачцы, трымае ў руках доўгі кій, «баба» галосіць каля яго, «дзед» старэчым голасам адказвае:

– А калі ж памрэш ты, мой дзядок,
А калі ж памрэш ты, галубок?
– Ў сераду, бабка, ў сераду, любка,
Ў сераду, сізая галубка мая.
– А з кім мне жыці, мой дзядок,
А з кім мне жыці, галубок?
– З дзеварам, бабка, з дзеварам, любка,
З дзеварам, сізая галубка мая.
– Дзевар будзе біцца, мой дзядок,
Дзевар будзе біцца, галубок.
– Бараніся, бабка, бараніся любка,
Бараніся, сізая галубка мая.
– А чым бараніцца, мой дзядок,
А чым бараніцца, галубок?
– І кiёчкам, бабка, і кiёчкам, любка,
І кiёчкам, сізая галубка мая.
– А дзе кiёк браці, мой дзядок,
А дзе кiёк браці, галубок?
– У лясочку, бабка, у лясочку, любка,
У лясочку, сізая галубка мая.
– А чым яго высеч, мой дзядок,
А чым яго высеч, галубок?
– Тапарочкам, бабка, тапарочкам, любка,
Тапарочкам, сізая галубка мая.
– А дзе тапор браці, мой дзядок,
А дзе тапор браці, галубок?
– У кузенцы, бабка, у кузенцы, любка,
У кузенцы, сізая галубка мая.
– А чым заплаціці, мой дзядок,
А чым заплаціці, галубок?
– Грошыкамі, бабка, грошыкамі, любка,
Грошыкамі, сізая галубка мая.
– А дзе грошы браці, мой дзядок,
А дзе грошы браці, галубок?
– Бабка, зарабіці, любка, зарабіці,
Зарабіці, сізая галубка мая.
– А дзе зарабіці, мой дзядок,

А дзе зарабіці, галубок.
– На рабоце, бабка, на рабоце, любка,
На рабоце, сізая галубка мая.

*Запісаў М. Я. Грынблат 26.07.1945 ад Сівец Амілі, 8 г. і Грыдзюшкі Ванды, 9 г. у вёсцы Навасёлкі Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр.1, л. 33–34*

### 3. Дзіцячая гульня-карагод «Цыган»

Кола. Пры выкананні прыпева трэба падскокваць.
А за рэкай, за ракою
Там цыганы плешчуць і танцуюць.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Плешчуць і танцуюць.
Адзін цыган не ўмее гуляці,
Ён сабе цыганку выбіраці.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Цыганку выбіраці.
Ты, цыганка, будзь мая гаданка,
Ты, цыганка, будзь мая гаданка.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Будзь мая гаданка.
Не хачу я быць тваёй гаданкай,
Не хачу я быць тваёй гаданкай.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Быць тваёй гаданкай.
Я табе і падару платочак,
Я табе і падару платочак
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
І падару платочак.
Не хачу я, я твайго платочка,
Не хачу я, я твайго платочка.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Я твайго платочка.
Я табе дам ключы залатыя,
Я табе дам ключы залатыя.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Дам ключы залатыя.
Не хачу я ключы залатыя,
Не хачу я ключы залатыя.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Я ключы залатыя.
Мы пайдзем на горушку катацца,
А з нас людзі будуць любавацца.
Гоп-ца-ца, тра-ля-ля,
Будуць любавацца.

*Запісаў М. Я. Грынблат 26.07.1945 ад дзяўчынак 8–10 гадоў у вёсцы Навасёлкі Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр.1, л. 35*

### 4. Дзіцячая гульня-карагод «Ванюша»

Кола. Падчас выканання прыпева трэба рукамі дэманстраваць адпаведныя дзеянні.
Раскажы ты нам, Ванюша,
Як рубаху адзяваць?
Ваня гэтак, Ваня так
І во гэтак, і во так.
Раскажы ты нам, Ванюша,

Як ты шчокі ўмываў?
Прыпеў.
Раскажы ты нам, Ванюша,
Як ты шчокі ўціраў?
Прыпеў.
Раскажы ты нам, Ванюша,
Як бацінкі адзяваў?
Прыпеў.
Раскажы ты нам, Ванюша,
Як ты шапачку шукаў?
Прыпеў.
Раскажы ты нам, Ванюша,
Як ты кнігі сабіраў?
Прыпеў.
Раскажы ты нам, Ванюша,
Як ты ў школу ўбягаў?

***Запісаў М. Я. Грынблат 26.07.1945 ад дзяўчынак 8–10 гадоў у вёсцы Навасёлкі Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 1, л. 36***

**5. Лічылка**

Кацілася торба
З высокага горбу,
У торбе хлеб,
Соль, пшаніца.
З кім хочаш,
З тым дзяліся.

***Запісаў М. Я. Грынблат 28.07.1945 ад хлопчыкаў 8–9 гадоў у вёсцы Жасцінае Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр.1, л. 65***

**6. Лічылка**

Ляцеў заяц
Па бару,
Ірваў лебяду,
Ірваў у пучок,
Выйдзі, ваўчок.

***Запісаў М. Я. Грынблат 28.07.1945 ад хлопчыкаў 8–9 гадоў у вёсцы Жасцінае Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 1, л. 66***

**7. Лічылка**

Ляцеў сабака
Цераз мост,
Чатыры лапы,
Пяты хвост.

***Запісаў М. Я. Грынблат 28.07.1945 ад хлопчыкаў 8–9 гадоў у вёсцы Жасцінае Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 1, л. 71***

**8. Лічылка**

Шла кумушка
Міма клеці і пазвала
Свае дзеці:
– Ку!

***Запісаў М. Я. Грынблат 31.07.1945 ад хлопчыкаў 9–12 гадоў у вёсцы Ізбішча Губіцкага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 1, л. 99***

### 9. Казка «Браты-груганы»

Было дванаццаць брацціяў, і была ў іх мачыха, ды вельмі злая. Канешна, як матка чужая, дык яна іх праклінала. Вось яна пякла блінцы, яны блінцы бралі, а іх мачаха ругала:

– Каб груганы чорныя пахапалі вас, як вы гэтыя блінцы бралі.

Праз гадзіну-другую прыляцелі груганы ды схапілі іх усіх. Засталася адна сястра. Надта было ёй скучна жыць, таму што яна не ведала, дзе яе браты знаходзяцца. Надумала яна сабе так: пайсці ў пуць далёкі. Пайшла яна з дому, уздыхнула сільна-глыбока і адправілася ў пуць-дарогу дальнюю. Ішла яна бальшым лесам, бальшым морам, бальшой вадою і ўбачыла яна – у лясу стаіць маленькі домік. Яна ўвайшла туды і схавалася пад ложак. Тады прыйшлі яе брацці, самі сабе разгаворваюць: каб хто з крапівы сплёў нам дванаццаць сецяў, тады б мы не былі груганамі. А адзін кажа:

– Я сёння сніў, што наша сястра прышла.

Яна выйшла, стала з імі вітацца і цалавацца, а потым сказала, што яна будзе плесці гэтыя сеці. Тады яна пайшла, нарвала крапівы і пачала плесці сеці. Ішоў тады пан і ўвідаў, што яна пляце. Ён і кажа:

– Дзень добры!

Яна маўчыць. Што з яе не спрашываюць, яна ўсё раўно пляце і пляце, сваёй работы не кідае. Пан яе забраў у турму. Яна і там пляце. Тады пан кажа:

– Нада яе ўтапіць.

Нясуць яе на бераг рэчкі, глядзь – лятаюць яе браты на крылах. Яна коп сеці ў рэчку. Яны і сталі людзьмі. А толькі ў аднаго не было рукі. Яна, бачыш, не дапляла. А яна стала такая раскрасавіца, што пану вельмі спадабалася, і ён узяў яе сабе за жонку. І цяпер пажываюць і дабра нажываюць.

***Запісала М. С. Мееравіч 29.07.1945 ад Філіповіч Веры Пятроўны, 1915 г. н., сляпой знаўцы народных казак у вёсцы Акалова Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 6, л. 26***

### 10. Казка «Жонка»

Жыла дзевіца і маці. Яны былі вельмі бедныя. Мусіць, доля ў іх была бедная такая. Вось маці і дачку ад сямі год аддалі пану служыць. Служачы пану яна і вырасла, ды зрабілася такая красівая барышня, што не ў казцы казаць, ні пяром апісаць. Ну вось, пан і надумаў справіць сабе баль. Прыходзіць да яго многа другіх паноў, ды разам з імі і купцоў сын. Ён як глянець на яе! Я яна тады на стол падавала. Ды так яна яму спандравілася! Вось ён і надумаў на ёй жаніцца. А яна, канешне, думае, што ён з яе смяецца, таму што батрачка яна, а ён – купцоў сын. (Даўней з гэтага смяяліся, і купцы жаніліся на багатых. Гэта цяпер толькі ўсе роўныя). Вось той купец і кажа пану:

– Гэта дзевіца мне надта ндравіцца.

Ну вось, а пан яму ў адказ:

– Мне ў маёнтку, – кажа, – нада пастух. Купі сабе лапці, адзенься абарванцам, ды прыдзі да нас у дварэц. Ну і пойдзеш з ёю ў поле пасвіць скаціну ўдваём, дам табе якіх пяць кароў у далёкую сенажаць.

Жылі яны так сабе харашо месяц, другі. Дамоў не хадзілі, рабіць ім было нечага, вось яны і плялі карзіны. Вось прыехаў да іх пан ды пытае, ці сагласна яна з гэтым пастухом жаніцца. А яна кажа:

– Мне што пан кажа, то і слухаю.

Вось паехалі яны вянчацца. Запраглі пару каней быстрых і пасадзілі яе ў карэту маляванную, красівую. А з касцёла прама ўзялі яе пад рукі людзі незнаёмыя, павялі яе ў капераціў, адзелі ў шоўкавае плацце. Як увайшла яна ў палац – як сонцам асвеціць. Усім пандравілася.

Жылі яны харашо. Навучылася яна пісаць, але вось даведаўся гасудар, што ў купца сына жана красівей, чым гасударава жонка. (Вядома, як захочаш, усё будзеш ведаць; вось, партызаны, усё, што ў немцаў рабілася, усё ведалі). Вось ён рашыў яе сабе за жонку ўзяць, а сваю расстрэліць. Вось ён прыехаў на аўтобусе, а яна ішла па тратуару, ён і як ухопіць яе, і ўвёз у царскі дварэц. Жыла яна з ім год, а ёй усё скушна, канешна, бо свайго было жалка. Даведалася яна, што ён разабраў маёнтак, усё прапіў і застаўся батраком. І жыла яна год так гасударавай жаной і вельмі саскучылася, а гасудар яе і пытае:

– Чаго цябе нет, я табе ўсяго дастаўлю.

А яна яму ў адказ:

– Як жа мне не скучаць, ніхто не ведае, дзе я, ні маці мая; ніхто к нам не прыедзе, жыву я адна, як птушка ў клетцы.

А гасудар ёй і кажа:

– Не скучай, мая даражэнькая, усё для цябе прадастаўлю, чаго цябе ндравіцца, толькі за маці не пашлю, яна бедная, хай жыве, як хоча.

І загадвае гасудар сваім слугам:

– Хадзіце ў капірацыю, купіце гарэлкі, пячыце пірагі, прыгатаўляцца трэба к балі.

І вось, паслалі за гасцямі. Каму пісьмом, каму тэлеграмай, а каму па радзія перадалі. І якія там прышлі паны высокія, з-за граніцы, генералы, толькі нам, бедным, месца не было. (Даўней бедным, вядома, нідзе мейсца не было). І пачалі госці піць і есць, а гасударавай жонке ўсё скучна, нявесела. Садзілася яна за маляваны стол, а там і гарэлка, і піва, і усякія бабкі, і мяса, і ўсё, што нада. А ёй скушна. Глянь праз вакно, аж там першы муж абарванцам ходзіць. Яна к цару:

– Пусціце яго, хай бедны помніць царскі баль.

Тады гасудар загадаў сваім слугам:

– Прапусціце яго ў кухню, дзе кушаюць свінні.

І вось, пілі яны і елі, колькі душа хоча. І сталі яны казаць, што яны харошых людзей не абіжалі, на людзей бальшую плату не накладалі. (Вядома, гэта байка, а ў байцы якая ж мо’ быць праўда). Ну і гасудар стаў гаварыць, што ён лепш усіх. А жана яму ў адказ:

– Які ж ты добры, з-за цябе мой муж не мае куска хлеба. Ён вось і цяпер тут, а калі не верыце, што ён мой муж, то ў яго на левай руцэ двухраздзельны значка.

Тады гасудар увесь са злосці хацеў сваю жонку ўстрэліць. Тады яна прывяла купцова сына, ды раздзелі яго. Гэтага гасудара расстрэлілі, а купцова сына гасударом паставілі.

Вось і казкі канец. І я там была, мёд, піва піла, па барадзе цякло, а ў рот не папала. Далі мне памяло, а мяне адтуль змяло. Як далі мне смык, а я адтуль шмыг, далі мне портку, а я праз хвортку.

***Запісала М. С. Меерові́ч 29.07.1945 ад Філіповіч Веры Пятроўны, 1915 г. н., сляпой знаўцы народных казак у вёсцы Акалова Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 6, л. 34–35***

### 11. Казка пра парабка

Жыў сабе парабак у аднаго пана. Вельмі было яму цяжка ў яго служыцы: і біў ён яго, і есці не даваў – штодзень 15 розаг замест хлеба. Потым пасадзіў пан батрака ў мех, завязаў і паехаў к вялізнай рэчцы. Аж па дарозе устрачаецца з паненкамі.

– Як маецеся? – пытае ён.

І паклаў ён на бераг ракі быстрай батрака звязанага, а сам паехаў з паненкамі. Едзе купец дарогай і чуе такі разгавор:

– Не ўмею ні чытаць, ні пісаць, а мяне за караля браць хацяць.

А купцу і зайзросна стала. Я купец, – думае сабе, – а ніколі шчэ каралём не быў.

– Дык я ўмею, – голасна сказаў ён.

А яму батрак у адказ:

– Развяжы мех і садзіся туды.

Вылез батрак, завязаў у мяшок купца, а сам сеў на купцовых коней. А пан тым часам выправіў свае слугі ўтапіць батрака. Яны і кінулі мех у глыбокую рэчку. А Сцяпан сабе жыве ды на купцовых конях катаецца. Аднаго разу паехаў пан на кірмаш, глядзіць – Сцяпан прадае коней.

– Сцяпан! – закрычаў голасна пан. – Гэта ж ты з таго свету?

– Ага.

– А дзе ж ты браў гэтыя коні?

– Дык на тым свеце, панок.

– А што ты там бачыў?

– Да там рэчкі з золатам, а колькі ўсякага багацця, а коней не пералічыш.

– Каб і мне там багацця ўзяць, – зайзросна пан сказаў.

– Вазьмі жалезную бочку і хай цябе туды слуга ўсадзіць.

Прынеслі слугі бочку, што хутчэй усадзілі туды пана і завязлі яго к мору, а Сцяпан як бросіць у глыбокае мора ды кажа:

– Вось табе багацце, для цябе хопіць.

Утапіў пана, а сам запяяў вясёлую песню. І стаў ён жыць-пажываць ды паноў забываць. Вось і казцы канец.

***Запісала М. С. Меерові́ч 29.07.1945 ад Філіповіч Веры Пятроўны, 1915 г. н., сляпой знаўцы народных казак у вёсцы Акалова Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 6, л. 36–37***

**12. Казка «Іван-дурак і шэры воўк»**

Быў гасудар і былі ў яго тры сына: адзін Амель, другі Андрон і трэці быў Іван-дурак. Быў у яго сад, а пасярод саду – яблыка залатое. Хто-та ў яго гэтыя яблыкі краў. Ён наймаў людзей каравуліць па вочарадзі і не мог унімаць. Тады ён сваіх сынавей заставіў. Першы, старшы сын праспаў, вара не паймаў. На другую ноч пайшоў сярэдні сын, і той ноч праспаў, вара не паймаў. А ў трэцюю ноч Іван-дурак сеў пад яблынёй, сочыць, стаў ён драмаць, але шпількі на адным плячы і на другім плячы паўторкваў сабе. Як задрэмле, галавою як сбалтне, так уколе. Смотра ў старану: як хто зарава падняў. Ажно ляціць Жар-пціца. Узляцела на поле, поле асвяціла, праляцела ў сад і прама пад залатой села яблыней. Іван-дурак быў не промах, паймаў пціцу ды за хвост, асталася адна пярына́. Толькі ён гэту пярыну сабе ў шапку схаваў і прыйшоў у царскія палаты і вялеў акошкі закрыць і выняў пяро Жар-пціцы і асвяціў усе палаты. Цар закрычаў:

– Відзіце, мы гарым!

А Іван сказаў:

– Не, ацец, гэта пяро Жар-пціцы.

Цар пяро ў сына адабраў і тагда сазваў усіх трох сыноў і сказаў ім, што б яны знайшлі гэту Жар-пціцу. Адправіліся яны ў пуць разысківаць Жар-пціцу. Ішлі яны сваім пуцём, прыйшлі на крыжавіны дарог, там стаяў стоўб, напісана над ім было: «Былі тры дарогі, але адна – хто паедзе, дык не вернецца, другая – хто паедзе, біт будзе няшчадна, трэцяя – хто паедзе, воўк каня з’есць. Ну і пайшлі яны ў розныя стораны – хто ўпярод прыдзе на гэта месца, ажыдаць адзін аднаго. Іван-дурак паехаў, воўк каня з’еў і сказаў:

– Як будзеш у бядзе, дык успомніш аб мяне. Скажаш: «Шэры воўк, прыбудзь ка мне ў помач».

Без каня пайшоў пехатой і прыйшоў к раке – перайсці не мог і сказаў:

– Ах скачы, шэры воўк, прыбудзь ка мне на помач.

Воўк явіўся яму і чэраз раку павёз на сабе. Прыехаў у гэта гасударства, дзе была Жар-пціца, і воўк сказаў:

– Бяры Жар-пціцу, але клеткі не руш, бо як клетку возьмеш, прачнуцца ўсе старажы.

Іван і пайшоў, прыйшоў к гэтай Жар-пціцы, кагда ўсе спалі. Да гэтай клеткі папрыцягваны шнуры, і на шнурах калакольчыкі. Як Іван стаў браць Жар-пціцу, дык яна:

– Што ты мяне бярэш без клеткі, я без яе не магу жыць.

Іван узяў клетку, калакольчыкі зазвінелі, і старажы прачнуліся. Івана паймалі ды да цара даставілі. Цар сказаў:

– Ёсць у такім-та царстве Цар-дзявіца і дастанеш мне яе, я табе з чэсцю, хвалаю Жар-пціцу вярну.

Вярнуўся Іван к воўку ні з чым, і тады воўк сказаў:

– Сядзь на мяне і паедзем.

Прыехалі ў гэта гасударства, дзе была Цар-дзявіца. Воўк сказаў:

– Сматры, Цар-дзявіцу ты бяры, але яна будзе сядзедзь без адзёжы, адзёжу не трогай, бо там прачнуцца і цябе заб’юць.

Іван не паслухаў. Калі паснулі, і Іван убачыў Цар-дзявіцу, узяў яе, а яна гаворыць:

– Як я буду без адзёжы, бяры яе.

Ён як стаў браць, прачнуліся старажы і яго схапілі і да цара даставілі. Цар яму сказаў:

– Так дастань мне жарэбчыка з залатою і сярэбранаю поўсткай, тады і аддам Цар-дзявіцу небывалай красаты.

Апяць вярнуўся к воўку ні з чым. Воўк пачаў ругаць:

– Я ж табе гаварыў адзёжы не браць. Садзісь на мяне і паедзем.

Паехалі ў гэта царства, дзе быў жарабец. Там яму сказаў воўк:

– Жарабца бяры, а ўздзечкі не руш.

Іван не паслухаў. Жарабца узяў. Жарабец кажа:
– Ты мяне не ўвязеш, бяры і ўздзечку.
Іван жа забыў пра то, і павялі яго к цару.
– Вось у такога цара ёсць барабан, тады я табе аддам жарабца з чэсцю, з хвалою.
Потым ён вярнуўся к ваўку, воўк укусіў за гэта за бруха, і паехаў у гэта царства, дзе быў барабан. Воўк сказаў:
– Сматры, барабан бяры, але палачак не руш.
Калі Іван прыйшоў к барабану, той кажа:
– Бяры і палачкі мае.
Хацеў узяць і адчуў боль укуса воўка. Узяў толькі адзін барабан, і каравул не прачнуўся. Ён к ваўку, аставіў барабан. Воўк сказаў:
– Рэж лазовыя палкі.
Ён выразаў і стаў біць у гэты барабан трывогу. Як ударыў трывогу, явілася войска нясметнае, цар з царыцай выйшлі к яму і прасілі прашчэння:
– Што хочаш бяры, толькі нас не губі.
Іван сказаў:
– Нічога не хачу, толькі ад барабана палачкі.
Цар вынёс з благадарнасцю. Тады яны паехалі да гэтага жарабца на ваўку, і сказаў воўк:
– Бі трывогу!
Яны тут трывогу ўдарылі і тут жа явілась войска нясметнае, цар з царыцаю выйшлі к Івану:
– Што хочаш бяры, толькі нас не губі.
– Нічога я не хачу, толькі жарабца хачу з сярэбранай і залатой поўсткай.
Вывёў цар жарабца і аддаў яму. Іван паехаў і к Цар-дзявіцы, і тут жа ўдарыў трывогу, явілась войска нясметнае, і цар і царыца просяць прашчэння:
– Што хочаш бяры, толькі нас не губі.
– Нічога не хачу, толькі аддайце Цар-дзявіцу.
Вывелі і аддалі дзявіцу. Сеў на ваўка Іван і паехаў к Жар-пціцы, і тут ударыў трывогу. Явілася войска нясметнае, цар з царыцаю выйшлі к яму:
– Што хочаш бяры, толькі нас не губі.
Аддалі яны Жар-пціцу, сабраліся яны ўсе, Іван на ваўку ды ўзяў барабан, а Цар-дзявіцу пасадзіў на жарабцу і паехалі к свайму аццу. Воўк перавёз іх цераз раку і цяпер гаворыць:
– Паўтара года цябе браты ажыдалі на скрыжаванні дарог.
Іван пайшоў к сваім братам.
– Ах, цябе мы так ажыдалі.
– Я так утамлён, нада нам аддыхнуць.
Іван лёг у Цар-дзявіцы на каленях і уснуў, а браты яго ўзялі, значыць, і ўбілі. А ёй прыказалі, што б яна гаварыла, што гэта яны дасталі. Адзін узяў Жар-пціцу, другі барабан, забралі Цар-дзявіцу і паехалі к аццу. Ацец устрэціў іх вялікаю благадарнасцю, і яны расказалі, што яны ўсё дасталі, а Іван прапаў без весці. Тады старшы із братоў на Цар-дзявіцы стаў жаніцца, а воўк прыбег на скрыжаванне, знайшоў труп задаўленага каня, трыбух вывернуў з сярэдзіны, а сам улез у сярэдзіну. Прыляцеў груган з дзецьмі, і дзеці кажуць:
– Татка, свежага мяса хочам.
Селі яны есці мяса, а воўк схапіў дзіця і сказаў:
– Прынясі жывой і мёртвай вады, і я аддам тады дзіця.
Гурган паляцеў, прынёс жывой і мёртвай вады, узяў дзіця. Воўк намазаў Івана мёртвай вадою – ён зжыўся і жывою – ён прачнуўся і кажа:
– Як смачна я ўснуў.
– Ты ўснуў бы навекі, твае браты цябе ўбілі і з тваёй Цар-дзявіцай старэйшы брат жаніцца будзе, хутка свадзьба, я паўчу цябе музыкантам.
Узяў і пашыў яму дуду, вось Іван ідзе к аццу, там ужо патрэбна іграць свадзьбу. Воўк вучыў Івана:
– Ты не руш ад яго, толькі скажы, каб выпілі па стакану віна з царом.
Выпілі віна. Цар-дзявіца яго ўзнала і сказала:
– Не яны мяне дасталі, а ён, а яго былі ўбілі.

Цар вялеў сваіх сынавей абадвух прывязаць к хвастам ліхіх каней і пусціць у поле. Прывязалі, ды іх разарвала, а Іван-дурак жаніўся на Цар-дзявіцы.

І я там быў, мёд, піва піў, па барадзе цякло, а ў рот не папала. Як далі мне барану, я адтуль як смаргану, аж па гэтае месца. За сталом сядзеў, дзе мы казкі пісалі. Вось і казкі канец, а стараны гэтай вянец.

***Запісала М. С. Мееровіч 30.07.1945 ад Еляневіча Рыгора Паўлавіча, 75 г. у вёсцы Горна Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 6, л. 54–57***

### 13. Казка «Суччы сын»

Жыла пані і не было ў яе дзяцей. Яна жыла з кухаркай удваіх. Прышоў да іх старык і ўпусціў у сажалку шчуку. Ён зайшоў к гэтай пані і бачыць, што пані бядуе. Ён кажа:

– У сажалцы ёсць шчука, схваці яе і з’еш і будзеш бярэменна.

Улавілі шчуку, значыць, яны з кухаркай і забярэменелі, і сучка забярэменела і кабыла, бо памоі выпіла. І радзілі яны па сыну: сучка, кухарка і пані, а кабыла – жарабца. Раслі яны не па днях, а па часах і не зналі, хто старшы, каму падчыняцца. Выехалі ў поле ўсе трое і пусцілі па страле – чыя страла далей паляціць, той і старшы. Паніч стрэліў, кухаркін сын далей, а суччын – далей за ўсіх. Яны яму і падчыніліся. Паехалі ў свет усе трое. На дарозе стаяла карчма і ў той карчме надпіс: «Быў мост па рацэ і хадзілі начаваць па вочарадзі на гэты мост. Пад гэтым мастом аставаліся». Тут, у карчме, паніч павесіў рукавічкі на сцяне, а суччын сын паставіў кубак на стол, адправіўся пад мост і кажа:

– Як будзе з кубка кроў, а з рукавіцы шум, то бяжыце бараніць.

Ён пайшоў, сеў пад калінавым мастом, пад смуродавым кустом, каня свайго запер за трыдзевяць дзвярэй. І вось, калі сядзеў, прыйшоў змей трохгаловы. Сабака забрахаў, сакол засвістаў і конь заржаў.

– Чаго, сокал, свішчаш? Чаго, конь, іржэш? Чаго, сабака, брэшаш? Можа якога непрыяцеля чуеш?

Ён гаворыць:

– Тут ёсць! Ну, вылезаю, айды, – гаворыць змею.

– Ці будзем біцца, ці гадзіцца, ці лучшэ вінца напіцца?

Суччы сын:

– Вінца напіцца – уп’емся, а будзем гадзіцца, вы мяне адурыце, лепш будзем біцца.

Ён яму, змею, тры галавы зняў, а змей яго па калені ў зямлю ўвагнаў. Ён вылез, прыйшоў на кватэру к сваім брацьцям, а яны спяць. З рукавіцы шум, а з кубка кроў, а яны не чуюць.

– Ах, спіце вы, а чуць не чуеце, будзець і вам гэта.

Тады нада на гэту ноч кухаркіну сыну ісці. Ён просіць суччага сына, каб ішоў за яго; ён сагласіўся.

– Як будзе з кубка кроў ісці – як сіла мага бяжыце бараніць.

І тады сеў пад калінавым мастом. Прыляцеў змей шасціглавы – сабака забрахаў, сокал засвістаў, конь заржаў. Змей гаворыць:

– Чаго, сабака, брэшаш? Чаго, сокал, свішчаш? Чаго, конь, ржэш? Можа якога непрыяцеля чуеш?

Суччы сын сказаў:

– Ён тут ёсць, айда сюды.

– Ці будзем біцца, ці гадзіцца, ці лучшэ вінца напіцца?

– Вінца вып’ем – уп’емся, гадзючыся, вы мяне адурыце, а лепш будзем біцца.

Сталі біцца. Ён яму тры галавы зняў, змей яго па калена ў зямлю ўвагнаў. Ён яму яшчэ тры галавы зняў, ён яго па пояс у зямлю ўвагнаў. Тады ён, значыць, вылез з гэтай зямлі і пайшоў на кватэру да сваіх братоў. У кватэры па калені крыві, поўна кватэра шума.

– Ах, братцы, спіце, не чуеце. Я чуць не прапаў галавою, будзе і вам гэта, што мне.

На трэцюю ноч панінаму сыну нада ісці, пачаў ён прасіць, каб за яго схадзіць, ну ён (суччы сын) і сагласіўся.

– Але калі будзе з кубка кроў, як сіла мага бяжыце бараніць.

І пайшоў, сеў пад калінавым мастом, пад смуродавым кустом. Прыляцеў змей дзевяціглавы, сабака забрахаў, сакол засвістаў і конь заржаў. Змей і гаворыць:

– Чаго, сабака, брэшаш? Чаго сокал свішчаш? Чаго конь іржэш? Можа, якога непрыяцеля чуеце?

А суччы сын:

– Я тут ёсць.

– Ну, вылезай сюды.

Ён вылез, змей і гаворыць яму:

– Ці будзем біцца, ці гадзіцца, ці лучшэ вінца напіцца?

– Вінца вып'ем – уп'емся, гадзючыся, вы мяне адурыце, а лепш будзем біцца.

Ён яму зняў тры галавы, ён (змей) яго па калені ў зямлю ўвагнаў, ён яшчэ тры галавы зняў, ён яго па пояс у зямлю ўвагнаў. Суччы сын гаворыць:

– Аддыхнем цяпер і што пагаворым. Разрашы мне тры разы свіснуць.

– А на што? – гаворыць змей.

– Каб чэрці па маю душу скарэй ляцелі.

Ён яму разрашыў свіснуць. Першы раз свіснуў – конь трое дзвярэй прабіў, ён свіснуў яшчэ – прабіў дзевяць дзвярэй.

– Што гэта гручыць? – пытаецца змей.

– Гэта чэрці па маю душу лятуць.

Трэці раз як свісне – конь астатнія дзверы прабіў, капытамі змею тры галавы зняў, выратаваў суччага сына з зямлі, пайшлі яны на кватэру са сваім канём і сказаў ён сваім брацціям:

– Вы тут спіце. Каб не выратаваў конь верны, я б прапаў. Ужо сабірайцесь, паедзем адгэтуль.

І яны сабраліся і паехалі. Едуць цераз мост, ажно каток такі красівы. Паноў сын:

– Вось красівы коцік, мы яго возьмем і павязем дамоў.

А суччы сын:

– Гэта не коцік, а вораг наш.

І шашкай адсек яму галаву. Едуць далей, ажно луг такі харошы, і рэчка бяжыць. Паноў сын гаворыць:

– Мы тут аддыхнем і коней падпасем і свежай вадзіцы пап'ем.

А ён:

– Паспрабую, што гэта.

І па гэтай вадзе шашкаю секануў, стала не вада – кроў.

– Засек, – кажа, – жану другога змея.

Тады едуць далей, а Суччы сын кажа:

– Бачыце змея, ён нас праглынець.

Бросіў ён назад шчотку, і вырас лес, такі гушчар, што невазможна прайсці. Яна давай грызці гэты лес і прагрызла дарогу, апяць даганяе іх. Тады ён бросіў скавараду назад. Абразавалася возера. Яна пачала піць гэту ваду. Суччы сын далёка паехаў і па дароге стаяла кузьня. Ён кавалю гаворыць: «Кладзі ў гарон дванаццаць кляшчэй». Пачаў грэць гэтыя клешчы, а кузню запер жалезнымі дзвярыма. Яна (жонка змея) прыляцела:

– Ці тут суччы сын?

Кузнец кажа:

– Тут.

– Падай мне яго сюды.

Кузнец кажа:

– Ліжы дзверы.

Яна як лізнула тры раза – пралізала дзверы.

– Ну, давай мне суччага сына сюды.

– Выстаў, – кажа кузнец, – язык.

Яна выставіла язык, а ён кляшчамі гарачымі яе язык і давай яго на кувалду. Яна тады варочылася ва ўсякія зверы, якія ёсць на зямлі і патом перавярнулася на жанчыну і так стала красіва, што ва ўсім свеце не было, і тады яны з суччым сынам пажаніліся.

Вось і казцы канец. Я там быў, мёд, піва піў, па барадзе цякло, а ў рот не папала. Як далі мне барану, я адтуль як смаргану, аж па гэтае месца. За сталом сядзеў, дзе мы казкі пісалі. Вось і казкі канец, а стараны гэтай вянец.

***Запісала М. С. Меерові́ч 31.07.1945 ад Еляневіча Рыгора, Паўлавіча, 75 г., непісьменны, у вёсцы Горна Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 6, л. 61–64***

## 14. Гульня «Цярэшка»

На другі дзень Каляд (Ражаства) збіраецца моладзь. Танцуюць, забаўляюцца. Раптам нехта з прысутных адзываецца: «Давайце Цярэшку жаніць». Звычайна ўсе сабраныя пачынаюць спяваць прыпеўкі «Цярэшкі», перастаюць танцаваць.

Казалі мой дзед нічога
Насеяў пшанічкі многа,
Пшанічка не ўдалася,
Я ўдавой засталася.
Цярэшка валочыцца,
Жаніцца не хочацца,
Жанісь, мой міленькі,
Жанісь, удаленькі.
Бяры тую ключніцу,
Што нашу разлучніцу,
Што ключэй расключыла,
Нас з табой разлучыла.
Хаджу я каля саду,
Ганяю курэй стаду,
Курачак ганяючы,
Дзядулькі шукаючы.
Дзядулька ўцёк, уцёк
У цёмны куток, куток.
Паю я каня ў вадзе
Віджу – дзядулька на дне,
Ходжа я ўтаплюся,
Але за нім паганюся.
Запалю я свечачку,
Знайду ў запечачку.
А мой ты дзядулечка!
Я ж твая бабулечка.
Пашыю кашулечку
Я свайму дзядулечку
З чырвоным каўнерыкам,
Каб ён быў жаўнерыкам.
Дзед бабу тапіць вядзе,
А баба крычыць, няйдзе.

Бацька з маткаю, звычайна са старэйшых, жанатых, ужо намечаны раней, засядаюць за сталом. Пасля некалькіх зваротак бацька з маткаю ўстаюць, ловяць намечаную пару і вядуць да сябе. Дзяўчына звычайна ўпіраецца. Падводзяць іх да сябе, яны бяруцца за рукі і танцуюць «Бярозку» пад спеў і музыку:

А бярозка нецярэбленая,
А хто яе церабіць будзе,
А хто яе церабіць будзе,
Той у золаце хадзіць будзе.

Найчасцей пары дабіраюць так, як хто з кім любіцца. Але бывае, што і жэняць «нахалам». Так жэняцца пар 10-15. Пасля «Бярозкі» кожнай пары прысутныя спяваюць прыпеўкі з «Цярэшкі», напрыклад, калі дзяўчына ўпіраецца – «Дзед бабу тапіць вядзе...», а калі хлопец хаваецца – «Цярэшка валочыцца, жаніціцца не хочацца...», а згоднай пары спяваюць: «Паю я каня ў вадзе...». У хлапцоў ужо водка запасена, а дзяўчаты радзяцца, што каторай прынясці. Ідуць да матак і выпрошваюць: каторыя – каўбасу, каторыя – кусок саланіны ці сыр. Нясуць усё на агульны стол і бяседуюць да раніцы, спяваючы прыпеўкі «Цярэшкі», розныя бяседныя песні і час ад часу выходзяць з-за стала па танец або на гульню. Потым разыходзяцца

***Запісалі Л. Г. Альтшулер-Савікоўская, Г. І. Цітовіч 27.07.1945***
***ад Белай Сабіны Дамінікаўны, 1909 г. н. у вёсцы Жасцінае Акалоўскага сельсавета***
***Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 2, л. 17–18***

### 15. Гульня «Яшчыр»

Гульня ў часе Каляд. Становяцца дзяўчаты ў кола, адна садзіцца пасярод кола – «яшчыр». Вядуць карагод і спяваюць:

Сядзі, сядзі, яшчыр
Сярод угароду,
Ладу-ладу.
Сярод угароду,
Паміж карагоду,
Ладу-ладу.
Ці ж то ў чаравічках,
Ці ж то ён у панчошках,
Ладу-ладу.
У лясковым кусце
Арэшыкі лушча,
Ладу-ладу.
А ў чырвонай хусцы
*Мілага (імя)* ішча,
Ладу-ладу.
Вазьмі сабе, яшчыр,
Катораю хочаш,
Ладу-ладу.

«Яшчыр» здзірае ўпамянутую ў песні чырвоную хусту, а пазней сінюю і г.д., пакуль не збярэ ад усіх удзельнікаў гульні хусткі і шапкі. Пасля гэтага «яшчыр» раздае сабраныя хусткі і шапкі. Кожны па чарзе падыходзіць да «яшчыра», кланяецца і гаворыць:

Паночку, паночку,
Аддай мой вяночак,
Што я пляла,
Што я віла,
Ручкі змазаліла,
Ножкі пазнабіла
І вяночак не знасіла.

«Яшчыр» аддае.

***Запісалі М. Я. Грынблат, Г. І. Цітовіч 28.07.1945 ад Таптоўкі Марыі Язэпаўны, 72 г., у вёсцы Жасцінае Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 2, л. 35–36***

### 16. Гульня «Проса»

Дзяўчаты становяцца ў два рады – «сценкі», пабраўшыся за рукі. Адны спяваюць, а другія «адпяваюць», сыходзячыся і разыходзячыся:

– А мы проса сеілі, сеілі,
Люлі, млоды, сеілі, сеілі.
– А мы проса патопчым, патопчым,
Люлі...
– А чым жа вы стопчыце, стопчыце,
Люлі...
– А мы коні нагонім, нагонім,
Люлі...
– А мы коні паловім, паловім,
Люлі...
– А чым жа вы зловіце, зловіце,
Люлі...
– Шаўковы повад закінем, закінем,
Люлі...
– Шаўковы повад парвецца, парвецца,
Люлі...

– А мы коні выкупім, выкупім,
Люлі...
– А чэм-жа вы купіце, купіце,
Люлі...
– А мы дадзім сто рублей, сто рублей,
Люлі...
– Нам сто рублей ні нада, ні нада,
Люлі...
– А мы дадзім дзедушку, дзедушку,
Люлі...
– А нам дзедушкі ні нада, ні нада,
Люлі...
– А мы дадзім бабушку, бабушку,
Люлі...
– А нам бабушкі ні нада, ні нада,
Люлі...
– А мы дадзім молайца, молайца,
Люлі...
– Нам молайца ні нада, ні нада,
Люлі...
– А мы дадзім дзевушку, дзевушку,
Люлі...
– Нам дзевушка спадобна, спадобна,
Люлі...
– А мы іх пажэнім, пажэнім,
Люлі...
Рады дзяўчат мяняюцца месцамі, гульня пачынаецца зноў.

***Запісалі М. Я. Грынблат, Г. І. Цітовіч 28.07.1945 ад Таптоўкі Марыі Язэпаўны, 72 г., у вёсцы Жасцінае Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 2, л. 37–39***

### 17. Хрэсьбінная песня

Ні слава, ні слава
Яначка твая.
Ні п’яна, ні п’яна
Бабулька твая.
Ці ў цябе, Яначка,
Ячмень не ўрадзіў,
Што ты, Яначка,
Піўца не зварыў.
Ні ўрадзіў ячмень,
Толькі пшоначка
Ні дазволіла мне
Мая жоначка.

***Запісалі М. Я. Грынблат, Г. І. Цітовіч 25.07.1945 ад Сівец Елізаветы у вёсцы Забор’е Акалоўскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Ф. 8 воп. 1 спр. 2, л. 13***

*Таццяна МАРОЗАВА*

(Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск, загадчык вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт)

## ФАЛЬКЛОР ЛАГОЙСКАГА РАЁНА: ПА МАТЭРЫЯЛАХ РЭГІЯНАЛЬНАГА АРХІВА ВУЧЭБНА-НАВУКОВАЙ ЛАБАРАТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ БДУ

Апошняя чвэрць XX стагоддзя вызначыла прыярытэтную тэндэнцыю глабалізацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці чалавецтва. Гэта тэндэнцыя спрыяе ўзаемазбліжэнню цывілізацый і культур, аднак яна жорстка нівеліруе, а часам і правацыруе знікненне рознаэтнічных традыцыйных культур, якія на працягу шматгадовай гісторыі існавання чалавецтва ўвасаблялі своеасаблівасць і непаўторнасць кожнага народа свету. У сувязі з гэтым у 2003 г. Генеральная канферэнцыя ЮНЕСКА прыняла Канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны народаў свету. Рэалізацыя палажэнняў Канвенцыі прадугледжвае асноўныя і першапачатковыя задачы: распрацоўка метадычных інструкцый і метадалагічных дапаможнікаў па збіранні, эталоннай фіксацыі на сучасных электронных носьбітах і актыўнае ўключэнне ў агульнаеўрапейскую навуковую, адукацыйную і творчую прастору традыцыйных аўтэнтычных нематэрыяльных каштоўнасцей усіх народаў свету. У дадзеным напрамку актуальнае значэнне набывае праблема перадачы нашчадкам назапашаных стагоддзямі скарбаў нацыянальнай культурнай спадчыны, сярод якіх важнейшае месца належыць фальклору.

Да разумення неабходнасці фіксацыі і наступнага выдання твораў фальклору, як і рапрацоўкі рэгіянальнага напрамку збіральніцка-выдавецкай дзейнасці, яшчэ напачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя прыйшлі выкладчыкі філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны Вера Анісімаўна Захарава і Ніл Сымонавіч Гілевіч. Дзякуючы іх намаганням, у вучэбныя планы спачатку ГДУ імя Ф. Скарыны, а пасля і іншых ВНУ рэспублікі была ўведзена абавязковая 2-тыднёвая палявая вучэбная практыка па фальклору. Параўнаем: самыя першыя выязныя экспедыцыі студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны здзейснілі ў 1965 годзе, і адбылося гэта на тэрыторыі Заходняга Палесся. У гэты час выкладчыкамі фальклору толькі наладжваліся сувязі з прадстаўнікамі ўлады ў пэўных раённых цэнтрах, распрацоўвалася методыка збіральніцкай работы і назапашваўся арганізацыйны вопыт. На месцах плануемых экспедыцый неабходна было дамовіцца аб размяшчэнні і сілкаванні студэнтаў, аб мясцовым транспарце. Калі камандзіровачныя выдаткі на суткі («сутачныя») для студэнтаў і выкладчыкаў аплочваў ГДУ імя Ф. Скарыны, то на мясцовыя ўлады клаўся клопат па прыманні экспедыцыі. Адпаведна той час можна назваць прапедэўтычным у адносінах выкрышталізоўвання методыкі арганізацыі выязных планавых экспедыцый. Не апошнюю ролю ў адборы тэрытарыяльна прыярытэтнага напрамку збіральніцкай дзейнасці адыгрывалі тыя абставіны, што выкладчыкі – арганізатары практыкі – былі родам з мясцін, у якіх планавалася экспедыцыя. Менавіта таму напачатку ўвага студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ імя Ф. Скарыны была скіравана на Палессе. А пачынаючы з 1979 года ў планах збіральніцкай студэнцкай практыкі з’явілася і Лагойшчына.

Аналіз фальклорных матэрыялаў з фондаў рэгіянальнага архіву Мінскай вобласці, якія цяпер захоўваюцца ў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны, паказаў наступнае. Па-першае, экспедыцыі ў Лагойскі раён ладзіліся ў асноўным супрацоўнікамі навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны, у сувязі з чым яны былі планавымі, але абмежаванымі па ахопу адміністрацыйных адзінак (у адрозненне ад студэнцкіх выязных практык). Па-другое, увага да фальклорнай спадчыны Лагойскага раёна ніколі не паслаблялася, пра што сведчаць гады запісаў – з 1971 да 2008 уключна (выключэннем сталі гады 1972–1975, 1980, 1983, 1987, 1993, 1994, 1997, 1999, 2002 і 2003). Па-трэцяе, палова зафіксаваных тут матэрыялаў была зроблена студэнтамі вячэрняга і завочнага факультэтаў, якія ажыццяўлялі практыку самастойна па месцы жыхарства, а значыць, ведалі носьбітаў фальклору і мелі магчымасць зафіксаваць самае «дарагое» для інфармантаў – творы, якія «чужым» не даверbegалі (замовы, балады, галашэнні, плачы, духоўную паэзію (духоўныя вершы, малітвы, песні). Па-чацвёртае, у сувязі з самастойным характарам збіральніцкай дзейнасці на тэрыторыі Лагойскага раёна студэнты

здолелі сабраць фальклорныя творы ў самых разнастайных вёсках, у выніку чаго ахоп населеных пунктаў, з якіх былі сабраны фальклорныя матэрыялы ў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны, аказаўся грандыёзным – 138! Такім чынам, атрымліваецца своеасаблівая раўнавага паміж практычнай адсутнасцю комплексных выязных студэнцкіх экспедыцый (усяго адна за ўвесь час вядзення збіральніцкай работы ў ГДУ імя Ф. Скарыны) і наяўнасцю запісаў з вялікіх і малых вёсак Лагойскага раёна.

Летапіс экспедыцый вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны сведчыць аб наступным.

І. Планавая выязная экспедыцыя на тэрыторыю Лагойскага раёна, як мы ўжо сказалі вышэй, ладзілася адзін раз – у 1979 годзе. Курыраваў яе Ніл Гілевіч. Пад го кіраўніцтвам працавала 50 студэнтаў беларускага аддзялення філалагічнага факультэта. Гэта была вельмі плённая экспедыцыя па колькасці зафіксаваных песенных твораў фальклору і па ахопу абследаваных населеных пунктаў – 24, а менавіта вёскі Смарынкі, Грыневічы, Калачы, Санавічы, Прагон, Ізбішча, Радзькавічы, Коргава, Малінаўка, Жардзяжжа, Рудня, Пячное, Крамянец, Акалова, Янушкавічы, Задор'е, Юравічы, Лагі, Швабы, Мяхеды, Заполле, Бабры, Гайна, Жасціннае. З запісаў бачна, што ўзрост інфармантаў і на той час быў вельмі паважаны – ад 65 да 90 гадоў! А адзін інфармант – А. Д. Жардзецкі – меў на той час нават 97-гадовы ўзрост, пры гэтым ён, па сведчанні студэнтаў, увесь час жартаваў і выканаў 5 любоўных песень.

Названая асаблівасць – паважаны ўзрост інфармантаў – яскравае сведчанне таго, што нягледзячы на антрапалагічную катастрофу, якой была Вялікая Айчынная вайна, людзі захавалі пераемнасць фальклорнай традыцыі.

Калі параўнаць запісы, зробленыя ў Лагойскім раёне дагэтуль, у 1971, 1976–1978 гг., адразу бачна, што, з аднаго боку, запісы ажыццяўляліся ў іншых вёсках (напрыклад, 1971-м годам датуюцца матэрыялы з вв. Грынеўшчына і Знаменка, 1976-м – з в. Беланы, 1977-м г. – з в. Дзвіноса, 1978-м – в. Матлічыцы); з другога – з рэестру Лагойскага раёна вынікае, што ў 1979 г. былі зафіксаваны запісы большасці жанравых разнавіднасцей сямейна-абрадавых вясельных песень, каляндарна-абрадавых і пазаабрадавых сацыяльных і бытавых. Значна меней запісана твораў дзіцячага фальклору і малых жанраў – прыказак, прымавак, загадак, выслоўяў. Засім не запісана твораў казкавай і няказкавай прозы. І гэта не дзіўна. У нашым артыкуле, прысвечным фальклору Мазырска-Прыпяцкага Палесся, мы звярталі ўвагу на гэтую акалічнасць. Справа ў тым, што, па сведчанні кіраўнікоў практык, якія разам са студэнтамі займаліся збіральніцкай дзейнасцю на месцах, інфарманты з лёгкасцю спявалі, больш ахвотна ўспаміналі менавіта песні, «сыпалі» прымаўкамі і прыказкамі, анекдотамі, апавядалі пра жыццёвыя бываліцы. Што датычыць казкавай прозы, успаміналі творы з неахвотай, выкарыстоўваючы ў якасці адмовы штампы тыпу «часу няма», «трэба сена грэбці», а то і зусім «не памятаю» ці «стамілася» і да т. п. [1].

Такім чынам, з прыведзенай жанрава-відавой характарыстыкі запісаў 1979 года бачна, што гэтая экспедыцыя была комплекснай, а не тэматычнай.

ІІ. Перш чым ажыццявіць выязную планавую экспедыцыю, выкладчыкамі фальклору філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны Верай Анісімаўнай Захаравай і Нілам Сымонавічам Гілевічам на працягу 4-х гадоў ажыццяўлялася падрыхтоўка: студэнты завочнага аддзялення, якія былі родам з Лагойскага раёна або працавалі тут, атрымалі персанальнае заданне сабраць у сваіх адміністрацыйных адзінках (як аказалася, гэта былі суцэльна вёскі) цікавыя, па-мастацку адметныя вусна-паэтычныя творы. Менавіта такім чынам у рэгіянальным архіве Мінскай вобласці вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны [*2] з'явіліся запісы 1971 (1 папка), 1976 (1 папка), 1977 (1 папка) і 1978 (1 папка) гадоў. Як сведчаць запісы, рэпертуар гэтых гадоў не абмяжоўваўся толькі песеннымі жанрамі і творамі дзіцячага фальклору. Тут можна ўбачыць і парэміі, і няказкавую смехавую і легендарную прозу, і каляфальклорныя творы тыпу снабачанняў, малітоўных песень і апісанняў тагачасных святкаванняў заканчэння веснавых і восеньскіх сельскагаспадарчых работ. Праўда, агульная колькасць запісаных у гэтыя гады адзінак не перавышае 250, што яшчэ раз падкрэслівае характар самастойнай збіральніцкай работы студэнтаў-завочнікаў.

ІІІ. Запісы 80-х гадоў, зробленыя на тэрыторыі Лагойскага раёна, у многім паўтараюць агульную карціну, якую дэманстравалі матэрыялы папярэднічаючых планавай студэнцкай экспедыцыі гадоў, за невялікімі зменамі.

1. Гэта былі справаздачы студэнтаў завочнага і вячэрняга аддзяленняў філалагічнага факультэта, сярод якіх ёсць запісы і студэнтаў стацыянара, якія па ўважлівых прычынах праходзілі практыку па месцы жыхартва. Прычым заўважана цікавая асаблівасць: у якасці збіральнікаў выступалі ад 2 да 5 чалавек, што само па сабе магло навесці на думку аб тым, што тут праходзіла экспедыцыя. Справа ў тым, што звычайна калектыўныя справаздачы па выніках праходжання фальклорнай практыкі студэнты філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны афармлялі тады, калі выязжалі на месца збору фальклорных матэрыялаў цэнтралізавана. У выпадку самастойнага праходжання практыкі афармленне павінна было змяшчаць персанальныя дадзеныя (ад аднаго збіральніка). Аднак былі і выключэнні, калі кіраўнікі практыкі ішлі насустрач студэнтам, у якіх не было магчымасці па тых або іншых прычынах ехаць адпрацоўваць практыку цэнтралізавана ці самастойна. Такім студэнтам дазвалялі па жаданні і магчымасці скласці калектыў і выехаць на месца жыхарства аднаго члена калектыву. Менавіта так з'явіліся ў рэестры рэгіянальнага архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны калектыўна афармленыя справаздачы з аднаго або двух населеных пунктаў.

2. Рэестр Лагойскага раёна 80-х гадоў мае наступнае апісанне: 1981 г. – 2 папкі, у адной з іх назва вёскі студэнтам прапушчана, у другой пазначаны вв. Вялікія Гаяны, Прысёлкі, Пунішча, якія дагэтуль у архіве лабараторыі не сустракаліся; 1982 г. – 2 папкі з матэрыяламі з вв. Заазер'е, Масцішча, Казлеўшчына, якія таксама ў архіве сустрэліся ўпершыню; 1984 г. – 3 папкі з матэрыяламі з вв. Плешчаніцы, Міхалова, Чэрнева, Замошша, Зарэчча, Кацялі, Селішча, якія зноў-такі раней у вопісе Лагойскага раёна не значыліся; 1986 г. – 4 папкі з запісамі з вв. Бычын, Швабы, Заполле, Малая Укропавічы, Пуцілава, Зарэчча, Корань, Міхалковічы, Старое Чэрнева, Вялікія Цэракі, Студзёнка, сярод якіх 3 вёскі (Швабы, Заполле, Зарэчча) ужо былі абследаваны падчас выязной экспедыцыі 1979 г.; 1988 г. – вв. Астрошыцы, Баяры, Закалюжжа, Зыкава, Панушэўшчына, Нова-Ганцавічы, сярод якіх 2 вёскі (Баяры, Закалюжжа) былі заяўлены ў спісе абследаваных падчас экспедыцыі. Такім чынам, атрымліваецца, што ў 80-я гг. XX ст. студэнтамі па месцы жыхарства самастойна было абследавана яшчэ 23 вёскі да ліку тых, якія былі наведаны падчас выязной комплекснай студэнцкай экспедыцыі 1979 г. Зразумела, што за гэты час пашырылася картатэка інфармантаў– носьбітаў фальклору, якія пастаянна пражывалі ў названых вёсках.

Жанрава-відавы склад фальклорных твораў, трапіўшых у рэгіянальны архіў Мінскай вобласці з Лагойскага раёна, у адпаведнасці з рэестрам, мае наступны выгляд: 70 % ад агульнай колькасці зафіксаваных твораў складаюць песенныя жанры (каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя (у абсалютнай большасці вясельныя) і пазаабрадавыя (прыпеўкі, бытавыя, радзей – сацыяльныя і жорсткія рамансы), астатнія 30 % прыкладна ў аднолькавай прапорцыі складаюць малыя жанры (прыказкі, прымаўкі, выслоўі), замовы, творы дзіцячага фальклору абодвух відаў – запісаных як ад дарослых, так і ад дзяцей. Зусім мала зафіксавана празаічных жанраў – казак, легенд і інш. (менш за 1 %). Названую акалічнасць – малую колькасць зафіксаваных празаічных твораў – мы ўжо тлумачылі вышэй жаданнем саміх інфармантаў спяваць, а не апавядаць, у тым ліку і з прычыны адсутнасці часу ў гарачую летнюю пару сельскагаспадарчых работ. Аднак са справаздач саміх студэнтаў часам можна ўбачыць і такія тлумачэнні: студэнтамі рухала жаданне назбіраць як мага больш адзінак, а фіксаваць прозу без тэхнічных сродкаў было значна цяжэй і даўжэй па часе. А паколькі інфарматы самі былі зацікаўлены ў спяванні, іх імкнуліся не турбаваць доўгімі апытваннямі.

IV. Сітуацыя з запісам фальклорных адзінак не толькі песенных жанраў калі не кардынальна, то значна змянілася ў 90-я і 2000-я гг. Фальклорная проза ва ўсёй яе разнастайнасці пачала запісвацца з другой паловы 90-х гадоў, калі выкладчыкамі фальклору кафедры тэорыі літаратуры Рымай Мадэстаўнай Кавалёвай і Вольгай Віктараўнай Прыемка быў падрыхтаваны спецыяльны апытальнік «Метадычныя ўказанні і праграма-апытальнік да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў I курса філалагічнага факультэта» (Мінск, 1995). У дадзеным выданні было прапанавана пашырыць разуменне фальклорнай адзінкі да адказу інфарманта на адно пытанне з праграмы-апытальніка, у тым ліку і па этнаграфічных тэмах, звязаных з хатнім бытам, будаўніцтвам, звычаямі, перасцярогамі і інш. Увесь гэты масіў адказаў прапаноўвалася класіфікаваць у адпаведнасці з прызначэннем. Названыя заўвагі праз 11 гадоў былі дапрацаваны ў новым выданні

«Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-апытальнік» (аўтары-складальнікі Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка, Т. А. Марозава), якое выйшла ў свет у 2008 годзе [*1].

У сувязі з гэтым архіў Лагойскага раёна вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны пашырыўся за кошт запісаў смехавай (легендаў, жартаў), магічнай (прыкметы, павер'і, забабоны, перасцярогі), няказкавай легендарнай (розных жанравых разнавіднасцей) і рэалістычнай (апавяданні-ўспаміны, бываліцы) прозы. Канешне, у працэнтных суадносінах усё роўна дамінуючымі застаюцца песенныя творы, аднак удалося запоўніць лакуны, якія дагэтуль былі суцэльнымі.

Рэестр Лагойскага раёна 90-х гг. утрымлівае наступныя статыстычныя звесткі: 1) запісы ажыццяўляліся амаль кожны год: у 1990 (1 папка), 1991 (1 папка), 1992 (2 папкі), 1995 (1 папка), 1996 (5 папак), 1998 (6 папак), 1999 (2 папкі) гадах; 2) «геаграфія» запісаў – 37 вёсак, з якіх толькі 10 (Малінаўка, Зарэчча, Гайна, Ганцавічы, Жасціннае, Астрашыцы, Літвічы, Лонва, Краснае, Стайкі) ужо сустракаліся, прычым неаднаразова, у запісах студэнтаў ранейшых гадоў. Астатнія 28 вёсак – новыя абследаваныя адміністрацыйныя адзінкі, сведчанні аб якіх маюцца ў фальклорным архіве ГДУ імя Ф. Скарыны: Прысёлкі, Закрынічча, Прудзішча, Слабада, Беланы, Асінцы, Займішча, Капуснікі, Асірошыцы, Лозкі, Корань, Звярынічы, Парабкі, г. п. Лагойск, Крамянец, Пушча, Новае Жыццё, г. п. Плешчаніцы, Старынкі, Палосы, Пасадзец, Рэпішча, Засоўе, Беларучы, Закрымічча, Лускава, Сямкова; 3) звесткі пра інфармантаў абследаваных раней вёсак паказваюць, што прыкладна палова з усіх апытаных – родныя (сёстры, браты, радзей – дзеці) тых, хто некалі выступаў у ролі апытваемых. Пра гэта сведчаць аднолькавыя прозвішчы, хаця ў дадзеным выпадку мы, на жаль, не можам спаслацца на дакладныя дзённікавыя запісы ці тлумачэнні, зробленыя студэнтамі, па прычыне таго, што такіх намі выяўлена не было. Адпаведна мы можам толькі меркаваць, што гэта былі родныя, зыходзячы з традыцый аседласці аднаго рода на адной тэрыторыі, калі ў адной вёсцы жыло пакаленне за пакаленнем. Акрамя таго, прычынай захавання ў названых вёсках аднолькавых з некалі запісанымі прозвішчаў інфармантаў можа быць таксама і не роднасць па крыві, а традыцыйная мясцовая лакалізацыя некалькіх родаў пад адным прозвішчам. Тым не менш, мы выкажам меркаванне, што гэтая асаблівасць можа быць сведчаннем перадачы фальклорнай традыцыі маладому пакаленню. Тут можна спаслацца на гады нараджэння інфармантаў – да- і пасляваенныя.

V. Матэрыялы 2000-х гадоў маюць наступную характарыстыку: 1) студэнты праходзілі практыку па месцы жыхарства ў 2000 (2 папкі), 2001 (2 папкі), 2004 (2 папкі), 2005 (3 папкі), 2006 (6 папак), 2007 (1 папка) і 2008 (1 папка) гадах; 2) творы былі зафіксаваны ў вв. Атрубак, Расохі, Задор'е, Акалова, Бурае, Пагранічча, Займішча, Харошае, Дрыла, Заполле, Лагі, Мяхеды, Горна, Літвічы, Лонва, Баяры, Косева, Кудзевічы, Траянец, Ізбішча, п. Плешчаніцы, Цна, Крайск. З названых вёсак 11 (Атрубак, Акалова, Бурае, Займішча, Харошае, Дрыла, Горна, Косева, Кудзевічы, Цна, Крайск) упершыню з'явіліся ў рэестры Лагойскага раёна, тады як астатнія неаднаразова сустракаліся як месцы запісаў падчас самастойнай практыкі студэнтаў; 3) агляд звестак пра інфармантаў паказаў, што большасць носьбітаў фальклору – людзі і паважанага 70–80-гадовага ўзросту, і народжаныя ў пасляваенныя гады, і досыць маладыя (35–40-гадоў), і падлеткі, і дзеці. Такая ўзроставая стракатасць сама па сабе – сведчанне пераемнасці традыцыі, яе выключнай «жывучасці» ў асяроддзі менавіта вясковага насельніцтва. Як бачна з характарыстыкі населеных пунктаў, у якіх запісваліся фальклорныя творы апошніх гадоў, гарадскія запісы фігурыруюць толькі тройчы: у 90-я гэта быў сам Лагойск, у 2000-я у абодвух выпадках – пасёлак Плешчаніцы. З гэтага вынікае наступная, 4) статыстычная характарыстыка, якая тычыцца запісаў фальклорных твораў па іх жанрава-відавому складу. Так, відаць, адносна невялікі памер гарадскіх населеных пунктаў Лагойшчыны спрыяла таму, што ў сучасным мясцовым гарадскім ужытку працягвалі функцыянаваць аўтэнтычныя традыцыйныя жанры фальклору, тады як ўласна гарадскіх тэкстаў, якія звычайна распаўсюджваюцца ў дзвюх формах – вуснай і пісьмовай, выўялена не было, нягледзячы на мэтаскіраванне студэнтаў да збору твораў і традыцыйных, і сучасных. Дадзеная стратэгія добра «спрацавала» на матэрыяле фальклору Мазырска-Прыпяцкага Палесся, які мы падрабязна прааналізавалі ў сваім артыкуле «Фальклор Мазырска-Прыпяцкага Палесся: з вопыту палявых экспедыцый студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ імя Ф. Скарыны». Нагадаю, што студэнтамі ў канцы 90-х– напачатку 2000-х гадоў былі

абследаваны раённыя цэнтры Петрыкаў, Лельчыцы і Мазыр, дзе разам з традыцыйнымі творамі быў выяўлены шэраг спецыфічных гарадскіх тэкстаў, сярод вусных формаў якіх найбольш паслядоўна быў праўстаўлены: гарадскі абрадавы фальклор, які датычыцца грамадскага і хатняга быту (грамадскі быт: паэзія адноўленых каляндарных традыцый, сучасных святаў, выпускных вечароў, вечароў сустрэч, «пасвяшчальных» абрадаў (у салдат тэрміновай службы, студэнтаў); хатні быт: рэпертуар сучаснага застолля, вяселля, хрысцінаў, пахавання, провадаў на тэрміновую службу) і 2) гарадская фальклорная проза (былічкі, у аснове якіх – міфалагічныя апавяданні; гарадскія бывальшчыны – апавяданні аб даўніх падзеях; гарадскія мемараты – апавяданні сведкаў аб нядаўніх падзеях; чуткі, плёткі, байкі; анекдоты; 3) малыя формы фальклору; 4) гарадская фальклорная паэзія (гарадскія рамансы, новыя балады, песенныя пераробкі папулярных твораў); 5) гарадскі дзіцячы фальклор (сучасныя нескладухі, недарэчнасці; «садысцкія» вершыкі; школьны тлумачальны слоўнік) [1]. Адсутнасць спецыфічна гарадскіх запісаў з Лагойска і Плешчаніц у фальклорным архіве ГДУ імя Ф. Скарыны нельга лічыць дастаковай падставай для таго, каб казаць аб абсалютнай адсутнасці дадзенай з'явы на тэрыторыі дадзенага раёна. Хутчэй за ўсё гэта паказчык дамінавання традыцыйнага фальклору, які і збіральнікі, і інфарманты лічаць і будуць лічыць эстэтычна больш вартымі ўвагі. Відаць, прыведзеныя вышэй віды і жанры сучаснага гарадскога фальклору, якія ўдалося зафіксаваць у іншых адміністрацыйных адзінках Беларусі, яшчэ чакаюць сваіх зацікаўленых збіральнікаў і даследчыкаў, а магчыма, ужо і захоўваюца ў іншых архівах.

Такім чынам, параўнальны аналіз зафіксаваных на тэрыторыі Лагойскага раёна і захоўваемых ў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны фальклорных твораў паказаў, што жанрава-відавы склад адзінак фальклору характарызуецца яскравым дамінаваннем песенных твораў – каляндарна- і сямейна-абрадавых, пазаабрадавых бытавых, сацыяльных, баладных, living рознатэматычных прыпевак. Дастаткова поўна прадстаўлены парэміялагічны фонд (прыказкі, прымаўкі, загадкі), выслоўі, сфера дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, дражнілкі, дзіцячыя гульні, лічылкі, страшылкі), замовы. Значнае месца займаюць творы савецкага часу – песні, рачоўкі, парэміі, прыпеўкі з адпаведнай тэматыкай, а таксама творы перыяду Вялікай Айчыннай вайны, сярод якіх, акрамя песень, вершаў, лозунгаў, прыпевак, сустракаюцца творы няказкавай рэалістычнай фальклорнай прозы, у прыватнасці бываліцы. Добра прадстаўлена фальклорная смехавая проза такім жанрам, як анекдот. Найменш зафіксавана празаічных жанраў казкавай і няказкавай фальклорнай прозы, а духоўных вершаў і псальмаў, твораў народнай драмы зусім не выяўлена. Прычым увага збіральнікаў да твораў фальклорнай прозы (ці адказаў інфармантаў на пытанні аб мясцовых звычаях, забабонах, перасцярогах, персанажах вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі, будаўніцтве, арганізацыі хатняга побыту і многім іншым) з'яўляецца ў тых справаздачах студэнтаў, якія датуюцца другой паловай 90-х гадоў. Дзякуючы гэтаму за апошнія 15 гадоў вопіс 9 вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны, за якім значыцца Лагойскі раён, папоўніліся запісамі фальклорнай прозы амаль усіх яе відаў: у большай ступені – каляндарна-святочнай і сямейна-абрадавай, у меншай – народна-хрысціянскай, казкавай, няказкавай, смехавай, магічнай. На жаль, зусім не сутракаюцца запісы міфалагічнай прозы (аб прадстаўніках вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі). Акрамя таго, як паказваюць запісы, студэнты працягваюць актыўна запісваць фальклорныя творы ў вёсках, прычым дамінуюць у іх справаздачах усё роўна аўтэнтычныя песні розных жанраў, што сведчыць аб адзінстве развіцця і наследаванні спрадвечнай фальклорнай традыцыі.

*Даследаванне ажыццяўляецца пры фінансавай падтрымцы адміністрацыі Лагойскага райвыканкама (код праекта: упішыце самі).*

### Заўвагі

* 1. Адзначым, што ў 2009 г. у рэдакцыйна-выдавецкі аддзел ГДУ імя Ф. Скарыны названымі аўтарамі быў прадстаўлены дапоўнены і дапрацаваны рукапіс дадзенага дапаможніка. У ім змешчаны асобным раздзелам карагодныя песні (карагоды), а таксама прадстаўлены патрабаванні да афармлення выніковай справаздачы студэнтаў у электронным варыянце і на аўдыё(відэа)носьбітах.

* 2. Каб пазбегнуць блытаніны ў назвах лабараторыі беларускага фальклору ГДУ імя Ф. Скарыны, лічым мэтазгодным даць наступную даведку.

Да 1981 года ўсё фальклорныя запісы захоўваліся на кафедрах, якія ажыццяўлялі фальклорную практыку, – беларускай літаратуры і рускай савецкай літаратуры. Калі, дзякуючы пастанове Савета Міністраў БССР ад 1 студзеня 1981 г., ГДУ імя Ф. Скарыны былі вылучаны сродкі для правядзення даследаванняў па беларускім фальклоры і дыялекталогіі, у складзе Праблемнай НДЛ сацыялагічных даследаванняў (якая існавала як структурнае падраздзяленне Навукова-даследчай часткі ГДУ імя Ф. Скарыны) быў утвораны сектар «Даследаванне беларускага фальклору і дыялекталогіі». Сектар афіцыйна функцыянаваў на філалагічным факультэце, і з часам у ім была сканцэнтравана ўся збіральніцкая фалькларыстычная дзейнасць: практыкі па фальклору і дыялекталогіі, рэгулярныя комплексныя экспедыцыі супрацоўнікаў. Адразу пасля адкрыцця сектара пачалі фарміравацца архівы з фальклорнымі і дыялекталагічнымі запісамі і фонаархіў, запісы з якіх класіфікаваліся і рыхтаваліся да выдання.

Загадам па ГДУ імя Ф. Скарыны ад 14 лістапада 1985 г. на базе сектара «Даследаванне беларускага фальклору і дыялекталогіі» была створана навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору і дыялекталогіі пры кафедры беларускай літаратуры. Фінансаванне лабараторыі ажыццяўлялася на аснове навуковых праектаў.

1 красавіка 2003 г. вучоным саветам Навукова-даследчай часткі ГДУ імя Ф. Скарыны было прынята Палажэнне, у якім афіцыйна замацоўвалася новая назва лабараторыі як лабараторыя беларускага фальклору. Скасаванне ў назве «і дыялекталогіі» было абгрунтавана тым, што з 1996 г. навуковыя даследаванні этналінгвістычнага характару ў лабараторыі не распрацоўваліся, а матэрыялы дыялекталагічных практык пачалі канцэнтравацца ў архіве новастворанай на філалагічным факультэце кафедры гісторыі беларускай мовы, якая з 1997 г. пачала самастойна ажыццяўляць дыялекталагічную практыку.

1 красавіка 2005 г. загадам па ГДУ імя Ф. Скарыны НДЛ беларускага фальклору была рэарганізавана ў вучэбна-навуковую лабараторыю (ВНЛ) беларускага фальклору на бюджэтнай аснове фінансавання (упершыню ў гісторыі).

## Літаратура

1. Марозава, Т. А. Фальклор Мазырска-Прыпяцкага Палесся: з вопыту палявых экспедыцый студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ імя Ф. Скарыны // Палявая фалькларыстыка: даследаванне лакальных культур Беларусі: зб. артыкулаў / уклад. І. Ю. Смірновай; пад навук. рэд. В. А. Лабачэўскай. – Мінск: ГДУ імя Ф. Скарыны КіМ, 2008. – С. 229–235.

## ЗАМОВЫ

### Замова, каб карова не брыкалася»

Госпаду Богу памолімся, Прачыстай Божай Маці пакланюся. Прачыстая Божа Маці з залатога прэстолу ўставала, рабой кароўцы  помачы давала. Ты, кароўка, стой, як дубову пол. Молока побока, сметаны поўвінца. Ножкамі не махай, ножкамі не трахай. Сваёй хозяйцы ўсю добычу отдавай.

*Запісала Ваўчаніна Ірына Анатольеўна ў в. Пагранічча Лагойскага раёна*
*ад Раднёнак Ганны Гаўрылаўны (1937 г. н.) у 2004 г.*

Звіг, звіг, не будзь ты ліх, не ламай касцей, не сушы Ігната. Ехаў ісус Хрыстос на сівенькім коніку, над крыжам стаў. Сустаў, на месце стань (3 р.).

*Запісаў Максімовіч Валерый у в. Траянец Лагойскага раёна*
*ад Дубаневіч Ніны Каітанаўны (1935 г. н.) у 1985 г.*

### Заклічкі

Дожджык, дожджык, крапані,
Бабу з поля прагані.
Дожджык, дожджык, перастань,
Бабу з поля не чапай.

*Запісала Ваўчаніна Ірына Анатольеўна ў в. Пагранічча Лагойскага раёна*
*ад Раднёнак Ганна Гаўрылаўны (1937 г. н.) у 2004 г.*

### Павер'е

Не можно цераз парог на двор выліваць ваду ці памоі, бо абальецца той анёл, які стаіць каля парога на варце. Ён можа саўсім пакінуць хату і тады нячыстая сіла падкрадзецца да гэтай хаты.

*Запісала Ваўчаніна Ірына Анатольеўна ў в. Пагранічча Лагойскага раёна*
*ад Раднёнак Ганна Гаўрылаўны (1937 г. н.) ў 2004 г.*

### Жніўныя песні

Палуднечкі загудзелі,
Палуднаваць захацелі.
Гудзіце, не гудзіце,
Палуднаваць не будзеце.
Наша пані маладая,
Яна вам не пагадае.
Прынясе палуднаваць
Булку хлеба аржанога,
Бочку піва медавога.
Сядзьце, жнейкі, у халадочку,
З'есце хлеба па кусочку,
Піце піва па кубачку.

*Запісалі Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Крамянец Лагойскага раёна*
*ад Мардас Марыі Рыгораўны (1917 г. н.) у 1979 г.*

### Вясельныя песні

Паедзеце, мае сваточкі, дадому.
Завязіце маёй мамачцы ўклоны,
Што яна мяне маленькую ўхавала,
Сорак ночак цямнюсенькіх не спала,
Трыццыць свечак яснюсенькіх спаліла,
Пакуль мяне маленькую ўзрасціла,

А ўзрасціўшы, да работачкі прыўчыла,
А прыўчыўшы, у чужыя людзі пусціла.

***Запісалі Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Крамянец Лагойскага раёна ад Мардас Марыі Рыгораўны (1917 г. н.) у 1979 г.***

Казалі нам людзі,
Што наша Ганначка
Не праха,
Не ткаха,
Аж наша Ганначка
І добра ткала,
І тонка прала,
І бела бяліла,
І ўсіх сватой дзяліла.

***Запісала Волкава Вольга Мікалаеўна ў в. Акалова Лагойскага раёна ад Андросік Таццяны Лукінішны ў 2000 г.***

Ішлі дзевачкі па зялёненькім садочку,
Шукалі яны Пецевых слядочкаў.
Ой, падышлі пад цісовае аконца –
Сядзіць Пецейка за столікам, як сонца.
Кругом яго зялёныя букеты,
А перад ім – салодкія канфеты.
А на руках – замшовыя пярчаткі…
Любілі яго красівыя дзяўчаткі.

***Запісаў Максімовіч Валерый у в. Траянец Лагойскага раёна ад Дубаневіч Ніны Каітанаўны (1935 г. н.) у 1985 г.***

**Купальская песня**

Купала ты, Купала,
Купала на Йвана.
А дзе ж твая дочка?
А ў гародзе чабор поле,
Чабор поле, рукі коле.
Няхай чабор свінні з'ядзяць,
Валы згудзяць, коні стопчуць,
Коні стопчуць капытамі,
А малойчыкі чабатамі.

***Запісалі Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Крамянец Лагойскага раёна ад Мардас Марыі Рыгораўны (1917 г. н.) у 1979 г.***

**Паданне**

Вы бачылі, што ў нас тут на Лагойшчыне гор многа. Дык вось як гэта было, як яны тут стаялі. Гэта даўно было. Як толькі свет зараджаўся, патоп быў, вады многа было. Дык тая вада вельмі шумлівая была. І нясла яна шмат зямлі і каменя рознага. Дзе лясы былі, гэтыя пяскі і камення асядалі. Дзе лес вышэйшы, там і гара, а дзе лес ніжэйшы – то там і горачка нізкая. Гэта вада аж да Чорнага мора дайшла. А калі йшла, то многа яе ў зямлю ўходзіла, і к Чорнаму мору гэтай вады ўжо не стала. Лясоў там таксама не было і таму на Ўкраіне раўніны.

***Запісалі Камінскі А., Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Крамянец Лагойскага раёна Мінскай вобласці ад Дабрагоста Кузьмы Маркавіча (1903 г. н.) у 1979 г.***

**Балада**

А ў нашай дзеравушкі
Нова навіна.

Маладая Настасся
Сына радзіла.
Не пусціла на свет Божы,
У мора бросіла.
А там хлопцы-рыбаловы
Рыбу лавілі,
Не злавілі рыбу-шчуку,
Думалі ліна,
Як узялі пасматрэлі –
Малае дзіця.
А ў нядзельку параненьку
Ўсё званы равуць,
Маладую Настассю
К растрэлу вядуць,
А за нею стара мамка
Горкі слёзы льёць.
– Не плач, не плач, стара мамка,
У цябе іх дома пяць,
Не пускай іх на вулачку,
Пускай дома спяць.

***Запісалі Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Гайна Лагойскага раёна ад Пунтус Сцепаніды Антонаўны (1889 г. н.) у 1979 г.***

**Пажаданне**

Дару табе кош гліны, каб цераз год былі радзіны.

***Запісалі Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Вепрашы Лагойскага раёна ад Лашукевіч Грыпіны Паўлаўны (1911 г. н.) у 1979 г.***

**Любоўная песня**

Ой, там на гарэ,
Ой, там на крутой,
Ой, там сядзела пара галубей.
Яны там сядзелі ўсё і кахаліся
І правым крылечкам абдымаліся.
Адкуль жа ўзяўся ахотнік-стралец?
Убіў, разагнаў пару галубей.
Галуба ўбіў, галубку злавіў,
Узяў пад палу, прынёс дадому,
Насыпаў пшанца аж па каленца,
Наліў вадзіцы па самыя крыльцы.
Галубка не есць, галубка не п’е,
Ўсё на ту гару яна плакаць ідзе.
– Галубка мая, сізакрылая,
Чаму ж ты такая клапатлівая.
– Як мне не быць, як не крапаціцца,
Я ў пары была, цяпер жа адна.
Ёсць сад ў мяне,
А ў тым жа саду сем пар галубей,
Лятай, выбірай, каторы мілей.
– Я там была і ўсіх відала,
Таго не нашла, каго ўцярала.

***Запісалі Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Крамянец Лагойскага раёна ад Мардас Марыі Рыгораўны (1917 г. н.) у 1979 г.***

**Калядная песня**

Сьяты наш дзень настаў,
Хрыстос васкрэс і з гроба ўстаў,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Суботня полнач ліш прашла,
Зара нядзельная ўзышла,
Как ангел ў гробе дзвер атверз,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Ту ноч ка гробу жоны ішлі
І мірацэн з сабой няслі.
Но смотрят: гроб был адкрыт,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Ці жоны плакаць пачалі,
Што цела ў гробе не знайшлі,
Но смотрят: в гробе кто-то есць,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Там быў блісцяшчы прызахлі
Пасланнік Божы быў для ніх.
Там светлы ангел із нябес,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
– У царквах лікуйцеся, у дамах,
Нам жысць адкрыта ў небясах.
Прыдложыл ангел ім ту весць,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.
Як ангелы на небясі,
Усе радуйцеся на зямлі.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс.

***Запісалі Гугіна Т., Жарыкава Л., Валюшыцкая В. у в. Гайна Лагойскага раёна ад Жылянілай Веры Мікалаеўны (1921 г. н.) у 1979 г.***

Ай на вуліцы
Сівы конь бяжыць,
Ай ля-лёй,
Сівы конь бяжыць.

Ой, бяжыць, бяжыць,
Развіваецца,
Ай ля-лёй рана,
Развіваецца.
На ёй грывачка развіваецца,

Разлітаеца.
Ай ля-лёй рана
Разлітаецца.

***Запісала Волкава Вольга Мікалаеўна ў в. Акалова Лагойскага раёна ад Андросік Таццяны Лукінішны ў 2000 г.***

**Загадка**

Прыйшла чорная карова,
Усіх людзей пабарола.

***Запісалі Багай А., Грэчанік Л., Дзяшова Г. у в. Бабры Лагойскага раёна ад Зянькевіч Елізаветы Вікеньцьеўны (1923 г. н.) у 1979 г.***

Пяцьдзесят дзве галкі і дванаццаць арлоў знеслі адно яйцо. (Год)

***Запісала Волкава Вольга Мікалаеўна ў в. Слабада Лагойскага раёна ад Цімохінай Алены Аляксееўны ў 2000 г.***

**Прыпеўка**

Як пайду я па ваду,
Я старога прывяду:
У пролубку галавой –
Пагуляю ўдавой.

***Запісала Волкава Вольга Мікалаеўна ў г. п. Плешчаніцы Лагойскага раёна ад Беляковіч Пятруні Іванаўны ў 2000 г.***

**Калыханка**

Хадзіў коцік па халадку,
Намарозіў лапкі,
Залез ён на печачку,
Сам лапачкі грэе,
Недзе катку дзецца,
Із кутка ў куток.

***Запісала Волкава Вольга Мікалаеўна ў в. Акалова Лагойскага раёна ад Андросік Таццяны Лукінішны ў 2000 г.***

**Сямейная песня**

**Прымаўка**

Ілля наробіць гнілля.

***Запісала Волкава Вольга Мікалаеўна ў в. Слабада Лагойскага раёна ад Цімохінай Алены Аляксееўны ў 2000 г.***

**Прыказка**

Зарубіць сабе па носе.

***Запісала Волкава Вольга Мікалаеўна ў в. Слабада Лагойскага раёна ад Цімохінай Алены Аляксееўны ў 2000 г.***

**Элігічныя песні**

Бярозка з лістом
Усё лета шумавала,
Як прыйшла восень,
Уся халодная
Бярозка стала.
– А мой лісточык,
Мой зяляненькі,

Як мы раснёмся?
Цябе павеюць буёны ветры,
А я тут застануся.
Тут застануся,
Вецейкам апушчуся,
Вецейкам тут я апушчуся,
Дожджыкам аблююся.

*Запісаў Максімовіч Валерый у в. Траянец Лагойскага раёна ад Жаўняровіч Таццяны Іосіфаўны (1923 г. н.) у 1985 г.*

**Жартоўныя песні**

Пайшла цешча к зяцю ў госці,
Ён сярдзіты быў той зяць.
Было ў яго многа злосці –
Не ўмеў цёшчу шанаваць.
Зяць дзверы адчыняе,
Маці дачку навучае:
– Ты, Алёнка, ты, дачушка,
Чорт бяры з работай той.
Ліш бы толькі дзень не спала,
Варухайся й ды не стой.
Зяць дзверы адчыняе:
– За твае, цёшча, саветы
Заплаціць табе хачу.
Узяў зяць папругу ў рукі
І папругай па плячу,
Вывеў зяць цёшчу сярдзіта
Ды ў борану запрог.
Забліжэлі ў бабы пяты,
Толькі пыл пайшоў з-пад ног.
Баба борану таскала,
Пэўна прайшло гадзін пяць
І ні разу не аддыхала.
Стаў ён цёшчу выпрагаць.
Выпраг зяць цёшчу сярдзіта,
Баба коціцца кулём,
Чэраз поле поле, лён і жыта
Валіць к дзеду перуном.
– Стары, стары, старэнькі,
Ідзі Алёнку ратаваць,
Ну ж глядзі не панадзіся,
Бо там катар, а не зяць.
Стары стаіць, зубы сцяўшы.
Баба хоча плётку сплесць,
А нарэшце кій ўзяўшы
Ды да зяця валя цесць.
Зяць у сенцах прызастаўся,
К клямке вуха прылажыў,
От ён слухаў, прыслухаўся,
Што цесць доццы гаварыў:
– Ты, Алёнка, ты, дачушка,
Ці ж без працы можна жыць,
Выкінь гэту дур з галоўкі
Трэба мужу прыгадзіць.

Ён жа не п’яніца, не злодзей,
Ён, дачушка, не гультай.
Жывіце, дзеткі, з Богам,
Ты язык свой прытрымай.
Зяць дзверы адчыняе:
– За твае, бацька, саветы,
Заплаціць табе хачу,
А ты, жонка, палі печ,
Пячы бацьку кілбасу,
А я гарэлку прынясу.
Затрашчэлі ў печы дровы,
Затрашчэла скварада.
Пайшла чарка з рук у рукі,
Гэта проста аж бяда.
– Ах, стары, стары, старэнькі,
Ты ж на нас не забывай,
На ж табе яшчэ за гэта
Трохпудовы каравай.
Стары ідзе сабе, спявае,
Добра выпіў, закусіў,
Каравая чуць трымае,
Яму плечы аддушыў.
Баба гэта ўвідала,
Яна ручкі заламала:
– Ведзь я барану таскала,
А дзед дамоў з ярмом ідзець.

***Запісаў Максімовіч Валерый у в. Траянец Лагойскага раёна ад Жаўняровіч Таццяны Іосіфаўны (1923 г. н.) у 1985 г.***

# ЗМЕСТ


Замовы………………………………………………………………………………. 3

Гладкі Я. (Варлыга А.) *Забабоны* ………………….……………………………… 15

Кастрыца А. *Міфалагічныя ўяўленні ў прыкметах і павер’ях (на матэрыялах палявой экспедыцыі 2008 г. па Лагойскаму раёну)*…………………………………………………….. 21

Прыкметы і павер’і ………………………………………………………………… 23

Ненадавец А. *Народныя перасцярогі, прыкметы і павер’і, запісаныя на Лагойшчыне ў 80-х гадах ХХ стагоддзя*…………………………………………………………………… 36

Валодзіна Т. *Народная медыцына Лагойшчыны*………………………………………… 55

Народная міфалогія………………………………………………………………… 59

Панкова Н. *Як прыказвалі на Лагойшчыне*…………………………………………… 66

Малыя фальклорныя жанры: прыказкі і прымаўкі……………………………………… 68

Алфёрава А. *Загадкі* ……………………………………………………………….. 71

Малыя фальклорныя жанры: загадкі ……………………………………………………... 74

Дзіцячы фальклор Лагойшчыны……………………………………………………. 79

Народная проза Лагойшчыны………………………………………………………... 92

Ганчарэнка Я. *Нарысы, звязаныя са знакамітымі мясцовасцямі Лагойшчыны* (кніга «Світанак над Гайнай»)………………………………………………………………... 114

З запісаў Ляцкага У. ………………………………………………………………….. 137

Доўнар-Запольская А. *З матэрыялаў фальклорнага архіва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі* ………………….. 156

Міхайлец М. *Фальклорная калекцыя Мінска-Маладзечанскай экспедыцыі 1945 года* .. 159

Марозава Т. *Фальклор Лагойскага раёна: па матэрыялах рэгіянальнага архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ* ……………………………… 172

Замовы ………………………………………………………………………………… 178

Навуковае выданне

# Бласлаўлёнай зямлі неўміручыя скарбы

***Народная духоўная культура Лагойшчыны***

У 3 кнігах

Кніга 3

Пад агульнай рэдакцыяй *В. С. Новак*

Камп'ютарная вёрстка: *С. П. Максіменка*

Подписано в печать 27.10.2013. Формат 60х84 1/8.
Бумага офсетная. Ризография. Усл. печ. л. 14,5.
Уч.-изд. л. 12,7. Тираж 30 экз. Заказ 482.

Издатель и полиграфическое исполнение :
учреждение образования
«Гомельский государственный университет
имени Франциска Скорины».
ЛИ № 02330/0549481 от 14.05.2009.
Ул. Советская, 104, 246019, г. Гомель.